А. Г. Каханоўскі

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX–ПАЧАТКУ XX ст.



Вучэбна-Метадычны Дапаможнік

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

А. Г. Каханоўскі

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
## ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX–ПАЧАТКУ XX ст.

*Рэкамендавана*
*Вучэбна-метадычным аб'яднаннем*
*па гуманітарнай адукацыі*
*ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка*
*для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі,*
*якія навучаюцца па спецыяльнасці*
*1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)»*

МІНСК
БДУ
2017

УДК 94(476)"18/19"(075.8)
ББК 63.3(4Беи)53я73-1
К12

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук *А. М. Люты*;
кандыдат гістарычных навук *В. В. Яноўская*

**Каханоўскі, А. Г.**
К12 Гісторыя Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. : вучэб.-метад. дапам. / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2017. – 251 с.
ISBN 978-985-566-485-8.

На аснове навейшых дасягненняў вывучэння айчыннай гісторыі прадстаўлены падзеі і працэсы, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: сацыяльна-эканамічнае развіццё, грамадска-палітычнае жыццё, а таксама фарміраванне беларускай нацыі, развіццё культуры, эвалюцыя ўрадавай палітыкі, рэалізацыя буржуазных рэформ, сацыяльная трансфармацыя грамадства.

Для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)».

**УДК 94(476)"18/19"(075.8)**
**ББК 63.3(4Беи)53я73-1**

**ISBN 978-985-566-485-8**

© Каханоўскі А. Г., 2017
© БДУ, 2017

# ПРАДМОВА

У вучэбна-метадычным дапаможніку асвятляюцца пытанні гісторыі Беларусі ад адмены прыгоннага права да Першай сусветнай вайны. Сялянская рэформа распачала шэраг буржуазных рэформ, што надалі дынамізм трансфармацыйным працэсам у беларускім грамадстве, змест якіх вызначае пераход ад традыцыйнай да індустрыяльнай формы развіцця. Пачатак Першай сусветнай вайны выклікаў прынцыпова іншыя зрухі ў грамадстве, часта абумоўленыя знешнімі ваенна-палітычнымі фактарамі. Адзначаны перыяд займае асобнае і важнае месца ў айчыннай гісторыі. На гэтым этапе адбыліся лёсавызначальныя змены, якія акрэслілі абрысы сучаснай беларускай нацыі, вызначылі кірунак фарміравання элементаў грамадзянскай супольнасці. То быў час рэформ і контррэформ, што на тэрыторыі Беларусі набыло адметнасць з-за спроб урада Расійскай імперыі вырашыць нацыянальнае пытанне і прымушала пастаянна змагацца супраць польскіх уплываў. Абазначаны кірунак урадавай палітыкі наклаў адбітак нават на сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы, вырашэнне сялянскай справы. Беларусь адносілася ў той час да ліку рэгіёнаў Расійскай імперыі, дзе нацыянальнае пытанне стаяла найбольш востра, але ўласна беларускі аспект у ім займаў нязначнае месца. У другой палове XIX ст. фактычна адбылася канчатковая ломка той сацыяльнай сістэмы грамадства ў Беларусі, якая

сфарміравалася на старашляхецкіх традыцыях Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай і працягвала функцыянаваць у першай палове стагоддзя. Сацыяльная трансфармацыя праходзіла пад уплывам двух асноўных фактараў: урадавай палітыкі, якая вызначалася ў дадзены перыяд моцнымі русіфікатарскім і ўніфікацыйным напрамкамі, і станаўлення буржуазнага грамадства. Апошні працэс на адзначаным этапе застаўся незавершаным, перш за ўсё з-за нявырашаных старых і дынамічных новых нацыянальных пытанняў.

Важнае месца ў кнізе адведзена разгляду гістарыяграфічных і крыніцазнаўчых аспектаў вывучэння айчыннай гісторыі другой паловы XIX – пачатку XX ст., вызначэнню агульнага і асаблівага ў разгортванні мадэрнізацыйных працэсаў, трансфармацыйных зменах і станаўленні буржуазнага грамадства, фарміраванні беларускага нацыянальна-культурнага руху і інш.

Вучэбна-метадычны дапаможнік адпавядае тыпавой вучэбнай праграме па гісторыі Беларусі, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, для студэнтаў гістарычных факультэтаў, якія атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)». Пры яго падрыхтоўцы ўлічаны назапашаная гістарыяграфічная спадчына вывучэння гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. і, безумоўна, напрацоўкі сучасных даследчыкаў, у тым ліку аўтарскія.

Выданне арыентавана на набыццё студэнтамі ведаў аб асноўных этапах, з'явах, падзеях і асобах айчыннай гісторыі другой паловы XIX – пачатку XX ст., разуменне імі сутнасных характарыстык ключавых праблем гэтага часу, фарміраванне дакладнага ўяўлення аб узаемаўплывах працэсаў, што тады адбываліся, аб іх месцы ў агульнай прасторы беларускай гісторыі і ўключанасці ў падзеі, якія разгортваліся на тэрыторыі Расійскай імперыі.

# Тэма 1

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ

## Гістарыяграфія. Крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

Другая палова XIX – пачатак XX ст. – вельмі складаны, супярэчлівы перыяд у гісторыі Беларусі. Ён уяўляе сабой пачатак сістэмных пераўтварэнняў у эканоміцы ў беларускім грамадстве, з'яўляецца адным з важнейшых этапаў мадэрнізацыйнага пераходу ад традыцыйнага да індустрыяльнага тыпу развіцця. Многія з працэсаў, якія мелі пачатак ці трансфармаваліся ў гэты час, знайшлі працяг у наступныя перыяды, некаторыя актуальныя да сёння. Вывучэнне названага гістарычнага адрэзка аб'ядноўвае шэраг самастойных у гістарыяграфічным плане пытанняў, сярод якіх сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства пад уплывам працэсаў мадэрнізацыі; рэалізацыя буржуазных рэформ у Беларусі; адмена прыгоннага права і шляхі капіталістычнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі; рост гарадоў, развіццё прамысловасці і гандлю; грамадска-палітычны рух; разгортванне рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. на тэрыторыі Беларусі; фарміраванне беларускай

нацыі і развіццё культуры; эвалюцыя ўрадавай палітыкі, асаблівасці канфесійнай сітуацыі і г. д. Пералік даследаванняў, дзе прадметам вывучэння непасрэдна ці ўскосна з'яўляецца гісторыя Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст., вялікі. Гістарыяграфія мае больш чым стагадовую традыцыю. На розных этапах яе станаўлення змяняліся прыярытэты вывучэння, адрозніваліся акцэнты, макра- і мікрападыходы. У рамках даследавання адзначанага перыяду быў сабраны і прааналізаваны багацейшы матэрыял, але сённяшні стан вывучэння гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. можна параўнаць з няякасным фотаздымкам, дзе больш-менш выразна акрэслены пярэдні план, аднак дастаткова слаба, размыта ўспрымаецца фонавая частка.

## Гістарыяграфія

Першыя публікацыі, прысвечаныя аналізу пытанняў гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст., выйшлі яшчэ да 1917 г. Іх аўтары часта з'яўляліся сведкамі гістарычных падзей і працэсаў, якія яны апісвалі, і ў абсалютнай большасці не былі гісторыкамі. Працы, апублікаваныя да 1917 г., падрыхтаваны пераважна эканамістамі, статыстыкамі, фалькларыстамі і этнографамі і вызначаюцца эмпірызмам, багаццем цікавых назіранняў, статыстычных звестак. Сярод іх сустракаюцца гістарычныя нарысы з элементамі мемуарыстыкі, падрабязныя статыстыка-эканамічныя даследаванні, падмацаваныя вялізнымі дадаткамі ў выглядзе табліц, этнаграфічныя і фальклорныя агляды, якія адрозніваюцца манерай структурызацыі і характарам змешчаных матэрыялаў.

У публікацыях П. Бранцава, М. Каткова, Г. Карнілава, М. Каяловіча, В. Ратча і іншых з афіцыйнага пункту гледжання адлюстраваны падзеі паўстання 1863 г. у Беларусі, а таксама грамадска-палітычнае жыццё пасля яго разгрому. У працах чарнасоценца Л. Саланевіча, ліберала А. Сапунова, прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай думкі Антона і Івана Луцкевічаў, К. Каганца, С. Палуяна знайшлі свой адбітак імклівыя падзеі і супярэчнасці канца XIX – пачатку XX ст.

У змястоўных даследаваннях К. Анікіевіча, І. Вульферта, А. Дэмбавецкага, П. Баброўскага, В. Сямёнава, Ю. Янсана адлюстраваны значны рост прамысловасці, саматужных промыслаў, пашырэнне гандлю, апісаны становішча рабочых, эвалюцыя аграрнага пытання і сельскагаспадарчай вытворчасці ў Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

Перыяд 20–30-х гг. XX ст. цікавы як час пачатку станаўлення ўласнабеларускай гістарычнай школы і гісторыі Беларусі як самастойнага аб'екта даследавання, вяўлення агульных абрысаў нацыянальнага мінулага. Яго гістарыяграфічныя здабыткі на некалькі дзесяцігоддзяў наперад вызначылі развіццё беларускай гістарычнай навукі, адным з прыярытэтаў якой у гэты час сталі даследаванні айчыннай гісторыі другой паловы XIX – пачатку XX ст., найперш сацыяльна-эканамічных працэсаў і рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху. Першаступенная ўвага надавалася аналізу форм і метадаў класавай барацьбы. Для даследаванняў дадзенага перыяду былі характэрны пераважна макрагістарычны падыход і імкненне ва ўмовах імклівага пашырэння марксісцкай парадыгмы зразумець і абгрунтаваць непазбежнасць рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Гэта былі працы рознай глыбіні пранікнення ў прадмет вывучэння, асваення гістарычных крыніц, часам заснаваныя на ўласным досведзе бачання аўтарамі апісваемых працэсаў.

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі сістэмны аналіз сацыяльна-эканамічных працэсаў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. ва ўзаемадачыненні розных іх элементаў зрабіў М. Доўнар-Запольскі ў даследаванні «Народное хозяйство Белоруссии 1861–1914 гг.» (1926). У ім знайшлі асвятленне пытанні эканамічнага развіцця, дынамікі саслоўнага складу насельніцтва Беларусі, сацыяльнай дыферэнцыяцыі, маёмаснага становішча сельскага насельніцтва, пралетарыяту. Пачатак капіталістычнай мадэрнізацыі Беларусі М. Доўнар-Запольскі звязваў з 80-мі гг. XIX ст. Асаблівую ўвагу аўтар надаваў сацыяльна-эканамічнаму развіццю беларускай вёскі. На яго думку, у эканамічным спаборніцтве з памешчыцкай гаспадаркай у Беларусі перамагала сялянская.

На старонках працы А. Цвікевіча «"Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в.» (1929) на шырокім фоне развіцця грамадска-палітычнага руху, эвалюцыі ўрадавай палітыкі адлюстравана разгортванне русіфікацыі на тэрыторыі Беларусі, станаўленне ідэалогіі заходнерусізму. Адным з першых да гісторыі Беларусі пасляРэформеннага перыяду звярнуўся У. Ігнатоўскі. Яго выданнем «Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX ст.» (1928) была пакладзена традыцыя падрыхтоўкі прац па асобных этапах гісторыі Беларусі насуперак створаным раней кароткім аглядным нарысам па ўсёй айчыннай гісторыі. У ім У. Ігнатоўскі зрабіў першую спробу аналізу эвалюцыі беларускага нацыянальнага руху. Грамадска-

палітычны рух другой паловы XIX – пачатку XX ст. і яго вынікі не маглі заставацца па-за ўвагай даследчыкаў 20-х гг. XX ст. Гэтай тэматыцы прысвечаны манаграфіі і артыкулы С. Агурскага, У. Пічэты, А. Смоліча, Ф. Турука і інш. У 1924 г. у часопісе «Полымя» быў надрукаваны артыкул У. Пічэты «Формы нацыянальнага і апазіцыйнага руху на Беларусі», які з'явіўся першай спробай сістэматычнага выкладання гісторыі беларускіх грамадскіх рухаў. Да сярэдзіны 1920-х гг. у БССР быў сфармуляваны погляд беларускай савецкай гістарычнай навукі на нацыянальны рух.

Гістарыяграфія 30–50-х гг. XX ст. вызначылася празмернай увагай да развіцця рабочага і сялянскага рухаў, ідэалагізацыяй фарміравання грамадска-культурнага жыцця. Не пазбаўлены шаблонаў таго часу, але ўсё ж змястоўны матэрыял аб сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі ўтрымліваюць даследаванні Д. Дудкова, К. Кернажыцкага, І. Саладкова, В. Шчарбакова, М. Фрыдман, П. Чарнушэвіча і інш. Для іх былі характэрны пераважна макрагістарычны падыход і імкненне ва ўмовах хуткага пашырэння марксісцкай парадыгмы зразумець і абгрунтаваць непазбежнасць рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Гэта былі працы рознай глыбіні пранікнення ў прадмет вывучэння, асваення гістарычных крыніц, часам заснаваныя на ўласным вопыце бачання аўтарамі апісваемых працэсаў.

На працягу 60–80-х гг. XX ст. гісторыкамі дастаткова дэталёва акрэслены агульныя абрысы сацыяльна-эканамічных працэсаў у Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст., вызначаны кірунак іх развіцця, уведзены ў навуковы ўжытак і ахарактарызаваны асноўныя віды масавых крыніц, акрэслены і выкарыстаны інфармацыйныя магчымасці статыстычных даных. Але ў гэты перыяд іх разгляд датычыўся пераважна ўплыву капіталістычных адносін на беларускія вёску і горад, пытанняў станаўлення пралетарыяту і сацыяльнага разлажэння сялянства, а таксама эвалюцыі і форм рабочага, сялянскага, рэвалюцыйна-дэмакратычнага і нацыянальна-вызваленчага рухаў, палітыкі царызму ў Беларусі. Для беларускай савецкай гістарыяграфіі было характэрна спалучэнне даследаванняў сацыяльна-эканамічнага развіцця з тэматыкай разгортвання рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху і рэвалюцыйных пераўтварэнняў. У гэты час з'явіўся шэраг прац М. Біча, М. Болбаса, К. Шабуні, В. Панюціча, Л. Ліпінскага, Х. Бейлькіна, С. Самбук і інш. Каштоўным здабыткам разглядаемага перыяду для вывучэння гісторыі Беларусі стала выданне калектыўных абагульняючых

прац: «Гісторыя Беларускай ССР» (1972. Т. 2), «Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя» (1985), «История рабочего класса Белорусской ССР» (1984. Т. 1) і інш.

Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі вялікі гістарычны матэрыял па пытаннях развіцця прамысловасці, крыніцах фарміравання, складзе пралетарыяту Беларусі сабраў і сістэматызаваў З. Абезгаўз. Разгортванне рабочага руху, станаўленне сацыял-дэмакратычных арганізацый у Беларусі, аналіз фарміравання пралетарыяту і буржуазіі ў Беларусі сталі прадметам разгляду ў манаграфіях М. Біча «Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883–1903 гг.» (1973), «Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг.» (1983).

Сацыяльная трансфармацыя беларускага сялянства, развіццё сельскай гаспадаркі, уплыў эвалюцыі капіталістычных адносін на стан памешчыцкай гаспадаркі, урадавая палітыка ў сферы землеўладання і землекарыстання дэталёва прааналізаваны ў працах В. Панюціча «Из истории формирования пролетариата Белоруссии. 1861–1914 гг.» (1969), «Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг.» (1990) і інш. Даследчык у рамках фармацыйнай парадыгмы сабраў і перапрацаваў вялікі аб'ём статыстычнага матэрыялу, неапублікаваных крыніц.

У манаграфіі М. Болбаса «Промышленность Белоруссии. 1860–1900» (1978) на аснове вялікага масіву эмпірычнага матэрыялу даследавана развіццё прамысловай вытворчасці, станаўленне прамысловага пралетарыяту і буржуазіі. Значную цікавасць уяўляюць статыстычныя табліцы, якія змешчаны ў дадатку да манаграфіі і сфарміраваны з улікам вялікай колькасці першасных даных. Даследчык у адпаведнасці з традыцыяй беларускай савецкай гістарыяграфіі імкнуўся паказаць працэсы прамысловага развіцця ў Беларусі, нават выйшаў за рамкі характарыстыкі ў межах 35 паветаў і тэрытарыяльна наблізіў разгляд да сённяшніх дзяржаўных меж Беларусі. М. Болбас таксама падрыхтаваў даведнік «Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі» (1988). Пачатак прамысловага перавароту ў Беларусі даследчык адносіў да канца 50-х гг. XIX ст. насуперак агульнапрынятаму ў большасці айчынных калектыўных і манаграфічных прац сцвярджэнню, што зыходным момантам гэтага працэсу былі 30–40-я гг. XIX ст. Шмат увагі М. Болбас надаваў аналізу сацыяльна-эканамічных перадумоў і наступстваў прамысловага развіцця ў Беларусі. Асобныя пытанні фарміравання некаторых груп рабочых, іх матэрыяльнага дабрабыту адлюстраваны ў працах А. Бараноўскага, В. Іванова,

У. Цітка і інш. Саслоўная ўрадавая палітыка ў другой палове XIX ст., рэжым выключных законаў у дачыненні да католікаў, яўрэяў, сферы землеўладання і землекарыстання, іх уплыў на сацыяльныя працэсы ў горадзе і вёсцы Беларусі прааналізаваны ў манаграфіі С. Самбук «Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века» (1980). Асобныя сацыяльна-дэмаграфічныя працэсы ў Беларусі разглядала З. Тальвірская, пытанні працоўнай міграцыі сялянства, у асноўным на ўсход Расійскай імперыі, – П. Верашчагін, развіццё сельскагаспадарчага рынку – Х. Бейлькін і інш. Барацьбе палітычных сіл на тэрыторыі Беларусі ў час рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. прысвечаны працы М. Марцюховай.

Перыяд другой паловы XIX – пачатку XX ст. не адносіўся да ліку прыярытэтных у шматграннай навуковай дзейнасці па вывучэнні гісторыі Беларусі выдатнага гісторыка выпускніка БДУ М. Улашчыка. Аднак ён пакінуў шэраг прац, якія актыўна цытуюцца даследчыкамі да сёння. У іх знайшлі асэнсаванне пытанні пашырэння пісьменнасці сярод насельніцтва Беларусі на мяжы XIX–XX стст., сацыяльна-эканамічнага развіцця заходнебеларускай вёскі напярэдадні адмены прыгоннага права, трансфармацыйных працэсаў у асяроддзі беларускага сялянства на прыкладзе вёскі Віцкаўшчыны.

У 60–80-я гг. XX ст. даследчыкамі было зроблена вельмі шмат для вывучэння развіцця культуры, станаўлення навуковых ведаў у Беларусі другой паловы XIX ст. Фактычна на гэтым этапе сфарміравана і прааналізавана інфармацыйная база вывучэння дадзеных працэсаў, праведзена сістэмнае вывучэнне кірункаў эвалюцыі і зместу грамадска-культурнага жыцця. Узнавіць многія забытыя старонкі гісторыі беларускай літаратуры, фарміравання пісьменніцкага асяродку дазваляюць даследаванні С. Александровіча, А. Мальдзіса, А. Лойкі, Г. Кісялёва. Апошні стаў адным з пачынальнікаў літаратурнага крыніцазнаўства XIX ст. Агульныя абрысы эвалюцыі грамадска-палітычнай думкі Беларусі, асабліва рэвалюцыйна-дэмакратычнага яе кірунку, знайшлі сваю распрацоўку і адлюстраванне ў працах В. Шалькевіча, А. Майхровіча, С. Самбук, У. Конана, М. Рожына і інш. Станаўленне беларусазнаўства, навуковых ведаў па археалогіі, археаграфіі, фалькларыстыцы, этнаграфіі Беларусі ўсебакова, на аснове вялікай базы архіўных крыніц разгледжана ў працах В. Бандарчыка, У. Васілевіча, Г. Каханоўскага, А. Фядосіка, М. Улашчыка, І. Цішчанкі і інш. Пэўным падсумаваннем даследавання складанага шляху этнакультурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі, станаўлення беларускай нацыі з'явілася

выданне «Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя» (1985). Адзін з пачынальнікаў вывучэння гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі XIX ст. – Л. Дробаў. Вынікам даследчыцкіх намаганняў гэтага вучонага, а таксама А. Кулагіна, В. Шматава, Я. Сахуты, В. Церашчатавай і іншых стала выданне трэцяга тома «Гісторыі беларускага мастацтва» (1989), другая глава якога прысвечана мастацтву 60–90-х гг. XIX ст. Значным быў уклад у вывучэнне гісторыі архітэктуры Беларусі У. Чантурыя.

На сучасным этапе ў параўнанні з папярэднімі перыядамі для айчыннай гістарычнай навукі адным з прыярытэтаў вывучэння развіцця Беларусі ў другой палове XIX ст. сталі пытанні сацыяльнага жыцця, у прыватнасці даследаванне гісторыі дваранства, купецтва, інтэлігенцыі, сацыяльнай трансфармацыі беларускай вёскі, структуры гарадскога насельніцтва, комплекснага асэнсавання беларускага нацыянальнага руху і яго ідэалогіі і інш. Гэтай тэматыцы прысвечаны працы А. Жытко, З. Шыбекі, Н. Палятаевай, В. Насевіча і інш. У манаграфіі З. Шыбекі «Гарады Беларусі (60-я гг. XIX – пачатак XX ст.)» (1997) з прымяненнем матэматыка-статыстычных метадаў вызначаны крыніцы фарміравання, дынаміка росту, месца гараджан у структуры насельніцтва Беларусі. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі аўтар узнімае праблему сацыяльнай і тэрытарыяльнай мабільнасці жыхароў беларускіх гарадоў і мястэчак, характарызуе палітыку расійскага ўрада ў дачыненні да працэсаў горадаўтварэння.

Даследаванне А. Жытко «Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг.» (2003) з'яўляецца першай у айчыннай гістарыяграфіі манаграфіяй, прысвечанай гісторыі вышэйшага саслоўя ў Беларусі на этапе станаўлення і развіцця капіталістычных адносін. Аўтарам зроблены аналіз дынамікі складу дваранства, крыніц яго папаўнення, ролі ў эканамічным жыцці. У манаграфіі Н. Палятаевай разгледжаны дынаміка, склад, прававое становішча, гандлёва-прамысловая дзейнасць купецтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

У апошняе дзесяцігоддзе ў айчыннай гістарыяграфіі адбываюцца спробы пошуку новых метадалагічных падыходаў, выкарыстання мадэрнізацыйнай парадыгмы для аналізу трансфармацыі беларускага грамадства. Этапы і асаблівасці разгортвання мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі, іх змест, уплыў на сацыяльныя змены ў другой палове XIX – пачатку XX ст. даследуе А. Каханоўскі. Сацыяльна-культурныя, гаспадарчыя, дэмаграфічныя змены ў традыцыйнай беларускай вёсцы, у тым ліку ў другой палове XIX – пачатку XX ст., прааналізаваў

на мікраўзроўні В. Насевіч, узяўшы за прыклад невялікі рэгіён на тэрыторыі сучаснага Лагойскага раёна. С. Токць, прыняўшы ў якасці метадалагічнай асновы даследавання мадэрнізацыйную парадыгму, вывучаў кірунак і характар сацыяльна-культурных працэсаў, якія адбываліся ў традыцыйным жыцці беларускай вёскі ў другой палове XIX – першай трэці XX ст. Аўтар акцэнтаваў увагу на эвалюцыі сацыяльнай і этнаканфесійнай свядомасці сярод сялян, пашырэнні пісьменнасці. Пытанням сацыяльна-прававога становішча і складу дробнай шляхты Беларусі ў XIX ст. прысвечаны дысертацыйнае даследаванне і артыкулы В. Макарэвіча. Разгляд сялянскага руху ў Беларусі ў другой палове XIX ст. змешчаны ў работах У. Крука. Г. Маскевіч прааналізавала сацыяльную стратыфікацыю беларускага сялянства ў 60–90-я гг. XIX ст., С. Талмачова – становішча сялянак і сялянскае самакіраванне ў Беларусі. Абагуленая характарыстыка колькасці, складу, асаблівасцей фарміравання пралетарыяту Беларусі ў 1907–1917 гг. дадзена Э. Савіцкім.

На сучасным этапе беларускімі гісторыкамі значна менш увагі надаецца традыцыйным у айчыннай гістарыяграфіі пытанням развіцця прамысловасці, сельскай гаспадаркі, фарміравання рабочага класа, сацыяльнага разлажэння сялянства і інш. Аднак выключэннем у гэтым сэнсе стаў выхад другога тома «Гісторыі сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён» (2002), дзе на аснове вялікага пласта архіўных крыніц і абагульнення вопыту ранейшых спецыяльных даследаванняў дадзены панарамны разгляд эвалюцыі сацыяльна-эканамічнага, прававога становішча, побыту беларускага сялянства ў 60–90-х гг. XIX ст., яго месца ва ўрадавай палітыцы, аграрных пераўтварэннях, удзелу ў міграцыйных працэсах і сацыяльных рухах.

У сучасных даследаваннях айчынных гісторыкаў актыўна распрацоўваюцца пытанні эвалюцыі ўрадавай палітыкі, нацыянальных рухаў, канфесійнай гісторыі, на іншы ўзровень асэнсавання выведзены аналіз развіцця культуры і інш. Гэтыя аспекты сталі прадметам навуковых работ В. Цяпловай, праз якія акадэмічнай супольнасці вернуты многія цікавыя імёны, падзеі грамадска-культурнага і канфесійнага жыцця Беларусі другой паловы XIX ст. У манаграфіі В. Яноўскай «Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863–1914 гг.» (2002) зроблены аналіз змен у стане хрысціянскіх канфесій Беларусі ў 1863–1914 гг., іх узаемадачыненняў, уплыву на грамадства. Эвалюцыя польскага грамадска-палітычнага руху на тэрыторыі Беларусі, яго суадносіны з беларускім нацыянальным асяроддзем, станаўленне краёўства як плыні ў сацы-

яльным жыцці знайшлі адлюстраванне ў манаграфічных даследаваннях А. Смаленчука. Этнічная гісторыя Беларусі XIX – пачатку XX ст. на падставе яе параўнальнага аналізу з аналагічнымі працэсамі ў народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы стала прадметам разгляду ў манаграфіі П. Церашковіча.

Увасабленне эклектыкі ў архітэктуры Беларусі другой паловы XIX ст. разглядаецца ў даследаваннях А. Кулагіна. Шэраг манаграфій і артыкулаў С. Снапкоўскай прысвечаны развіццю адукацыі на тэрыторыі Беларусі. Прадпрымальніцтва ў Беларусі аналізуецца ў навуковых артыкулах А. Бурачонка. Метадалагічныя праблемы вывучэння грамадскіх рухаў, іх класіфікацыя і перыядызацыя сталі сферай даследаванняў М. Сакаловай. Разгляд станаўлення сацыяльнай работы, дабрачыннасці ў Беларусі дадзены ў працах А. Грыгор'ева, С. Шымуковіча і інш. Развіццё асобных этнаканфесійных груп насельніцтва Беларусі ў больш шырокім, чым разглядаемы перыяд, гістарычным кантэксце стала прадметам спецыяльнага аналізу ў манаграфічных даследаваннях А. Гарбацкага (стараверы), У. Тугая (латышы). Пытанні гістарыяграфіі гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст., эвалюцыю гістарычнай думкі ў Беларусі вывучае Д. Караў, працэсы рэалізацыі буржуазных рэформ на тэрыторыі беларускіх губерняў – А. Загорнаў. Аўтарамі манаграфічных даследаванняў аб дзейнасці палітычных партый на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. з'яўляюцца П. Брыгадзін, К. Бандарэнка, Д. Лаўрыновіч, У. Коршук, М. Сташкевіч, І. Раманоўскі. Дзейнасць дэпутатаў ад беларускіх губерняў у складзе Дзяржаўнай Думы Расійскай імперыі прааналізаваў М. Забаўскі, земскага самакіравання ў Беларусі – В. Слабажанін. Беларускаму нацыянальна-культурнаму руху ў пачатку XX ст. прысвечаны даследаванні А. Унучака.

Першай спробай у Рэспубліцы Беларусь абагуліць гістарыяграфічны матэрыял і стварыць канцэптуальнае бачанне развіцця Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. з'яўляецца выданне першай часткі «Нарысаў гісторыі Беларусі» (1994). У раздзеле «Станаўленне буржуазнага грамадства (60–90-я гг. XIX ст.)» чацвёртага тома шасцітомнага навуковага выдання «Гісторыя Беларусі» (2005), падрыхтаванага супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, акцэнтавана ўвага на разглядзе асаблівасцей урадавай палітыкі, правядзення рэформ на тэрыторыі Беларусі, капіталістычнай трансфармацыі эканамічнага жыцця, эвалюцыі асноўных плыняў грамадскага руху, здабыткаў культуры. Стан, дыскусійныя пытанні, перспектывы айчыннай гістарыя-

графіі гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. у больш шырокім храналагічным і праблемным кантэксце разгледжаны ў іншых калектыўным даследаванні супрацоўнікаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі – «Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы» (2006).

Навуковая, літаратурная, творчая дзейнасць прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, пытанні фарміравання культурна-асветніцкіх асяродкаў знайшлі адлюстраванне на старонках даведачных выданняў «Мысліцелі і асветнікі Беларусі» (1995), «Беларускія пісьменнікі. Біябібліяграфічны даведнік» (1992–1995) і інш.

У расійскай гістарыяграфіі разгляд сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. адбываўся пераважна ў кантэксце макрагістарычнага развіцця Расійскай імперыі. Цікавыя даныя і характарыстыка асобных сацыяльных працэсаў у беларускіх губернях прыведзены ў даследаваннях шэрагу расійскіх навукоўцаў, якія часцей за ўсё больш шырокія па тэрытарыяльных межах прадмета разгляду. Сярод іх вылучаюцца працы Б. Ананьіча, А. Анфімава, А. Боханава, М. Дружыніна, П. Заянчкоўскага, А. Карэліна, І. Кавальчанкі, В. Лейкінай-Свірскай, П. Рындзюнскага і інш. Асобныя пытанні грамадскага руху на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX ст., нацыянальнай урадавай палітыкі разглядалі В. Дзякін, К. Шаціла, А. Аўрэх і інш. В. Зайцаў ахарактарызаваў нацыянальны і саслоўны склад насельніцтва беларускіх і літоўскіх губерняў напярэдадні паўстання 1863 г. Некаторыя аспекты сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў на тэрыторыі беларускіх губерняў асвятляліся ў працах З. Тальвірскай, А. Мыльнікава, Б. Ціханава, Л. Склярова, Л. Іванова і інш. Пытанні выпрацоўкі ўрадавых рашэнняў у сацыяльна-саслоўнай сферы ў перыяд і пасля паўстання 1863 г. на тэрыторыі беларускіх губерняў сталі прадметам разгляду ў манаграфічным даследаванні Г. Камзолавай. Этнаканфесійную палітыку расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі і Літвы ў 60–70-я гг. XIX ст. даследуе М. Далбілаў. Цікавыя факты, назіранні аб сацыяльных працэсах на тэрыторыі Беларусі змешчаны ў працах Л. Бародкіна, Б. Міронава. Асобныя даныя аб саслоўным складзе насельніцтва беларускіх губерняў прыведзены ў даследаваннях Н. Івановай і В. Жалтовай, аб нацыянальнай палітыцы – у работах А. Мілера, Л. Гарызонтава.

У польскай гістарыяграфіі пры разглядзе пытанняў развіцця Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. перавага аддаецца выву-

чэнню этнакультурных працэсаў, палітычнаму кампаненту, звязанаму з адлюстраваннем стану польскай справы на заходніх ускраінах Расійскай імперыі. Сацыяльна-эканамічнае жыццё Беларусі знаходзіць фонавае адлюстраванне ў абагульняючых выданнях па гісторыі Польшчы, дзе разглядаюцца толькі асобныя аспекты, такія як нацыянальны склад насельніцтва, эміграцыя (перш за ўсё палітычная), канфесійнае жыццё і каталіцкае духавенства. Цікавасць уяўляюць даследаванні Ё. Сікорскай-Кулешы, Л. Заштаўта аб «разборы шляхты», Б. Стэпнеўскай-Хольцэр аб поліэтнічным складзе насельніцтва гарадоў і мястэчак усходняй часткі Беларусі, Р. Юркоўскага аб становішчы землеўласнікаў Літвы і Беларусі і дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў. Характарыстыка этнаканфесійнага складу насельніцтва беларускіх губерняў у канцы XIX – пачатку XX ст., пераважна на аснове даных перапісу насельніцтва 1897 г. і даследаванняў беларускіх навукоўцаў, дадзена ў працах Р. Радзіка і польскіх даследчыкаў беларускага паходжання Я. Мірановіча, А. Латышонка. Развіццё свядомасці і культуры польскіх землеўласнікаў на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Украіны ў 1864–1914 гг. ахарактарызаваў М. Устшыцкі. Дастаткова паказальнай з'яўляецца праца А. Хвальбы, дзе ў агульны кантэкст гісторыі Польшчы 1795–1918 гг. укладаюцца асобныя фрагменты гісторыі Беларусі. Падобны падыход прымяняецца ў выданнях С. Кеневіча, Е. Здрада і інш. Даныя аб працэсах у беларускім грамадстве другой паловы XIX – пачатку XX ст. прысутнічаюць у асобных выданнях па гісторыі Беларусі М. Космана, С. Ланца, а таксама ў працах Д. Файнхаўза, А. Заянчкоўскага. Як спрэчныя айчыннымі даследчыкамі ўспрымаюцца падлікі этнічнага складу насельніцтва Беларусі на мяжы XIX–XX стст. у працах П. Эберхарта. Літоўскі навуковец Д. Сталюнас падрыхтаваў даследаванне аб рэалізацыі палітыкі русіфікацыі на тэрыторыі Беларусі і Літвы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Асобныя звесткі аб этнічным складзе насельніцтва, сацыяльных і этнаканфесійных працэсах, грамадска-культурным жыцці ў Беларусі прыводзяцца Е. Александравічусам, А. Кулакаўскасам (Літва), Д. Зіберт, Р. Ліндзэрам, І. Путкамерам (Германія), А. Капелерам (Аўстрыя) і інш.

У апошні час у параўнанні з папярэднімі этапамі развіцця айчыннай гістарыяграфіі гісторыя Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. стала прадметам дастаткова актыўнага разгляду на старонках навучальных дапаможнікаў для сярэдняй школы, абітурыентаў, студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. У гэтым кірунку найболь-

шых поспехаў дасягнулі супрацоўнікі профільных кафедр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

## Крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

Выданні адпаведнай тэматыкі ўяўляюць сабой разнастайны і складаны корпус даных. У значнай ступені яны апрацаваны і апублікаваны, асабліва статыстыка і заканадаўчыя акты. Але большасць дакументаў знаходзіцца ў архівасховішчах і рукапісных аддзелах бібліятэк Мінска, Гродна, Вільнюса, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Варшавы, Кракава і інш. Існуе праблема іх выяўлення і выкарыстання. Як архіўныя, так і апублікаваныя крыніцы адрозніваюцца па сваім фарміраванні і ступені рэпрэзентатыўнасці. Часта гістарычныя выданні несупастаўляльныя паміж сабой з-за адрозненняў па паходжанні, тэхніцы і праграме збору звестак. З прычыны існуючага разрыву паміж задачамі, якія стаялі перад складальнікам дакумента, і навуковымі мэтамі даследчыкаў нярэдка паўстае праблема выяўлення падтэкставай, скрытай інфармацыі.

У апошнія дзесяцігоддзі XIX – пачатку XX ст. у параўнанні з папярэднім перыядам новых відаў крыніц практычна не ўзнікла, з'явілася вялікая колькасць іх разнавіднасцей. У той жа час адзначана тэндэнцыя да ўніфікацыі формы і зместу многіх відаў пісьмовых крыніц – матэрыялаў справаводства, перыядычнага друку і інш. Істотна павялічыўся аб'ём і інфармацыйны рэсурс прац, у тым ліку прызначаных да друку. Гэта прывяло да сітуацыі, калі даследчык гістарычных працэсаў другой паловы XIX – пачатку XX ст. у параўнанні са спецыялістамі па сярэднявечнай гісторыі ўжо не ў стане вывучыць усе крыніцы, а павінен мэтанакіравана іх адбіраць у адпаведнасці са сваёй навуковай гіпотэзай. Колькасны рост выданняў ставіць перад даследчыкам праблему карэктнасці выбаркі інфармацыі, перш за ўсё на матэматыка-статыстычнай аснове.

Змяненне характару дзяржаўнага кіравання прывяло да ўзнікнення такой групы крыніц, як статыстыка. Яе прызначэнне – рэалізацыя зваротнай сувязі ў сістэме кіравання, збор і аналіз інфармацыі для пры-

няцця адэкватных кіраўнічых рашэнняў. Пачатак іх фарміравання як сістэмы даных у Расійскай імперыі традыцыйна звязваюць з 1860-мі гг., калі быў створаны Цэнтральны статыстычны камітэт (ЦСК) Міністэрства ўнутраных спраў. Да гэтага часу статыстыка была прадстаўлена галоўным чынам статыстычнымі дадаткамі да справаздач губернатараў. Цэнтральным і губернскімі статыстычнымі камітэтамі за гады дзейнасці быў назапашаны агромністы масіў даных, значная частка якога апублікавана на старонках спецыялізаваных выданняў таго часу «Статистический Временник Российской империи» (1866–1890), «Статистика Российской империи» (1887–1917) і «Временник Центрального статистического комитета» (1888–1903).

Статыстычныя крыніцы ўяўляюць сабой значны і складаны корпус гістарычных дакументаў. Сярод іх вылучаюць матэрыялы дэмаграфічнай, аграрнай, прамысловай статыстыкі, а таксама статыстыкі працы, якая пераважна звязана з дзейнасцю фабрычна-заводскіх інспектараў. У статыстыцы ў паслярэформенны перыяд перавагу набылі перапісы як спосаб атрымання даных.

Асаблівасцю статыстычнага ўліку ў Расійскай імперыі была адсутнасць адзінай сістэмы збору і апрацоўкі звестак. Да канца XIX ст. у беларускіх губернях сфарміраваліся два асноўныя яго тыпы: першы быў звязаны з дзейнасцю ЦСК і быў яму падкантрольны, другі праводзіўся асобнымі міністэрствамі і ведамствамі. З разрозненасцю спосабаў атрымання даных звязана тое, што статыстычныя матэрыялы вельмі разнастайныя па сваім паходжанні, праграме і тэхніцы збору звестак, што, у сваю чаргу, стала прычынай несупастаўляльнасці інфармацыі крыніц. З прычыны існуючых адрозненняў у задачах, якія стаялі перад складальнікамі крыніц у мінулым, і навуковымі мэтамі сённяшніх даследчыкаў даныя статыстыкі нярэдка маюць ускоснае дачыненне да прадмета вывучэння, у прыватнасці да сацыяльнай структуры, сацыяльнай стратыфікацыі насельніцтва і інш. Пры працы са статыстычнымі крыніцамі трэба таксама ўлічваць, што на іх надзейнасць паўплывала непасрэдная сувязь статыстычных даных з інтарэсамі людзей, сацыяльна-эканамічнай сферай іх дзейнасці. Гэтым выклікана нярэдка наўмысная фальсіфікацыя крыніц рэспандэнтамі. Часам такое адбывалася ад простага няведання, неразумення сутнасці запытваемых паказчыкаў.

Улік насельніцтва ў Расійскай імперыі да 1860-х гг. вёўся інтуітыўна, ацэначна. Пасля арганізацыі ЦСК пачалі публікавацца даныя аб коль-

касці насельніцтва і яе зменах. Асноўнымі формамі ўліку жыхароў у другой палове XIX – пачатку XX ст. былі адміністрацыйна-паліцэйскі і царкоўны перапісы. Неўпарадкаванасць на месцах, слабы кантроль дакладнасці збіраемых звестак, адсутнасць спецыяльнай падрыхтоўкі ў зборшчыкаў даных, ведамасная раз'яднанасць і ў сувязі з гэтым часта розныя праграма і методыка збору дэмаграфічных паказчыкаў з'яўляліся характэрнымі рысамі адміністрацыйна-паліцэйскага ўліку насельніцтва. Напрыклад, аб дваранстве звесткі назапашваліся ў губернскіх і павятовых дваранскіх сходах, аб мяшчанах – у гарадской думе, аб святарах – у духоўнай кансісторыі і г. д. Розныя даныя аб саслоўным складзе жыхароў, характары іх заняткаў, маёмасным становішчы праз мясцовыя органы збіраліся ў дэпартаментах міністэрстваў унутраных спраў, фінансаў, дзяржаўных маёмасцей, герольдыі і інш. Матэрыялы для статыстыкі дасылаліся праз павятовую паліцыю. Яна давала інфармацыю нярэдка па сваім разуменні, не абцяжарваючы сябе ўдакладненнем і кантролем звестак. Царкоўны ўлік праводзіўся праваслаўным, каталіцкім, іўдзейскім, мусульманскім, пратэстанцкім духавенствам адпаведна веравызнанню насельніцтва. Фіксаваліся дата нараджэння і смерці чалавека, яго саслоўная прыналежнасць.

Найбольш каштоўныя, разнастайныя, адносна дакладныя звесткі ўтрымліваюць матэрыялы Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 28 студзеня 1897 г. Да яго правядзення неаднаразова ў розных частках Беларусі рабіліся спробы арганізацыі дэмаграфічных перапісаў. У 1874 г. Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства вёў падрыхтоўку перапісу жыхароў гарадоў Віленскай губерні. Магілёўскі губернатар у 1886 г. ставіў пытанне аб перапісе насельніцтва ў губерні з мэтай удакладнення адбывання вайсковай павіннасці.

Перапіс насельніцтва 1897 г. быў грандыёзным па задуме, але недастаткова падрыхтаваным. Жыхары не мелі дакладнага ўяўлення аб яго мэтах і задачах. Маналікім быў кантынгент прафесійных статыстыкаў, не хапала перапісчыкаў. Арганізацыю абследавання зімой ускладнялі моцныя маразы. Праверка даных перапісу ў сельскай мясцовасці праводзілася не шляхам паўторнага абходу двароў, а на вясковых сходах. Апрацаваная частка матэрыялаў дэмаграфічнага абследавання апублікавана ў пагубернскіх выданнях і спецыяльных зборніках («Распределение рабочих и прислуги по группам занятий и по месту рождения на основании данных первой всеобщей пере-

писи населения Российской империи 28 января 1897 года», «Численность и состав рабочих в России на основании данных Первой всеобщей переписи населения Российской империи 1897 г.»). Падчас перапісу фіксаваліся звесткі аб усіх жыхарах, незалежна ад полу, узросту, нацыянальнасці. У лісты для апытання ўносіліся даныя аб саслоўнай прыналежнасці ці стане жыхароў, месцы нараджэння, прапіскі і пастаяннага пражывання, адносінах да гаспадара і главы сям'і (сваяк, прыслуга, наёмны работнік і інш.), занятках (асноўных і дадатковых), пісьменнасці, роднай мове. Перапіс улічваў гаспадаркі і прадпрыемствы, дзе прымянялася наёмная праца, а таксама асобна людзей, занятых працай па найме. Даныя абследавання падчас публікацыі былі разнесены па 25 табліцах, але яны не ўтрымлівалі поўнай інфармацыі, якая трапіла ў перапісныя лісты. Выдадзеныя па асобных губернях матэрыялы перапісу пры іх аднолькавай праграме публікацыі ўсё ж у дачыненні да некаторых табліц нераўнацэнныя. Напрыклад, у выданнях па Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях звесткі аб размеркаванні насельніцтва па месцы нараджэння дадзены па зводных саслоўных групах, а ў публікацыях па Віленскай і Віцебскай губернях гэта інфармацыя больш падрабязная – па асобных саслоўях. Тым не менш матэрыялы перапісу ўяўляюць сабой больш дакладныя ў параўнанні са статыстыкай XIX ст. звесткі, якія дазваляюць характарызаваць сацыяльна-саслоўную, полаўзроставую структуру, а таксама структуру занятасці насельніцтва Беларусі.

Звесткі асобных табліц апублікаваных матэрыялаў перапісу насельніцтва 1897 г. выклікаюць крытыку некаторых даследчыкаў. Асаблівую ўвагу ў гэтым сэнсе заслужыла статыстыка размеркавання насельніцтва па даных аб іх роднай мове. Збор даных аб размеркаванні насельніцтва па народнасцях на падставе звестак аб роднай мове аб'ектыўна апраўдвае тое, што падчас правядзення перапісу для значнай часткі жыхароў былі незразумелымі паняцці «нацыя» і «нацыянальная прыналежнасць». У бытавым разуменні яны замяняліся канфесіяналізмамі, лакальнай ідэнтыфікацыяй. У той час нават у навуковай літаратуры не было выпрацаваных крытэрыяў вызначэння нацыянальнай прыналежнасці, але інфармацыя аб роднай мове, несумненна, больш аб'ектыўна сведчыла аб нацыянальнасці, чым канфесійная прыналежнасць. Распрацоўка табліц аб роднай мове адпавядала міжнародным стандартам таго часу, і гэты паказчык выкарыстоўваўся пры правядзенні дэмаграфічных абследаванняў у еўрапейскіх краінах.

Сярод матэрыялаў аграрнай статыстыкі значную каштоўнасць маюць даныя абследаванняў землеўладання і землекарыстання. У 1877, 1887 і 1905 гг. ЦСК былі праведзены перапісы зямельнай уласнасці еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. Падчас першага абследавання ўлічваліся прозвішча, саслоўная прыналежнасць ці званне землеўласніка, колькасць зямлі, якая яму належала, а ў сельскай грамадзе – колькасць двароў, жыхароў і характар землекарыстання (падворны ці абшчынны). Вынікі перапісу па беларускіх губернях змешчаны ў пятым выпуску «Статистики поземельной собственнности и населенных мест Европейской России» (1882). У публікацыі прыведзены даныя аб колькасці і памерах зямельных уладанняў, падзеленыя па саслоўях і катэгорыях уладальнікаў. Праграма абследавання 1887 г. у асноўным супадала з праграмай папярэдняга, але распрацоўка яго вынікаў для публікацыі была больш вузкай, і ў сувязі з гэтым апублікаваныя матэрыялы праведзенага абследавання па шэрагу важных паказчыкаў аказаліся несупастаўляльнымі з данымі статыстыкі землеўладання 1877 г., а таксама 1905 г. Акрамя таго, перапіс 1887 г. улічваў як зручныя землі сялянскіх надзелаў, так і няўдобіцы, чаго не было падчас абследавання 1877 г. Перапіс 1905 г. быў задуманы з мэтай выяўлення змен, якія адбыліся ў структуры землеўладання з 1877 г., таму яго праграма паўтарала праграму перапісу 1877 г. Апублікаваныя матэрыялы абодвух абследаванняў дазваляюць характарызаваць іерархію землеўласнікаў па іх саслоўнай прыналежнасці і велічыні маёмасці, грамадскія працэсы сярод сялянства, памеры яго сацыяльнай дыферэнцыяцыі адпаведна велічыні землеўладання і землекарыстання. Яны даюць магчымасць аналізаваць пастаўленыя пытанні асобна па кожным з храналагічных зрэзаў, аднак іх супастаўленне ў дынаміцы абцяжарана тым, што ў даных за 1877 г. прыводзіцца статыстыка землеўласнікаў, а за 1905 г. – уладанняў.

Шмат гадоў айчынныя даследчыкі выкарыстоўвалі матэрыялы ваенна-конскіх перапісаў для аналізу і характарыстыкі класавага расслажэння сялянства паводле ступені забяспечанасці іх гаспадарак рабочай жывёлай. Магілёўская губерня стала адной з першых, дзе ў 1875 г. быў праведзены падобны перапіс. Апублікаваныя матэрыялы наступнага абследавання 1882 г. не ўтрымліваюць звестак аб размеркаванні двароў па колькасці рабочых коней, што было б вельмі важна для ўстанаўлення групіроўкі сялян у пачатку 1880-х гг. і для супастаўлення з данымі наступных перапісаў. Вельмі каштоўныя звесткі для ранжыравання ўладальнікаў у залежнасці ад забяспечанасці іх коньмі

прыводзяцца ў апублікаваных матэрыялах ваенна-конскіх перапісаў 1888, 1900 і 1912 гг. Зацікаўленасць ваеннага ведамства ў правядзенні абследаванняў прадвызначыла высокую якасць статыстычнай інфармацыі. Разнастайныя звесткі аб сацыяльна-культурных працэсах у беларускай вёсцы ўтрымліваюць пагубернскія выданні «Трудов местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности», а таксама «Сельскохозяйственные и статистические сведения по материалам, полученным от хозяев».

Для прамысловай статыстыкі Расійскай імперыі быў характэрны найперш улік развіцця вытворчасці, яго вынікаў. Для аналізу развіцця прамысловай вытворчасці Беларусі, фарміравання тут пралетарыяту, прадпрымальніцкага асяродку каштоўнасць уяўляюць інфармацыйныя магчымасці прамысловых перапісаў 1900 і 1908 гг., якія сёння яшчэ недастаткова выкарыстаны айчыннымі даследчыкамі. Звесткі для першага прамысловага перапісу збіраліся за ўвесь 1900 г. ці за справаздачны год, прычым быў прыменены анкетны спосаб, калі бланкі запаўнялі ўладальнікі прадпрыемстваў, але пад наглядам фабрычных інспектараў. Пад перапіс трапілі прадпрыемствы перапрацоўчай прамысловасці еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, якія не былі абкладзены акцызам і знаходзіліся пад наглядам фабрычнай інспекцыі. Аднак нават добра арганізаваная прамысловая статыстыка не магла замяніць статыстыку працы і працоўных, якая вызначалася сваімі ўласнымі задачамі і не атрымала належнага развіцця.

Характарыстыку адной з сацыяльна-прафесійных груп – настаўнікаў – утрымліваюць матэрыялы абследавання навучальных устаноў у сакавіку 1880 г. Яны дазваляюць прааналізаваць колькасць, саслоўнае паходжанне, склад, узровень атрыманай адукацыі выкладчыкаў мужчынскіх і жаночых спецыяльных, сярэдніх навучальных устаноў і сельскіх вучылішч. Параўнальную характарыстыку працэсаў пашырэння пісьменнасці на тэрыторыі Беларусі і ў суседніх рэгіёнах можна зрабіць на аснове матэрыялаў «Статистические сведения по начальному образованию в Российской империи», «Сборник статистических сведений о состоянии среднего и низшего профессионального образования в России». У студзені 1911 г. быў праведзены аднадзённы перапіс пачатковых школ Расійскай імперыі. Матэрыялы па Віленскай навучальнай акрузе, куды ўваходзілі беларускія губерні, апублікаваны асобным выпускам. Яны ўтрымліваюць цікавыя звесткі аб пачатковых школах Беларусі па стане на 1910 г. У матэрыялах ахарактарызавана дынаміка развіцця пачатковай адукацыі на тэрыторыі Віленскай навучальнай

акругі, па кожным з паветаў, асобна для гарадскіх і сельскіх населеных пунктаў, прыводзяцца звесткі аб колькасці адмоў у прыёме ў школы ў 1910 г., аб выкладчыках пачатковых вучылішч па тыпах навучальных устаноў у гарадах і сельскіх населеных пунктах, абагульняючыя даныя па паветах і губернях. Інфармацыя ўключае склад настаўнікаў, працягласць іх педагагічнай дзейнасці, сямейны стан і ўзровень атрыманай адукацыі. На вялікі жаль, не ўтрымліваюцца традыцыйныя для такога роду абследаванняў звесткі аб саслоўнай прыналежнасці і роднай мове выкладчыкаў. Матэрыялы перапісу дазваляюць ахарактарызаваць склад вучняў пачатковых вучылішч. Тут прыведзены звесткі аб узросце навучэнцаў, іх роднай мове, веравызнанні і саслоўным стане, узроўні атрымліваемай адукацыі.

За дзесяцігоддзі працы на старонках выданняў ЦСК былі апублікаваны і іншыя разнастайныя статыстычныя матэрыялы, якія ўяўляюць безумоўную каштоўнасць для характарыстыкі сацыяльна-эканамічных і этнакультурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Інфармацыю для ЦСК прадстаўлялі губернскія статыстычныя камітэты, намаганнямі якіх, акрамя таго, выдаваліся памятныя кніжкі губерняў на пэўны год, агляды губерняў, гісторыка-статыстычныя апісанні і інш. Памятныя кніжкі Віленскай губерні пачалі выходзіць з 1845 г., Віцебскай – 1861, Гродзенскай – 1859, Мінскай – 1860, Магілёўскай – з 1853 г. Іх частку складаў статыстычны раздзел, дзе прыводзіліся звесткі аб колькасці і саслоўным складзе насельніцтва, яго дынаміцы, даныя аб розных катэгорыях сельскіх жыхароў і інш. Аналагічную інфармацыю ўтрымлівалі «Обзоры губерний», якія ўяўлялі сабой статыстычныя дадаткі да штогадовых справаздач губернатараў і пачалі рыхтавацца з 1870 г. З 1880-х гг. справаздачы губернатараў і агляды губерняў сталі рэгулярна друкавацца. Надзейнасць статыстычных і аналітычных даных мела нярэдка праблемны характар, яны не правяраліся належным чынам і патрабавалі ўдакладнення праз супастаўленне са звесткамі іншых крыніц. Аднак тым не менш падрабязная штогадовая характарыстыка эканамічнага становішча рэгіёна і выказаныя мясцовай адміністрацыяй прапановы шляхоў вырашэння праблем ставяць справаздачы губернатараў і агляды губерняў у лік найбольш запатрабаваных даследчыкамі крыніц.

Адным з самых цікавых і інфарматыўна багатых стала трохтомнае выданне Магілёўскага статыстычнага камітэта «Опыт описания Могилевской губернии...», падрыхтаванае па праграме і пры непасрэдным

удзеле губернатара і старшыні камітэта А. С. Дэмбавецкага. Цікавыя звесткі для характарыстыкі сацыяльна-эканамічных, дэмаграфічных працэсаў у Беларусі ўтрымліваюць даныя паказальнікаў і спісаў фабрык і заводаў, аглядаў навучальных устаноў, «Адресов-календарей...», «Статистических ежегодников России», «Статистики Российской империи», «Статистического временника Российской империи» за шэраг гадоў і г. д. Дасканаласцю інфармацыі аб урбанізацыйных працэсах, стане гарадской гаспадаркі вылучаюцца «Сборник сведений о настоящем состоянии городского хозяйства в главнейших городах России» (1889), выданні «Ежегодник России», «Города России». Разнастайныя звесткі аб сацыяльна-культурных працэсах у беларускай вёсцы ўтрымліваюць пагубернскія выданні «Трудов местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности», а таксама «Сельскохозяйственные и статистические сведения по материалам, полученным от хозяев».

Значную частку дакументаў складаюць заканадаўчыя акты, распараджэнні ўрадавых органаў, а таксама матэрыялы справаводства міністэрстваў, Сінода, губернатарскіх канцылярый, павятовых органаў. Яны дазваляюць характарызаваць палітыку царызму ў Беларусі, тагачаснае грамадскае і культурнае жыццё, некаторыя працэсы ў развіцці эканомікі. Заканадаўчыя дакументы прадстаўлены маніфестамі, указамі, пастановамі, законамі, інструкцыямі, статутамі, рэскрыптамі і інш. Першыя з іх (напрыклад, Маніфест 19 лютага 1861 г. (аб вызваленні сялян), Маніфест Аляксандра III ад 29 красавіка 1881 г. аб узыходжанні на трон) выдаваліся ў сувязі з важнейшымі падзеямі ў жыцці краіны. Шматлікую групу заканадаўчых актаў складалі ўказы. Сярод іх вылучаліся тры групы дакументаў: імянныя, абвешчаныя з Сената, сенацкія. Змест указаў дазваляе характарызаваць змены ва ўрадавай палітыцы на тэрыторыі Беларусі. Прававое становішча той ці іншай групы насельніцтва, пашырэнне дзеяння пэўных устаноў і іншае вызначалі палажэнні. Фарміраванне ўрадавай палітыкі на тэрыторыі заходніх губерняў, у тым ліку ўвядзенне, напрыклад, рэжыму выключных законаў у дачыненні да яўрэяў, католікаў, было звязана з выданнем законаў. Асноўнымі публікацыямі заканадаўчых дакументаў з'яўляюцца наступныя: «Полное собрание законов Российской империи», «Свод законов Российской империи», «Собрание узаконений и распоряжений правительства, издаваемых при Правительствующем Сенате». Цікавасць выклікаюць таксама тэматычныя

зборнікі заканадаўчых актаў, якія датычацца розных галін жыцця беларускіх губерняў. Сярод іх: «Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет с 1652 по 1892 г.», падрыхтаваны С. Ф. Рубінштэйнам; «Алфавитный указатель действующих и руководственных канонических постановлений, указов, определений и распоряжений Святейшего Правительствующего Синода (1721–1901 гг. включительно) и гражданских законов, относящихся к духовному ведомству православного исповедания», «Полный хронологический сборник законов и положений, касающихся евреев» і інш.

Вельмі разнастайная інфармацыя прысутнічае ў матэрыялах справаводства цэнтральных і мясцовых органаў улады, грамадскіх арганізацый: пратаколах, справаздачах, цыркулярах, рапартах, перапісцы розных установ, прашэннях і г. д. Дадзеныя дакументы розняцца як па форме, так і па змесце. Асноўная іх частка не апублікавана і знаходзіцца ў архівасховішчах Мінска, Гродна, Вільнюса, Пецярбурга і інш.

Звесткі аб палітычных працэсах і падзеях, сацыяльных канфліктах, вызваленчым руху на тэрыторыі Беларусі ўтрымліваюць дакументы палітычных партый, нелегальных арганізацый. Гэтыя матэрыялы ў большасці яшчэ не апрацаваныя і захоўваюцца ў архівах.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. узрасла роля выданняў перыядычнага друку. Яны істотна адрозніваліся паміж сабой па ідэйна-мастацкім кірунку. У Мінску, Гродне, Віцебску, Магілёве, Вільні выдаваліся «Губернские ведомости», якія прадстаўлялі афіцыйную інфармацыю, «Памятные книжки...», «Епархиальные ведомости» і г. д. Шматлікія матэрыялы аб тагачасным грамадскім жыцці і падзеях культуры, фальклорныя і этнаграфічныя замалёўкі змяшчаў на сваіх старонках «Виленский вестник» – газета, якая мела больш чым стагадовую гісторыю выдання і пэўны час у сярэдзіне XIX ст. рэдагавалася А. Кіркорам. Вялікі ўплыў на грамадскую думку Беларусі аказала газета «Минский листок», якая з ліберальных пазіцый аператыўна адклікалася на розныя падзеі. Характарыстыку сацыяльных змен у вёсцы, пашырэння працоўнай эміграцыі ў Амерыку, росту сялянскіх перасяленняў на ўсход Расійскай імперыі, беларускага нацыянальна-культурнага жыцця і многае іншае можна знайсці на старонках «Нашай нівы» і «Нашай долі».

Да крыніц асабістага характару адносяцца дзённікі, прыватная перапіска, мемуарыстыка. Каштоўнасць мемуараў заключаецца ў вы-

кладанні фактычнага боку апісваемых падзей, а не з пункту гледжання іх ацэнак, якія заснаваны на асабістым вопыце і памяці іх аўтараў. У крыніцах прыватнага характару, асабліва мемуарыстыцы, праяўляецца публіцыстычная накіраванасць. Яны часта былі ад пачатку прызначаны для друку, што адбівалася на пазіцыі іх аўтараў. Мемуарныя крыніцы XIX ст. шматмоўныя, іх значную частку складаюць творы на рускай мове.

Падзеі паўстання 1863 г. знайшлі адлюстраванне на старонках успамінаў яго ўдзельнікаў Я. Гейштара, Ф. Ражанскага, Е. Кучэўскага-Парая і інш., а таксама «Успамінаў аб паўстанні 1863 г. у Мінскім ваяводстве» В. Кошыца. Цікавыя звесткі аб грамадска-палітычнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі ў 60-х гг. XIX ст. змяшчаюць мемуары прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі М. Мураўёва, І. Нікіціна, А. Масолава і інш. Аб'ёмную інфармацыю ўтрымлівае выданне В. Ратча «Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-Западной России». Яркія замалёўкі з грамадска-культурнага жыцця, традыцый насельніцтва Беларусі другой паловы XIX ст. змешчаны ва ўспамінах А. Багдановіча, І. Насовіча, М. Нікіфароўскага і інш. На польскай мове напісаны мемуарныя або блізкія па змесце да іх творы беларускіх і польскіх пісьменнікаў – «Малюнкі з узбярэжжаў Нёмана» В. Каратынскага, «Літоўскія абразкі» А. Кіркора, «З крывавых дзён» Я. Лучыны, «Манюшка ў Мінску» А. Плуга, «Пісьмы з падарожжа», «Успаміны з мінулага» А. Адынца, «Вандроўка па малых дарогах» К. Буйніцкага і інш. У канцы XIX ст. з'явіліся мемуары на беларускай мове, першыя з якіх – успаміны А. Абуховіча «З папер Альгерда Абуховіча». У гэты час, акрамя дваран, мемуары пачалі пісаць выхадцы з сялянства (Л. Корхаў, А. Крылоў) і рабочых (Я. Гурвіч, М. Макарэвіч і інш.). Для характарыстыкі грамадскага жыцця Беларусі ў пачатку XX ст. вялікую цікавасць уяўляюць успаміны М. Ромера, А. Луцкевіча і інш. На мяжы XIX–XX стст. узніклі новыя разнавіднасці крыніц – фотаматэрыялы, машынапісныя дакументы і г. д.

Шматлікія крыніцы апублікаваны на старонках зборнікаў дакументаў і матэрыялаў: пяцітомнага выдання «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772–1903 гг.)» (Мінск, 1940. Т. 2); «Документы и материалы по истории Белоруссии» (Мінск, 1953. Т. 3), «Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг. » (М., 1964); «Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864» (М., 1965); «Пачынальнікі. З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст.» (Мінск, 1977); двухтомнага зборніка

«Белоруссия в эпоху капитализма» (Мінск, 1983–1990); «Публицистика белорусских народников» (Мінск, 1993); «Иностранные подданные в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.)» (Мінск, 2012) і інш.

Крыніцы па беларускай гісторыі другой паловы XIX – пачатку XX ст. разнапланавыя і багатыя, што дазваляе гісторыкам праводзіць маштабныя даследаванні. Сёння яны далёка не поўна выкарыстаны навукоўцамі. Ёсць перспектывы выяўлення ў архівасховішчах Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы, Украіны і іншых краін новых дакументаў, аналіз якіх дазволіць канкрэтызаваць і ўдакладніць уяўленне даследчыкаў аб тых працэсах, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў разглядаемы перыяд.

Тэма 2

# МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў БЕЛАРУСІ

**Вызначэнне мадэрнізацыі.**
**Этапы мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі.**
**Мадэрнізацыя і індустрыялізацыя.**
**Мадэрнізацыя і ўрбанізацыя.**
**Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства.**
**Мадэрнізацыя і разгортванне этнакультурных працэсаў.**
**Асноўныя асаблівасці мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі.**

## Вызначэнне мадэрнізацыі

На працягу XIX – пачатку XX ст. у Беларусі адбываліся істотныя трансфармацыйныя змены, якія склалі важны этап пераходу ад традыцыйнага (аграрнага) да індустрыяльнага (сучаснага) грамадства. Для абазначэння і вывучэння гэтых сістэмных змен параўнальна эфектыўным з'яўляецца выкарыстанне мадэрнізацыйнай парадыгмы. Мадэрнізацыя – працяглы гістарычны працэс, які часта меў хвалявідны, цыклічны характар. Не бывае ідэальнага тыпу мадэрнізацыі, і для кожнай краіны і рэгіёна характэрны свой шлях. Аднак агульны змест мадэрнізацыйных працэсаў укладваецца ў шэраг узаемазвязаных кірункаў,

такіх як высокі ўзровень дыферэнцыяцыі сацыяльнай структуры грамадства, замацаванне адкрытай сістэмы стратыфікацыі са значнай сацыяльнай мабільнасцю, калі сацыяльны статус і роля асобы вызначаюцца не праз прыпісванне, прымацаванне да пэўнай саслоўнай, статуснай групы, але праз механізмы дасягнення; рацыяналізацыя і секулярызацыя грамадскай свядомасці; высокія тэмпы ўрбанізацыі; пераход да выкарыстання машынных тэхналогій, тэхналагічны рост і шырокае прымяненне навуковых ведаў, прафесіяналізацыя розных відаў дзейнасці; станаўленне грамадзянскай супольнасці, пашырэнне пісьменнасці і рост ролі свецкай культуры пры адначасовай дыферэнцыяцыі яе галоўных элементаў, распаўсюджванне сродкаў камунікацыі. Для асобы істотным становіцца індывідуалізм, вера ў навуку і прагрэс, пазітыўнае ўспрыманне каштоўнасці асабістай кар'еры і мабільнасці. Мадэрнізацыя ўключае працэсы нацыянальнай ідэнтыфікацыі, станаўлення нацыі сучаснага тыпу, зніжэння ролі і ўплыву рэлігіі, дэмаграфічнай рэвалюцыі і інш. Гэта змены рознага ўзроўню, хуткасці і накіраванасці.

Для Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. была характэрна парцыяльная (фрагментарная) мадэрнізацыя. Дадзенаму тыпу мадэрнізацыі ўласціва перапляценне мадэрнізаваных і традыцыйных элементаў, суіснаванне ўстойлівых форм разнародных сацыяльных структур.

## Этапы мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі

Вытокі протамадэрнізацыі можна назіраць у XVI ст., калі Беларусь знаходзілася пад прыкметным уплывам ідэй Адраджэння і Рэфармацыі, новых ідэалаў і каштоўнасцей. Пратэстанцкая этыка і рэлігія садзейнічалі станаўленню капіталістычнай сістэмы. У XVI ст. у гарадах Беларусі фарміраваліся новая працоўная этыка, стаўленне да працы як да каштоўнасці, пазітыўныя адносіны да прадпрымальнасці і ашчаднасці, імкненне да атрымання прыбытку, у тым ліку праз ліхвярскую дзейнасць, якія ахапілі як шляхту, так і заможных гараджан. Гэтыя змены адбываліся, як вядома, насуперак сярэднявечным стэрэатыпам грахоўнасці атрымання прыбытку, але ў Беларусі новыя ідэі не знайшлі свайго ўкаранення. Некалькі дзесяцігоддзяў імклівага развіцця рэфармацыйнага руху змяніліся інтэнсіўнай Контррэфармацыяй. Зацвярджэнне пратэстанцкіх ідэалаў засталося нерэалізаванай

гістарычнай альтэрнатывай развіцця беларускага грамадства. Эвалюцыя трэцяга саслоўя, якое выявіла свой эканамічны патэнцыял у гарадах Беларусі ў XVI ст., была стрымана ўвядзеннем грабежніцкіх мытных тарыфаў у інтарэсах шляхты і магнатаў.

У пачатку XVIII ст. у Беларусі адкрыліся першыя мануфактуры, са з'яўленнем якіх у краінах Захаду часам звязвалі даіндустрыяльную мадэрнізацыю. Эканамічныя поспехі другой паловы XVIII ст. не былі падмацаваны трывалай дзяржаўнай воляй да рэфармавання грамадства. Падзелы Рэчы Паспалітай, змена геапалітычных рэалій, уваходжанне ў склад Расійскай імперыі істотна паўплывалі на кірунак і тэмпы працэсаў. У краіне, дзе паступова адбываліся змены, цяжка вызначыць момант пачатку мадэрнізацыі. Гэта заўвага тычыцца ўсіх рэгіёнаў Расійскай імперыі. У 20-х гг. XIX ст. Беларусь са з'яўленнем першых фабрык і заводаў уступіла на шлях да прамысловага перавароту, аб якім у гэты час можна ўзгадваць з вялікай доляй умоўнасці. Укараненне мануфактурна-фабрычнай сістэмы ў Беларусі, таксама як і ў краінах Заходняй Еўропы, адбылося ў мястэчках і невялікіх населеных пунктах, дзе не было рамесніцкай карпаратыўнай арганізацыі. Мануфактуры ў Беларусі адкрываліся перш за ўсё ў магнацкіх рэзідэнцыях, і іх з'яўленне выклікала супраціўленне з боку рамесніцкіх цэхаў. Першыя мясцовыя фабрыкі былі таксама адкрыты ў дваранскіх маёнтках.

Доўгі час, да сярэдзіны XIX ст., беларускія губерні, беларусы разглядаліся не як самастойны суб'ект урадавай палітыкі, але толькі ў сувязі з агульнай палітыкай у дачыненні да былой шляхты Рэчы Паспалітай. Адсутнасць уласнай неспаланізаванай эліты ўспрымалася ўрадавымі коламі як сведчанне неразвітасці высокай культуры і мовы, з якой патрэбна было лічыцца. Некаторыя прадстаўнікі расійскага вышэйшага чыноўніцтва ў пачатку XIX ст. разглядалі рух імперыі па шляху мадэрнізацыі, прапаноўваючы ў якасці пэўнага эталона заходнія ўскраіны. Аднак у хуткім часе апошнія пераўтварыліся з эталона для астатняй часткі імперыі ў крыніцу пагрозы. Мясцовыя эліты разгарнулі барацьбу супраць імперскага цэнтра не пад саслоўнымі ці лакальна-тэрытарыяльнымі лозунгамі, а за нацыянальна-дзяржаўную эмансіпацыю.

Буржуазныя рэформы 60–70-х гг. XIX ст. сталі вехавай падзеяй мадэрнізацыйных працэсаў. Вызваленне сялян стымулявала пераход ад сістэмы прымусовай працы да вольнай. У Расійскай імперыі рэформы пранiклі ў глыбокія слаі традыцыйнай сацыяльнай рэчаіснасці, таму

што гэта было падрыхтавана выяўленнем змен у сістэме каштоўнасцей, ментальнымі пераменамі, якія закранулі найперш інтэлектуальную і бюракратычную эліты. З аднаго боку, Беларусь лічылася найбольш падрыхтаванай да рэформ часткай імперыі і выкарыстоўвалася ў якасці своеасаблівага палігона для іх выпрабаванняў (напрыклад, падрыхтоўка да адмены прыгоннага права), з другога боку – уплыў рэформ тут быў больш абмежаваны з-за асаблівасцей рэалізацыі ўрадавай палітыкі. Паралельна правядзенню рэформ у Беларусі быў уведзены рэжым абмежавальных законаў у дачыненні да католікаў, яўрэяў, замежных грамадзян, ішло змаганне з польскімі ўплывамі. Рэформы ў Беларусі былі скіраваны ў значнай ступені на ўніфікацыю беларускіх губерняў з велікарускім цэнтрам.

Пачатак XX ст. у гісторыі Беларусі вызначаўся прамысловым крызісам, рэвалюцыйнымі падзеямі 1905–1907 гг., правядзеннем аграрнай і земскай рэформ, нацыянальна-культурным і гаспадарчым уздымам пасля рэвалюцыі пры адначасовым росце матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва і інш. У гэты перыяд узмацнілася канцэнтрацыя вытворчасці, адчувальны ўплыў на эканоміку пачалі аказваць манапалістычныя аб'яднанні, а таксама павялічылася колькасць людзей, якія ў сваёй дзейнасці не былі непасрэдна заняты ў вытворчай сферы. Названыя працэсы садзейнічалі пашырэнню прасторы мадэрнізацыі Беларусі.

## Мадэрнізацыя і індустрыялізацыя

Гэтыя працэсы вельмі цесна паміж сабой звязаны, але не падмяняюць адзін аднаго. У краінах Заходняй Еўропы на пачатковых этапах мадэрнізацыі індустрыялізацыя выступала галоўным стрыжнем пераходу ад традыцыйнага да сучаснага грамадства. Аднак у розных краінах і рэгіёнах уплыў індустрыялізацыі быў неаднолькавым. Далёка не заўсёды яна з'яўлялася рашаючым фактарам, перадумовай мадэрнізацыі. У беларускіх губернях уплыў індустрыялізацыі запазніўся. Фабрычна-заводская вытворчасць Беларусі была сканцэнтравана пераважна на дробных прадпрыемствах і заснавана на выкарыстанні мясцовай сыравіны.

Пад індустрыялізацыяй звычайна разумеюць працэс замяшчэння ручной рабочай сілы тэхналогіямі, заснаванымі на выкарыстанні неадушаўлёных крыніц энергіі. Аб узроўні разгортвання індустрыялізацыі

можна меркаваць паводле змены суадносін удзельнай вагі рабочай сілы, занятай у сельскай гаспадарцы з аднаго боку і ў прамысловай вытворчасці – з другога. Індустрыялізацыя суправаджалася дыферэнцыяцыяй і ўскладненнем сацыяльна-прафесійнай структуры грамадства, з'яўленнем і пашырэннем колькасці асоб, занятых у сферы паслуг. Яна патрабавала больш высокага ўзроўню адукацыі працоўных, выклікала пашырэнне пісьменнасці, развіццё сістэмы адукацыі.

Рабочы клас Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. у значнай ступені складаўся не са спадчынных рабочых, а з учарашніх сялян ці збяднелых рамеснікаў, гандляроў. Індустрыяльнае развіццё Беларусі на пачатковых этапах мадэрнізацыі было скарэліравана з натуральнымі патрэбамі рэгіёна, заснавана на традыцыйнай структуры эканамічнага жыцця. Узровень развіцця прамысловасці ў Беларусі быў ніжэйшы, чым у сярэднім на еўрапейскай частцы Расійскай імперыі. Яе тэхнічнае пераўзбраенне да канца XIX ст. не завяршылася. У той жа час паралельнае існаванне рамесніцкіх майстэрань, мануфактур і фабрык не сведчыла аб адсталасці прамысловага развіцця Беларусі. Яно было абумоўлена арыентацыяй на выкарыстанне пераважна сельскагаспадарчай сыравіны, перапрацоўка якой не патрабавала стварэння вялікіх прамысловых магутнасцей, а таксама структурай мясцовых працоўных рэсурсаў, наяўнасцю вялікай колькасці танных працоўных рук. Для перапрацоўкі лясной і сельскагаспадарчай сыравіны нават уладальнікам значных капіталаў было больш зручным заснoўваць параўнальна невялікія вытворчасці, дзе эканомія на транспартныя расходы і заработную плату перавышала выгады, якія магла даць буйная вытворчасць у параўнанні з дробнай. У Беларусі адсутнічалі буйныя прамысловыя цэнтры, значныя прадпрыемствы па вырабе сродкаў вытворчасці. Попыт на прамысловую прадукцыю ў першыя дзесяцігоддзі пасля адмены прыгоннага права быў не вельмі высокім.

## Мадэрнізацыя і ўрбанізацыя

Адным з магістральных працэсаў мадэрнізацыі, што падштурхоўваўся прамысловым развіццём, стала ўрбанізацыя. Горад павінен быў цягнуць да адпаведнай цывілізацыі навакольны сельскі асяродак. Павелічэнне ўдзельнай вагі гарадскога насельніцтва ў Беларусі адбывалася нязначнымі тэмпамі. Рост гарадоў Беларусі стрымлівалі асаблівасці

тэрытарыяльнага размяшчэння і спецыялізацыі мясцовай прамысловасці, а таксама кірунак урадавай палітыкі (умацаванне рысы аседласці яўрэяў, штучнае абмежаванне надання афіцыйнага статусу горада населеным пунктам і інш.). Запаволеныя тэмпы ўрбанізацыйных працэсаў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. адпавядалі структуры і дынаміцы мясцовага прамысловага развіцця. У Беларусі менш адчувальна праявіўся ўплыў сялянства на сацыяльную мабільнасць гарадскіх груп жыхароў. На мяжы XIX–XX стст. істотнай была раз'яднанасць сацыяльных працэсаў у горадзе і на вёсцы Беларусі. Шматэтнічны і ў значнай ступені іншаэтнічны ў дачыненні да навакольнага вясковага асяродка састаў насельніцтва ўскладняў сацыяльныя кантакты паміж горадам і вёскай. Мясцовае сялянства вельмі насцярожана ставілася да «гарадской цывілізацыі». Урадавая палітыка садзейнічала гэтаму.

## Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства

Пад уплывам мадэрнізацыі адбывалася фарміраванне класаў буржуазнага грамадства, павялічваўся ўзровень тэрытарыяльнай і сацыяльнай мабільнасці насельніцтва. У другой палове XIX – пачатку XX ст. састаў насельніцтва Беларусі ўяўляў сабой складанае перапляценне элементаў, характэрных для сацыяльнай структуры індустрыяльнага грамадства, і элементаў саслоўнай іерархіі мінулай эпохі. На працэс буржуазнай эвалюцыі сацыяльнай структуры насельніцтва Беларусі, які да канца XIX ст. не завяршыўся, стрымліваючае ўздзеянне аказаў агульны кірунак урадавай палітыкі.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі адбываўся значны рост колькасці насельніцтва, звязаны з пачаткам дэмаграфічнага пераходу, які суправаджаў працэсы мадэрнізацыі. Ён характарызуе пераход ад традыцыйнага тыпу ўзнаўлення насельніцтва, уласцівага аграрнаму грамадству з яго высокай нараджальнасцю і адначасова высокай смяротнасцю, да сучаснага тыпу з яго нізкімі смяротнасцю і нараджальнасцю. У выніку такога пераходу, асабліва на пачатковых этапах, у тым ліку ў Беларусі і ў еўрапейскай частцы Расійскай імперыі, калі зніжаецца смяротнасць, але захоўваецца дастаткова высокая нараджальнасць, адбываецца імклівы рост насельніцтва, змяня-

ецца яго структура. Пераходны перыяд характарызаваўся разрывам у тэмпах зніжэння абодвух паказчыкаў. Удасканаленне медыцынскага абслугоўвання, вызваленне сялян ад прыгону паступова прывялі да зніжэння смяротнасці, а нараджальнасць пэўны час заставалася яшчэ на дастаткова высокім узроўні. Адначасова павялічвалася сярэдняя працягласць жыцця, працэс змены пакаленняў запавольваўся. Дэмаграфічны пераход суправаджаўся фарміраваннем новага тыпу сям'і, змяненнем адносін да шлюбу, ростам свабоды паводзін асобы. Беларускія губерні ў другой палове XIX – пачатку XX ст. мелі адзін з найбольш высокіх паказчыкаў натуральнага прыросту насельніцтва сярод рэгіёнаў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. Яны займалі другую пазіцыю ў краіне пасля прыбалтыйскіх па ступені ўцягнутасці ў працэсы, звязаныя з дэмаграфічным пераходам. Акрамя таго, перапісам насельніцтва 1897 г. тут была адзначана большая, чым у сярэднім па краіне, працягласць жыцця ў мужчын і жанчын. У Беларусі сярэдняя працягласць жыцця мужчын складала 37 гадоў, у жанчын – 37,9 года, па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі ў сярэднім адпаведна 31,4 і 33,4 года. Беларускія губерні былі таксама аднесены да ліку тых, дзе назіралася найменшая дзіцячая смяротнасць (да 1 года): Магілёўская губерня – 17,6 праміле (колькасць памерлых за год у пераліку на тысячу чалавек сярэднегадавой колькасці насельніцтва), Гродзенская губерня – 17,4, Віцебская – 17,2, Мінская – 14,2, Віленская – 12,5 праміле. Апошняя лічба была найбольш нізкай у еўрапейскай частцы Расійскай імперыі. Сярэдні паказчык дзіцячай смяротнасці па Расійскай імперыі складаў у гэты час 26,1 праміле.

Па стане на 1858 г. у беларускіх губернях налічвалася 4410,8 тыс. жыхароў, у тым ліку па 35 паветах, якія тэрытарыяльна найбольш дакладна ўпісваюцца ў сучасныя межы Рэспублікі Беларусь, – 3306,8 тыс. чалавек. У гэты час жыхары беларускіх губерняў скаладалі 7,4 % ад колькасці насельніцтва еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. У 1863 г. насельніцтва беларускіх губерняў склала 4496,3 тыс. чалавек, у тым ліку ў межах 35 паветаў – 3356,2 тыс. чалавек. Перапісам насельніцтва 1897 г. у беларускіх губернях было ўлічана 8518,2 тыс. жыхароў. У межах 35 паветаў налічвалася 6493,6 тыс. жыхароў. Удзельная вага насельніцтва беларускіх губерняў у еўрапейскай частцы Расійскай імперыі складала 9,1 %. Паводле звестак на 1 студзеня 1914 г., насельніцтва беларускіх губерняў налічвала 11 569,6 тыс. чалавек, у тым ліку ў 35 беларускіх паветах – 8952,8 тыс. чалавек. Калі ўлічыць насельніцтва

Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні (242,3 тыс. чалавек), значная частка якога ўваходзіць у межы сучаснай беларускай дзяржавы, то насельніцтва Беларусі ў межах, блізкіх да сучасных дзяржаўных, склала каля 9100–9150 тыс. чалавек. За 1858–1914 гг. насельніцтва беларускіх губерняў вырасла ў 2,6 раза.

Удзельная вага саслоўных груп насельніцтва Беларусі за другую палову XIX – пачатак XX ст. колькасна змянілася нязначна. Саслоўны склад жыхароў Беларусі дастаткова кансерватыўна адлюстроўваў структуру насельніцтва і напярэдадні рэформы 1861 г. выглядаў наступным чынам: дваране (спадчынныя і асабістыя) складалі 5,1 % насельніцтва пяці беларускіх губерняў, хрысціянскія святары – 0,6, ганаровыя грамадзяне – 0,012, купцы – 0,4, мяшчане – 12,3, цэхавыя – 0,9, сяляне – 77, ваенныя саслоўі (за выключэннем рэгулярных войскаў) – 1,6 %. Паводле даных перапісу 1897 г., сярод насельніцтва беларускіх губерняў налічвалася 2,4 % спадчынных дваран, 0,4 – асабістых дваран і чыноўнікаў, 0,3 – прадстаўнікоў хрысціянскага духавенства, каля 0,2 – ганаровых грамадзян, 0,2 – купцоў, 20,9 – мяшчан, 75,3 % – сялян. Колькасць асоб, якія не былі аднесены да абазначаных катэгорый, склала 0,3 %.

Саслоўная арганізацыя складала аснову сацыяльнай сістэмы Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. Гэта быў прыярытэт для захавання стабільнасці пануючага рэжыму і лаяльнасці нярускіх падданых у дачыненні да дынастыі. Саслоўны прынцып дазваляў захаваць цэласнасць шматнацыянальнай імперыі і вызначаў сацыяльныя сувязі. Гэту функцыю саслоўных інстытутаў не магла замяніць нацыянальная ці канфесійная ідэалогія. Прыярытэт дынастычных і саслоўных прынцыпаў над этнічнымі і моўнымі быў агульным для Расійскай імперыі і іншых шматнацыянальных дзяржаў. Беларускія землі, як і іншыя заходнія вобласці, да часу ўваходжання ў склад Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. мелі адметную і больш развітую саслоўна-карпаратыўную арганізацыю, чым цэнтральныя губерні. На працягу большай часткі XIX ст. расійскі ўрад імкнуўся ўніфікаваць, наблізіць сацыяльную арганізацыю беларускага грамадства да стандарту велікарускіх губерняў.

Традыцыйна даследчыкамі вылучаюцца наступныя прыкметы саслоўя: заканадаўчае афармленне і замацаванне саслоўных абавязкаў і праў, сацыяльных функцый і заняткаў; перадача прыналежнасці да пэўнага саслоўя ў спадчыну; наяўнасць саслоўных карпаратыўных ар-

ганізацый; адметны менталітэт і самасвядомасць саслоўяў. Адпаведна расійскаму заканадаўству асобы, якія не належалі ні да аднаго з саслоўяў, павінны былі прыпісацца да падатковых саслоўяў. Атрыманне саслоўнага звання адбывалася праз перадачу ў спадчыну, ці яно набывалася шляхам падаравання, выслугі, прыпіскі (для падатковых саслоўяў), паляпшэння асабістага адукацыйнага ўзроўню.

Падзел саслоўяў на падатковыя і прывілеяваныя быў галоўнай рысай саслоўнай сістэмы Расійскай імперыі. Акрамя таго, саслоўнае паходжанне, вызначэнне праў і абавязкаў, а ў вялікай ступені з'яўленне саміх саслоўяў цалкам залежалі ад дзяржавы. Згодна з расійскім заканадаўствам насельніцтва дзяржавы падзялялася на прыродных абывацеляў, іншародцаў і іншаземцаў, якія адрозніваліся паміж сабой правамі стану. Падданыя Расійскай імперыі, за выключэннем асобных груп іншародцаў, раздзяляліся на чатыры «галоўныя роды людзей» (саслоўі): дваранства, духавенства, гарадскіх і сельскіх абывацеляў. Кожнае з саслоўяў не ўяўляла сабой кансалідаваную групу, а падзялялася на асобныя разрады, якія былі дастаткова рознымі па прававым становішчы. Напрыклад, спадчыннае і асабістае дваранства вельмі мала мела паміж сабой агульнага; духавенства адрознівалася ў залежнасці ад веравызнання і не ўяўляла сабой асобнага саслоўя. Сярод гарадскіх абывацеляў вылучаліся чатыры групы: ганаровыя грамадзяне, купцы, мяшчане і цэхавыя. Акрамя таго, прыналежнасць да некаторых саслоўных груп не перадавалася ў спадчыну і часам не была пажыццёвай. Правамі купецтва карысталіся тыя, хто ўплаціў пэўную гільдзейскую пошліну.

Разбурэнню ранейшых саслоўных інстытутаў, пашырэнню ўніфікацыйных працэсаў і ў канчатковым выніку пераходу да адкрытай грамадскай структуры, якая не стрымлівала сацыяльную мабільнасць насельніцтва, перашкаджалі сфарміраваныя на працягу стагоддзяў традыцыі ў сацыяльна-псіхалагічнай сферы, маральныя каштоўнасці. Апошнія былі падмацаваны настальгічнымі настроямі шляхты па страчанай дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай, разгортваннем нацыянальна-вызваленчай барацьбы пад лозунгамі аднаўлення былых вольнасцей і краіны. Шляхта ў Расійскай імперыі захавала свае эканамічныя і сацыяльныя пазіцыі, частка нават умацавала іх. Але да падзелаў Рэчы Паспалітай у параўнанні з дваранствам іншых краін і народаў Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы яна валодала значна большымі палітычнымі правамі і мела адпаведныя традыцыі. Атрымаўшы мен-

шыя магчымасці для выяўлення сацыяльнай актыўнасці, шляхта праявіла цікавасць да нацыянальна-вызваленчага руху. Гэты фактар аказваў значны ўплыў на трансфармацыю шляхты ў дваранскае саслоўе Расійскай імперыі. Нават працэсы маргіналізацыі шляхты, пераводу часткі яе ў падатковыя саслоўі закранулі перш за ўсё сацыяльна-эканамічную сферу, маёмаснае і прававое становішча. Акрамя таго, трываласць саслоўна-групавога складу насельніцтва Беларусі, які сфарміраваўся ў часы Рэчы Паспалітай, падмацоўвалася існаваннем пэўнай структуры эканамічных адносін.

Нівеліроўка саслоўных абмежаванняў адбывалася перш за ўсё праз гандлёва-прамысловае расійскае заканадаўства, якое ў другой палове XIX – пачатку XX ст. насіла шмат у чым усесаслоўны характар. Пацвярджэннем дадзенай тэндэнцыі стала выданне Палажэнняў ад 1 студзеня 1863 г. і 9 лютага 1865 г. «Аб пошлінах за права гандлю і іншых промыслаў» і інш. Гандлёвы статут 1893 г., Статут аб прамысловасці 1893 г. дазвалялі займацца гандлем і засноўваць прамысловыя прадпрыемствы расійскім грамадзянам незалежна ад саслоўнай прыналежнасці. Гэта значна паўплывала на дынаміку колькасці купецкага саслоўя ў пачатку XX ст., зрабіла менш прывабным выкуп гільдзейскіх пасведчанняў. Тым не менш прыналежнасць да купецкага саслоўя заставалася прыцягальнай для яўрэяў беларускіх губерняў, якія ў выніку набыцця адпаведных дакументаў маглі пражываць па-за межамі рысы аседласці. Мяшчане і сяляне часам прылічалі сябе да складу купецтва і тым самым атрымлівалі права на валоданне бестэрміновымі пашпартамі, вольнае перамяшчэнне па тэрыторыі краіны. Купецтва было адзіным саслоўем, уступленне ў шэрагі якога цалкам залежала ад штогадовай уплаты пэўнага грашовага ўзносу. Кошт гільдзейскіх дакументаў разам з прамысловымі пасведчаннямі і іншымі зборамі дасягаў дастаткова значнай сумы і быў даступны толькі заможным асобам.

Эвалюцыя саслоўнага заканадаўства Расійскай імперыі сведчыла аб паступовым фарміраванні грамадзянскай супольнасці і пераходзе да грамадзянскай роўнасці. Асновай станаўлення такой супольнасці выступала саслоўе мяшчан. У прававым сэнсе праналежнасць да яго не вызначалася пэўнымі ўмовамі. Кожны, хто не належаў да якога-небудзь саслоўя, адпаведна расійскаму заканадаўству абавязкова прылічаўся да мяшчанства. У той жа час прыпісацца да сялянства можна было толькі са згоды сельскай грамады. Прыналежнасць да мяшчан-

скага саслоўя была пажыццёвай і перадавалася ў спадчыну, а таксама выключала магчымасць адначасова знаходзіцца ў іншым саслоўным званні. Пераход у мяшчанскае саслоўе адбываўся толькі праз прыпіску да грамады якога-небудзь горада.

Адпаведна заканадаўству Расійскай імперыі дваране ў залежнасці ад іх паходжання, заслуг і пасады на вайсковай ці грамадзянскай службе падзяляліся на спадчынных (дваранскі тытул якіх перадаваўся з пакалення ў пакаленне) і асабістых (пажыццёвае дваранства). Спадчыннае дваранства ўключала шэсць разрадаў: нададзенае; вайсковае; дваранства, атрыманае ў выніку выслугі пэўнага чыну на грамадзянскай службе ці ўзнагароджання ордэнам; замежныя дваранскія роды; тытулаванае дваранства; старажытныя шляхецкія роды. Першыя тры разрады складалі роды, якія атрымлівалі дваранства дзякуючы якім-небудзь заслугам (асноўная крыніца папаўнення родаў дваранства ў Расійскай імперыі). Сярод 1371 дваранскага роду Магілёўскай губерні ў пачатку XX ст. налічвалася 273 фаміліі (19,9 %) нададзенага дваранства, 170 фамілій (12,4 %), якія набылі тытул у выніку адзнакі на вайсковай службе, 270 (19,7 %) – якія атрымалі дваранства за заслугі на грамадзянскай службе ці праз узнагароджанне ордэнам, 3 (0,2 %) – замежныя роды, 14 (1 %) – тытулаванае дваранства, 691 (46,8 %) – старажытныя роды.

За чатыры парэформенныя дзесяцігоддзі ў беларускіх губернях колькасць асабістага дваранства і класных чыноўнікаў павялічылася амаль на 150 % – з 22,6 тыс. у 1863 г. да 36 тыс. у 1897 г. Пасля падаўлення паўстання 1863 г. асобам каталіцкага веравызнання было вельмі цяжка трапіць на дзяржаўную службу, каб мець магчымасць праз пэўную выслугу атрымаць асабістае дваранства. У сувязі з гэтым інстытут асабістага дваранства выкарыстоўваўся ў Беларусі для ўзмацнення пазіцый рускага элемента ў вышэйшым саслоўі за кошт прызыву на службу прысланых з унутраных губерняў Расіі чыноўнікаў і вайскоўцаў.

У пачатку 60-х гг. XIX ст. асноўную частку дваран Беларусі складалі тыя, хто фігураваў ва ўрадавых дакументах таго часу як шляхта. Яна вызначалася тым, што не валодала зямельнай уласнасцю ці мела зямлю, не населеную сялянамі. Сродкі свайго існавання шляхта часта вымушана была здабываць арэндай зямлі, прадпрыемстваў у памешчыкаў, службай, працай па найме. Па эканамічным становішчы беззямельная і малазямельная (да 20 дзесяцін) яе часткі істотна не адрозніваліся ад

асноўнай масы сельскага насельніцтва. Характарызуючы дробнае дваранства Гродзенскай губерні, афіцэр Генеральнага штаба П. Баброўскі пісаў, што яно расселена «па гарадах, мястэчках і сёлах. Некаторыя трымаюць у арэндзе фермы, памешчыцкія маёнткі і розныя чыншавыя стацці; іншыя служаць у памешчыкаў, займаючы пасады эканомаў, кіраўнікоў, канторшчыкаў, пісараў і г. д.; нарэшце, трэція, і бадай што гэта ці не найбольшая колькасць дваран, займаюцца сельскай гаспадаркай, утвараючы цэлыя дваранскія аколіцы, і сваім бытам і спосабам жыцця стаяць на адной прыступцы з сялянамі». Аднак сацыяльныя ўстаноўкі, арыентацыя, псіхалагічны бар'ер у стасунках з навакольным вясковым насельніцтвам, звязаныя з асэнсаваннем сваёй прыналежнасці да вышэйшага саслоўя, перашкаджалі размыванню шляхты сярод іншых катэгорый жыхароў. З гэтай нагоды магілёўскі губернатар А. С. Дэмбавецкі адзначаў: «У характары шляхціца адметныя рысы: запал і выхвальства ў адносінах да роўных, уніжэнне і рабалепства перад вышэйшымі. Запал і выхвальства выяўляюцца ў шляхты не толькі перад сялянамі, але і адзін перад другім, што часта даводзіла шляхту да судовых разбораў».

Адной з галоўных характарыстык дваранства як сацыяльнай групы з'яўляецца яго нацыянальны склад. Пасля паўстання 1863 г. нацыянальна-канфесійная прыналежнасць адыгрывала значную ролю ў вызначэнні сацыяльнай іерархіі ўнутры вышэйшага саслоўя ў Беларусі: рускія займалі безумоўна больш высокую страту, абмежаванні ў дачыненні да католікаў і палякаў прывялі да прыніжэння іх становішча ўнутры вышэйшага саслоўя. Сярод спадчынных дваран 51,8 % прызнавалі роднай мовай беларускую, 11,7 – рускую, 32,9 % – польскую. Большасць асоб, якія мелі асабістае дваранства, складалі рускія – 50,8 %, 25,6 % былі беларусамі, 18,7 % – палякамі. У другой палове XIX ст. у беларускіх губернях, паводле сведчання мясцовых чыноўнікаў, адчувалася значнае сацыяльнае раз'яднанне дваранскага саслоўя: «...палякі трымаюцца асобна і не сыходзяцца з рускімі дваранамі. Прычынай гэтага з'яўляецца, з аднаго боку, адсутнасць дваранскіх сходаў... а з другога боку, розніца павялічваецца праз абмежаванне праў палякаў, якім забаронены доступ на службу».

Духавенства Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. было прадстаўлена пераважна праваслаўным, каталіцкім і іўдзейскім. Астатнія яго групы – евангелісцка-лютэранскае, евангелісцка-рэфарматарскае, мусульманскае – былі нешматлікімі. У 1866 г. у Беларусі налічвалася 18 593 прадстаўнікі праваслаўнага святарства, 679 – каталіцкага,

1713 – іўдзейскага, 89 – адзінаверніцкага, 55 – мусульманскага, 47 – евангелісцка-рэфарматарскага, 15 – евангелісцка-лютэранскага, усяго – 21 193. Апублікаваныя матэрыялы перапісу насельніцтва 1897 г. не дазваляюць дэталізаваць саслоўна-групавы склад духавенства беларускіх губерняў. Аднак, напрыклад, у Віленскай губерні ў 1912 г. налічвалася 1609 прадстаўнікоў белага праваслаўнага духавенства, 198 праваслаўных манахаў, 484 каталіцкія святары, 35 евангелісцка-лютэранскіх, 2 евангелісцка-рэфармацкія, 1876 іўдзейскіх, 19 мусульманскіх, 10 караімскіх, 17 стараверніцкіх. Рост колькасці праваслаўных вернікаў выклікаў павелічэнне штату праваслаўных святароў. Калі ў Магілёўскай епархіі ў 1877 г. налічвалася 567 свяшчэннаслужыцеляў, у 1892 г. – 590, то ў 1904 г. іх было 672. Пасля выдання Закона 26 мая 1869 г., які адмяніў спадчыннасць і замкнёнасць духавенства, у яго складзе павялічылася ўдзельная вага выхадцаў з падатных саслоўяў. Каталіцкія святары Беларусі значна ўступалі праваслаўным па сацыяльным статусе ў сувязі з абмежавальнымі мерапрыемствамі ў нацыянальна-канфесійнай сферы пасля паўстання 1863 г. Яўрэйскія святары – рабіны – карысталіся саслоўнымі правамі купецтва першай гільдыі, аднак гандлёва-прамысловай дзейнасцю займаліся на агульнай аснове.

Гарадское насельніцтва падзялялася на некалькі саслоўных груп, якія адрозніваліся паміж сабой правамі, прафесійнай дзейнасцю і даходамі. Ганаровыя грамадзяне былі вышэйшым гарадскім саслоўем. Сярод іх былі спадчынныя і асабістыя. Спадчыннае ганаровае грамадзянства атрымлівалі ад нараджэння дзеці асабістых дваран, праваслаўных святароў, калі апошнія мелі пэўныя багаслоўскія вучоныя ступені па заканчэнні духоўнай акадэміі ці семінарыі і г. д. Да гэтага саслоўя прыпісваліся купцы першай і другой гільдый адпаведна пасля 10 і 20 гадоў знаходжання ў гільдзействе ці па атрыманні ордэна; камерц- і мануфактурсаветнікі; асобы, якія скончылі ўніверсітэт з вучонай ступенню магістра ці доктара; чыноўнікі з XIV па IX клас і інш. Прадстаўнікі ганаровых грамадзян займаліся прамысловым, гандлёвым прадпрымальніцтвам, «вольнымі» прафесіямі і г. д. Іх заканадаўча афармленыя прывілеі ў 1860–90-я гг. паступова страцілі сваё рэальнае значэнне.

Да канца XIX ст. гандлёвае прадпрымальніцтва ў значных памерах заканадаўча звязвалася з прыналежнасцю да купецкага саслоўя. На працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. адбывалася памяншэнне ўдзельнай вагі гільдзейскага купецтва, адначасова колькасна

і па сваёй эканамічнай сіле расло мяшчанскае саслоўе. Мяшчанства папаўнялася за кошт купцоў, якія бяднелі ці страчвалі сэнс у набыцці гільдзейскіх дакументаў, цэхавых, калі яны змянялі прафесійную дзейнасць, сялян, якія мігравалі ў горад. Мяшчане набывалі пасведчанне на права займацца гандлем і промысламі.

Сярод ваенных саслоўяў, акрамя рэгулярных войскаў, асобна ўлічвалася колькасць бестэрмінова адпушчаных, адстаўных ніжэйшых вайсковых чыноў, дзяцей і жонак салдат і кантаністаў. Асноўная маса іх жыла ў сельскай мясцовасці, займалася земляробствам, промысламі, яны атрымлівалі пенсію, знаходзіліся на ўтрыманні.

Беларусь у другой палове XIX – пачатку XX ст. заставалася аграрным рэгіёнам. Рэформа 1861 г. змяніла характар і тэмп сацыяльных працэсаў сярод беларускага сялянства, хоць яго ўдзельная вага ў складзе насельніцтва заўважна не змянілася. Пасля адмены прыгоннага права ўсе катэгорыі сялян паступова кансалідаваліся ў межах аднаго саслоўя, якое адначасова стала страчваць свае саслоўныя рысы. У той жа час расійскае заканадаўства канца XIX – пачатку XX ст. развівалася ў кірунку, з аднога боку, захавання саслоўнай адасобленасці сялянства, з другога боку – размывання яго адрозненняў у параўнанні з іншымі станамі. Эвалюцыя сялянства як саслоўнага інстытута на тэрыторыі Беларусі вызначалася як кансалідацыяй і ўніфікацыяй у кантэксце агульнаімперскай перспектывы, так і рэгіянальнымі асаблівасцямі. Апошнія былі напрамую звязаны з традыцыйнай культурай беларускага сялянства, спецыфікай яго светаўспрымання, функцыянаваннем норм звычаёвага права, сельскай грамады. Захоўваў сваю ролю сельскі сход, мясцовыя традыцыі якога стваралі дастаткова дэмакратычны інстытут, заснаваны на шматвекавой практыцы беларускага сялянства. Вызначэнне сацыяльнага статусу селяніна ўнутры грамады было неадназначным: утрымліваліся рысы традыцыйнасці і новых змен пад уплывам працэсаў мадэрнізацыі. Галоўнай дэтэрмінантай выступала валоданне нерухомай маёмасцю, зямельным надзелам, што давала голас у грамадзе. Нават наяўнасць невялікай гаспадаркі пры вельмі сціплым дастатку і ўзроўні спажывання давала селяніну ў вачах аднавяскоўцаў больш павагі, чым большы даход і дабрабыт ад працы па найме ці адыходных промыслаў пры адсутнасці зямлі.

Паводле даных 1858 г., у беларускіх губернях налічвалася 2 477 568 памешчыцкіх сялян, з іх 51 284 дваровыя, 869 353 дзяржаўныя і 24 373 удзельныя. Да 1914 г. у параўнанні з 1858 г. колькасць сельскага насельніцтва Беларусі, нягледзячы на выразны адмоўны міграцыйны

баланс, павялічылася ў 2,9 раза. Акрамя сялянства, існавалі і іншыя нешматлікія групы сельскіх жыхароў – стараверы, чыншавікі, аднадворцы, вольныя людзі, праваслаўныя арандатары і інш. Стракатая структура сельскага насельніцтва Беларусі была вынікам напластавання традыцыйных гаспадарчых адносін і рэалізацыі эканамічных праектаў расійскага ўрада. Стараверы складалі кансерватыўную групу, якая жыла адасоблена ад навакольнага вясковага насельніцтва. Гэтаму спрыялі іх этнарэлігійныя адрозненні. Стараверы пераважна негатыўна ўспрымалі праявы сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху, падтрымлівалі ўрадавыя мерапрыемствы. Большасць іх была сканцэнтравана ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. У канцы XIX ст. іх тут налічвалася каля 125 тыс. чалавек.

Праваслаўныя арандатары, нешматлікія па колькасці, пражывалі ў асноўным у Мінскай губерні. У 1861 г. іх налічвалася каля 13,5 тыс. чалавек. У Беларусі канца XIX ст. пражывала некалькі сотняў тысяч чыншавікоў. Яны бестэрмінова карысталіся зямлёй і былі абавязаны плаціць яе ўладальніку грашовы аброк і выконваць шэраг павіннасцей адпаведна закону ці звычаю. Прадстаўнікі гэтай сацыяльнай групы маглі прадаваць, дарыць, перадаваць у спадчыну, закладваць чыншавае права. У пачатку 60-х гг. XIX ст. у беларускіх губернях налічвалася каля 100 тыс. «вольных людзей». Гэта былі нашчадкі вызваленых з-пад прыгону сялян. Асобную групу сельскіх жыхароў складалі аднадворцы – былая шляхта, якая не пацвердзіла дакументальна сваю прыналежнасць да дваранскага саслоўя. У пачатку 60-х гг. XIX ст. у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях аднадворцаў налічвалася каля 58 тыс. чалавек. Пасля паўстання 1863 г. іх колькасць павялічылася з-за паскарэння працэсу «разбору шляхты».

У параўнанні з саслоўнай іерархіяй больш дынамічна сацыяльныя зрухі адлюстроўваюць перамены ў структуры заняткаў насельніцтва. Паводле перапісу 1897 г., 8,15 % колькасці жыхароў Беларусі складалі асобы, занятыя ў прамысловасці (тут улічаны і прадпрымальнікі, і інжынерна-тэхнічныя работнікі, і рабочыя); 4,9 – у сферы гандлю; 3,5 – прыватнай службай, прыслуга, падзёншчыкі; 1,7 – на транспарце і ў сувязі; 1,15 – рантье; 1,15 – вайскоўцы; 0,6 – чыноўнікі; 0,01 – прадстаўнікі вольных прафесій (вучэбная выхаваўчая дзейнасць, урачэбная і санітарная праца, работа ў сферы навукі, літаратуры і мастацтва, прыватная юрыдычная практыка); 0,05 – пенсіянеры; 0,04 – духавенства і 75,1 % – сельскагаспадарчае насельніцтва. Межы многіх сацыяльна-прафесійных груп былі дастаткова ўмоўнымі, рухомымі.

Адпаведна набыццю пэўнага ўзроўню адукацыі чалавек на працягу жыцця мог змяніць сваё становішча ў сацыяльна-прафесійнай іерархіі. Аднак саслоўнае паходжанне да канца XIX ст. па-ранейшаму істотна ўплывала на фарміраванне асобных сацыяльных груп. Напрыклад, складванне чыноўніцкага апарату адбывалася двума шляхамі: па праве паходжання і па пэўным адукацыйным цэнзе. Па сваім сацыяльным паходжанні права на дзяржаўную службу мелі дзеці дваран, чыноўнікаў, купцоў першай гільдыі, святароў. Такое ж права мелі асобы, якія атрымалі вышэйшую ці сярэднюю (з адзнакай) адукацыю. У далейшым, у апошнія дзесяцігоддзі XIX ст., былі зроблены выключэнні для асобных відаў дзяржаўнай службы: фінансаў, тэлеграфа і інш. Акрамя таго, у сувязі з узрослай патрэбнасцю дзяржавы ў павелічэнні колькасці служачых і пашырэннем адміністрацыйнага апарату, развіццём транспарту, сродкаў сувязі і г. д. шэраг пасад пачаў замяшчацца па вольным найме. Указам імператара ад 5 кастрычніка 1906 г. усім расійскім падданым, незалежна ад паходжання, але акрамя іншародцаў, даваліся аднолькавыя ў дачыненні да дзяржаўнай службы правы, скасоўваліся ўсе асаблівыя саслоўныя перавагі па займанні пасад, вызначаных урадам. У беларускіх губернях, як правіла, не бралі на дзяржаўную службу яўрэяў, іcнавалі істотныя абмежаванні для католікаў.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. у беларускім грамадстве адбываліся працэсы, звязаныя з фарміраваннем дынамічнай сацыяльнай сістэмы з высокім узроўнем сацыяльнай мабільнасці. У канцы XIX і асабліва пачатку XX ст. павялічылася колькасць асоб, якія імкнуліся змяніць сваё становішча, узвысіць сацыяльны статус. Дадзены працэс ахапіў усе без выключэння групы насельніцтва. На магчымасць іх сацыяльных перамяшчэнняў уплывалі ўрадавыя мерапрыемствы ў эканамічнай і сацыяльна-саслоўнай сферах, узровень адукацыі асоб, іх этнаканфесійная прыналежнасць, індывідуальныя здольнасці, тэрытарыяльныя перамяшчэнні. На мяжы XIX–XX стст. заўважнай стала тэндэнцыя вызначэння сацыяльнага статусу і ролі асобы не толькі праз прыпісванне, прымацаванне да пэўнай саслоўнай, статуснай групы, але і праз механізмы дасягнення, дзякуючы асабістым якасцям. Гэта датычылася прафесійнай дзейнасці эканамічна актыўнай і адукаванай часткі грамадства. Актывізацыя і ўскладненне форм сацыяльнага жыцця прывялі да пашырэння магчымасцей сацыяльнай мабільнасці ўсіх груп насельніцтва. Міжсаслоўныя пераходы былі адным з найбольш распаўсюджаных шляхоў вертыкальнай сацыяльнай мабільнасці.

З пашырэннем мадэрнізацыйных працэсаў адбывалася станаўленне грамадзянскай супольнасці з характэрнымі для яе добраахвотнымі арганізацыямі, аб'яднаннямі, клубамі, палітычнымі партыямі і інш. Традыцыйнае грамадства станаў і саслоўяў змянілася класавым грамадствам. У пачатку XX ст. саслоўная арганізацыя ўсё менш прадвызначала сацыяльную ролю і становішча асобы ў соцыуме, значна больш на іх уплывалі асабістыя дасягненні, у тым ліку набыццё прафесійнай адукацыі.

## Мадэрнізацыя і разгортванне этнакультурных працэсаў

Пашырэнне пісьменнасці, развіццё сістэмы адукацыі ў значнай ступені з'яўляюцца індыкатарам уцягнутасці грамадства ў працэсы разгортвання мадэрнізацыі. Адукацыя ва ўмовах XIX – пачатку XX ст. і валоданне элементарнай граматай стваралі прадстаўнікам розных сацыяльных слаёў насельніцтва надзейны фундамент для павышэння свайго сацыяльнага статуса. Рух наверх па сацыяльнай іерархіі таксама стаў адным з найбольш важных фактараў фарміравання грамадзянскай і этнічнай свядомасці розных сацыяльных груп насельніцтва.

Згодна з данымі перапісу насельніцтва 1897 г., найбольш высокі паказчык узроўню пісьменнасці быў адзначаны для насельніцтва Віленскай губерні – 33,9 %, у тым ліку сярод жаночай часткі жыхароў – 25,2 %. Другі па велічыні паказчык па Гродзенскай губерні – 33,1 %, прычым самы высокі сярод мужчын – 46,5 %. Па астатніх губернях велічыня ўдзельнай вагі пісьменных жыхароў істотна не адрознівалася: у Віцебскай – 25,2 % (сярод мужчын – 34,3 %, жанчын – 16,1 %); Мінскай – 23,8 (мужчыны – 34,1; жанчыны – 13,5); Магілёўскай – 23,3 % (мужчыны – 35,3 %; жанчыны – 11,3 %). Сярод гарадскога насельніцтва беларускіх губерняў узровень адукаванасці быў прыкладна аднолькавым. Стан пісьменнасці сельскіх жыхароў вылучаўся больш высокімі паказчыкамі ў Віленскай і Гродзенскай губернях, у астатніх узровень быў дастаткова блізкім. Сярод саслоўных груп насельніцтва Беларусі найбольшай удзельнай вагой пісьменных вылучалася хрысціянскае духавенства. Узровень адукаванасці святароў-мужчын па ўсіх без выключэння губернях набліжаўся да 100 %; сярод жаночай часткі духоўнага саслоўя ён складаў ад 85 да 95 %.

Дваране і чыноўнікі па стане авалодання граматай займалі другую пазіцыю пасля духавенства. Узроўнем пісьменнасці вылучаліся прадстаўнікі вышэйшага саслоўя Гродзенскай (91,5 %) і Віцебскай (79,2 %) губерняў. Нечакана нізкім аналагічны паказчык аказаўся ў дваран і чыноўнікаў Віленскай (66,4 %) і Мінскай (63,9 %) губерняў. Дастаткова аднароднымі лічбамі зафіксаваны стан пісьменнасці ганаровых грамадзян, купцоў, мяшчан і прадстаўнікоў іншых гарадскіх саслоўяў. Сярэднія паказчыкі іх па беларускіх губернях вар'іравалі ў межах ад 57,2 (Гродзенская губерня) да 47,8 % (Мінская губерня). Адчувальна больш адрозніваліся даныя стану пісьменнасці жаночай часткі гарадскіх саслоўяў: ад 45,3 % у паветах Гродзенскай губерні да 28,4 % у Мінскай.

Сярод людзей розных веравызнанняў самы высокі паказчык адукаванасці быў характэрны для пратэстантаў. Гэтай групе была ўласціва практычна роўная велічыня працэнта пісьменных як для мужчын, так і для жанчын. Найбольш высокая ўдзельная вага пісьменных была ў пратэстантаў Віленскай губерні (76,3 %), мінімальны ўзровень – у Мінскай (57,8 %). Дастаткова значнымі былі паказчыкі адукаванасці ў іўдзеяў. Максімальнае і мінімальнае значэнні іх знаходзіліся ў дыяпазоне ад 54,3 (Віленская губерня) да 50,7 % (Мінская губерня) у мужчын і ад 35,3 (Віцебская губерня) да 29,7 % (Мінская губерня) у жанчын. У мусульман Беларусі ўдзельная вага пісьменных вар'іравала ў межах лічбавых паказчыкаў ад 41,5 (Віленская губерня) да 34,1 % (Магілёўская губерня) сярод мужчын і ад 50,7 (Гродзенская губерня) да 20 % (Магілёўская губерня) сярод жанчын. Працэнт пісьменных у каталікаў быў некалькі ніжэйшы, чым у названых вышэй канфесійных груп. У мужчын ён знаходзіўся ў межах ад 41,7 (Гродзенская губерня) да 33,5 % (Віленская і Мінская губерні). Для каталічак была характэрна наступная дыстанцыя паміж максімальным і мінімальным паказчыкамі адукаванасці: 41,4 (Віцебская губерня) і 23,4 % (Мінская). У самай шматлікай канфесійнай групы – праваслаўных – варыятыўнасць даных аб узроўні адукаванасці была значнай. Істотна адрозніваўся працэнт пісьменных у мужчын і жанчын. Удзельная вага адукаваных сярод апошніх была ў тры – пяць разоў меншая, чым у мужчын-праваслаўных. Напрыклад, у Гродзенскай губерні паказчык пісьменнасці ў мужчын складаў 32,6 %, у жанчын – 7,1 %. Аналагічныя даныя па Мінскай губерні, дзе адзначаўся найменшы ўзровень пісьменнасці праваслаўных, былі зафіксаваны ў наступных межах: адпаведна 18,9 і 3,7 %. Самым нізкім узроўнем пашырэння пісьменнасці вызначаліся

стараверы, асабліва жанчыны. Выключэнне складала Гродзенская губерня, дзе адзначаны ўнікальна высокі паказчык адукаванасці: 59,3 % у мужчын і 33,3 % у жанчын. Ва ўсіх астатніх губернях удзельная вага пісьменных старавераў знаходзілася ў межах паміж 25,6 (Магілёўская губерня) і 13,9 % (Мінская губерня) у мужчын; 5,4 (Магілёўская губерня) і 1,5 % (Мінская губерня) у жанчын.

Ва ўсіх без выключэння беларускіх губернях у пачатку XX ст., асабліва ў 1907–1914 гг., назіраўся школьны бум. Колькасць адкрываемых штогод у гэты перыяд навучальных устаноў у тры – сем разоў перавышала аналагічны паказчык за папярэднія гады.

Рост колькасці навучальных устаноў на мяжы XIX–XX стст. быў выкліканы зменай адносін розных пластоў насельніцтва да магчымасці атрымаць адукацыю. Змяніўся таксама змест паняцця «пісьменны чалавек», узрасла ступень адукаванасці сялян. Сярод іх усё часцей сустракаліся людзі, якім удалося атрымаць сярэднюю і часам вышэйшую адукацыю. Кожная вёска ўжо магла пахваліцца сваім выхадцам, які стаў настаўнікам ці паступіў на ніжэйшыя прыступкі дзяржаўнай службы. Але часта асобы, якія атрымалі адукацыю, імкнуліся парваць сувязь са сваім сялянскім асяродкам, падкрэсліць сацыяльную дыстанцыю з ім. Пісьменнік Л. Гмырак на старонках «Нашай нівы» адзначаў: «Патрэбу і карысць асветы ў нашай вёсцы цяпер людзі пачынаюць разумець. Даўней, калі загаварыць аб гэтым з селянінам, найчасцей пачуеш, што гэта ўсё пустое, што араць патрапіць і непісьменны і, адным словам, нятрэба пасылаць дзяцей у школу, а цяпер ужо не. Гэткай гаворкі неяк саўсім не чутно, бадай кожны кажа, што грамату ведаць трэба, што неграматнаму надта цяжка жыць на свеце».

Сістэмная мадэрнізацыя суправаджалася абуджэннем этнакультурных працэсаў. Рэформы зрабілі актуальным пытанне аб прыродзе нацыянальнага. Менавіта ў 60–70-х гг. XIX ст. пад непасрэдным уплывам паўстання 1863 г. з'явіўся рускі нацыяналізм. Паралельна адбывалася пашырэнне ў Беларусі «заходнерусізму» як ідэалогіі і формы этнічнай самасвядомасці часткі гарадскога насельніцтва. Пад уплывам спрэчак аб гістарычным шляху і месцы Беларусі, актывізаваных не без удзелу прыхільнікаў «заходнерусізму», фарміравалася беларуская нацыянальная ідэалогія.

Русіфікацыя і этнакультурная ўніфікацыя ўрадавымі коламі Расійскай імперыі ў 60–90-х гг. XIX ст. успрымаліся як неабходны элемент мадэрнізацыі. У перыяд пасля вызвалення сялян і рэформ 60–70-х гг. XIX ст. павялічыліся маштабы добраахвотнай русіфікацыі. Чыгунач-

нае будаўніцтва, развіццё прамысловасці і ўнутранага рынку, удасканаленне камунікацый, пашырэнне перспектыў прафесійнага росту і сацыяльнай мабільнасці стваралі перавагі не толькі для рускіх, але і для прадстаўнікоў іншых народаў. У той жа час эмансіпацыя сялянства, індустрыялізацыя і ўрбанізацыя садзейнічалі фарміраванню сярэдняга слоя ў горадзе і вёсцы, які стаў сацыяльнай базай абуджэння і пашырэння нацыянальных рухаў. Для некаторых этнічных ускраін (найперш для Польшчы) была характэрна апераджальная ў параўнанні з расійскім цэнтрам мадэрнізацыя, якая прывяла да стварэння тут новых нацый, што разгарнулі барацьбу не пад саслоўнымі ці тэрытарыяльнымі, а пад нацыянальнымі сцягамі.

Расійская рэпрэсіўная палітыка, выразна аформленая пасля падаўлення паўстання 1863 г., значна запаволіла беларускую культурна-асветніцкую дзейнасць, фарміраванне палітычных сіл і арганізацый. У той жа час гэты супярэчлівы перыяд адкрыў магчымасці разнявалення чалавечай асобы, да якога б саслоўя чалавек ні адносіўся. Набыла свае абрысы ідэя беларускай нацыі, змяніўся характар нацыянальнай самасвядомасці. Пашырэнне беларускай па сваім сённяшнім змесце свядомасці ў значнай ступені звязана з дзейнасцю мясцовай народніцкай, а затым марксісцкай моладзі. Яна не прымала ранейшую «ліцвінскую», «краёвую» ідэалогію, звязаную са шляхецтвам, а больш арыентавалася на сялянства.

Трансфармацыя грамадства адбывалася дзякуючы таму, што змянялася сацыяльная псіхалогія людзей. Мадэрнізацыя – гэта таксама зрухі ў менталітэце насельніцтва, яго здольнасць адаптавацца да змен, мабільнасць. Пад уплывам мадэрнізацыйных працэсаў адбывалася трансфармацыя грамады ў грамадства. Невялікая па памерах традыцыйная грамада з уласцівымі ёй блізкімі, даверлівымі чалавечымі адносінамі змянялася вялікім урбаністычным, індустрыяльным грамадствам, дзе адносіны паміж людзьмі набывалі безасабовы, індывідуалістычны, прагматычны характар. У працэсе мадэрнізацыі адбывалася трансфармацыя сям'і – пераход ад пашыранай да невялікай, нуклеарнай (муж, жонка, дзеці). Слабеў кантроль над асобай з боку бацькоў і сваякоў. Акрамя таго, эканамічная дзейнасць паступова страчвала сувязь з сямейнымі, сваяцкімі адносінамі, хатнімі гаспадаркамі. Члены сям'і пакідалі хатнюю гаспадарку ў пошуках працаўладкавання.

У традыцыйным грамадстве функцыя вытворчасці рэалізуецца пераважна ў сваяцкіх калектывах. Функцыя навучання паступова пераходзіць ад сям'і да школы. Традыцыя і сучаснасць не толькі суіс-

нуюць у грамадствах, якія мадэрнізуюцца, але і пранікаюць адна ў адну і змешваюцца паміж сабой. Па меры станаўлення індустрыяльнага грамадства адбывалася эмансіпацыя жанчыны, ураўноўванне яе ў правах з мужчынам. Для вялікай колькасці жанчын стала неабходным шукаць самастойны занятак, працу. Яны набывалі медыцынскія, юрыдычныя, выкладчыцкія прафесіі, займалі многія з тых пасад, якія раней займалі мужчыны. Жыццё станавілася больш напружаным, практычным і абцяжараным клопатамі. Справа, заробак, пытанні матэрыяльнага дабрабыту для многіх груп насельніцтва вылучаліся на першы план. Уяўленне пра свята, адпачынак, вольны час амаль знікла з побыту.

## Асноўныя асаблівасці мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі

У XIX – пачатку XX ст. авангардам мадэрнізацыі ў краінах Еўропы былі гарады, дзе канцэнтравалася прамысловасць. У Беларусі значная частка прадпрыемстваў знаходзілася ў сельскай мясцовасці. Узнікненне мануфактурна-фабрычнай сістэмы ў Беларусі адбылося ў мястэчках і невялікіх населеных пунктах, дзе не было рамесніцкай карпаратыўнай арганізацыі. Гарады ў Беларусі ў параўнанні з прамысловымі рэгіёнамі Расійскай імперыі адыгралі больш сціплую мадэрнізуючую ролю ў дачыненні да навакольнага сельскага асяроддзя. Рухавіком мадэрнізацыі ў краінах Еўропы была буржуазія, купцы, а ў Беларусі дваранства, якому належала вялікая частка прамысловых прадпрыемстваў, доўгі час утрымлівала права сацыяльна-эканамічнай ініцыятывы. Гандлёвая і прамысловая буржуазія недваранскага паходжання была пераважна іншаэтнічнага і іншаканфесійнага паходжання ў параўнанні з большасцю насельніцтва.

Мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі разгортваліся нераўнамерна, з неаднолькавай ступенню пранікнення ў розныя сферы жыцця. У дзяржаўна-палітычных умовах Расійскай імперыі сацыяльныя змены адбываліся пасля і ў некаторай адлегласці па часе ад эканамічнай і тэхналагічнай складаючых мадэрнізацыйных працэсаў. Развіццё апошніх выявіла рэгіянальную асаблівасць: заходняя частка Беларусі па многіх паказчыках вылучалася як больш уцягнутая ў станаўленне індустрыяльнага грамадства. Працэс мадэрнізацыі спалучаўся з існаваннем дыспрапорцый паміж горадам і вёскай, больш хуткім ростам прамысловасці і руцінным станам сельскай гаспадаркі. Для Беларусі

ў абазначаны час была характэрна фрагментарная мадэрнізацыя. Накіраванасць і межы мадэрнізацыйнага працэсу ў Расійскай імперыі вызначаліся дзяржавай. На тэрыторыі беларускіх губерняў дзяржава больш актыўна ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі імперыі выконвала стрымліваючую ролю ў мадэрнізацыі эканомікі і сацыяльнай структуры грамадства. У рэалізацыі палітыкі мадэрнізацыі гаспадарка грамадства і культура выступалі ў якасці аб'екта правядзення пераўтварэнняў і практычна ніколі – як апора змен. У Беларусі мадэрнізацыя здзяйснялася найперш на ўнутранай аснове. Адным з яе наступстваў было развіццё беларускай нацыі. Складанасць і супярэчлівасць дадзенага працэсу сталі ўвасабленнем выніковасці сацыяльна-культурнай мадэрнізацыі.

Тэма 3

# АДМЕНА ПРЫГОННАГА ПРАВА. БУРЖУАЗНЫЯ РЭФОРМЫ 60–70-х гг. XIX ст.

**Аграрная рэформа 1861 г.**
**Судовая рэформа.**
**Вайсковая рэформа.**
**Школьная рэформа.**
**Рэформа гарадскога самакіравання.**
**Цэнзурная рэформа.**

## Аграрная рэформа 1861 г.

Да сярэдзіны XIX ст. у Расійскай імперыі вызначыліся прыкметы разлажэння прыгонніцкай сістэмы. Яна перашкаджала развіццю буржуазных адносін, мадэрнізацыйным працэсам у гаспадарцы і грамадстве. Сяляне не мелі нармальных умоў для жыцця, выканання павіннасцей на карысць дзяржавы і сваіх уладальнікаў. Значная частка памешчыцкіх гаспадарак была нерэнтабельнай. Каб павялічыць даходнасць сваіх маёнткаў, памешчыкі памяншалі сялянскія надзелы, абеззямельвалі прыгонных. Імкненне павялічыць даходнасць гаспадарак праз узмацненне экс-

плуатацыі сялянства сустракала яго супраціўленне. Да канца 50-х гг. XIX ст. узрос сялянскі рух. У 1858–1860 гг. у Беларусі адбыліся 42 хваляванні, 11 з якіх былі падаўлены з дапамогай вайсковай сілы. Спецыфічнай формай сялянскага супраціўлення напярэдадні адмены прыгоннага права стаў «цвярозы рух». Ён разгарнуўся на тэрыторыі Беларусі, Літвы і некаторых іншых частак Расійскай імперыі. Сяляне адмаўляліся набываць у сваіх памешчыкаў гарэлку – гэта было дадатковай і даволі цяжкай для іх павіннасцю. Штогод селянін быў абавязаны выкупіць у свайго гаспадара вызначаную колькасць вёдраў гарэлкі, нават калі ён гэты напой не спажываў. Каталіцкія святары выкарысталі «цвярозы рух» для антырасійскай прапаганды напярэдадні паўстання 1863 г. Яны даводзілі сялянам, што расійскі ўрад вельмі зацікаўлены ў спойванні сялян.

Расійскі ўрад вымушаны быў стаць на шлях практычнага ажыццяўлення адмены прыгоннага права. У студзені 1857 г. пад кіраўніцтвам Аляксандра II быў створаны Сакрэтны камітэт для абмеркавання мерапрыемстваў, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем сялянскай рэформы. Упершыню аб сваім жаданні адмяніць прыгоннае права Аляксандр II заявіў падчас сустрэчы з прадстаўнікамі маскоўскага дваранства: «...існуючы парадак валодання душамі не можа заставацца нязменным. Лепш адмяніць прыгоннае права зверху, чым дачакацца таго часу, калі яно само сабой пачне адмяняцца знізу». Яшчэ летам 1856 г. Аляксандр II у размове з віленскім генерал-губернатарам У. І. Назімавым выказаў думку аб неабходнасці ўнушэння дваранству адказнасці за справу вызвалення сялянства. У. І. Назімаву ўдалося арганізаваць выступленне віленскага, ковенскага, гродзенскага дваранства з ініцыятывай адмены прыгоннага права. Такі пачатак выклікаў стрымана-негатыўную рэакцыю з боку прадстаўнікоў дваранства шэрагу цэнтральных і паўднёвых губерняў Расійскай імперыі.

У ходзе папярэдняга абмеркавання памешчыкі беларускіх губерняў прадэманстравалі рознае ўяўленне аб паслярэформенным уладкаванні сваіх гаспадарак, але былі амаль адзінадушнымі ў адмаўленні прапановы ўрада аб абавязковым продажы сялянству той ці іншай долі апрацоўваемай імі зямлі па фіксаваных дзяржавай цэнах. Яны звязвалі такі падыход з расійскім парадкам ураўняльнага землекарыстання і лічылі яго не адпавядаючым эканамічным запатрабаванням свайго, на іх погляд, больш развітога рэгіёна, дзе панавала падворнае землекарыстанне. Больш за тое, памешчыкі беларускіх і літоўскіх губерняў падкрэслівалі перакананне ў адасобленасці свайго рэгіёна ад унутранай

часткі Расіі. Яны прапаноўвалі такія спосабы арганізацыі зямельных адносін у маёнтках, якія б спрашчалі арэнду зямлі і прыцягненне батракоў у якасці вольнанаёмнай рабочай сілы. Акрамя абмеркавання сялянскай справы, памешчыкі выказваліся таксама за вяртанне польскай мовы ў дзяржаўныя ўстановы, адкрыццё Віленскага ўніверсітэта і інш.

У адказ на адрасы, накіраваныя памешчыкамі Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай губерняў Аляксандру II, дзе выказвалася згода на вызваленне сялян, але без зямлі, 20 лістапада 1857 г. выйшаў рэскрыпт імператара на імя У. І. Назімава, які абвяшчаў пачатак падрыхтоўкі сялянскай рэформы. Для гэтай мэты былі створаны губернскія дваранскія камітэты. У лютым 1858 г. Сакрэтны камітэт быў перайменаваны ў Галоўны камітэт па сялянскай справе.

Зварот да беларускіх і літоўскіх памешчыкаў у сувязі з пачаткам падрыхтоўкі рэформы быў абумоўлены большай уцягнутасцю рэгіёна ў рынкавыя адносіны; перасцярогай урада ў сувязі з магчымым аб'яднаннем сялянскага руху з польскім нацыянальна-вызваленчым; зацікаўленасцю мясцовых памешчыкаў у льготных умовах правядзення рэформы. Таксама было ўлічана суседства Польшчы і інфлянцкіх губерняў, дзе прыгоннае права ўжо адсутнічала.

19 лютага 1861 г. Аляксандр II падпісаў «Палажэнне» і Маніфест аб адмене прыгоннага права. На беларускія губерні было пашырана дзеянне Агульнага і двух мясцовых палажэнняў. У Агульным палажэнні вызначаліся асабістыя і маёмасныя правы сялян, парадак утварэння сельскага кіраўніцтва, выканання сялянамі казённых, земскіх і грамадскіх павіннасцей. Паводле «Палажэнняў» памешчык заставаўся ўласнікам усёй зямлі. Аднак частка яе вылучалася сялянам для надзелу, які даваўся ім у карыстанне. Да заключэння выкупной здзелкі селянін знаходзіўся ў часоваабавязаным стане і мусіў выконваць на карысць памешчыка вызначаныя павіннасці. Пазямельныя адносіны паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі рэгуляваліся ўстаўнымі граматамі.

Мясцовыя палажэнні вызначалі канкрэтны парадак землеўпарадкавання сялян і выканання імі павіннасцей. На Віцебскую і Магілёўскую губерні пашыралася «Палажэнне для губерняў вялікарасійскіх, наварасійскіх і беларускіх». У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях рэформа ажыццяўлялася паводле мясцовага палажэння для гэтых губерняў. Вылучэнне іх, а таксама Ковенскай губерні ў асобную групу было выклікана панаваннем тут падворнага землекарыстання, увядзеннем інвентароў і палітычнымі меркаваннямі, звязанымі з блізкасцю Поль-

шчы. Рэдакцыйныя камісіі пры падрыхтоўцы заканадаўчых дакументаў аб адмене прыгоннага права стварылі для іх спецыяльны праект. Паводле яго планавалася пакінуць за кожным сялянскім дваром той зямельны надзел, які быў у яго карыстанні на момант вызвалення, а таксама ўстанавіць максімальны памер павіннасцей. Дакладнае вызначэнне памераў надзелу і павіннасцей павінна было быць зроблена пры складанні ўстаўных грамат.

У беларускіх паветах Віцебскай і Магілёўскай губерняў, дзе захавалася абшчыннае сялянскае землекарыстанне, памеры зямельных надзелаў устанаўліваліся наступным чынам: вышэйшы – ад 4 да 5,5 дзесяцін, ніжэйшы – 1/3 вышэйшага. Калі памер надзелу перавышаў вышэйшы, памешчык меў права адрэзаць лішак на сваю карысць. За карыстанне поўным надзелам сяляне павінны былі плаціць аброк або адбываць паншчыну (40 мужчынскіх і 30 жаночых дзён у год). У абшчынах захоўвалася кругавая парука для спраўнага выканання сялянамі павіннасцей.

У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях сялянам перадавалася тая зямля, якой яны карысталіся да 1861 г. адпаведна інвентарам. Калі ў сялян зямлі было больш, чым паказана ў інвентары, або калі ў памешчыка заставалася менш за 1/3 зручных зямель, апошні меў права адрэзаць на сваю карысць 1/6 частку сялянскага надзелу. Памер павіннасцей устанаўліваўся не больш за: аброк – 3 руб. з дзесяціны, паншчына – 23 дні ў год. За выкананне павіннасцей сяляне неслі асабістую адказнасць перад памешчыкам. Акрамя таго, прадугледжвалася стварэнне ў кожным павеце паверачных камісій, якія на працягу шасці гадоў пасля зацвярджэння ўстаўных грамат разбіралі спрэчкі і рознагалоссі паміж сялянамі і памешчыкамі. Аналага такога органа ў велікарускіх губернях не прадугледжвалася. Супраць гэтага праекта выступілі мясцовыя памешчыкі, пагражаючы поўным сваім разарэннем у выпадку яго прыняцця.

Зямля трапляла ва ўласнасць селяніна праз выкуп. Правілы выкупной аперацыі былі аднолькавымі для ўсіх губерняў. Выкупная сума вызначалася такім чынам, што ў выпадку ўкладання яе ў банк пры ўмове 6 % гадавых памешчык павінен быў атрымліваць даход, роўны па памерах гадавому аброку. Усе лясы пакідаліся ва ўласнасці памешчыкаў. Сяляне маглі нарыхтоўваць дровы толькі з іх дазволу і, як правіла, у вызначаны час і за пэўную плату. Акрамя выкупных плацяжоў, сяляне вымушаны былі плаціць дзяржаўныя падаткі і зборы: падушны падатак, земскі падушны збор і з 1872 г. – земскі пазямельны падатак

на мясцовыя патрэбы. Сумарна падаткі і зборы ў разліку на адну дзесяціну перавышалі выкупныя плацяжы.

Дзяржава для ажыццяўлення выкупной аперацыі давала сялянам доўгатэрміновую грашовую пазыку. Сяляне на 49 гадоў рабіліся даўжнікамі дзяржавы і павінны былі выплачваць ёй доўг з улікам высокіх працэнтаў, так званыя «выкупныя плацяжы». Памер выкупу значна перавышаў фактычны кошт зямлі.

Практычнае ажыццяўленне рэформы ўскладалася ўрадам на міравых пасрэднікаў, павятовыя міравыя з'езды і губернскія па сялянскіх справах прысутнасці. Міравым пасрэднікам, якія прызначаліся губернатарамі з ліку мясцовых памешчыкаў, падпарадкоўвалася сялянскае кіраванне некалькіх валасцей. Яны дастаткова сумленна выконвалі ўскладзеныя на іх абавязкі. Нярэдкімі былі скаргі з боку мясцовых памешчыкаў на дзейнасць міравых пасрэднікаў, якія выступалі ў вырашэнні спрэчных пытанняў на баку сялян.

Азнаямленне з умовамі адмены прыгоннага права праводзілася ў цэрквах і касцёлах у прысутнасці паліцыі. Вялікай радасці рэформа ў сялян не выклікала, паколькі ім абяцалі толькі асабістую волю і то не адразу, а сваю зямлю яны павінны былі выкупляць у памешчыка. Асаблівае незадавальненне ў сельскіх жыхароў выклікаў двухгадовы пераходны перыяд, на працягу якога міравым пасрэднікам трэба было скласці ў кожным маёнтку ўстаўныя граматы. Паводле апошніх вызначаліся колькасць, памеры сялянскіх надзелаў і парадак іх паступовага пераходу на ўмовах выкупу ва ўласнасць сялян.

Умовы адмены прыгоннага права не былі прыняты сялянствам, пашырыўся яго рух. Калі пачалося паўстанне 1863 г., урад імкнуўся прадухіліць далучэнне беларускіх сялян да паўстанцаў. Расійскі ўрад вымушаны быў пайсці на ўступкі сялянам. 1 сакавіка 1863 г. выйшаў указ аб адмене часоваабавязаных адносін у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губернях і інфлянцкіх паветах Віцебскай губерні. 2 лістапада 1863 г. указ быў пашыраны на Магілёўскую губерню і беларускія паветы Віцебскай губерні. Ім уводзіўся абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў. Выкупныя плацяжы за надзельную зямлю паніжаліся на 20 %. Сяляне пераходзілі ў разрад сялян-уласнікаў і павінны былі ўносіць выкупныя плацяжы, былі павялічаны зямельныя надзелы, за сялянамі замацоўваліся сервітутныя ўгоддзі (пашы, вадапоі і г. д.), якімі яны карысталіся да рэформы 1861 г. У адрозненне ад унутраных губерняў Расійскай імперыі напаўпрыгонніцкія адносіны ў Беларусі былі ліквідаваны ў 1863 г. праз спыненне часоваабавязанага становішча сялян.

Надзельныя землі не дазвалялася прадаваць да часу выплаты выкупной пазыкі. Той, хто купляў гэту зямлю, станавіўся членам сельскай грамады, для чаго патрэбна была згода з боку сельскага сходу. Зямельнае пытанне было найбольш вострым у паслярэформеннай вёсцы. Сяляне часам куплялі памешчыцкую зямлю, але яна прадавалася, як правіла, вялікімі кавалкамі, і патрэбна была згуртаванасць аднавяскоўцаў для куплі ў складчыну. Нярэдкімі станавіліся выпадкі, калі сяляне самавольна захоплівалі асобныя кавалкі памешчыцкай зямлі, і далёка не заўсёды землеўласнікам удавалася даказаць у судзе сваю праўду. Асабліва частай такая сітуацыя была, калі аднавяскоўцы калектыўна абаранялі свае набыткі.

Адмена прыгоннай залежнасці памешчыцкіх сялян Беларусі і перавод іх на абавязковы выкуп вызначылі неабходнасць пазямельнага ўладкавання іншых катэгорый сельскага насельніцтва. Другой па колькасці катэгорыяй сялянства пасля памешчыцкіх былі дзяржаўныя. Яны складалі, паводле рэвізіі 1858 г., 19,5 % сялянства Беларусі. Казённыя сяляне плацілі дзяржаве грашовы аброк, былі асабіста вольныя, па ўласным меркаванні распараджаліся сваёй рабочай сілай. Дзяржаўныя сяляне прызнаваліся суб'ектамі грамадзянскага і публічнага права і ў той жа час мелі няпэўнае прававое становішча, залежалі ад дзяржавы, патэнцыяльна маглі быць падораны дваранам разам з землямі, на якіх знаходзіліся. У маі 1867 г. быў выдадзены Закон аб рэформе дзяржаўнай вёскі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны. Паводле яго землеўладкаванне дзяржаўных сялян праводзілася на той жа аснове, што і былых памешчыцкіх. Згодна з законам, а таксама правіламі для складання люстрацыйных актаў ад 20 кастрычніка 1867 г. іх пераводзілі на абавязковы выкуп і прылічалі да сялян-уласнікаў, у адрозненне ад казённага сялянства велікарускіх губерняў, Левабярэжнай і Паўднёвай Украіны, дзе надзельная зямля знаходзілася толькі ў іх пастаянным карыстанні.

За дзяржаўнымі сялянамі Беларусі захоўвалася зямля, якая знаходзілася ў іх карыстанні да часу правядзення рэформы 1867 г. Велічыню надзельных зямельных участкаў і суму выкупных плацяжоў вызначалі люстрацыйныя камісіі. Для складання і зацвярджэння люстрацыйных актаў у Віленскай і Гродзенскай губернях устанаўліваўся тэрмін 3 гады, у Мінскай – 4, у Віцебскай і Магілёўскай – 6 гадоў. Штогадовыя выкупныя плацяжы вызначаліся зыходзячы з памераў павялічанага на 10 % аброчнага падатку. Тэрмін пагашэння выкупнога доўгу складаў 46 гадоў. Ніякай пазыкі ад казны дзяржаўныя сяляне не атрымлівалі. Выкупныя плацяжы адпавядалі мясцовым рыначным цэнам на зямлю і былі прыкметна ніжэй, чым у былых памешчыцкіх сялян. На захадзе і ў цэнтры

Беларусі вызначэнне велічыні і меж надзелаў, выкупу дзяржаўных сялян было завершана ў пачатку 1870-х гг. У Віцебскай і Магілёўскай губернях рэалізацыя рэформы была скончана ў сярэдзіне 1870-х гг.

Асобную катэгорыю прыгонных складалі ўдзельныя сяляне. У канцы 50-х гг. XIX ст. яны налічвалі ва ўсходняй частцы Беларусі 0,7 % вясковых жыхароў. У сувязі з паўстаннем расійскі ўрад у чэрвені 1863 г. вымушаны быў удзельных сялян перавесці на абавязковы выкуп. Выкупная сума ў іх вызначалася аналагічна як і ў былых памешчыцкіх людзей, аднак удзельныя сяляне атрымалі крыху большыя надзелы, якія каштавалі ім танней.

У ліпені 1864 г. быў апублікаваны ўказ аб пазямельным уладкаванні вольных людзей, якія з'яўляліся асабіста свабоднымі, але былі абавязаны плаціць падушны аброк ці адпрацоўваць за зямлю. Яны жылі ў Віленскай, Гродзенскай, Віцебскай і Мінскай губернях і складалі каля 0,6 % сельскага насельніцтва. Напярэдадні адмены прыгоннага права многія з вольных людзей былі абеззямелены. У катэгорыю «без зямлі» было пераведзена мноства прыгонных сялян. Паводле ўказа 1864 г. вольныя людзі, абеззямеленыя памешчыкамі пасля лістапада 1857 г., надзяляліся зямлёй з правам выкупу на тых жа ўмовах, што і памешчыцкія сяляне; пазбаўленыя зямлі да 1857 г. заставаліся на 12 гадоў у якасці арандатараў. Апошнія ў 1882 г. атрымалі права выкупіць зямлю ці заключыць новыя арэндныя дагаворы.

Згодна з Законам ад 9 чэрвеня 1886 г. на тэрыторыі Беларусі, Правабярэжнай Украіны і Літвы была праведзена чыншавая рэформа. Чыншавікоў пераводзілі на абавязковы выкуп. Да іх ліку адносіліся тыя, хто карыстаўся памешчыцкай зямлёй на ўмовах бестэрміноваспадчыннай арэнды з фіксаванай грашовай платай. Для доказу права спадчыннай арэнды чыншавікі павінны былі падаць пэўныя дакументы. Рэалізацыя рэформы зацягнулася, у пачатку XX ст. разгляд чыншавых спраў быў далёкі ад завяршэння. Законам 1893 г. права выкупіць зямлю было дадзена праваслаўным арандатарам.

Вызваленне сялян ад прыгону, правядзенне аграрных пераўтварэнняў, нягледзячы на сваю пэўную абмежаванасць, адкрылі шлях для капіталістычнай мадэрнізацыі вёскі. Адчувальным фактарам, які паўплываў на іх змест і кірунак, стала актывізацыя нацыянальна-вызваленчага руху ў пачатку 1860-х гг. Перавод на выкуп памешчыцкіх, а затым і дзяржаўных сялян Беларусі, у адрозненне ад унутраных і некаторых іншых рэгіёнаў Еўрапейскай Расіі, стварыў больш спрыяльныя ўмовы для сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі беларускай вёскі.

## Судовая рэформа

Адмена прыгоннага права, буржуазнае развіццё Расійскай імперыі абумовілі неабходнасць правядзення шэрагу рэформ: земскай (1864), судовай (1864), гарадскога самакіравання (1870), вайсковай (1862, 1874), школьнай (1864), а таксама некаторых пераўтварэнняў у галінах фінансаў, цэнзуры. У Беларусі гэтыя рэформы былі праведзены пазней і са значнымі адхіленнямі ад агульнарасійскіх норм.

З усіх буржуазных рэформ 1860–80-х гг. найбольш паслядоўнай была судовая. У яе аснову былі пакладзены: бессаслоўнасць суда, спаборніцтва бакоў, галоснасць судаводства і незалежнасць суддзяў. Былі створаны спецыяльныя інстытуты прысяжных паверaных (адвакатаў), прысяжных засядацеляў (суддзяў-непрафесіяналаў), якія ўдзельнічалі ў крымінальных працэсах і выносілі канчатковае рашэнне аб вінаватасці ці невінаватасці падсуднага. Аснову судовай рэформы склалі чатыры законы, якія былі зацверджаны 20 лістапада 1864 г.: «Заснаванне судовых устанаўленняў», «Статут грамадзянскага судаводства», «Статут крымінальнага судаводства», «Статут аб пакараннях, якія накладваюцца міравымі суддзямі». Паводле судовай рэформы дакладна вызначаліся судовыя інстанцыі і размяжоўваліся іх функцыі. Сама сістэма судоў была ў значнай ступені спрошчана. Для разгляду дробных злачынстваў і нязначных іскаў быў створаны міравы суд са спрошчаным судаводствам. Міравыя суддзі выбіраліся на сходах земскіх і гарадскіх галосных. Іх рашэнні маглі быць абскарджаны ў павятовым міравым судзе. Стваралася стройная сістэма судовых устаноў: акруговыя суды, судовыя палаты, Сенат. Для ўсіх саслоўяў уводзіўся адзіны акруговы суд.

Пачатак судовай рэформы ў Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі быў сустрэты з большым энтузіязмам, чым у іншых рэгіёнах. Гэта праявілася ў шматлікіх допісах, накіраваных мясцовымі пракурорамі, судовымі работнікамі ў Пецярбург. Трэба ўлічваць, што тут каля 250 гадоў дзейнічаў Статут ВКЛ 1588 г., які меў пэўны ўплыў на падрыхтоўку новых судовых статутаў 1864 г. і абвяшчаў амаль тыя ж прынцыпы права. Дваранства беларускіх губерняў прапаноўвала ўвесці тут судаводства па правілах Статута 1588 г. Аднак у Пецярбургу, а таксама ў акружэнні віленскага генерал-губернатара ў сувязі з падзеямі паўстання 1863 г. і ўвядзеннем ваеннага становішча перавагу атрымаў погляд аб несвоечасовасці пашырэння норм судовай рэформы на тэрыторыю беларускіх губерняў. Ваеннае становішча на ўсёй тэрыторыі Беларусі было адменена ў 1870 г., пасля гэтага стала магчымай рэалізацыя тут

рэформы. На думку генерал-губернатара А. Л. Патапава, судовая рэформа павінна была зблізіць заходнія губерні з астатняй часткай імперыі, выклікаць у мясцовага насельніцтва пачуццё павагі да законаў Расійскай імперыі. Указам імператара ў чэрвені 1871 г. Сенату было загадана пачаць увядзенне міравых судовых устаноў у заходніх губернях.

У беларускіх губернях рэалізацыя судовай рэформы пачалася ў 1872 г. з увядзення міравых судоў. Аднак паколькі тут адсутнічалі земствы, якія выбіралі суддзяў, прэтэндэнты на гэту пасаду прызначаліся міністрам юстыцыі з ліку лаяльных да ўрада памешчыкаў; у Беларусі ў параўнанні з цэнтральнымі расійскімі губернямі быў паніжаны маёмасны і адукацыйны цэнз. У беларускіх губернях міравыя суддзі зацвярджаліся тэрмінам на тры гады. Для адбору кандыдатаў у міравыя суддзі складаліся спецыяльныя часовыя камісіі. Займаць пасады суддзяў забаранялася асобам «польскага» паходжання. Такім чынам, Беларусь адразу была пазбаўлена адной з галоўных рыс рэформы – выбарнасці суддзяў. Дзейнасць міравых судоў тут у пэўнай ступені насіла палітычны характар, што было звязана з разглядам спраў аб забароне навучання сялян польскай грамаце, выкарыстання польскіх нацыянальных сімвалаў і інш.

Вышэйшыя судовыя інстанцыі – акруговыя суды, судовыя палаты, а таксама пракуратура, інстытуты прысяжных паверaных і засядацеляў – у Беларусі былі ўведзены ўказам імператара ад 9 лістапада 1882 г. Акруговыя суды былі створаны тут у лістападзе 1883 г. Яны заснаўваліся ў губернскіх гарадах і складаліся з крымінальнага і грамадзянскага аддзяленняў.

Старшыні і члены судоў вышэйшай інстанцыі прызначаліся імператарам па прапанове міністра юстыцыі. Больш высокай апеляцыйнай інстанцыяй для Гродзенскага і Мінскага акруговых судоў была Віленская судовая палата, для Віцебскага – Пецярбургская, Магілёўскага – Кіеўская судовая палата. Аднак не абышлося без выключных норм для заходніх губерняў. Іх адміністрацыям было дадзена права выкрэсліваць са спісаў прысяжных засядацеляў асоб, якія іх не задавальнялі. Для яўрэйскага прадстаўніцтва былі ўведзены працэнтныя нормы. Да гэтага часу ўрад звузіў межы судовай рэформы, асабліва адносна незалежнасці суддзяў. У 1878 г. разгляд спраў аб дзяржаўных (палітычных) злачынствах быў перададзены з суда прысяжных у судовыя палаты і ваенныя суды.

У працэсе рэалізацыі рэформы дзейнасць некаторых міравых суддзяў выклікала незадаволенасць улад. У 1889 г. быў уведзены інстытут земскіх начальнікаў, якія прызначаліся губернатарамі, міністрам унутраных спраў. Зацвярджэнню гэтага інстытута папярэднічалі шмат-

лікія скаргі памешчыкаў на міравыя суды і органы сялянскага самакіравання. Землеўласнікаў не задавальняла зацягнутасць прыняцця рашэнняў міравымі і валаснымі судамі па іх скаргах у дачыненні да сялян. Земскім начальнікам, якія павінны былі быць дваранамі, падпарадкоўвалася ўсё сялянскае самакіраванне. Яны мелі права прыпыняць рашэнні сельскіх і валасных сходаў, маглі выносіць штрафы, аддаваць на кароткі тэрмін пад арышт. Пасады земскіх начальнікаў былі ўведзены на тэрыторыі Беларусі не адразу, а пасля атрымання першага вопыту дзейнасці новай улады на вёсцы. У Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях яны з'явіліся ў 1900 г., у Віленскай і Гродзенскай – у 1904 г.

Судовая сістэма з самага пачатку правядзення рэформы захоўвала і некаторыя рысы папярэдняй эпохі. Побач з агульнасаслоўнымі судамі дзейнічалі сялянскія валасныя суды, святары ў шэрагу выпадкаў судзіліся ў асобным парадку і г. д.

## Вайсковая рэформа

Адной з першых пачалася рэалізацыя вайсковай рэформы. У 1862 г. тэрмін службы ў рэгулярных падраздзяленнях расійскай арміі быў скарочаны да сямі-васьмі гадоў. Гэта адкрывала магчымасці для амаладжэння войска і стварэння рэзерву для мабілізацыі з ліку звольненых у запас, але захоўваўся саслоўны характар яго фарміравання. У 1864 г. Расійская імперыя была падзелена на вайсковыя акругі. Беларускія губерні былі ўключаны ў склад Віленскай акругі. Змянялася і пашыралася сетка ваенных навучальных устаноў, замест кадэцкіх карпусоў ствараліся ваенныя гімназіі, з 1864 г. – юнкерскія вучылішчы.

З 1874 г. уводзілася ўсеагульная вайсковая павіннасць, аднак адбор прызыўнікоў вёўся, як правіла, па жэрабю і на службу трапляла прыкладна трэцяя частка мужчын адпаведнага ўзросту. Тыя, хто пазбягаў службы, залічаліся ў апалчэнне. Прызыву падлягалі мужчыны, не маладзейшыя за 20 гадоў. Афіцыйна ад службы ў войску вызваляўся старэйшы сын главы гаспадаркі. Тэрмін праходжання службы ў арміі скарачаўся: у сухапутных войсках складаў шэсць гадоў, на флоце – сем. Пры наяўнасці пэўнага ўзроўню адукацыі маладыя людзі служылі менш. Пасля заканчэння вышэйшых навучальных устаноў тэрмін службы зніжаўся да шасці месяцаў, гімназій – да паўтара года, пачатковых школ – да чатырох гадоў. Ільготы па службе ў войску з'явіліся дадатковым стымулам для распаўсюджвання адукацыі. Звольненыя

ў запас траплялі ў мабілізацыйны рэзерв. З 1875 г. непісьменных салдат абавязкова навучалі грамаце. Асноўная частка маладых людзей пасля службы ў войску вярталася на радзіму, але армейскі вопыт значна пашыраў іх далягляд, сказваўся на іх паводзінах, усрпыняцці традыцыйнага вясковага жыцця.

Па новым Воінскім статуце 1888 г. устанаўліваўся 5-гадовы тэрмін службы ва ўсіх родах рэгулярнага войска і 13-гадовы тэрмін знаходжання ў запасе, з наступным залічэннем у апалчэнне. Прызыўны ўзрост павялічваўся з 20 да 21 года. Мерапрыемствы вайсковай рэформы былі праведзены найбольш паслядоўна, і яна аказалася самай удалай у параўнанні з іншымі буржуазнымі рэформамі 60–70-х гг. XIX ст.

## Школьная рэформа

На тэрыторыі беларускіх губерняў школьная рэформа праводзілася паводле Палажэння аб пачатковых народных вучылішчах і Статута гімназій і прагімназій 1864 г., якія былі заснаваны на прынцыпе агульнасаслоўнай адукацыі. Саслоўныя абмежаванні адмяняліся пры паступленні і ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Аднак склад навучэнцаў у сярэдняй і вышэйшай школах рэгуляваўся высокай аплатай за навучанне. У дадатак да прынятых палажэнняў цыркуляр ад 18 чэрвеня 1887 г. уводзіў афіцыйныя абмежаванні па прыёме ў гімназіі для асобных маламаёмасных груп насельніцтва, а выдадзены ў ліпені 1887 г. новы заканадаўчы дакумент устанавіў працэнтныя нормы паступлення ў сярэднія навучальныя ўстановы для яўрэяў. Разам з тым былі пашыраны магчымасці для адкрыцця жаночых сямікласных гімназій.

У выніку рэалізацыі школьнай рэформы значна пашырылася сетка пачатковых школ, якія было дазволена адкрываць грамадскім установам і прыватным асобам з падначаленнем іх саветам вучылішч. Адначасова над пачатковай школай узмацняўся адміністрацыйны нагляд. З гэтай мэтай у 1869 г. уводзілася пасада інспектара народных вучылішч, а ў 1874 г. – дырэктара народных вучылішч. Асаблівая ўвага надавалася развіццю сеткі царкоўнапрыходскіх школ і школ граматы, падначаленых праваслаўнаму ведамству.

Паводле Статута 1864 г. уводзіліся два тыпы гімназій: класічныя і рэальныя. У класічных вялікая ўвага надавалася вывучэнню старажытных моў і дысцыплін гуманітарнага профілю, засваенне якіх давала

права паступлення ва ўніверсітэты без уступных экзаменаў. У рэальных гімназіях павялічвалася выкладанне прыродазнаўчых дысцыплін, замежных моў. Выпускнікі маглі паступаць у вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы. У 1871 г. быў зацверджаны новы статут гімназій. Тэрмін навучання ў класічных гімназіях павялічваўся з сямі да васьмі гадоў, пашыралася выкладанне старажытных моў і матэматыкі. Рэальныя гімназіі былі пераўтвораны ў рэальныя вучылішчы, і тэрмін навучання ў іх скарачаўся з сямі да шасці гадоў. Права паступаць у вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы атрымлівалі толькі тыя, хто заканчваў сёмы дадатковы клас вучылішча.

Важнымі элементамі дзейнасці ўрадавых органаў у сферы адукацыі Беларусі 60–90-х гг. XIX ст. сталі штучнае стрымліванне развіцця вышэйшай і сярэдняй адукацыі і адначасова значнае павелічэнне колькасці пачатковых школ, адкрыццё шэрагу настаўніцкіх семінарый, дзе навучалася сельская моладзь. Нягледзячы на ўсе абмежаванні з боку ўрадавых органаў, школьная рэформа садзейнічала развіццю адукацыі і культуры.

## Рэформа гарадскога самакіравання

Падрыхтоўка праекта рэформы гарадскога самакіравання расійскім урадам была пачата ў 1862 г., аднак толькі 16 чэрвеня 1870 г., пасля неаднаразовага абмеркавання папярэдніх варыянтаў, Аляксандрам II было зацверджана і набыло моц закона новае Гарадавое палажэнне. У аснову прынятага дакумента былі пакладзены прынцыпы бессаслоўнасці і выбарнасці, заснаванай на маёмасным цэнзе. Гарадская рэформа праводзілася паэтапна, найперш у буйных велікарускіх населеных пунктах. На нацыянальных ускраінах рэформа ажыццяўлялася з перасцярогай. На беларускія і літоўскія губерні яна была пашырана з 1875 г., на тэрыторыі Латвіі і Эстоніі – у 1877 г., а ў польскіх губернях зусім не была рэалізавана. Рэформа на тэрыторыі беларускіх губерняў праводзілася пасля кансультацый Міністэрства ўнутраных спраў з губернскімі адміністрацыямі, з улікам мясцовых асаблівасцей. Кіраўніцтва губерняў выказалася за неабходнасць рэфармавання органаў гарадскога самакіравання, але лічыла абавязковым абмежаваць прадстаўніцтва ў іх яўрэйскага і польскага насельніцтва, пазбавіць магчымасці быць выбаршчыкамі палітычна нядобранадзейных асоб, прызначаць кіраўнікоў гарадскога самакіравання Міністэрствам унутраных спраў.

Для прынящця рашэння аб пашырэнні Гарадавога палажэння на беларускія і літоўскія губерні ў 1872 г. была створана камісія на чале з міністрам унутраных спраў А. Цімашовым. У выніку працы камісіі з 25 красавіка 1875 г. Гарадавое палажэнне было распаўсюджана на тэрыторыю беларускіх губерняў. Першымі права на фарміраванне органаў гарадскога самакіравання паводле новага палажэння атрымалі губернскія цэнтры. Прадастаўленне дазволу павятовым цэнтрам і іншым гарадскім паселішчам расцягнулася на некалькі гадоў. Урад устрымліваўся ад адначасовага пашырэння рэформы з-за недаверу да палітычнай лаяльнасці насельніцтва, аднак сваю адмову тлумачыў недастаткова развітым эканамічным становішчам горада.

Структурна гарадское самакіраванне паводле праведзенай рэформы складалася з гарадскіх выбарчых сходаў, якія збіраліся кожныя чатыры гады для абрання галосных (галосны – пасада ў органах гарадскога кіравання), а таксама гарадскіх дум і гарадскіх упраў. Для кантролю за дзейнасцю органаў гарадскога самакіравання стваралісся губернскія па гарадскіх справах установы. Правам голасу падчас выбараў галосных (членаў) думы карысталіся жыхары горада, якія дасягнулі 25-гадовага ўзросту і валодалі пэўным маёмасным цэнзам, не мелі запазычанасцей па зборах, не знаходзіліся пад судом і следствам, не былі пазбаўлены праў стану. З увядзеннем буржуазных прынцыпаў выбараў, звязаных з прымяненнем маёмаснага цэнзу, сацыяльная база выбаршчыкаў некалькі пашырылася, аднак яны складалі 4–6 % ад агульнай колькасці гараджан. Большасць гарадскога насельніцтва, якія не мелі неабходнага маёмаснага цэнзу – рабочыя, рамеснікі, хатняя прыслуга і г. д., – поўнасцю былі пазбаўлены права на ўдзел у выбарах у гарадскія думы.

Гарадскія думы фарміраваліся шляхам двухступеньчатых выбараў. Спачатку з ліку гараджан, якія валодалі адпаведным маёмасным цэнзам, стваралісся сходы выбаршчыкаў, якія затым выбіралі са свайго складу галосных гарадскіх дум. З улікам памераў выплачваемых гарадскіх падаткаў і адпаведна нерухомай маёмасці жыхары падзяляліся на тры групы. Кожная з іх выбірала ў думу аднолькавую колькасць галосных. Існавалі пэўныя абмежаванні ў карыстанні выбарчым правам і магчымасці быць абраным у дачыненні да яўрэяў, католікаў і жанчын. Выканаўчым органам гарадской думы, якой надавалася асноўная распараджальная роля ў структуры гарадскога самакіравання, была гарадская ўправа. Яна складалася з дзвюх-трох асоб, выбраных думай. Узначальваў управу гарадскі галава, які адначасова быў і старшынёй думы.

Дзеянне Гарадавога палажэння не датычылася прыватнаўласніцкіх гарадоў. Тут для вядзення гарадскіх спраў ствараласся спрошчанае грамадскае кіраванне, якое складалася з гарадскога старасты і яго памочнікаў (па адным прадстаўніку ад кожнай саслоўнай групы насельніцтва). Гарадскога галаву ў губернскіх цэнтрах, а нярэдка і ў іншых гарадах прызначаў міністр унутраных спраў. Мяшчане дробных мястэчак прыпісваліся да мяшчанскіх таварыстваў гарадоў ці вялікіх мястэчак. У мястэчках з колькасцю мяшчанскіх двароў больш за 10 утваралася самастойная мяшчанская ўправа, выбіраўся стараста і яго памочнік. У тых населеных пунктах, дзе налічвалася больш за 50 мяшчанскіх двароў, мясцовая грамада магла хадайнічаць аб утварэнні мяшчанскай управы.

У час рэалізацыі рэформы былі істотна зменены функцыі органаў гарадскога самакіравання. Урадавыя структуры Расійскай імперыі ва ўмовах паскарэння ўрбанізацыйных працэсаў вымушаны былі перадаць частку сваіх паўнамоцтваў мясцоваму самакіраванню, паколькі былі не ў стане аператыўна вырашаць шматлікія сацыяльныя і гаспадарчыя праблемы. У той жа час яны імкнуліся трымаць любы від грамадскай дзейнасці пад жорсткім адміністрацыйна-паліцэйскім кантролем.

Да правядзення рэформы паўнамоцтвы органаў гарадскога самакіравання былі абмежаваны зборам падаткаў і забеспячэннем своечасовага выканання павіннасцей гараджанамі. У час рэформы была павялічана самастойнасць органаў гарадскога самакіравання ў вядзенні спраў гаспадарчага характару. Гарадскія ўправы сталі займацца пытаннямі добраўпарадкавання гарадоў, супрацьпажарнымі мерапрыемствамі, наглядам за станам мясцовага гандлю і прамысловасці, аховы здароўя і адукацыі і інш. На дзейнасці органаў гарадскога самакіравання на тэрыторыі Беларусі значны адбітак наклаў ранейшы вопыт пашырэння і функцыянавання тут магдэбургскага права.

У 80-х гг. XIX ст. ва ўрадавых колах нарастала незадаволенасць дзейнасцю органаў гарадскога самакіравання, недасканаласцю Гарадавога палажэння 1870 г., адсутнасцю пільнага кантролю з боку адміністрацыі за працай выбарных органаў. Новым Гарадавым палажэннем 1892 г. была значна абмежавана самастойнасць гарадскіх дум, асабліва ў магчымасці заключаць падрады, набываць маёмасць, і скарочана колькасць гарадскіх выбаршчыкаў за кошт павелічэння маёмаснага цэнзу, абмежавання выбарчых праў яўрэйскага насельніцтва. Склад гарадскіх дум быў зменшаны. Паводле новага палажэння гарадскі га-

лава быў абавязаны знаёміць губернатара з пералікам пытанняў для абмеркавання на чарговым пасяджэнні думы. Значна павялічвалася колькасць пытанняў, пастановы па якіх патрабавалі зацвярджэння міністрам унутраных спраў або губернатарам. Органы гарадскога самакіравання фактычна сталі часткай сістэмы дзяржаўных устаноў; у сувязі з гэтым з новага палажэння знікла ўказанне, што гарадскія ўлады дзейнічаюць самастойна. Галосны не мог вынесці на разгляд думы пытанне, папярэдне не падаўшы пісьмовую заяву старшыні. Аднак у новым палажэнні не былі закрануты асноўныя прынцыпы пабудовы і структура гарадскога самакіравання.

У 90-х гг. XIX ст. толькі на 15 гарадоў Беларусі было распаўсюджана Гарадавое палажэнне 1892 г. у поўным аб'ёме. У астатніх з-за недастатковасці сродкаў і гандлёва-прамысловага развіцця не выбіраліся гарадскія думы, а ствараліся толькі ўправы. К канцу XIX ст. органы гарадскога самакіравання значна павысілі выніковасць сваёй дзейнасці па наладжванні амбулаторнага лячэння гараджан, паляпшэнні санітарнага стану населеных пунктаў, адкрыцці пачатковых і прафесійных школ і інш., нягледзячы на тое, што сацыяльныя праекты фінансаваліся па астаткавым прынцыпе і складалі невялікую частку гарадскіх бюджэтаў.

## Цэнзурная рэформа

Рэформа цэнзуры была праведзена ў 1865 г., калі былі зацверджаны новыя Часовыя правілы аб цэнзуры і друку. Яны крыху пашыралі магчымасці друку, абмяжоўвалі самавольства ўлад у галіне выдавецкай справы. Адмянялася папярэдняя цэнзура для кніг вялікага памеру (10 друкаваных аркушаў і больш за 20 – для перакладных выданняў). Аднак масавыя перыядычныя выданні для шырокага кола чытачоў павінны былі праходзіць папярэднюю цэнзуру. Яны маглі быць вызвалены ад яе толькі спецыяльным дазволам міністра ўнутраных спраў пры ўмове ўнясення вялікага грашовага закладу. Адсутнасць папярэдняй цэнзуры азначала судовую адказнасць выдаўца за змест перыядычнага выдання.

Для правінцыяльных масавых выданняў, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі, захоўвалася папярэдняя цэнзура. Дзяржаўныя ўлады ўтрымлівалі за сабой права накладваць штрафы, прыпыняць і нават закрываць выданні, якія займалі непажаданую пазіцыю. У 1873 г. міністру

ўнутраных спраў было дазволена прыпыняць любое выданне. Праз шэсць гадоў такія паўнамоцтвы атрымалі і генерал-губернатары. Улады абмяжоўвалі выдачу дазволаў на адкрыццё новых перыядычных выданняў, перш за ўсё незалежных ад урадавых устаноў. Яшчэ доўгі час перыядычны друк абмяжоўваўся нешматлікімі афіцыйнымі выданнямі. Цэнзурная рэформа была найбольш непаслядоўнай з праведзеных у 60–70-х гг. XIX ст. пераўтварэнняў.

У 1882 г. цэнзура стала больш жорсткай, што знайшло адлюстраванне ў новай рэдакцыі Часовых правіл аб цэнзуры і друку. Паводле гэтых правіл нарада ў складзе трох міністраў (унутраных спраў, асветы і юстыцыі) і обер-пракурора Сінода магла забараніць выхад любога выдання. Пэўнае паслабленне цэнзуры адбылося толькі ў перыяд рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. Цэнзурны статут забараняў крытыкаваць на старонках перыядычных выданняў асобу манарха і членаў яго сям'і, а таксама дзейнасць урада і мясцовых органаў улады.

Земская рэформа была распаўсюджана на тэрыторыі Беларусі толькі ў 1911 г. і закранула Віцебскую, Мінскую і Магілёўскую губерні. Урад непакоіла магчымае ўзмацненне польскага ўплыву ў земскіх выбарных органах. Гэта стала прычынай адсутнасці земстваў у Віленскай і Гродзенскай губернях, дзе значнай была ўдзельная вага насельніцтва каталіцкага веравызнання. Земствы адыгралі пэўную ролю ў развіцці школьнай адукацыі, медыцынскага і ветэрынарнага абслугоўвання, гаспадарчага жыцця і г. д.

Рэалізацыя буржуазных рэформ для Расійскай імперыі стала вельмі важнай вехай на шляху да станаўлення грамадзянскай супольнасці, росту пачуцця грамадзянскасці розных пластоў насельніцтва. Новымі элементамі грамадска-палітычнага жыцця былі міравыя пасрэднікі, галосныя гарадскіх дум, прысяжныя павераныя і інш. Прадстаўнікі мясцовых эліт беларускіх губерняў часцей за дваранскія асяродкі шэрагу іншых рэгіёнаў імперыі з вялікай надзеяй і спадзяваннем успрымалі падрыхтоўку і правядзенне рэформ. Многія са спаланізаванай грамадскасці хацелі бачыць у іх магчымасць вяртання да нядаўна страчаных палітычных традыцый, верылі ў наяўнасць агульных рыс з ранейшымі традыцыямі арганізацыі судовай сістэмы, гарадскога самакіравання і інш. Аднак урад Расійскай імперыі з вялікай перасцярогай ставіўся да памераў рэалізацыі буржуазных рэформ у беларускіх губернях. Галоўны акцэнт быў зроблены ў канчатковым выніку не на інтэграцыйным змесце рэформ, а на сегрэгацыі палякаў, беларусаў-католікаў, яўрэяў.

Тэма 4

# УРАДАВАЯ ПАЛІТЫКА

**Асаблівасці эканамічнай і саслоўнай палітыкі ў Беларусі. Абмежаванні ў дачыненні да палякаў, беларусаў-католікаў, яўрэяў.**
**Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі па нацыянальным і рэлігійным пытаннях.**

Урадавая палітыка на тэрыторыі беларускіх губерняў у наступныя пасля падаўлення паўстання 1863 г. дзесяцігоддзі знаходзілася пад уплывам неабходнасці вырашэння наспелага нацыянальна-рэлігійнага пытання, умацавання «русских основ» на заходніх ускраінах Расійскай імперыі. Агульнай мэце былі падпарадкаваны практычна ўсе ўрадавыя мерапрыемствы, што абумовіла надзвычай цесную ўзаемасувязь розных кірункаў дзяржаўнай палітыкі.

## Асаблівасці эканамічнай і саслоўнай палітыкі ў Беларусі. Абмежаванні ў дачыненні да палякаў, беларусаў-католікаў, яўрэяў

Урадавая палітыка на тэрыторыі Беларусі нярэдка вызначалася неадназначнасцю прынятых рашэнняў, наяўнасцю розных падыходаў і супярэчнасцей паміж цэнтральнымі

органамі і мясцовай адміністрацыяй. Нават у перыяд паўстання 1863 г. і адразу пасля яго, калі для расійскага ўрада стала зразумелай неабходнасць сістэмнай і паскоранай русіфікацыі заходніх ускраін, сярод вышэйшага чыноўніцтва сфарміраваліся два падыходы. Першы ўвасабляўся групоўкай, якая атрымала назву «руская партыя» (віленскі генерал-губернатар М. М. Мураўёў, ваенны міністр Д. А. Мілюцін, міністр дзяржаўных маёмасцей А. А. Зялёны і інш.). Другі – «партыяй касмапалітаў» (міністр унутраных спраў П. А. Валуеў, вялікі князь Канстанцін Мікалаевіч, міністр народнай асветы А. В. Галаўнін, кіраўнік жандармаў князь В. А. Даўгарукаў, пецярбургскі генерал-губернатар князь А. А. Сувораў і інш.). Для іх былі характэрны прынцыпова розныя падыходы да выпрацоўкі метадаў інтэграцыі беларускіх і літоўскіх губерняў з велікарускім цэнтрам. М. М. Мураўёў сумняваўся ў магчымасці сталага сацыяльнага супрацоўніцтва ўрадавых органаў з мясцовым польскім і каталіцкім дваранствам, рабіў стаўку на праваслаўнае сялянства і ў яго інтарэсах праводзіў аграрныя мерапрыемствы. П. А. Валуеў, наадварот, зыходзіў з саслоўнага прынцыпу фарміравання ўнутранай палітыкі, лічыў, што беларускае і літоўскае спаланізаванае дваранства павінна разглядацца як сацыяльная апора самадзяржаўя. Аднак для магчымасці ўплыву ўрада на мясцовае дваранства П. А. Валуеў прапаноўваў выкарыстоўваць праваслаўнае сялянства ў якасці стрымліваючага фактару, умацоўваючы яго супярэчнасці з памешчыкамі-католікамі.

Рэалізацыя ўрадавай палітыкі ў дачыненні да Беларусі вызначалася ў большай ступені спецыфічнымі, чым агульнымі з еўрапейскім цэнтрам Расійскай імперыі рысамі. Гэта было абумоўлена неабходнасцю змагання расійскага самадзяржаўя з польскімі нацыянальна-палітычнымі ўплывамі, а таксама ўсталяваннем рэжыму выключных законаў, асабліва ў дачыненні да каталіцкага і яўрэйскага насельніцтва. Яны ўключалі перш за ўсё абмежавальныя меры ўрада ў сферы землеўладання і землекарыстання, прынятыя ў час і адразу пасля падаўлення паўстання 1863 г.

Абмежаванне праў па валоданні зямлёй асобамі польскага паходжання ўпершыню зафіксавана ў цыркуляры міністра дзяржаўных маёмасцей А. Зялёнага ад 25 лютага 1864 г. Законам ад 5 сакавіка 1864 г. «асобам польскага паходжання» і яўрэям у заходніх і паўднёва-заходніх губернях Расійскай імперыі было забаронена купляць казённыя і прыватныя землеўладанні, прададзеныя за даўгі. Ім не дазвалялася таксама набываць, прымаць у заклад, кіраванне, здаваць у арэнду зем-

лі, купленыя на ільготных умовах. Для набыцця прыватных зямельных уладанняў, якія прадаваліся на агульных умовах, абазначаныя ў прыведзеным законе асобы не мелі права карыстацца ільготамі і пазыкамі. Такое права для набыцця канфіскаваных маёнткаў удзельнікаў паўстання 1863 г. мелі прыезджыя памешчыкі і чыноўнікі з цэнтральных губерняў Расійскай імперыі і мясцовыя буйныя праваслаўныя землеўласнікі. Праводзілася мэтанакіраваная палітыка па скарачэнні памераў землеўладання памешчыкаў-католікаў і пашырэнні рускага, пераважна буйнога, землеўладання. Адпаведна Закону ад 10 ліпеня 1864 г., а таксама распараджэнню ад 5 жніўня 1864 г. яўрэі ў межах аседласці наогул былі пазбаўлены права набываць зямлю. Законам ад 10 снежня 1865 г. «асобам польскага паходжання» таксама было забаронена набываць ва ўласнасць маёнткі. Выключэнне складалі ўладанні, якія перадаваліся ў спадчыну. Абмежаванне ўводзілася да таго часу, пакуль у заходніх губернях у дастатковай ступені не павялічыцца рускае землеўладанне. Да набыцця маёнткаў дапускаліся «асобы рускага паходжання, праваслаўнага ці пратэстанцкага веравызнання». Акрамя таго, усе высланыя з заходніх губерняў за ўдзел ці дачыненне да паўстання 1863 г. на працягу двух гадоў павінны былі прадаць ці абмяняць свае маёнткі на ўмовах, якія б іх задавальнялі.

Рэалізацыя абмежавальных мерапрыемстваў на практыцы характарызавалася шэрагам складанасцей. Тэрмін «асоба польскага паходжання» ў дакументах не заўсёды меў акрэслены змест, што дазволіла значнай колькасці польскіх арыстакратаў абысці закон дзякуючы сувязям пры двары імператара ці ва ўрадавых структурах. Тыя рускія землеўласнікі, якія на ільготных умовах набылі канфіскаваныя маёнткі ці казённыя землі, не мелі права заключаць іпацечныя дамовы з палякамі і яўрэямі, аддаваць ім уладанні ў арэнду ці наймаць у якасці кіраўнікоў. Гэта ставіла рускіх землеўласнікаў, якія кепска ведалі мясцовыя ўмовы вядзення гаспадаркі, у нязручныя эканамічныя ўмовы. У выніку нямногія затрымліваліся надоўга ў сваіх новых уладаннях. Акрамя таго, абмежавальныя мерапрыемствы садзейнічалі памяншэнню кошту зямлі, скарачэнню яе вольнай куплі-продажу, маргіналізацыі часткі каталіцкіх землеўласнікаў, вылучэнню сярод іх тых, хто займаўся разумовай працай, быў схільны да ўспрымання шкодных для расійскай дзяржавы ідэй. У той жа час уведзеныя абмежавальныя мерапрыемствы ў дачыненні да асоб польскага паходжання і яўрэяў не ўлічвалі ўсяго багацця форм зямельных адносін у заходніх губернях і запатрабавалі ў будучым выдання шматлікіх тлумачэнняў. Акра-

мя таго, католікі і яўрэі на тэрыторыі беларускіх губерняў знаходзілі шматлікія абыходныя шляхі набыцця зямельных уладанняў.

У мэтах пашырэння рускага землеўладання ў 1866 г. было заснавана таварыства пакупнікоў маёнткаў у заходніх губернях з устаўным капіталам 5 млн руб. Сваю задачу таварыства рэалізоўвала вельмі павольна, паколькі знаходзілася няшмат жадаючых з ліку асоб рускага паходжання набываць зямлю на публічных таргах. Секвестраваныя маёнткі ў заходніх губернях траплялі пад распараджэнне Міністэрства дзяржаўнай маёмасці, якое прадавала іх на ільготных умовах без таргоў. Аднак ужо ў 1875 г. Камітэт міністраў Расійскай імперыі вымушаны быў прызнаць, што «маёнткі, набытыя рускімі, прыйшлі да заняпаду, таму што ўладальнікі іх часта мяняліся, весці гаспадарку самастойна не жадалі». Пасля таго як былі вычарпаны магчымасці ільготнага распродажу зямель, Міністэрства дзяржаўнай маёмасці з 1887 г. перастала выдаваць пасведчанні на права атрымання ільгот і пазык пры куплі зямлі на тэрыторыі заходніх губерняў. Адначасова было скасавана і таварыства пакупнікоў маёнткаў.

За наступныя некалькі дзесяцігоддзяў пасля прыняцця Закона 1865 г. толькі невялікай колькасці дваран-католікаў па асабістым рашэнні імператара было дазволена набыць зямлю. Абсалютная большасць з іх непасрэдна працавалі на зямлі, некаторыя атрымалі дазвол за ўдзел у руска-турэцкай вайне 1877–1878 гг. Да канца XIX ст. у канцылярыі імператара назбіралася вялікая колькасць хадайніцтваў на набыццё зямлі ад католікаў беларускіх губерняў. 3 сакавіка 1899 г. міністру ўнутраных спраў было даручана непасрэдна прымаць станоўчыя рашэнні па такіх справах, але пры ўмове, што прасіцелі самі будуць гаспадарыць на зямлі. Аднак колькасць зямлі, што знаходзілася ва ўласнасці прасіцеля, разам з набываемай не павінна была перавышаць 60 дзесяцін на сям'ю.

Дваране-католікі знаходзілі спосабы абысці забарону на набыццё зямлі. Нярэдка яны куплялі ўладанні на імя акцыянерных таварыстваў або падстаўных асоб, часам давалі пазыкі рускім землеўласнікам пад заклад маёнткаў і фактычна станавіліся іх уласнікамі. З мэтай недапушчэння гэтага былі прыняты новыя правілы ад 27 снежня 1884 г.

Пэўным адступленнем ад абмежавальных мерапрыемстваў у дачыненні да яўрэяў стаў указ ад 8 снежня 1867 г., паводле якога яўрэям было дазволена з'яўляцца арандатарамі або аканомамі млыноў і заводаў пры маёнтках у заходніх губернях. Гэта мера садзейнічала актывізацыі эканамічнага жыцця на тэрыторыі Беларусі. Аднак у пачатку

80-х гг. XIX ст. урад вярнуўся да паслядоўнай палітыкі абмежаванняў. У маі 1882 г. яўрэям у межах аседласці было забаронена пастаянна жыць па-за гарадамі і мястэчкамі, а таксама арандаваць, прымаць у заклад і кіраваць нерухомай маёмасцю. Адносна эфектыўнасці прымянення падобных абмежавальных мерапрыемстваў буйны землеўласнік Мінскай губерні Э. Вайніловіч адзначаў: «Яўрэі, якіх застаў у вёсках закон 1882 года, пражывалі на так званых запушчаных пляцах і ўчастках, якія засталіся за памешчыкам пасля надзялення сялян; яны там пражывалі як трымальнікі патэнтных ці беспатэнтных кабакоў, якія здаваліся ў арэнду заўсёды па пісьмовых дамовах. Пасля 3 мая 1882 г. вотчыннаму ўладальніку пустэчаў і карчомных пабудоў заставалася адно з двух: ці прыбраць яўрэя з пабудоў і сядзібы, ці ігнараваць закон і дазволіць яўрэю жыць на ранейшых умовах. Большасць уладальнікаў выбрала гэты другі выхад не толькі па прычыне дабрадушнасці і спагады да пастаўленых па-за законам, што, аднак, часта магло мець месца, паколькі нярэдка некалькі пакаленняў так званых шынкароў зжылося і несла службу столькім жа пакаленням вотчыннікаў». Часта высяленне яўрэя было немагчымым з прычыны фінансавай залежнасці вотчынніка ад шынкара як крэдытора ці паслужлівага фактару. На практыцы аказвалася, што гэта было адзінапрымальнае выйсце для землеўласніка, паколькі ў іншым выпадку ён вымушаны быў гадамі судзіцца з арандатарамі.

У 1887 г. забарона на набыццё зямлі ў сельскай мясцовасці (за выключэннем Магілёўскай губерні) распаўсюджвалася на замежных грамадзян. Прынятыя меры былі скіраваны на прадухіленне канкурэнцыі для мясцовых памешчыкаў з боку яўрэйскай буржуазіі і іншаземцаў з мэтай захавання буйнога латыфундыяльнага землеўладання. Абмежавальныя законы ў дачыненні да рассялення яўрэяў прывялі таксама да іх штучнай канцэнтрацыі ў гарадах і мястэчках Беларусі, колькаснай перавагі яўрэяў сярод гарадскога пралетарыяту і гандлёва-прамысловага насельніцтва. Яны адбіліся на ўзроўні канцэнтрацыі прадпрыемстваў і дэфармавалі структуру прамысловай і гандлёвай буржуазіі, пралетарыяту, затрымлівалі іх кансалідацыю як сацыяльных груп. Законы перашкаджалі вольнай куплі-продажу зямлі, садзейнічалі захаванню дваранскага землеўладання ў беларускіх губернях.

Увядзенне абмежаванняў для яўрэяў у межах аседласці спалучалася з выданнем у 60–70-х гг. XIX ст. шэрагу законаў, якія дазвалялі вольны выбар месца жыхарства для іўдзеяў з вышэйшай адукацыяй, вучонымі ступенямі, а з 1879 г. – для памочнікаў аптэкараў, дантыстаў,

фармацэўтаў і інш. Пазней гэтыя законы нярэдка парушаліся адміністрацыяй губерняў. У 1887 г. была ўведзена працэнтная норма для паступлення яўрэяў спачатку ў сярэднія, а потым і вышэйшыя навучальныя ўстановы ў памеры 10 % у межах аседласці, 5 – па-за яе межамі, 3 % – у сталіцах. У пачатку 80-х гг. XIX ст. актывізавалася яўрэйская эміграцыя з Расійскай імперыі, якая віталася ўрадам. Тым, хто пакідаў межы краіны, было забаронена вяртацца назад.

Кантынгент чыноўнікаў у Беларусі другой паловы XIX ст. фарміраваўся ў асноўным за кошт прысланых з унутраных губерняў Расіі дзяржаўных служачых. Яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. П. Баброўскі адзначаў, што многія пасады ў вышэйшай адміністрацыі Гродзенскай губерні займалі рускія чыноўнікі, якія «не зліваюцца з мясцовым чыноўніцтвам». Для апошняга заставаліся сярэднія і ніжэйшыя пасады ў адміністрацыі. З 1863 па 1865 г. у беларускіх губернях было прызначана на службу звыш 4600 новых чыноўнікаў. Пераважная большасць іх з'яўляліся ўраджэнцамі цэнтральных губерняў Расійскай імперыі. З мэтай «утрымання» запрошаных чыноўнікаў на новым месцы ім на ільготных умовах прадаваліся казённыя і канфіскаваныя маёнткі, устанаўліваліся павышаныя аклады. Так, у 1866–1873 гг. у Віленскай, Мінскай і Гродзенскай губернях 300 чыноўнікаў купілі 320 зямельных уладанняў агульнай плошчай 146,3 тыс. дзесяцін. Наогул, служба ў заходняй частцы Расійскай імперыі лічылася найбольш выгаднай і прывілеяванай. Указам імператара ад 5 сакавіка 1864 г. устанаўлівалася 50-працэнтная надбаўка да аклада рускім чыноўнікам у беларускіх і Ковенскай губернях за кошт кантрыбуцыйных збораў з памешчыцкіх уладанняў. Праўда, далёка не заўсёды прынятыя ільготы апраўдваліся. Нярэдка губернатары скардзіліся на тое, што прыезджыя чыноўнікі часта не мелі высокіх маральных і прафесійных якасцей. Ахвочымі да прапанаваных прывілеяў былі чыноўнікі авантурыстычнага складу, і гэта стварала аўтарытэт расійскім уладам сярод мясцовага грамадства.

Да канца 60-х гг. XIX ст. на тэрыторыі беларускіх губерняў больш паслядоўна, чым у Царстве Польскім, былі праведзены мерапрыемствы па звальненні ці пераводзе ў іншыя месцы «асоб польскага паходжання» з адміністрацыйных, судовых, навучальных устаноў.

Па нацыянальным складзе, у адпаведнасці з данымі перапісу насельніцтва 1897 г., сярод тых, хто ў беларускіх губернях у якасці асноўнага занятку абазначыў працу ў адміністрацыі, судзе, паліцыі, 32,3 % складалі беларусы, 48,3 – рускія, 12,1 – палякі, 1,2 % – яўрэі і інш. Тут улічана толькі самадзейнае насельніцтва, без членаў сямей. Сярод чы-

ноўнікаў, якія знаходзіліся на грамадскай і саслоўнай службе, удзельная вага беларусаў была значна вышэй – 48,0 %, рускіх налічвалася 25,9 %, палякаў – 9,9, яўрэяў – 9,1 %.

Урадавая палітыка ў дачыненні да дваранства Беларусі змянялася ў залежнасці ад нацыянальна-канфесійнай прыналежнасці яго прадстаўнікоў, пашырэння польскага нацыянальнага і рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху у Расійскай імперыі, змен у адносінах дваранства да ўрадавых мерапрыемстваў, а таксама стаўлення ўрада да сялянства і асабліва ад рэалізацыі рэформы 1861 г. і аграрнага заканадаўства.

Першыя гады пасля падаўлення паўстання 1863 г. вызначаліся недаверам расійскай улады да каталіцкага дваранства, рэпрэсіўнымі мерамі, некаторым абмежаваннем саслоўных праў. Мясцовае дваранства было падзелена ўрадам на часткі. Большасць дваранства – каталіцкага веравызнання, палякі – лічыліся нядобранадзейнымі ў палітычных адносінах, меншасць – праваслаўнага веравызнання, нямецкія памешчыкі, дваране прыбалтыйскага паходжання – былі прызнаны апорай самадзяржаўя.

Імкненне ўрада пазбавіцца ад палітычна нядобранадзейнай і эканамічна беднай часткі вышэйшага саслоўя, выключыць дробную шляхту, прымусіць яе плаціць падаткі, выконваць рэкруцкую павіннасць прывяло да выдання ўказа ад 19 кастрычніка 1831 г. аб «разборы шляхты», паводле якога ўтвараліся ў пэўным сэнсе штучныя і, як аказалася, часовыя саслоўныя групы для не зацверджанай у дваранстве шляхты – аднадворцаў і грамадзян заходніх губерняў. У 1857 г. быў выдадзены ўказ «Аб уладкаванні быту асоб з былой шляхты, не зацверджаных у дваранстве і прапусціўшых тэрміны для запісу ў аклад», паводле якога абазначаныя асобы павінны былі быць прылічаны ў залежнасці ад месца пражывання да дзяржаўных сялян, ці да вольных людзей, ці да мяшчанскага саслоўя. Магчымасці прыпіскі да аднадворцаў ці грамадзян ужо не існавала.

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. урад вярнуўся да палітыкі прыпіскі да падатковых саслоўяў беззямельнай і неаселай шляхты, якая праявіла актыўнасць у нацыянальным руху. Указам імператара ад 23 верасня 1864 г. былі прыняты меры па канчатковым завяршэнні спраў шляхты, якая працягвала даказваць сваю прыналежнасць да дваранскага саслоўя. Усе, хто не быў зацверджаны ў сваёй прыналежнасці да дваранства і не знаходзіўся на дзяржаўнай службе, не меў чыноў і званняў, абавязаны былі да 1 студзеня 1865 г. прыпісацца да аднаго з падатковых саслоўяў і выконваць павіннасці адпаведна новаму стану.

У той жа час за шляхтай пакідалася права даказваць сваю дваранскую годнасць. Такое права атрымалі ўсе, хто ўжо меў станоўчае рашэнне дваранскага дэпутацкага сходу, чые справы знаходзіліся на разглядзе ў Дэпартаменце герольдыі. Усе справы, па якіх дваранскімі дэпутацкімі сходамі не было прынята станоўчае рашэнне, лічыліся канчаткова завершанымі. Узнаўленне спраў было магчымым толькі па сведчанні грамады, да якой быў прыпісаны былы шляхціц, аб добранадзейнасці і спраўным на працягу трох гадоў выкананні павіннасцей, а таксама па прадстаўленні пасведчання аб непазбаўленні праў па законе.

У 1868 г. катэгорыі аднадворцаў і грамадзян былі ліквідаваны і ўключаны ў склад сялянскага і мяшчанскага саслоўяў. Яны былі пазбаўлены асобага прававога статусу. Рэалізацыя палітыкі «разбору шляхты» ўкладвалася ў агульную ўрадавую лінію на павышэнне патрабаванняў да атрымання дваранскай годнасці асобамі недваранскага паходжання, якая выразна акрэслілася пачынаючы з 1845 г. У выніку «разбору шляхты» гэта саслоўе юрыдычна страчвала сваё ранейшае палажэнне. Аднак прадстаўнікі дробнай шляхты, не зацверджаныя ў сваёй прыналежнасці да вышэйшага саслоўя, псіхалагічна не маглі і не хацелі адаптавацца да ўмоў падатковых саслоўяў і фактычна склалі значную маргінальную групу. Дробная шляхта не адмаўляла сістэму норм і каштоўнасцей саслоўнай групы, з якой яна паходзіла, не прымала звычаі і традыцыі суседняга вясковага насельніцтва, прадстаўнікоў падатковых саслоўяў. «Разбор» практычна не закрануў дробную шляхту татарскага паходжання. Яна пакідалася ў дваранскіх спісах, калі нават не была зацверджана герольдыяй, захоўвала прывілей дваранскага саслоўя. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што татарская шляхта была лаяльнай да ўрада, не ўдзельнічала ў польскім нацыянальна-вызваленчым руху.

Мерапрыемствы па «разборы шляхты» аказаліся недастаткова эфектыўнымі, рэалізацыя гэтай палітыкі расцягнулася на дзесяцігоддзі і выклікала супраціўленне з боку шляхты, масавую падробку дакументаў, злоўжыванні ў дваранскіх сходах. Нават у 1864 г. у Віленскай губерні налічвалася 20 019 дваран, якія мелі нейкую ўласнасць, і 32 611 дваран, якія не валодалі ніякай нерухомай маёмасцю, г. зн. прадстаўнікоў дробнай шляхты. Перавод не зацверджанай у дваранстве шляхты на справе сустракаў нямала перашкод у асяроддзі мясцовых чыноўнікаў. У 1867 г. віленскім генерал-губернатарам Э. Баранавым была створана камісія для раскрыцця злоўжыванняў пры выдачы дакументаў Віленскім дваранскім дэпутацкім сходам. За два гады дзейнасці камісія

высветліла факты выдачы дакументаў аб дваранскім званні асобам, не зацверджаным у прыналежнасці да вышэйшага саслоўя. Акрамя таго, выдаваліся копіі пастаноў дэпутацкага сходу аб далейшым накіраванні ў Сенат дакументаў на зацвярджэнне ў прыналежнасці да дваранства прыватным асобам, якія потым карысталіся правамі вышэйшага стану і ў выпадку незацвярджэння ў прыналежнасці да дваранства ўхіляліся ад прыпіскі да падатковых саслоўяў. Павятовыя прадвадзіцелі дваранства, маючы неправераныя дваранскія сямейныя спісы, выдавалі пасведчанні аб прыналежнасці да вышэйшага саслоўя.

Даволі часта прадстаўнікі малазямельнай і беззямельнай шляхты зараблялі сродкі для ўласнага існавання праз службу ў дзяржаўных установах. Паступова такая шляхта страчвала сувязі са сваім асяроддзем і традыцыямі, пераходзячы па сацыяльным становішчы ў разрад разначынцаў. З гэтай групы ў значнай меры фарміравалася мясцовая інтэлігенцыя. Чыноўніцкая і вайсковая служба была папулярнай менавіта сярод дробнай шляхты, якая бачыла ў ёй шлях да захавання свайго сацыяльнага статусу і паляпшэння становішча. Сярод заможнай шляхты дзяржаўная служба была непапулярнай.

Паказчыкамі эфектыўнасці ўрадавай палітыкі па ўмацаванні «рускай справы» да канца XIX ст. сталі пашырэнне ўдзельнай вагі праваслаўнага землеўладання на тэрыторыі беларускіх губерняў да 45 %, скарачэнне каталіцкага прыкладна да 50 %. Сярод уладальнікаў маёнткаў памерам больш за 200 дзесяцін праваслаўныя колькасна пераважалі ў Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай губернях. У Віленскай губерні землеўласнікі-католікі захоўвалі пераважную большасць, ім належалі 73 % зямлі. Якасны склад «рускага элемента» сярод землеўласнікаў выклікаў клопат у мясцовай адміністрацыі. Нямногія з рускіх уладальнікаў маёнткаў стала займаліся ўласнай гаспадаркай. Звычайнай справай было парушэнне імі забароны на передачу маёнткаў у арэнду католікам і яўрэям. У сваю чаргу, рэзкі рост цэн на зямлю ў апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. дазволіў многім буйным землеўласнікам-католікам захаваць сваё становішча і прэстыж.

У залежнасці ад адносін улад да дваранства Беларусі адбываліся перамены ва ўрадавай палітыцы ў дачыненні да сялянства. Адмена ва ўмовах паўстання 1863 г. часоваабавязаных сялян і іх перавод у разрад уласнікаў прымусілі ўрад тэрмінова вырашаць пытанні забеспячэння сялян палівам, размежавання памешчыцкіх і сялянскіх угоддзяў, а таксама сервітутнае пытанне. Памешчыкі пасля адмены часоваабa-

вязаных нярэдка пераставалі забяспечваць сялян і лічылі, што апошнія трацілі права на сервітуты. У 1863 г. урад быў зацікаўлены ў спакоі вёскі і ў сувязі з гэтым пайшоў на ўступкі сялянству. Згодна з распараджэннем віленскага генерал-губернатара за сялянамі захоўвалася права атрымання паліва ад памешчыкаў па ўстаноўленай плаце ці за павіннасці. Урад таксама забараніў у Беларусі і Літве абавязковае размежаванне ўгоддзяў па жаданні памешчыка і захаваў за сялянамі права на сервітуты. Пасля 1864 г., калі паўстанне станавілася ўсё больш аддаленай гістарычнай падзеяй, урад спыніў уступкі сялянству. Ужо ў канцы 60-х гг. XIX ст. мясцовая адміністрацыя прапаноўвала ў выпадках несупадзення памераў надзелаў сялян у сапраўднасці і паводле выкупнога акта браць за аснову апошні паказчык, што фактычна пазбаўляла беларускіх сялян права на іх дарэформенны надзел. Сялянам прапаноўвалася заключаць з памешчыкамі пагадненні аб перадачы першым лішкаў зямлі супраць выкупных дакументаў за дадатковыя выкупныя плацяжы. У такім выпадку складаўся дадатковы акт. Калі ж землеўладальнік не пагаджаўся на вяртанне зямлі, то яе адразалі на карысць памешчыка.

На рубяжы 70–80-х гг. XIX ст. урад зноў праявіў пэўную гнуткасць у сялянскім пытанні і ўлічыў некаторыя бяскрыўдныя для памешчыкаў патрабаванні сялян. Не парушаючы праў памешчыкаў, у канцы 70–80-х гг. XIX ст. была зменена падатковая сістэма, устаноўлены абавязковы выкуп зямлі для ўсіх сялян. Для змяншэння колькасці малазямельных спрабавалі стварыць умовы для перасялення сялян на вольныя землі і арганізаваць крэдыт для набыцця зямлі. Акрамя таго, прадугледжвалася ліквідацыя сервітутаў і ўладкаванне зямельнага пытання для дробных катэгорый сельскага насельніцтва. У 1882 г. быў створаны Сялянскі пазямельны банк для арганізацыі крэдыту для сялян, аказання дапамогі ў набыцці зямлі. У 1886 г. у Мінску адкрыта аддзяленне гэтага банка, што з вялікай надзеяй было сустрэта ліберальнымі коламі мясцовага грамадства. Аднак не вельмі выгадна было карыстацца паслугамі банка нават заможным сельскім жыхарам. З-за вялікіх працэнтных ставак дорага абыходзілася зямля, купленая праз банк, у параўнанні з яе рынкавым коштам.

Сяляне былі абцяжараны вялікімі выкупнымі плацяжамі і падаткамі. У сувязі з гэтым неаднаразова ўздымалася пытанне аб спісанні нядоімак. 21 лютага 1884 г. быў прыняты закон, паводле якога зніжаліся выкупныя плацяжы з сялян Магілёўскай і беларускіх паветаў Віцебскай

губерні. Па Законе ад 18 мая 1882 г. у Расійскай імперыі паступова адмяняўся падушны падатак.

У 70–90-х гг. XIX ст. у адносінах да сялянства для карысці памешчыкаў праводзілася палітыка стрымлівання паўперызацыі вёскі, ускладнення адрыву ад зямлі сялянства, захавання сельскай грамады. На гэта былі нацэлены Закон ад 14 снежня 1893 г. аб неадчужэнні сялянскіх надзельных зямель і Закон аб сельскагаспадарчых рабочых ад 12 чэрвеня 1896 г., якія часткова аднавілі пазаэканамічную залежнасць сялян ад памешчыкаў.

Такім чынам, пад уплывам напружанасці польскага нацыянальна-вызваленчага руху і палітычнай сітуацыі ў краіне змянілася палітыка і адносіны ўрада ў дачыненні да розных сацыяльных груп, перш за ўсё сялянства і дваранства. Зычайна яны знаходзіліся ў супрацьлеглай залежнасці. Аднак дваранства любога веравызнання заставалася сацыяльнай апорай ва ўрадавай палітыцы.

## Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі па нацыянальным і рэлігійным пытаннях

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. расійскі ўрад перайшоў да фарсіраванай уніфікацыі нацыянальных ускраін імперыі, у тым ліку ў сацыяльна-саслоўнай і этнакультурнай сферах. Гэтаму аб'ектыўна садзейнічалі разгортванне паскоранай мадэрнізацыі, узмацненне працэсаў сацыяльнай і тэрытарыяльнай мабільнасці жыхароў, паглыбленне ўрбанізацыі грамадства.

На менталітэт і самасвядомасць мясцовага дваранства беларускіх губерняў істотны ўплыў аказвалі дзяржаўна-палітычныя традыцыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, вопыт ранейшай саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі. Юрыдычна маючы аднолькавыя правы расійскага дваранства, але будучы больш арганізаваным і палітычна спрактыкаваным, спаланізаванае вышэйшае саслоўе беларускіх губерняў аказвала значны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё Расійскай імперыі. Нават у перыяд паўстання 1863 г. расійскія ўлады, абмяркоўваючы пытанне аб месцах высылкі ўдзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху, непакоіліся з прычыны магчымага пашырэння ў месцах высылкі радыкальных ідэй, значнага ўплыву спаланізаваных пасяленцаў на мясцовае культурна-асветніцкае жыццё.

У сувязі з паўстаннем 1863 г. у беларускіх губернях была прыпынена дзейнасць дваранскіх сходаў – саслоўных выбарных органаў, а таксама закрыты дваранскія вучылішчы, заканчэнне якіх давала права паступаць на дзяржаўную службу. У дваранскія вучылішчы паступалі пераважна дзеці маламаёмаснай шляхты, якая выклікала ва ўрадзе асаблівую заклапочанасць сваёй сацыяльнай актыўнасцю. Былі ўведзены абмежаванні пры паступленні каталікаў у вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы. Дваранства Беларусі ў час дзеяння ваеннага становішча не мела права збірацца разам па некалькі чалавек, нават на сямейныя ўрачыстасці, без асобага дазволу мясцовых улад. З 1863 г. на ўсе маёнткі заходніх губерняў быў накладзены кантрыбуцыйны збор у памеры 10 % ад прыбытку. У 1864 г. ён быў паменшаны да 5 %. Штрафы і кантрыбуцыйныя зборы захоўваліся да 1897 г. Яны спачатку накладваліся бескантрольна і пераўтварыліся ў крыніцу дадатковых даходаў мясцовых улад, але па распараджэнні з 1866 г. прызначаліся толькі са згоды губернатара і генерал-губернатара.

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. абвастрылася пытанне аб становішчы каталіцкай царквы ў Расійскай імперыі. Быў прыняты шэраг мер па ўстанаўленні больш жорсткага кантролю за каталіцкім духавенствам і манастырамі ў заходніх губернях. Указамі імператара ад 27 кастрычніка 1864 г. і 14 снежня 1865 г. уводзіўся новы парадак прызначэння на пасады каталіцкіх святароў. Вызначаліся тры шляхі закрыцця манастыроў: пры наяўнасці ў іх менш чым васьмі манахаў; пры несумяшчальнасці дзейнасці манастыра з грамадскім парадкам; у выглядзе пакарання за злачынствы, зробленыя манахамі. У выніку колькасць каталіцкіх манастыроў значна скарацілася. Да канца 1867 г. у заходніх губернях было закрыта больш за 30 каталіцкіх манастыроў, каля 160 касцёлаў, 80 капліц. Былі накладзены абмежаванні на свабоду перамяшчэнняў ксяндзоў, забаронены іх імправізаваныя пропаведзі. На тэрыторыі беларускіх і літоўскіх губерняў за перыяд з 1863 па 1868 г. у праваслаўе было звернута больш за 70 тыс. католікаў, аднак пазней такая практыка ў значных памерах ужо не прымянялася. У студзені 1864 г. быў выдадзены цыркуляр віленскага генерал-губернатара, які забараняў выкарыстанне польскай мовы ў навучальных установах. Парушальнікам пагражалі вялікімі грашовымі штрафамі. У 1865 г. польская мова была заменена рускай у выкладанні каталіцкага Закона Божага ў народных школах.

Усё гэта стала нагодай для дыпламатычнага заяўлення 29 кастрычніка 1866 г. Папы Рымскага Пія IX аб нягодах каталіцкай царквы ў Ра-

сійскай імперыі. У адказ Аляксандр II 22 лістапада 1866 г. падпісаў указ аб аб'яўленні канкардату 1847 г., які рэгуляваў адносіны Ватыкана і Расійскай імперыі, страціўшым сілу і разрыве адносін са Святым прастолам. У выніку пашырыліся правы кантралюемай урадам Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі як кіруючага органа каталіцкай царквы ў Расійскай імперыі. Супраць гэтага выступала Рымская курыя, паколькі такі стан звужаў правы каталіцкіх епіскапаў і ставіў іх у большую залежнасць ад расійскага ўрада. У 1875 г. у выніку перамоў з расійскім урадам Папа Рымскі прызнаў Духоўную калегію, але толькі як установу, што займалася адміністрацыйна-гаспадарчымі справамі каталіцкай царквы. Аднак пазней расійскі бок без узгаднення з Ватыканам скасаваў Мінскую епархію і правёў некаторыя іншыя перастаноўкі. Разглядаючы такія дзеянні як незаконныя, Папа Рымскі тым не менш быў вымушаны даручыць весці справы былой Мінскай епархіі магілёўскаму архіепіскапу-мітрапаліту. Расійскі ўрад умешваўся ў пытанні прызначэння епіскапаў, што нярэдка прыводзіла да разыходжанняў паміж Ватыканам і Пецярбургам адносна легітымнасці кіраўнікоў каталіцкай царквы на тэрыторыі Расійскай імперыі. На працягу XIX ст. ён практычна імкнуўся стварыць на сваёй тэрыторыі каталіцкую царкву, якая б была максімальна незалежнай ад Рыма.

Адной з галоўных у гэты час была ідэя аб «распалячванні каталіцызму». Яна прадугледжвала ўдзел свецкіх улад у адборы навучэнцаў для каталіцкіх навучальных устаноў, абавязковае ўвядзенне ў іх вывучэння рускай мовы і гісторыі Расіі, а таксама правядзенне службы ў касцёлах на рускай мове. Хросныя хады за межамі будынкаў касцёлаў у гарадах і агароджаў храмаў у сельскай мясцовасці маглі праводзіць толькі праваслаўныя святары. Мерапрыемствы расійскіх улад, асабліва спробы ўвесці рускую мову ў богаслужэнне, выклікалі значнае супраціўленне і непрыняцце з боку большасці каталіцкіх святароў.

У канцы 1869 г., пасля працяглай дыскусіі ва ўрадавых колах, было зацверджана палажэнне аб выкарыстанні рускай мовы ў богаслужэнні іншых канфесій. Кіраўніцтву беларускіх губерняў было прапанавана знайсці сярод каталіцкіх святароў тых, хто пагадзіўся б весці службу на рускай мове. Асаблівую актыўнасць у гэтым кірунку праявіў ксёндз Мінскай губерні Ф. Сенчыкоўскі, які ў 1874 г. быў прызначаны на пасаду візітатара прыходаў і атрымаў шырокія паўнамоцтвы па кантролі над дзейнасцю каталіцкай царквы. Аднак дадзенае мерапрыемства сустрэла моцнае супраціўленне сярод ксяндзоў і ігнаравалася каталіцкім

насельніцтвам. Да канца 70-х гг. XIX ст. рускамоўная служба захавалася толькі ў 10 касцёлах Мінскай губерні ў параўнанні з 30 у пачатку дзесяцігоддзя. Урадавыя колы, кіраўніцтва беларускіх губерняў вымушаны былі прызнаць бесперспектыўнасць дадзенага праекта і фактычна адмовіцца ад яго амаль да пачатку XX ст.

Праз два гады пасля аднаўлення адносін з Рымам у 1894 г. быў прыняты новы Статут духоўных спраў замежных веравызнанняў, якім замацоўвалася існаванне 12 каталіцкіх епархій на тэрыторыі Расійскай імперыі. Акрамя Магілёўскага архіепіскапства, стваралася Варшаўскае, якому падпарадкоўваліся каталіцкія епархіі на этнічна польскіх тэрыторыях. Статутам агаворвалася, што католікі Расійскай імперыі маглі мець зносіны з Рымскай курыяй толькі пры пасрэдніцтве Міністэрства ўнутраных спраў.

Адным з варыянтаў, шляхоў сацыяльнай мабільнасці ва ўмовах Беларусі, заходніх губерняў сталі канфесійныя пераходы з каталіцтва ў праваслаўе. Нават пры фармальна захаванай ранейшай саслоўнай прыналежнасці сацыяльныя правы асобы пры пераходзе ў праваслаўе фактычна пашыраліся. Яўрэі, якія прымалі хрысціянства, таксама ва ўмовах Расійскай імперыі пазбаўляліся многіх негатыўных момантаў сваёй прыналежнасці да іншародцаў.

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. асаблівая ўвага ва ўрадавай палітыцы на тэрыторыі заходніх губерняў надавалася павелічэнню колькасці праваслаўных храмаў. На ўсёй тэрыторыі Беларусі будаваліся і рамантаваліся праваслаўныя цэрквы, пераводзіліся з унутраных губерняў святары. Грошы на гэтыя патрэбы выдзяляліся з ліку кантрыбуцыйных збораў, якімі былі абкладзены мясцовыя дваранеземлеўласнікі. Пад праваслаўныя цэрквы нярэдка выкарыстоўвалі будынкі закрытых касцёлаў. У выніку рэалізацыі канфесійнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX ст. удалося значна павялічыць колькасць праваслаўных вернікаў. У першыя гады пасля паўстання ў праваслаўе пераходзілі нават цэлымі сем'ямі, а часам і прыходамі. Гэтаму садзейнічалі падараванні розных праў, прывілеяў эканамічнага характару. У пачатку 60-х гг. XIX ст. у беларускіх губернях налічвалася каля 2,5 млн праваслаўных і звыш 1,3 млн католікаў. Паводле даных перапісу насельніцтва 1897 г., тут пражывала ўжо звыш 5,1 млн праваслаўных і каля 1,9 млн католікаў. Аднак многія з тых, хто перайшоў з каталіцтва ў праваслаўе, доўгі час захоўвалі каталіцкую абраднасць. Гэта датычылася і некаторых былых уніятаў.

У 60-я гг. XIX ст. адбылася рэформа навучальных устаноў праваслаўнага духоўнага ведамства. Паводле новага Статута 1867 г. гэтыя ўстановы сталі ўсесаслоўнымі.

Пасля паўстання 1863 г. урадавыя колы звярнулі ўвагу на становішча, перш за ўсё матэрыяльнае, праваслаўнага духавенства ў заходніх губернях. У 1864 г. быў прыняты шэраг указаў і пастаноў у гэтым напрамку: выдадзена распараджэнне аб бясплатным выдзяленні казённага лесу для пабудоў і ацяплення дамоў свяшчэннаслужыцеляў; дазволена аддаваць у карыстанне некаторых прыходаў бліжэйшыя фермы і фальваркі; амаль удвая павялічана жалаванне мясцовага праваслаўнага духавенства. Гэта адбывалася ў той час, калі з 1861 г. у астатніх праваслаўных епархіях Расійскай імперыі было спынена выдзяленне дзяржаўных сродкаў на ўтрыманне духавенства. З канца 1860-х гг. у Расійскай імперыі скарачаліся штаты праваслаўных прычтаў, што ў нязначнай ступені закранула і беларускія губерні.

Да канца 60-х гг. XIX ст. для ўрада стала зразумелым, што жорсткая палітыка дэпаланізацыі неэфектыўная. Патрэбна была карэкціроўка ўрадавага курсу, аднак яго рэалізацыя пасля паўстання 1863 г. істотна падарвала магчымасці польскіх культурна-нацыянальных уплываў на тэрыторыі Беларусі.

Пасля канчатковай адмены ў 1870 г. ваеннага становішча ў заходніх губернях расійскі ўрад меў пэўныя хістанні ў рэалізацыі сваёй палітыкі ў дачыненні да мясцовага дваранства. Але ў выніку, адмовіўшыся штонебудзь змяніць у сферы абмежаванняў для каталіцкай часткі дваранства, урад пайшоў па шляху выключэнняў з правіла: вызваляў ад дзеяння закона асобных дваран, прадстаўляючы гэта як акт асаблівай міласці. Такім чынам, улады стрымлівалі незадаволеных і задавальнялі тых, у супрацоўніцтве з кім былі зацікаўлены, ці тых, хто ішоў на супольную працу. Праўда, спачатку на дробныя ўступкі ўрад пайшоў. У 1867 г. было дазволена замяніць прадвадзіцеляў дваранства, якія не мелі маёнткаў у краі, на мясцовых рускіх ці праваслаўных памешчыкаў. Акрамя таго, у 1867 г. былі спынены ўсе незавершаныя следчыя справы па ўдзеле ў паўстанні, а высланым у адміністрацыйным парадку з Царства Польскага і заходніх губерняў было дазволена вяртацца і пасяляцца ў Царстве Польскім.

Перыяд ад пачатку 1870-х гг. і да канца XIX ст. вызначаўся пэўнай стабільнасцю ў правядзенні ўрадавай палітыкі. Захаваўся дэпаланізатарскі кірунак мерапрыемстваў, аднак прынцыпова новых канцэпту-

альных падыходаў да яго рэалізацыі не было выяўлена. Адбылася руцінізацыя адміністрацыйнай дзейнасці.

Новая стратэгія рэалізацыі ўрадавых мерапрыемстваў была прынята пасля прызначэння віленскім генерал-губернатарам А. Л. Патапава (час кіравання ў Вільні – 1868–1874 гг.). Не маючы асаблівых сімпатый да палякаў, А. Л. Патапаў тым не менш не быў вельмі актыўным прыхільнікам прыцясненняў прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя, а таксама абмежавальных мерапрыемстваў у дачыненні да дваранскага землеўладання. Як правіла, у дзейнасці адміністрацый віленскіх генерал-губернатараў пасля перыядаў узмацнення жорсткага курсу на русіфікацыю наступаў час спроб нерашучай лібералізацыі. Актыўнымі прыхільнікамі метадаў М. М. Мураўёва праявілі сябе генерал-губернатары І. С. Каханаў (час кіравання ў Вільні – 1884–1893 гг.) і В. Н. Троцкі (1897–1901). За ўсталяванне пэўнага паразумення з польскім адукаваным грамадствам выступаў П. П. Альбядзінскі (1874–1880). Жорсткія русіфікатарскія мерапрыемствы ўзмацніліся ў час праўлення Аляксандра III.

З канца 60-х гг. XIX ст. урад палічыў магчымым змяніць адносіны ў дачыненні да каталіцкай царквы і выдання польскай літаратуры. У сярэдзіне 1869 г. у беларускіх губернях аднавілі выданне кніг на польскай мове. У 70-х гг. XIX ст. з дазволу віленскага цэнзара былі апублікаваны 254 кнігі, галоўным чынам на рэлігійную тэматыку. У гэты час стала магчымым адкрываць губернскія сельскагаспадарчыя таварыствы, дзейнасць якіх абмяжоўвалася выключна эканамічнымі пытаннямі і ўносіла ўклад у падтрымку культурных традыцый дваранскіх сядзіб. Пры неабходнасці невялікія падачкі мясцоваму дваранству ўрадавымі коламі маглі быць растлумачаны як першы крок да поўнага задавальнення іх памкненняў узамен на адмову змагацца за адраджэнне Польшчы.

Не адмяняючы ўведзеных абмежаванняў, урад вырашыў пазбягаць дзеянняў, што маглі б быць расцэнены як ганенні на каталіцкую царкву. Закрыццё касцёлаў і капліц адбывалася з вялікай перасцярогай. У мясцовым друку зменшыліся адкрытыя нападкі на католікаў. Аднак мясцовая адміністрацыя не адмовілася ад пільнага нагляду за каталіцкімі святарамі і за зместам іх пропаведзяў. Па-ранейшаму ксяндзам не дазвалялася пакідаць свае прыходы без дазволу мясцовых улад, забараняліся духоўныя працэсіі, якія былі ўстаноўлены каталіцкай царквой. Праяўленне некаторай лаяльнасці ў канфесійным пытанні было выклікана ўзнікненнем зацікаўленасці ўрада ў саюзе з мясцовым каталіцкім дваранствам для ўмацавання сваёй сацыяльнай апоры.

У 70-х гг. XIX ст., насуперак існаваўшым абмежаванням, у заходніх, асабліва беларускіх, губернях тайна быў пашыраны доступ мясцовага каталіцкага дваранства да дзяржаўнай службы. Да пачатку 1880-х гг. у дзяржаўных установах Віленскай губерні прадстаўнікі мясцовага дваранства складалі ўжо каля 30 %. У 1869 г. з-пад юрысдыкцыі віленскага генерал-губернатара былі выведзены Віцебская і Магілёўская губерні, а ў 1870 г. – Мінская, якія непасрэдна былі падпарадкаваны Пецярбургу. Такое адміністрацыйна-тэрытарыяльнае пераўладкаванне падавалася як сведчанне ліквідацыі прамой пагрозы новага паўстання на тэрыторыі Беларусі, агульнага палітычнага пацяплення. Аднак у выведзеных з-пад віленскага кіравання губернях не былі адменены абмежавальныя законы і распараджэнні ў дачыненні да католікаў і яўрэяў; яны па-ранейшаму знаходзіліся ў сферы ўплыву Віленскай навучальнай акругі.

У час палітычнай рэакцыі пачатку 80-х гг. XIX ст. ва ўмовах узмацнення палітыкі вялікадзяржаўнага шавінізму ўрад і мясцовая адміністрацыя адышлі ад палітыкі папярэдніх гадоў. Каталіцкае дваранства зноў пачало ўспрымацца як ненадзейны саюзнік. Папярэдняя палітыка была аб'яўлена памылковай і расцэньвалася як здрада «рускай справе» ў Беларусі. Па загадзе віленскага генерал-губернатара І. С. Каханава ў 1884–1885 гг. большасць чыноўнікаў каталіцкага веравызнання зноў былі звольнены і заменены на рускіх. Да 1888 г. усе прадвадзіцелі дваранства з ліку мясцовых каталіцкіх землеўладальнікаў былі зменены на рускіх дваран, многія з якіх не мелі зямельнай уласнасці ў Беларусі.

Былі спробы нават закрыць таварыствы сельскіх гаспадароў з прычыны таго, што там, на думку расійскіх улад, справамі кіравалі «польскія» землеўладальнікі. Мясцовыя ўлады ўзмацнілі дыскрымінацыйныя меры ў дачыненні да каталіцкага дваранства, не дапускалі парушэнняў абмежавальных законаў у сферы землеўладання і землекарыстання католікаў і яўрэяў.

Адным з урадавых мерапрыемстваў, накіраваных на змаганне з польскімі ўплывамі, сталі ганенні супраць таемных школ, колькасць якіх павялічылася з пачатку 80-х гг. XIX ст. У такіх школах, як правіла, без дазволу і ведама ўлад дзяцей сялян навучалі польскай мове і асновам каталіцкай веры. У 1892 г. быў выдадзены закон, паводле якога за адкрыццё таемных школ, іх матэрыяльную падтрымку і выкладанне ў іх прадугледжваўся буйны грашовы штраф ці турэмнае зняволенне да трох месяцаў. Аднак прымяненне закона, без выразнага абазначэння на яго старонках мэты змагання супраць польскамоўнай адукацыі, мела нечаканыя вынікі. Пад яго дзеянне траплялі часам школы з вы-

кладаннем на літоўскай, ідыш і нават на рускай мове. У 1906 г. гэты заканадаўчы акт быў адменены.

Ацэньваючы вынікі ўрадавай палітыкі па сегрэгацыі «польскага элемента», міністр фінансаў Расійскай імперыі М. Бунге ў канцы XIX ст. адзначаў: «Вынікі, якіх дасягнуў урад прынятымі мерамі, былі вельмі нязначнымі. Само абмежаванне дзейнасці палякаў на ніве дзяржаўнай службы засяродзіла іх дзейнасць на гаспадарцы, якая бясспрэчна зрабіла вялікія поспехі і з нядбайнай, панскай пераўтварылася ў эканамічную памешчыцкую».

Асабліва недальнабачнай была нацыянальная палітыка расійскага ўрада пры імператарах Аляксандры III і Мікалаю II. У ёй прысутнічалі факт дыскрымінацыі шэрагу народаў і спробы іх русіфікаваць. Ва ўмовах разгортвання мадэрнізацыі краіны такая палітыка садзейнічала росту нацыянальных рухаў. Аднак да пачатку XX ст. асноўнымі іх праграмнымі лозунгамі, за выключэннем польскага і фінскага рухаў, былі культурна-аўтанамісцкія патрабаванні, барацьба за мясцовае самакіраванне і вырашэнне сацыяльных пытанняў.

Другая палова XIX ст. стала перыядам напружанай дзейнасці расійскіх уладных структур па выпрацоўцы і рэалізацыі сістэмнай урадавай палітыкі, накіраванай на ўніфікацыю беларускіх губерняў адпаведна ўзору сацыяльна-эканамічнай сістэмы цэнтральных губерняў Расійскай імперыі. Паваротным момантам было паўстанне 1863 г., падаўленне якога патрабавала не толькі рэпрэсіўных мер, але і прэвентыўнай моцнай палітычнай волі па прадухіленні абвастрэння нацыянальна-палітычнай сітуацыі. Менавіта падзеі паўстання 1863 г. прымусілі расійскі ўрад перайсці да рашучай і паслядоўнай палітыкі русіфікацыі, рэалізацыя якой была скарэктавана разгортваннем мадэрнізацыйных працэсаў. Расійская ўрадавая палітыка на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX ст. вызначалася непараўнальна большай мэтанакіраванасцю, чым гэта адбывалася ў першай палове стагоддзя.

Тэма 5

# СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

**Асаблівасці буржуазнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі.**
**Аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст.**
**Эвалюцыя памешчыцкага землеўладання.**
**Становішча сялянства.**
**Сельская грамада, рэгіянальныя асаблівасці яе функцыянавання ў Беларусі.**

## Асаблівасці буржуазнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі

Галоўным кірункам сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XIX ст. было пашырэнне капіталістычных адносін. Першыя два парэформенныя дзесяцігоддзі адносяцца да ліку пераходных, калі адбывалася разбурэнне рэшткаў прыгонніцкай сістэмы ў сельскай гаспадарцы, завяршаўся працэс тэхнічнага перааснашчэння прамысловасці, ствараўся механізаваны транспарт і складаліся новыя, характэрныя для капіталістычнага грамадства сацыяльныя групы насельніцтва – пралетарыят і прамысловая буржуазія.

Зацвярджэнне капіталізму як дамінуючай сацыяльна-эканамічнай сістэмы адносіцца да канца XIX – пачатку XX ст.

Яго развіццё адбывалася ва ўмовах мадэрнізаванай, але, па сутнасці, старой палітычнай сістэмы, пры захаванні самадзяржаўнага і саслоўнага ладу. Гэта накладвала пэўны адбітак на сацыяльна-эканамічныя працэсы як у Беларусі, так і ў парэформеннай Расійскай імперыі ў цэлым, абумовіла іх цяжкасці і супярэчнасці.

Пасля адмены прыгоннага права асновай эканомікі Беларусі паранейшаму заставалася сельская гаспадарка, характэрнай рысай якой было спалучэнне капіталістычных адносін з рэшткамі прыгонніцтва. Наяўнасць буйнога памешчыцкага землеўладання вызначыла для Беларусі павольны, паступовы («прускі») шлях буржуазна-аграрнай эвалюцыі, пры якім буйная памешчыцкая гаспадарка надоўга захавала свае прыгонніцкія рысы. У 70-х гг. XIX ст. у Беларусі памешчыкам належала звыш 50 % усёй зямлі, а сялянам – менш за 33 %. Буйныя памешчыкі валодалі дзясяткамі і сотнямі тысяч дзесяцін зямлі. У значнай колькасці сялянскіх двароў ва ўласнасці знаходзілася ад дзвюх да пяці дзесяцін. Разам з латыфундыямі памешчыкаў існавала цераспалосіца сялянскіх і памешчыцкіх зямель.

Першыя два дзесяцігоддзі пасля адмены прыгоннага права сталі перыядам пакутлівага выспявання капіталістычных адносін, шырокага распаўсюджвання адпрацовачнай сістэмы, сутнасць якой заключалася ў апрацоўцы зямлі памешчыка селянінам сваім інвентаром за прадастаўленыя яму ў арэнду ворыўную зямлю і іншыя ўгоддзі. Адпрацовачная сістэма асабліва прыжылася ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. У Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях памешчыкі больш шырока выкарыстоўвалі працу наёмных рабочых. Але і ў гэтых губернях адпрацоўкі займалі значнае месца, асабліва падчас збору збожжа і сенакосу. Трэба адзначыць, што ў цэлым тэхнічная ўзброенасць у земляробстве як у памешчыцкай, так і ў сялянскай гаспадарцы ў першыя паслярэформенныя дзесяцігоддзі амаль нічым не адрознівалася ад папярэдняга часу.

Развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы Беларусі ў другой палове XIX ст. знайшло праяўленне найперш у пашырэнні вытворчасці таварнай прадукцыі, інтэнсіфікацыі і паглыбленні спецыялізацыі земляробства, павелічэнні выкарыстання машын і ўдасканаленых прылад працы, укараненні прадпрымальніцкіх форм арганізацыі гаспадаркі і пашырэнні выкарыстання вольнанаёмнай працы, удасканаленні агракультуры.

У буйных маёнтках, на землях заможных сялян (часцей за ўсё купчых і арэндных) к канцу XIX ст. уводзілася шматпольная сістэма се-

вазвароту, прымяняліся мінеральныя ўгнаенні, пашыралася выкарыстанне машын (малатарні, арфы) і палепшаных сельскагаспадарчых прылад (жалезныя плугі, бароны з жалезнымі зубамі). Па прымяненні машын Беларусь стаяла на адным з першых месцаў у Расійскай імперыі, хоць ва ўсёй сельскай гаспадарцы панавала ручная тэхніка. У другой палове 90-х гг. XIX ст. у чатырох заходніх губернях (без Віленскай) палепшаную глебаапрацоўчую тэхніку (пераважна плугі) выкарыстоўвалі 17–25 % сялянскіх гаспадарак. Сяляне, галоўным чынам заможныя, набывалі простыя сельскагаспадарчыя машыны: малатарні, арфы, крупадзёркі, ільночасалкі, сячкарні.

Асноўнай галіной земляробства ў Беларусі заставалася зерневая гаспадарка, якая ў 1860–70-я гг. складала галоўны кірунак рыначнай спецыялізацыі сельскай гаспадаркі. За 60–90-я гг. XIX ст. сярэднегадавы чысты збор збожжавых культур тут павялічыўся ў 2,4 раза, у той час як пасяўныя плошчы на тэрыторыі беларускіх губерняў выраслі толькі на 28,8 %.

Значнае развіццё ў пароформенны перыяд атрымала жывёлагадоўля, асабліва малочная, якая ў канцы XIX ст. стала вядучай таварнай галіной сельскай гаспадаркі Беларусі. Пагалоўе свойскай жывёлы ўсіх відаў павялічылася за 60–90-я гг. XIX ст. у 1,5–2,5 разы. У маёнтках і заможных сялянскіх гаспадарках практыкаваўся адкорм буйной рагатай жывёлы на продаж. Яшчэ большай папулярнасцю, асабліва ў сялян, карысталіся свінагадоўля і гандаль яе прадукцыяй. У першыя дзесяцігоддзі пасля адмены прыгоннага права ў памешчыцкіх гаспадарках, галоўным чынам заходняй і цэнтральнай частак Беларусі, прамысловае значэнне захоўвала танкарунная авечкагадоўля.

Важным відам капіталістычнага прадпрымальніцтва як у памешчыкаў, так і ў заможных сялян з'яўлялася вінаробства, асноўнай сыравінай для якога было спачатку зерне, пераважна жыта, а потым бульба. Адходы вінаробства ішлі на корм жывёле.

З ростам гандлёвага земляробства, пашырэннем пасеваў кармавых траў і бульбы, распаўсюджаннем палепшаных прылад працы трохпольная сістэма земляробства паступова выцяснялася шматпольным севазваротам. У канцы XIX ст. большасць памешчыцкіх гаспадарак выкарыстоўвала чатырохполле з пасевамі кармавых траў і бульбы.

Развіццё таварнага земляробства, яго спецыялізацыя па асобных галінах (малочная жывёлагадоўля, вытворчасць ільну, пянькі, вінаробства) пашырылі абмен паміж сельскай гаспадаркай і прамысловасцю. Гэта садзейнічала росту ўнутранага рынку і прывяло да з'яўлення

ў канцы XIX ст. у памешчыцкіх гаспадарках буйных, высокатаварных капіталістычных прадпрыемстваў, якія працавалі выключна на рынак. Колькасць малатаварных маёнткаў, заснаваных на адпрацовачнай сістэме, паступова скарачалася. Збяднелыя дваране прадавалі маёнткі і ішлі на дзяржаўную службу, а іх зямля станавілася аб'ектам вольнай куплі-продажу, яе набывалі прадстаўнікі вышэйшага саслоўя, купцы і заможныя сяляне.

Нягледзячы на рэшткі прыгонніцкіх адносін, капіталізм у сельскай гаспадарцы Беларусі развіваўся адносна хутка ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Гэтаму садзейнічалі развіццё прамысловасці, сістэмы капіталістычнага крэдыту, чыгуначнае будаўніцтва, рост гарадоў, канцэнтрацыя войскаў на тэрыторыі Беларусі. Усё пералічанае стварала спрыяльныя ўмовы таварнага земляробства і рынкавых адносін. Моцным каталізатарам эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі з'явіўся сусветны аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст., які выклікаў рэзкае зніжэнне цэн на хлеб. Ён прывёў да карэнных змяненняў у эканамічнай арганізацыі і тэхнічнай аснашчанасці сельскай гаспадаркі, да канчатковай перамогі таварнага земляробства і павелічэння рынкавага попыту.

## Аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст.

Сусветны аграрны крызіс пачаўся ў 1873 г. Яму папярэднічала хуткае развіццё земляробства ў ЗША, Аўстраліі, Канадзе, некаторых краінах Лацінскай Амерыкі, якое аказалася больш эфектыўным, чым у традыцыйных пастаўшчыкоў збожжа. У выніку рэзка ўзрасла сусветная вытворчасць хлеба. Вялікую ролю ў наступленні крызісу адыграла значнае ўдасканаленне транспартнай сістэмы, што дазваляла хутка і танна дастаўляць зерне з Амерыкі ў Еўропу. Пачалося падзенне цэн на хлеб на еўрапейскіх рынках. Аграрны крызіс Расійскую імперыю закрануў некалькі пазней, чым краіны Заходняй Еўропы. Складанасці ў збыце збожжа тут узніклі з канца 1870-х гг., а з 1881 г. пачалося падзенне цэн на хлеб, якое прадаўжалася, за выключэннем некалькіх гадоў, да канца 1897 г. Напярэдадні крызісу ў Расійскай імперыі значна вырасла зерневая гаспадарка, з'явіліся новыя збожжавыя раёны, што стымулявалася высокім узроўнем цэн на хлеб у самой Расіі, а таксама за мяжой. У сувязі з падзеннем цэн вытворцы земляробчай прадукцыі з беларускіх губерняў аказаліся не ў стане канкурыраваць з больш танным зернем з Амерыкі і поўдня Расіі. Геаграфічная блізкасць Бе-

ларусі да рынкаў збыту сельскагаспадарчай прадукцыі вызначыла тут спецыфіку развіцця крызісу. Ён праявіў сябе ў беларускіх губернях раней, чым у іншых рэгіёнах Расійскай імперыі, і аказаў больш значны ўплыў на далейшае развіццё сельскай гаспадаркі. Рэзкія спады цэн на хлеб і, адпаведна, вывазнога гандлю збожжам адбыліся ў 1887–1888 і 1894–1895 гг. На развіццё хлебнага гандлю адмоўна паўплывала тарыфная палітыка расійскага ўрада. Перагляд збожжавых тарыфаў у 1889 і 1893 гг. у значнай ступені абумовіў выцясненне беларускага збожжа з яго традыцыйных рынкаў збыту. Акрамя таго, гэтыя тарыфы садзейнічалі наплыву ў Беларусь хлеба з цэнтральна-чарназёмных губерняў.

Аграрны крызіс прывёў да структурнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Гэта праявілася перш за ўсё ў змене спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў жывёлагадоўчым кірунку. На мяжы XIX–XX стст. Беларусь стала раёнам развітой малочнай гаспадаркі. У 1890-х гг. тут налічвалася больш за 200 прадпрыемстваў па перапрацоўцы малочнай прадукцыі, якая пастаўлялася ў розныя рэгіёны Расіі і за мяжу. У гады аграрнага крызісу ў памешчыцкіх гаспадарках вырасла значэнне вінакурэння. Пасля спаду, выкліканага ўвядзеннем з 1863 г. акцызнай сістэмы, з другой паловы 1880-х гг. пачаўся рост вінакурнай вытворчасці. У пачатку 1890-х гг. яе валавы аб'ём узрос на 67 % у параўнанні з першай паловай 60-х гг. XIX ст. Аграрны крызіс прывёў да інтэнсіфікацыі вытворчасці ў памешчыцкіх і некаторых сялянскіх гаспадарках, пачала шырока выкарыстоўвацца ўдасканаленая сельскагаспадарчая тэхніка.

Развіццё мясамалочнай жывёлагадоўлі паўплывала на структуру пасяўных плошчаў, садзейнічала пашырэнню травасеяння. За апошняе дваццацігоддзе XIX ст. іх аб'ём павялічыўся ў 7,7 раза, і беларускія губерні па ўдзельнай вазе кармавых культур у агульнай пасяўной плошчы выйшлі на трэцяе месца пасля Прыбалтыкі і прывісленскіх губерняў. Узрасла таксама вытворчасць тэхнічных культур, сярод якіх першае месца займала бульба, што, у сваю чаргу, прывяло да паляпшэння тэхнічнай аснашчанасці сельскай гаспадаркі і павышэння якасці агратэхнікі. Рост гандлёвага бульбаводства быў абумоўлены ў першую чаргу развіццём вінакурнай вытворчасці. У паўночных раёнах Беларусі адным з асноўных кірункаў рыначнай спецыялізацыі сельскай гаспадаркі было ільнаводства. Льняное валакно і семя пастаупалі на продаж за мяжу і ў іншыя рэгіёны Расійскай імперыі. У апошняй Паўночная Беларусь адносілася да ліку асноўных пастаўшчыкоў гэтай сыравіны.

## Эвалюцыя памешчыцкага землеўладання

Адным з асноўных адрозненняў развіцця сельскай гаспадаркі ў беларускіх губернях ад цэнтральных губерняў імперыі ў другой палове XIX ст. з'яўлялася захаванне і развіццё памешчыцкіх гаспадарак. У парэформенныя дзесяцігоддзі асобныя маёнткі сталі месцам праяўлення эканамічнай ініцыятывы, імкнення гаспадарыць на прадпрымальніцкай аснове.

Сацыяльна-эканамічнае аблічча памеснага дваранства вызначалі памеры і структура зямельнай уласнасці і сістэма вядзення гаспадаркі. Паводле матэрыялаў пазямельнага абследавання 1877–1878 гг., у Беларусі налічваліся 7984 памешчыкі, з іх 7284 дваране (91,2 %). У гэты час вышэйшаму саслоўю належала 8,24 млн дзесяцін зямлі, што складала 94,1 % агульнай плошчы памешчыцкага землекарыстання. Дваране-памешчыкі з уласнасцю больш за 500 дзесяцін (каля 35 % памеснага дваранства) валодалі 89 % дваранскага зямельнага фонду, у тым ліку найбольш значныя аграрыі, з уласнасцю больш за 2 тыс. дзесяцін (10,9 % памеснага дваранства), мелі 68,2 % (5,6 млн дзесяцін) фонду. У Беларусі налічвалася 14 буйных магнацкіх сямействаў, ва ўласнасці якіх у 70–80-х гг. XIX ст. знаходзілася чвэрць агульнай плошчы памешчыцкай зямлі. Самымі значнымі землеўласнікамі былі князь П. Вітгенштэйн, якому належала 795,5 тыс. дзесяцін зямлі, князь А. Радзівіл – 150,6 тыс., граф К. Патоцкі – 137,5 тыс., граф М. Патоцкі – 111,5 тыс., Ф. Пуслоўскі – 105,3 тыс. дзесяцін.

Для памешчыцкіх гаспадарак беларускіх губерняў пасля адмены прыгоннага права стала ў пэўнай ступені характэрным пашырэнне маяратнага права, што само па сабе было анахранізмам. Заснаванне маяратаў рэгулявалася Законам ад 16 ліпеня 1845 г., які быў накіраваны на захаванне буйнейшага дваранскага землеўладання і ўласнасці арыстакратычных родаў. Маяраты абмяжоўваліся памерамі ад 10 да 100 тыс. дзесяцін зямельных угоддзяў ці павінны былі даваць ад 12 да 200 тыс. руб. штогадовага даходу. Маяратнае ўладанне не магло закладвацца за даўгі ці прадавацца. Яно пераходзіла ў спадчыну да старэйшага ў сям'і ці родзе. У пасляэформенны час павялічылася колькасць зваротаў з боку памешчыкаў аб магчымасці пераводу ў запаведныя сярэдніх зямельных уладанняў. Законапраектам 1893 г. прадугледжвалася магчымасць пераводу ў маяратныя маёнткаў і памешчыцкіх уладанняў мінімальным памерам 600–700 дзесяцін.

Эвалюцыю памешчыцкага землеўладання ў наступныя дзесяцігоддзі пасля адмены прыгоннага права вызначалі пашырэнне капіталістычных адносін у эканамічным жыцці і ўсталяванне рэжыму выключных адносін у дачыненні да католікаў і яўрэяў. Абодва фактары, асабліва апошні, істотна змянілі ўмовы гаспадарання для ўладальнікаў маёнткаў.

Асаблівасцю эвалюцыі памешчыцкага землеўладання ў Беларусі ў 60–90-х гг. XIX ст. сталі наяўнасць сервітутаў, цераспалосіцы, прававая неўрэгуляванасць і неакрэсленасць адносін з асобнымі катэгорыямі сялянства. Гэта стрымлівала пашырэнне прадпрымальніцтва ў сельскай гаспадарцы, працэс вольнай мабілізацыі зямлі. Абазначаная акалічнасць у вялікай ступені была абумоўлена рэпрэсіўнай палітыкай урада ў дачыненні да дваранства каталіцкага веравызнання.

У 1886 г. на тэрыторыі Беларусі пачалі працу аддзяленні Дзяржаўнага дваранскага зямельнага банка, які меў мэту праз выдачу доўгатэрміновых пазык уратаваць дваранскія зямельныя ўладанні ад пераходу да іншых саслоўяў. Яго паслугамі не маглі карыстацца землеўласнікі каталіцкага веравызнання, якія вымушаны былі звяртацца за грашовымі сродкамі ў звычайныя акцыянерныя банкі.

Непадрыхтаванасць большасці памешчыкаў да вядзення гаспадаркі ў новых умовах выклікала шырокае выкарыстанне ў першыя дзесяцігоддзі пасля адмены прыгоннага права пераходнай адпрацовачнай сістэмы, а таксама перадачы зямлі ў арэнду.

Памешчыцкія гаспадаркі Беларусі ў значнай ступені аказаліся ўспрымальнымі да навінак у агратэхніцы. Многія памешчыкі дастаткова аператыўна рэагавалі на запатрабаванні рынку, у сціслыя тэрміны пераарыентавалі свае гаспадаркі на вытворчасць малака і мяса, увялі шматпольны севазварот, пашырылі вырошчванне тэхнічных культур. Пералом у выкарыстанні новай сельскагаспадарчай тэхнікі адбыўся пад уплывам аграрнага крызісу 1880-х гг. У сярэдзіне 1890-х гг., паводле даных Міністэрства земляробства, беларускія губерні сярод іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі знаходзіліся на другім месцы пасля Наваросіі па выкарыстанні палепшаных прылад працы. Распаўсюджваннем і практычным прымяненнем новых дасягненняў у сельскай гаспадарцы займаліся сельскагаспадарчыя таварыствы, дастаткова шырокая сетка якіх была створана ў беларускіх губернях у 80–90-я гг. XIX ст. мясцовымі дваранамі.

Скарачэнне памешчыцкага землеўладання ў беларускіх губернях адбывалася ў меншых памерах, чым у еўрапейскай частцы Расійскай

імперыі. З 1877 па 1905 г. у Беларусі яно зменшылася на 10,8 %, а ў губернях еўрапейскай часткі Расійскай імперыі – на 27,2 %. Гэта было вынікам урадавай пазямельнай палітыкі, а таксама таго, што землеўласнікі Беларусі хутчэй і лепш адаптаваліся да новых рыначных адносін. Паўплывала і тое, што беларускія губерні адносіліся да рэгіёна больш ранняга развіцця капіталістычных адносін. Мабілізацыя зямельных рэсурсаў для свабоднай куплі-продажу стрымлівалася таксама наяўнасцю вялікай колькасці маяратаў, сервітутаў, цераспалосіцы, неакрэсленых пазямельных адносін памешчыкаў з сялянамі і іншымі групамі сельскіх жыхароў.

Першыя два дзесяцігоддзі пасля адмены прыгоннага права былі дастаткова складанымі для памешчыцкіх гаспадарак, аднак у 1880–90-х гг., нягледзячы на стан аграрнага крызісу, яны ў большасці сваёй паступова пачалі прыстасоўвацца да рыначных адносін. Землеўласнікі вымушаны былі выкарыстоўваць удасканаленую тэхніку ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Яны паступова перайшлі на вырошчванне тэхнічных культур, травасеянне. Важнай і распаўсюджанай галіной вытворчасці памешчыцкіх гаспадарак беларускіх губерняў стала інтэнсіўная жывёлагадоўля, была створана вялікая колькасць конезаводаў. Больш як удвая тут павялічылася колькасць буйной рагатай жывёлы. З 80-х гг. XIX ст. у памешчыцкіх гаспадарках дастаткова хуткімі тэмпамі развівалася малочна-таварная жывёлагадоўля.

## Становішча сялянства

Сялянства ў другой палове XIX ст. па-ранейшаму ўтварала асноўную групу насельніцтва Беларусі. Пасля адмены прыгоннага права і амаль да пачатку XX ст. захаваўся яго падзел на шэраг катэгорый – былыя памешчыцкія, дзяржаўныя, удзельныя, дваравыя і інш., якія адрозніваліся па характары надзельнага землеўладання, умовах выкупу, памерах плацяжоў і інш. Гэтаму садзейнічала ўрадавая палітыка, а таксама традыцыйнасць светаўспрымання сельскага насельніцтва. Дзяржаўныя сяляне з'яўляліся больш заможнымі, чым былыя памешчыцкія, яны валодалі ў сярэднім большымі ўчасткамі надзельнай зямлі. Прыкладна ў роўным маёмасным становішчы з дзяржаўнымі знаходзіліся былыя ўдзельныя сяляне.

Трансфармацыя сялянства Беларусі ў 60–90-х гг. XIX ст. адбывалася пад уплывам эвалюцыі буржуазных адносін. З гэтым працэсам

звязаны сацыяльныя змены ў асяроддзі сялянства: паглыбленне маёмаснага расслаення, паскарэнне міграцыйных працэсаў сярод сельскіх жыхароў, з'яўленне новых рыс у менталітэце. Аднак дадзеныя змены адбываліся нераўнамерна ў прасторы і часе. Больш прыкметнымі яны сталі пачынаючы з 80-х гг. XIX ст., 1860–70-я гг. ніякіх істотных змен не прынеслі. У рэгіянальных адносінах буржуазная трансфармацыя сялянства найменш інтэнсіўна адбывалася ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, дзе панавала абшчынная форма землекарыстання.

Анахранізмам ранейшай эпохі ў былой памешчыцкай вёсцы Беларусі былі сервітуты – права сялян карыстацца некаторымі ўгоддзямі, якія юрыдычна належалі памешчыкам. Найбольшае распаўсюджанне яны атрымалі ў заходніх і цэнтральных раёнах, дзе ў 1860-х гг. імі карысталася 56 % сялянскіх двароў, якія мелі зямельныя надзелы. Сервітуты былі важнымі для функцыянавання гаспадаркі вясковых жыхароў, а ў сувязі з нарастаннем сялянскага малазямелля іх значэнне ўзрастала. У пачатку XX ст. сервітутнымі правамі працягвалі карыстацца каля 1/3 былых памешчыцкіх сялян.

Сялянства было абкладзена шэрагам прамых падаткаў і павіннасцей, якія падраздзяляліся на казённыя, земскія, грамадскія. Да першых адносіліся выкупныя плацяжы, дзяржаўны пазямельны падатак і падушны падатак, які збіраўся да сярэдзіны 80-х гг. XIX ст. Земскія павіннасці складаліся з грашовых збораў і натуральных павіннасцей – дарожнай, падводнай, паліцэйскай. Грамадскія павіннасці таксама адбываліся ў грашовай і натуральнай формах. Да іх ліку адносіліся зборы на ўтрыманне валаснога праўлення і суда, сельскіх адміністрацыйных асоб, рамонт сельскіх запасных магазінаў і інш. Апрача прамых падаткаў, сяляне плацілі ўскосныя ў выглядзе дадатковай платы за тавары шырокага ўжытку.

Маёмасная дыферэнцыяцыя сялянства айчыннымі гісторыкамі традыцыйна праводзілася на аснове класіфікацыі сялянскіх гаспадарак у залежнасці ад колькасці коней, якія ім належалі, і велічыні выкарыстоўваемай ворыўнай зямлі. Крытэрыямі такога іерархічнага ранжыравання сялянства былі наступныя: уладальнікі гаспадарак без коней і з адным канём адносіліся да ліку бедных; з двума коньмі – да сярэдніх, з трыма і больш – да заможных; гаспадары з колькасцю ворыўнай зямлі да чатырох дзесяцін – да бедных, звыш васьмі дзесяцін – да заможных, астатнія – да сераднякоў. На аснове прыведзенага групавання стваралася сацыяльна-маёмасная іерархія сялянства. На мяжы XIX–XX стст. бяднейшая група налічвала больш за 60 % сялянства, сярэдняя па за-

можнасці – каля 30, багацейшая – каля 8–10 %. Аднак прыведзеныя крытэрыі і зробленая на іх аснове стратыфікацыя небездакорныя. Пад ціскам нарастаючага к канцу XIX ст. беззямелля сялянства вымушана было адыходзіць на промыслы, шукаць дадатковыя заработкі па-за межамі сваёй гаспадаркі, вёскі і г. д. Амаль палова сялян значную частку даходаў атрымлівалі не праз сельскагаспадарчыя заняткі. У сувязі з гэтым больш аб'ектыўнай з'яўляецца пабудова маёмаснай іерархіі сялянства праз улік агульнага даходу сялянскай гаспадаркі на душу насельніцтва. Але рэпрэзентатыўныя даныя гістарычных крыніц аб сукупных даходах вясковых жыхароў адсутнічаюць. Надзельная зямля, атрыманая ў 1860-х гг. па ўраўняльным прынцыпе, ужо к канцу 1870-х гг. была размеркавана нераўнамерна. Павялічылася колькасць беззямельных двароў. Малазямельныя і беззямельныя сяляне, вымушаныя наймацца да памешчыкаў або да заможных сялян, па сутнасці, рабіліся наёмнымі сельскагаспадарчымі рабочымі. У паслярэформенны перыяд працэсам маёмаснай дыферэнцыяцыі сялянства спадарожнічалі памяншэнне памераў вясковай сям'і, пашырэнне сямейных раздзелаў гаспадаркі. Вялікая роля ў апошніх працэсах належала жанчыне. У сярэдзіне XIX ст. у беларусаў пераважалі неразздзеленыя сем'і, прычым іх бацькоўская форма, якая была адналінейнай і трохпакаленнай: бацька, жанатыя сыны і іх сем'і. У канцы XIX ст. пераважала ўжо малая, нуклеарная сям'я. Сямейныя раздзелы дазваляліся адпаведна пісьмоваму прыгавору сельскай грамады, але большая іх частка адбывалася самавольна.

Беларускі селянін, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, ацяжаранасць падаткамі і павіннасцямі, пры ўмове дбайнага вядзення гаспадаркі нярэдка дасягаў істотных поспехаў у сваім змаганні за лепшае жыццё. Аб гэтым гавораць неадзінкавыя выпадкі набыцця сялянамі значных участкаў зямлі, з'яўлення з іх ліку групы так званых новых памешчыкаў. Заможныя сяляне вялі сваю гаспадарку, выкарыстоўваючы наёмную працу, нярэдка спалучалі таварнае земляробства і жывёлагадоўлю з ліхвярскімі аперацыямі. Такі селянін выступаў і як капіталіст-фермер, і як гандляр, і як ліхвяр. Гэта сведчыла пра тое, што на Беларусі быў магчымы працэс фермерскага («амерыканскага») шляху развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Палову набытай зямлі сяляне куплялі з выкарыстаннем крэдытаў Сялянскага пазямельнага банка.

Сяляне шырока арандавалі землі ў памешчыкаў. На мяжы XIX–XX стст. у беларускіх губернях плошча зямель, арандаваных вясковымі

жыхарамі, складала каля 1/3 плошчы іх надзелаў. Найбольш пашыранай была арэнда за частку ўраджаю. Звычайна сяляне аддавалі ўладальніку зямлі 1/3 сабранага, але памер залежаў ад мясцовых умоў і ўрадлівасці зямлі.

За пасляэформенныя дзесяцігоддзі адбыліся перамены ў бытавых умовах жыцця беларускіх сялян. Замест курных пачалі шырока выкарыстоўвацца печы з комінамі. К пачатку XX ст. курныя хаты ўжо былі рэдкасцю. У вясковых дамах ва ўжытак уваходзілі газавыя лямпы. Нават не вельмі заможныя сяляне маглі сабе дазволіць набыць тканіну фабрычнай вытворчасці ці адзенне гарадскога фасону. Даматканую вопратку пачалі размалёўваць яркімі фарбамі, набытымі ў крамах. У той жа час традыцыйнасць падыходаў да арганізацыі і вядзення гаспадаркі не дазваляла сялянам павысіць іх эфектыўнасць. У вялікай колькасці выпадкаў гаспадаркі былі малапрыбытковымі, не хапала сродкаў на амартызацыю пабудоў і інвентару. Па традыцыі сяляне перш за ўсё імкнуліся забяспечыць сябе збожжам, з мэтай чаго памяншалі памеры сенажацяў, а адпаведна і колькасць жывёлы. Гэта стварала безальтэрнатыўную сітуацыю, калі скарачэнне пагалоўя жывёлы вяло да недахопу арганічных угнаенняў і зніжэння ўраджайнасці, замяшчэнне якога патрабавала яшчэ большых плошчаў пад зернявыя культуры. Між тым рыначная кан'юнктура вымагала большай спецыялізацыі на жывёлагадоўлі.

Светаўспрыманне беларускіх сялян мела істотныя адрозненні ад рускіх. Адно з найбольш выразных – адносіны да працы. У народнай культуры беларусаў адсутнічае погляд на працу як на непрыемную неабходнасць, выконваемую толькі пад прымусам. Другім адрозненнем з'яўляўся значна большы ўзровень індывідуалізму, характэрны для беларускіх сялян. Сельская абшчына з яе кругавой парукай і перадзеламі зямлі, якая натуральна ўспрымалася рускімі сялянамі, была ўведзена пад націскам расійскага ўрада толькі ва ўсходніх раёнах Беларусі. У заходніх і цэнтральных раёнах панавала падворнае сялянскае землекарыстанне.

Захаванне буйнога памешчыцкага землеўладання, абеззямельванне сялян абумовілі і развіццё сялянскага руху Беларусі ў пасляэформенны час. Асноўнымі патрабаваннямі сялян былі вяртанне зямель, адрэзаных памешчыкамі падчас адмены прыгоннага права, памяншэнне падаткаў і павіннасцей, пазбаўленне ад саслоўнага няраўнапраўя. Дынаміка сялянскіх выступленняў была нераўнамернай. Калі ў першыя гады пасля падаўлення паўстання 1863 г. адбыўся спад сялянскіх

пратэстаў, то ў 1870-х гг. назіраўся іх пад'ём. Акрэсленую вастрыню і размах сялянскі рух набыў у сярэдзіне 1880–90-х гг., калі побач з традыцыйнымі канфліктамі сялян з памешчыкамі з'явіліся новыя – паміж сельскай буржуазіяй і беднатой. Як своеасаблівая форма пратэсту ўспрымаўся значны рух сялян за перасяленне ў Сібір і паўднёвыя расійскія губерні, адзначаны найперш у Магілёўскай, Віцебскай і асобных паветах Мінскай губерні. Паступова элементы арганізаванасці і самасвядомасці пранікалі ў сялянскае асяроддзе, адбіваліся на светапоглядзе селяніна, узмацнялі ў ім пачуццё грамадзянскасці. Стандартным адказам мясцовай адміністрацыі на сялянскія хваляванні было прымяненне воінскіх каманд.

Ускладненне эканамічных адносін на вёсцы, рост колькасці пазямельных спрэчак, ігнараванне расійскім заканадаўствам спецыфічных умоў мясцовага жыцця, недахоп пісьменнасці ў сельскіх жыхароў, ведаў законаў і кампетэнцый дзяржаўных устаноў стварылі спрыяльную глебу для пашырэння дзейнасці вясковых адвакатаў. Імі станавіліся розныя адстаўныя асобы, мясцовыя яўрэі і нават больш-менш пісьменныя сяляне. Для многіх адвакацкая дзейнасць была асноўным заняткам, крыніцай даходаў. Сяляне-адвакаты пакідалі земляробчыя заняткі, пастаянна займаліся падрыхтоўкай судовых разбораў. Іх дзейнасць была шырокай і запатрабаванай сярод вясковага насельніцтва. Часам адвакаты самі ініцыявалі звароты сельскіх жыхароў у судовыя ўстановы.

У сувязі з малазямеллем сялян вырас іх адыход на промыслы. Амаль палова сялян значную частку даходаў атрымлівалі не праз сельскагаспадарчыя заняткі. Сярод адыходных промыслаў пераважалі неземляробчыя, аднак паступова павялічвалася ўдзельная вага сельскагаспадарчага адыходу. Больш шырокае распаўсюджанне промыслы атрымалі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. Аднак у першыя паслярэформенныя дзесяцігоддзі беларускія сяляне праяўлялі невысокі адносна іншых рэгіёнаў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі ўзровень тэрытарыяльнай мабільнасці. У той час калі насельніцтва беларускіх губерняў складала 7,5 % гэтай часткі дзяржавы, беларусаў сярод адыходнікаў налічвалася каля 5 %. У 1860-х гг. штогод у беларускіх губернях пакідалі свае гаспадаркі і накіроўваліся на заработкі ў гарады, сельскагаспадарчыя раёны Расійскай імперыі і за мяжу ў сярэднім каля 61 тыс. чалавек, у 1890-я гг. – звыш 400 тыс. чалавек.

Выхадцы з вёскі мелі няшмат шансаў знайсці працу ў беларускіх гарадах з-за слабасці і невялікай патрэбы ў рабочых руках гарадской прамысловасці, а таксама канкурэнцыі з боку яўрэйскай беднаты. Яны

часцей знаходзілі сабе прымяненне на будаўніцтве чыгунак, прадпрыемствах Масквы, Пецярбурга, Адэсы і інш. Значным быў адыход на кароткачасовыя заробкі. Вызначалася нават пэўная рэгіянальная спецыялізацыя адыходу: вялікі паток насельніцтва з Віцебскай і ў меншай ступені з Віленскай губерняў накіроўваўся ў Пецярбургскую губерню, з Магілёўскай і Мінскай – у Кіеўскую, Екацярынаслаўскую і Херсонскую, з Гродзенскай – у Варшаўскую.

Значным быў рух з мэтай перасялення на малазаселеныя землі Сібіры, Далёкага Усходу, Паўночнага Каўказа. З 1896 па 1900 г. з беларускіх губерняў выехала 100,6 тыс. сельскіх жыхароў (для параўнання, з 1886 па 1895 г. – 4,1 тыс. чалавек). Аднак нямала было «зваротнікаў». За апошнія пяць гадоў XIX ст. на радзіму вярнуліся 14,1 % перасяленцаў, якія не змаглі справіцца з цяжкасцямі адаптацыі ці нават не дабраліся да новага месца жыхарства. Імкненне сялян набыць зямлю праз перасяленне ў аддаленыя раёны краіны нярэдка нарастала пад уплывам агітацыі рэвалюцыянераў, а часам і ашуканцаў, якія за грошы складалі розныя спісы, хадайніцтвы і г. д. У справаздачы віцебскага губернатара за 1896 г. адзначалася: «Перасяленчы рух, які пачаўся ў Віцебскай губерні з восені 1894 г., у справаздачным годзе ахапіў амаль усю губерню і набыў масавы характар... нягледзячы на пастаянныя тлумачэнні... вельмі многія з сялян, таемна распрадаўшы маёмасць... з усім сваім астатнім скарбам накіроўваліся на бліжэйшыя чыгуначныя станцыі. Партыі такіх самавольных перасяленцаў часам бывалі настолькі значнымі, што мясцовая паліцыя нярэдка была не ў стане спыніць іх рух і не магла перашкаджаць пасадцы перасяленцаў на цягнікі. Пры затрыманні такіх перасяленцаў і асабліва некаторых хадакоў, атрымаўшых у краі вядомасць як асабліва старанных і, канечне, не бескарыслівых агітатараў перасяленчага руху, былі выпадкі даволі буйных сутыкненняў з паліцыяй». Падкрэсліваючы далей карыснасць новага цыркуляра міністра ўнутраных спраў ад 20 студзеня 1896 г. аб новым парадку перасяленняў і неабходнасці пасылаць папярэдне ад кожнай сям'і хадакоў, віцебскі губернатар асобна выказаў меркаванне: «Паездка ў Сібір людзей, асабіста зацікаўленых у выбары падыходзячага месца для жыцця сям'і, падзейнічала самым выцвяражальным чынам на масы. Ілюзіі аб новым краі, створаныя перавялічанымі расказамі розных прайдзісветаў, разваліліся; якасць зямлі, бытавыя і кліматычныя ўмовы былі ацэнены належным чынам, і грамадная большасць хадакоў, расчараваныя ў Сібіры, вярнуліся дахаты і ўзяліся за ранейшыя свае заняткі, больш не падумваючы аб спусташальным перасяленні ў далёкую Сібір».

Сялянскія перасяленні на ўсход Расіі і за мяжу прыводзілі да вымывання сярэдняй па заможнасці групы вясковага насельніцтва, якая складала асноўную масу мігрантаў. Пачынаючы з 1880-х гг. многія сяляне, асабліва заходняй часткі Беларусі, у пошуках заробку накіроўваліся за мяжу, галоўным чынам у Амерыку. У паведамленні гродзенскага губернатара віленскаму генерал-губернатару ад 20 кастрычніка 1890 г. адзначалася з'яўленне ў некаторых паветах эміграцыйнага руху сялян, пераважна католікаў, у Бразілію. Большасць ад'язджала тайна, без пашпартоў. Значная частка такіх мігрантаў праз некалькі гадоў вярталіся на радзіму, назапасіўшы сродкі для набыцця зямлі і пашырэння гаспадаркі. Паводле прыкладных падлікаў у Амерыку да пачатку Першай сусветнай вайны выехала звыш 500 тыс. беларусаў.

## Сельская грамада, рэгіянальныя асаблівасці яе функцыянавання ў Беларусі

У паўсядзённым жыцці сялян шэраг важных функцый выконвала сельская грамада, ва ўсходняй частцы Беларусі – абшчына, якая тут набыла новае жыццё пасля адмены прыгоннага права. У «Агульных палажэннях» акрэсліваліся асноўныя прынцыпы арганізацыі, пабудовы і функцыянавання сельскай грамады для былых памешчыцкіх сялян. З 1867 г. гэтыя правілы самакіравання былі распаўсюджаны на былых дзяржаўных сялян. Кожны селянін у абавязковым парадку прыпісваўся да сельскай грамады. У яе склад уваходзілі, як правіла, сяляне, якія раней належалі да аднаго маёнтка. Яе ўтварэнне і функцыянаванне характарызаваліся ў Беларусі рэгіянальнымі асаблівасцямі. Намінальна сельская грамада мела аднолькавую назву для ўсіх рэгіёнаў Беларусі. Адрозненні датычыліся пытанняў землеразмеркавання і карыстання. У Віцебскай і Магілёўскай губернях, дзе пераважала абшчынная форма землекарыстання і землеўладання, сельская грамада мела кантроль за размеркаваннем і пераразмеркаваннем зямлі. У іншых рэгіёнах Беларусі сельская абшчына была прадстаўлена ў нязначных памерах. Фактычна абшчына выступала ўласнікам зямлі. У губернях, дзе панавала падворная форма землеўладання, быў абмежаваны ўплыў сельскай грамады на распараджэнне сялянскімі землямі. Тут яна не займалася пытаннямі пазямельнага ўладкавання. Выключэнне складалі пусташы, агульныя ўгоддзі. Ворыўнай зямлёй распараджаўся кожны гаспадар самастойна. У заходніх і цэнтральных раёнах Беларусі грамада выступала ў большай ступені ў якасці формы сялянскага самакіравання.

Урадавыя колы прыклалі намаганні для актывізацыі функцыянавання абшчыны на тэрыторыі Беларусі ў сувязі з уладкаваннем сялянства пасля адмены прыгоннага права. У гэтым кірунку спрабавалі дзейнічаць адміністрацыі віленскіх генерал-губернатараў М. М. Мураўёва і К. П. Каўфмана. У пасляреформенны перыяд актывізаваліся адміністрацыйна-паліцэйскія і фіскальныя функцыі грамады (абшчыны). Выбарныя органы грамады сталі ніжэйшым звяном адміністрацыйнага кіравання ў вёсцы на землях сялян усіх катэгорый. Адміністрацыйны кантроль над органамі самакіравання грамады ўзмацніўся ў канцы 70-х гг. XIX ст. з утварэннем павятовых устаноў па сялянскіх справах і асабліва з увядзеннем у пачатку XX ст. інстытута земскіх начальнікаў.

Большасць абшчын у адміністрацыйных адносінах стваралі асобную сельскую грамаду. У канцы 70-х гг. XIX ст. доля абшчыннага землеўладання ў Магілёўскай губерні складала 83,7 %, у беларускіх паветах Віцебскай губерні – 44,9 %. Паступова адбываўся пераход сялян ад абшчыннага да падворнага землеўладання, пры якім абшчына валодала толькі надзельнымі выганамі, лесам, рыбным ловам, пусткамі. Да канца 70-х гг. XIX ст. да падворнага землеўладання перайшлі 25 вёсак Чэрыкаўскага павета, да пачатку XX ст. – 88 вёсак Віцебскага павета. У Беларусі на адну грамаду прыходзілася ў сярэднім 2–3 паселішчы, прыкладна 40 двароў.

Абшчына выконвала істотныя эканамічныя, грамадскія (дабрачынныя), ідэалагічныя і іншыя функцыі. Выкуп зямлі праводзіла сельская абшчына. У яе межах сялянскія двары мелі права на часовае індывідуальнае карыстанне ворнай зямлёй і сенакосамі. Выганы знаходзіліся ў карыстанні ўсёй абшчыны. Галоўным прынцыпам абшчыннага землеўладання быў перыядычны перадзел угоддзяў пры ўмове адпаведнага патрабавання 2/3 гаспадароў абшчыны. Як правіла, перадзел адбываўся не часцей аднаго разу ў 10–15 гадоў. Да пачатку 90-х гг. XIX ст. перадзелы не рэгламентаваліся і рашэнні па гэтым пытанні былі цалкам у кампетэнцыі сельскіх сходаў. У 1893 г. быў прыняты закон, паводле якога пастановы сходаў кантралявалі земскія начальнікі і зацвярджалі павятовыя міравыя з'езды. Члены абшчыны былі звязаны кругавой парукай за своечасовае выкананне казённых, земскіх і грамадскіх павіннасцей. У сельскай грамадзе захаду і цэнтра Беларусі, дзе панавала падворнае землекарыстанне, кругавая парука практыкавалася вельмі рэдка. Поўнасцю яна была ліквідавана ў 1903 г.

У функцыянаванні грамады захаваліся элементы ўзаемадапамогі на выпадак стыхіі, хваробы ці страты дарослага работніка і кармільца

ў гаспадарцы, размеркавання падаткаў, выканання павіннасцей і інш. На заможных гаспадароў грамадой накладваўся маральны абавязак ахвяраваць на сірот, удоў, адзінокіх старых і інш. Адмова накарміць жабрака ў вёсцы заўсёды выклікала ўсеагульнае абурэнне. У сельскай грамадзе спалучаліся дзве структуры – афіцыйная і нефармальная. У афіцыйнай існавала іерархія кіраўнікоў: стараста, пісар, зборшчык падаткаў, дзясяцкі, соцкі і інш. У нефармальнай структуры дзейнічалі неафіцыйныя лідары, аўтарытэт якіх быў заснаваны на гаспадарчым і жыццёвым вопыце. Рашаючым элементам кіраўніцтва ў сельскай грамадзе выступаў агульны сход, арганізацыя і правядзенне якога былі заснаваны пераважна на шматвекавой традыцыі. Сяляне імкнуліся ўдзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах грамады, паколькі яе рашэнні закраналі гаспадарчыя патрэбы практычна кожнай сям'і. Ігнараванне думкі і пастанаўленняў грамады ўспрымалася надзвычай адмоўна.

Выхад з сельскай грамады для селяніна быў няпростым. Для гэтага ў выпадку абшчыннага землеўладання патрэбна была згода сельскага сходу і аплата паловы выкупной пазыкі за зямлю пры паручыцельстве з боку грамады за выплату астатняй часткі. Пры падворным землеўладанні для выхаду дастаткова было згоды з боку гаспадара дома пры ўмове адмаўлення ці продажу сваёй долі надзелу, а наступны ўладальнік павінен быў пагасіць выкупныя плацяжы.

У 60–90-я гг. XIX ст. выразна выявіліся рысы паступовага распаду традыцыйнай беларускай вёскі. Пад уплывам развіцця капіталістычных адносін змянялася структура сельскагаспадарчай вытворчасці, адбывалася трансфармацыя памешчыцкіх гаспадарак у прадпрымальніцкія. Запатрабаванні жыцця сталі вызначальнымі для сялянскага асяродку, звычайнымі справамі для яго былі працоўная міграцыя, узрастаючая маёмасная дыферэнцыяцыя, работа па найме, а таксама ўзнікненне і пашырэнне сярод сельскіх жыхароў уяўлення, што зямля не адзіны сродак існавання і дабрабыту.

Тэма 6

# ПРАМЫСЛОВАСЦЬ І ГАРАДЫ. ТРАНСПАРТ, ГАНДАЛЬ І КРЭДЫТ

**Развіццё прамысловасці.**
**Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі Беларусі.**
**Колькасць, склад, становішча рабочых.**
**Развіццё гарадоў.**
**Транспарт і гандаль.**
**Фарміраванне фінансава-крэдытнай сістэмы.**

## Развіццё прамысловасці

У другой палове XIX ст. назіралася павелічэнне ролі прамысловай вытворчасці ў эканамічным жыцці беларускіх губерняў. Прамысловасць Беларусі развівалася ў кірунку перапрацоўкі пераважна мясцовай мінеральнай, лясной і сельскагаспадарчай сыравіны, аднак паступова некалькі змяніліся прыярытэты ў яе структуры. Аказаліся неканкурэнтаздольнымі металургічная, цукровая, суконная галіны вытворчасці. На працягу першых двух дзесяцігоддзяў пасля рэформы 1861 г. прамысловы рост быў запаволены. Па-ранейшаму па ўсіх паказчыках пераважалі дробная вытворчасць і мануфактура. У 1873–1875 гг. Беларусь была ахоплена прамысловым крызісам,

які выявіў нізкую пакупную здольнасць селяніна – галоўнага спажыўца тавараў. Крызіс закрануў пераважна дрэваапрацоўчыя і харчасмакавыя, дробныя і мануфактурныя прадпрыемствы. Крызіс 1881–1882 гг. зноў ахапіў харчасмакавую, дрэваапрацоўчую, сілікатную, гарбарную і тэкстыльную галіны. Працэс развіцця прамысловай вытворчасці значна паскорыўся ў 1880–90-я гг. За апошняе дзесяцігоддзе XIX ст. сярэднегадавы яе прырост складаў прыблізна 8,2 %, што ў два разы вышэй, чым у папярэднія дзесяцігоддзі. Прамысловае развіццё ў гэты перыяд выклікала інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва.

У 1860 г. на Беларусі налічвалася 20 тыс. рамесніцкіх майстэрань, 7,8 тыс. немеханізаваных дробнакапіталістычных прадпрыемстваў, 140 мануфактур і 76 фабрык і заводаў. Большая частка рамесніцкай вытворчасці Беларусі была сканцэнтравана ў гарадах і мястэчках. За чатыры паслярэформенныя дзесяцігоддзі адбылося яе павелічэнне, што было абумоўлена перш за ўсё попытам сялянства, местачковага і гарадскога насельніцтва на прадметы штодзённага ўжытку і паслугі. Хуткімі тэмпамі развіваліся новыя віды рамёстваў – хімічныя, метала- і дрэваапрацоўчыя. Павялічылася ўдзельная вага рамесных прадпрыемстваў – з 23,2 (1860) да 55,3 % (1890). У канцы XIX ст. іх налічвалася звыш 58 тыс. Аднак доля рамесніцкіх майстэрань у агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці знізілася за паслярэформенны перыяд з 18,7 да 9,0 %, але заставалася даволі высокай у 1900 г. у металаапрацоўчай (31 %), хімічнай (29 %), дрэваапрацоўчай (19 %), сілікатна-будаўнічай (12 %) галінах. Звычайна майстэрні рамеснікаў былі невялікія. У іх працавалі самі гаспадары («майстры») з 2–3 наёмнымі рабочымі, а нярэдка і без іх. Падзел працы ў працэсе вытворчасці тут адсутнічаў, усе работы выконваліся ўручную. Збытам тавару спачатку займаўся сам рамеснік, потым з'явіліся скупшчыкі, якія рэалізоўвалі вырабы і куплялі сыравіну для рамеснікаў. Паступова скупшчык ператвараўся ў дробнага прадпрымальніка, а залежныя ад яго рамеснікі – у наёмных работнікаў. Рамяство ва ўмовах развіцця таварна-грашовых адносін перарастала ў дробную вытворчасць у форме простай кааперацыі.

Да дробнакапіталістычных прадпрыемстваў прынята адносіць тыя, на якіх працавала 5–15 рабочых, адсутнічаў паравы рухавік, а таксама вадзяныя і ветраныя млыны, пільні і алейні (да 10 рабочых), вінакурні і піваварні з вытворчасцю да 25 тыс. вёдзер адпаведнага напітку ў год і іншыя прадпрыемствы, на якіх выраблялася прадукцыі менш чым на 1 тыс. руб. у год. У 1860 г. дробнакапіталістычная прамысловасць складала 9 % ад агульнай колькасці прадпрыемстваў і 62 % ад выра-

бленай прадукцыі, і да 1888 г. на яе прадпрыемствах выпрацоўвалася больш за палову прамысловых вырабаў Беларусі. Аднак у сувязі з інтэнсіўным павелічэннем мануфактурна-фабрычнай вытворчасці ў канцы XIX ст. удзельная вага дробнакапіталістычнай паменшылася да 28,2 %, хоць доля яе ў той самы час па колькасці прадпрыемстваў павялічылася на 7 %.

У другой палове XIX ст. адзначаўся рост мануфактурнай вытворчасці. Яе ўдзельная вага ў гэты перыяд павялічылася па аб'ёме вытворчасці з 7,2 да 15,1 %, па колькасці прадпрыемстваў – з 0,2 да 0,7 %. У 1890 г. у Беларусі працавала 760 мануфактур, у тым ліку 193 дрэваапрацоўчыя, 185 сілікатных. Машынная вытворчасць у гэты перыяд развівалася найбольш інтэнсіўна. Колькасць фабрык і заводаў павялічылася ў 15 разоў і склала на канец XIX ст. 1137 прадпрыемстваў. Аб'ём вытворчасці на іх павялічыўся ў 37 разоў, колькасць рабочых – у 9. Да 1890 г. доля фабрычна-заводскай вытворчасці ў агульным аб'ёме прамысловасці склала 46,2 % (1860 г. – 8,4 %), па колькасці прадпрыемстваў – 1,1 % (1860 г. – 0,1 %). Тэмпы росту аб'ёму вытворчасці і колькасці занятых наёмных работнікаў у мануфактурнай і фабрычна-заводскай прамысловасці ў 4–7 разоў перавышалі адпаведныя паказчыкі ў дробнай. Пачалі дзейнічаць запалкавыя фабрыкі ў Барысаве (1881) і Пінску (1882), тытунёвая ў Гродне (1862), папяровая ў Добрушы (1871) і інш. Пад канец XIX ст. адчувальным стаў уплыў замежнага, асабліва нямецкага, капіталу. Пераход ад ручной да машыннай вытворчасці ў Беларусі меў адметную асаблівасць. У адрозненне ад велікарускіх губерняў, ён разгортваўся не ў тэкстыльнай, а перш за ўсё ў харчасмакавай і металаапрацоўчай галінах.

Шырокае чыгуначнае і прамысловае будаўніцтва садзейнічала паскоранаму росту вырабу сродкаў вытворчасці. Пры павелічэнні аб'ёму ўсёй прадукцыі па Беларусі ў 6,8 раза ў цяжкай прамысловасці вытворчасць вырасла ў 12 разоў. У канцы XIX ст. сродкі вытворчасці складалі 32 % усёй прамысловай прадукцыі Беларусі (для параўнання – па Расійскай імперыі каля 40 %). Найбольш буйныя фабрыкі і заводы знаходзіліся ў гарадах. Аднак 2/3 фабрык і заводаў Беларусі і амаль палова занятых там рабочых былі сканцэнтраваны ў вёсцы. Гэта ў значнай ступені абумоўлена спецыялізацыяй беларускай прамысловасці і наяўнасцю ў сельскай мясцовасці таннай рабочай сілы.

Узровень развіцця прамысловасці ў Беларусі быў у цэлым ніжэйшы, чым у сярэднім па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі. У 1900 г. у Беларусі на душу насельніцтва прыпадала 8,69 руб. прамысловага

абаротнага капіталу, тады як у Еўрапейскай Расіі – 26,4 руб. Тэхнічнае пераўзбраенне прамысловасці Беларусі да канца XIX ст. не завяршылася. Па тэмпах і ўзроўні індустрыяльнага развіцця беларускія губерні адставалі ад найбольш перадавых рэгіёнаў Еўрапейскай Расіі. Тут адсутнічалі буйныя прамысловыя цэнтры, значныя прадпрыемствы па вырабе сродкаў вытворчасці. Попыт на прамысловую прадукцыю ў першыя дзесяцігоддзі пасля адмены прыгоннага права быў не вельмі высокі. Аднак гэта не перашкаджала з'яўленню на тэрыторыі Беларусі ўнікальных вытворчасцей: адна з нямногіх у Расійскай імперыі алоўкавая фабрыка ў Гродне атрымала ў 1889 г. на сусветнай выставе ў Парыжы ганаровы водзыў; у 1892 г. у Віцебску пачала дзейнічаць першая ў імперыі фабрыка акуляраў і аптычных прылад. У 1884 г. у Пінску быў адкрыты першы ў паўночна-заходняй частцы Расійскай імперыі суднабудаўнічы завод. Акрамя таго, паралельнае існаванне рамесніцкіх майстэрань, мануфактур і фабрык не сведчыла аб адсталасці прамысловага развіцця Беларусі, а было абумоўлена арыентацыяй на выкарыстанне пераважна сельскагаспадарчай сыравіны, перапрацоўка якой не патрабавала стварэння вялікіх прамысловых магутнасцей, а таксама структурай мясцовых працоўных рэсурсаў, наяўнасцю значнай колькасці танных працоўных рук.

## Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі Беларусі

Развіццё прамысловасці і гандлю садзейнічала фарміраванню прадпрымальніцкай дзейнасці і адпаведнага асяроддзя. Буржуазія колькасна пашыралася за кошт прадстаўнікоў розных саслоўяў, найперш дваранства і купецтва, а таксама мяшчан, саслоўя ганаровых грамадзян, сялян і інш. У другой палове XIX ст. агульная колькасць уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў узрасла з 28,2 тыс. у 1860 г. да 77,1 тыс. чалавек у 1900 г. Сюды ўключаны ўладальнікі як рамесніцкіх майстэрань, так і мануфактур, фабрык.

У 60-х гг. XIX ст. 83 % мануфактур і фабрык Беларусі належала дваранам. З 94 прадпрыемстваў, якія знаходзіліся ў іх уласнасці, было 55 харчовых, прычым тут перавага аддавалася вінагарэлачнай, цукровай, мукамольна-крупяной вытворчасцям; 17 сілікатна-будаўнічых; 7 металаапрацоўчых і г. д. Купцы валодалі 16 % фабрык і мануфактур. Іх капіталы былі сканцэнтраваны ў асноўным у суконна-шарсцяной і харчовай вытворчасцях.

Да канца XIX ст. удзельная вага дваранскіх прадпрыемстваў у мануфактурна-фабрычнай прамысловасці знізілася да 45 %, хоць колькасць іх складала 281. Па-ранейшаму асноўная маса прадпрымальнікаў з ліку вышэйшага саслоўя валодала харчовымі прадпрыемствамі (73,7 %). Сярод фабрык і мануфактур дваран 15,7 % былі дрэваапрацоўчыя, 4,6 % – сілікатна-будаўнічыя. Купцам належала 189 (30 %) мануфактур і фабрык. Мяшчане валодалі 93 буйнымі прадпрыемствамі (15 %). Яны ўкладвалі свае капіталы ў першую чаргу ў гарбарна-абутковую і дрэваапрацоўчую вытворчасці.

У канцы XIX ст. назіралася тэндэнцыя да зніжэння ўдзельнай вагі дваран сярод сярэдніх і буйных прамыслоўцаў і росту прадпрымальніцкай дзейнасці купцоў і мяшчан. У 1900 г. большая частка дваран-прамыслоўцаў валодала фабрыкамі і заводамі з колькасцю рабочых да 20 чалавек і толькі 23 % іх мелі адносна буйныя прадпрыемствы з колькасцю наёмных работнікаў звыш 51. Сярод купцоў пераважалі сярэднія і буйныя прамысловыя прадпрымальнікі, а дробных было менш. Мяшчане валодалі пераважна невялікімі фабрыкамі і заводамі (з колькасцю рабочых да 30 чалавек). Сярод буржуазіі асноўную масу складалі мясцовыя прадпрымальнікі.

У другой палове XIX ст. назіраецца развіццё гандлёвага прадпрымальніцтва. Састаў прадпрымальнікаў паводле саслоўнага паходжання і сацыяльна-эканамічнага становішча істотна пашырыўся. Да канца XIX ст. гандаль і іншая прамысловая дзейнасць у асноўным заканадаўча звязваліся з прыналежнасцю да купецкага саслоўя. Кошт гільдзейскіх дакументаў разам з прамысловымі пасведчаннямі і іншымі зборамі дасягаў досыць значнай сумы. Купецкае званне ўспрымалася як сінонім буйной буржуазіі. Пасля прыняцця закона аб дзяржаўным прамысловым падатку стала неабавязковым запісвацца ў купецкае званне, каб набыць прамысловае пасведчанне і займацца прадпрымальніцтвам. Яго саслоўныя перавагі набылі шмат у чым дэкаратыўны характар. Але для купецтва Беларусі вельмі актуальнай заставалася адзіная рэальная карпаратыўная ільгота, якая пазбаўляла ад неабходнасці прыпіскі, што было абавязковым, напрыклад, для сялян і мяшчан. Гэта іншы раз вызваляла ад аб'ёмнай валакіты па адмацаванні ад сваёй грамады, што асабліва істотна было для мясцовай яўрэйскай буржуазіі, бо давала права на жыхарства па-за межамі рысы аседласці.

Паводле перапісу насельніцтва 1897 г., купцы складалі 0,22 % (18,3 тыс. чалавек) насельніцтва пяці беларускіх губерняў. Гэты паказ-

чык вельмі нязначна перавышаў сярэдні па Расійскай імперыі – 0,2 %. Сярод купецтва Беларусі пераважную большасць складалі асобы, якія прызнавалі ў якасці роднай мовы яўрэйскую. Па губернях удзельная вага гэтых асоб размеркавалася наступным чынам: Віленская – 77,7 %, Віцебская – 84,85, Гродзенская – 81,4, Магілёўская – 90,79, Мінская – 86,02 %. Наступнай па колькасці была група купцоў, якая вызначыла роднай рускую мову. Па губернях лічбавыя паказчыкі ў адпаведным парадку размеркаваліся наступным чынам: 16,5 %; 10,6; 11,08; 5,81; 11,22 %. Трэцім па велічыні стаў купецкі асяродак з беларускай мовай у якасці роднай: 0,2 %; 1,98; 2,17; 1,22; 2,54 %. Польскую мову прызналі роднай адпаведна па губернях 3,15 %; 0,68; 0,13; 0,26; 0,85 % купцоў. Найбольшая колькасць рускамоўных купцоў пражывала ў заходняй частцы Беларусі, а тыя, якія прызналі ў якасці роднай яўрэйскую, – ва ўсходняй.

Купецтва не ўяўляла сабой усю буржуазію Беларусі. Многія прадпрымальнікі лічылі для сябе больш мэтазгодным набываць гадавыя і паўгадавыя пасведчанні на права займацца гандлем і промысламі, але не выкуплялі гільдзейскія дакументы. Статыстыка набытых прамысловых дакументаў улічвала і дробнае прадпрымальніцтва (развозны, разносны гандаль і г. д.). Напрыклад, у 1895 г. у Мінскай губерні было выдадзена 14 239 гадавых дакументаў, у тым ліку 2529 (17,8 %) купецкіх; 1054 паўгадавыя, з іх 136 (12,9 %) гільдзейскіх. Па Магілёўскай губерні ў 1895 г. было прададзена гандлёва-прамысловых пасведчанняў і білетаў 12 772 гадавыя (2530 (19,8 %) купецкіх) і 818 паўгадавых (130 (15,9 %) гільдзейскіх). Дакументы выкуплялі не толькі купцы, але і мяшчане, часам сяляне і інш.

Па эканамічнай магутнасці буржуазія беларускіх губерняў уступала гандлёва-прамысловым прадпрымальнікам некаторых суседніх прыбалтыйскіх і правабярэжных украінскіх губерняў. У Беларусі гандлёвая буржуазія па велічыні зваротных капіталаў перавышала прамысловую. У гандлі было сканцэнтравана 76,08 % зваротных капіталаў, у прамысловасці – 23,92 %. У сярэднім па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі гэтыя суадносіны былі прадстаўлены адпаведна 62,97 і 37,03 %. Тым не менш к канцу XIX ст. некаторыя сем'і прадпрымальнікаў валодалі цэлымі галінамі вытворчасці ў Беларусі. Напрыклад, купцу Шэрашэўскаму належала тытунёвая вытворчасць у Гродне, купцам Якабсону і Ліўшыцу – машынабудаванне ў Мінску і г. д. Прадпрымальнікі-купцы разам з мяшчанамі паступова сталі валодаць усёй тытунёвай вытворчасцю Беларусі. Ім належала таксама

89 % ільноперапрацоўчых прадпрыемстваў, 84 % друкарань і слясарных майстэрань, 73 % запалкавых прадпрыемстваў і г. д.

Да канца XIX ст. працэс станаўлення гандлёва-прамысловай буржуазіі Беларусі як сацыяльнай групы не завяршыўся. Кансалідацыі буржуазіі перашкаджалі саслоўныя перагародкі паміж яе прадстаўнікамі, а таксама іх нацыянальна-рэлігійныя адрозненні. Беларуская нацыянальная буржуазія ў другой палове XIX ст. знаходзілася на стадыі фарміравання і складала найбольш слабую групу мясцовага прадпрымальніцкага асяродку.

## Колькасць, склад, становішча рабочых

Яшчэ да правядзення аграрнай рэформы 1861 г. у прамысловасці Беларусі налічвалася 41,5 тыс. наёмных работнікаў, у тым ліку 3,1 тыс. фабрычных і 4,7 тыс. мануфактурных. У 60–70-я гг. XIX ст. павелічэнне колькасці пралетарыяту ў Беларусі адбывалася адносна невысокімі тэмпамі. У далейшым, асабліва ў 1890-я гг., рост колькасці рабочых паскорыўся. Новай з'явай стала ўзнікненне групы спадчынных рабочых. У канцы XIX ст. яны складалі каля 20 % ад агульнай колькасці прамысловага пралетарыяту Беларусі. На мяжы XIX–XX стст. у прамысловасці Беларусі працавала 237 тыс. рабочых, што складала прыкладна 3 % ад агульнай колькасці насельніцтва. На чыгунках колькасць рабочых дасягала 25 тыс. чалавек. Разам з іншымі сферамі народнай гаспадаркі агульны паказчык пастаянных наёмных работнікаў дасягаў у той час 460 тыс. чалавек. Пралетарыят папаўняўся за кошт збяднелых мяшчан, рамеснікаў, гандляроў, а таксама збяднелага сялянства, якое з-за існаваўшай у той час рысы аседласці яўрэяў і адносна невялікіх магчымасцей гарадской прамысловасці не магло знайсці працу на прадпрыемствах гарадоў і мястэчак Беларусі і шукала найму на працу ў сельскай і лясной гаспадарцы, а таксама на транспарце і прамысловых прадпрыемствах, размешчаных у вёсках. Яўрэі складалі большасць сярод гарадскога прамысловага пралетарыяту Беларусі. Паводле даных перапісу насельніцтва 1897 г., сярод рабочых беларускіх губерняў, якія былі заняты ў прамысловасці, гандлі, на транспарце, у якасці прыслугі і падзёншчыкаў, 17,1 % былі беларусы, 10,1 – рускія, 10,2 – палякі, 60 % – яўрэі. У той час сярод рабочых 86,8 % складалі ўраджэнцы той жа губерні, дзе знаходзілася месца працы, 5 % былі выхадцамі з іншых беларускіх губерняў.

Становішча рабочых было розным у залежнасці ад галіны і характару вытворчасці, велічыні прадпрыемства. На яго таксама ўплывалі саслоўныя, канфесійныя, этнічныя адрозненні работнікаў. На больш буйных і тэхнічна абсталяваных прадпрыемствах, як правіла, лепшымі былі ўмовы працы, некалькі вышэй заработная плата. Напрыклад, на Добрушскай папяровай фабрыцы (паперні) у 1894 г. упершыню ў Расійскай імперыі быў уведзены васьмігадзінны працоўны дзень. На прадпрыемстве працавала бальніца, дзе за кошт адміністрацыі аказвалася медыцынская дапамога, дзейнічала фабрычная ашчадная каса, бясплатнае вучылішча. Лепшымі былі ўмовы працы на чыгунцы. Але гэтыя прыклады былі хутчэй выключэннем. На пераважнай частцы прадпрыемстваў Беларусі, найперш дробных, у рамесных майстэрнях для эканамічнага выжывання ў канкурэнтнай барацьбе выкарыстоўваліся больш жорсткія метады эксплуатацыі наёмных работнікаў, прымяняліся жаночая і дзіцячая праца, быў больш працяглы працоўны дзень, які часта дасягаў 13–14 гадзін, і меншая заработная плата. Матэрыяльнае становішча вельмі многіх рабочых было цяжкім: яны жылі ў жабрацкіх умовах, адсутнічалі пенсійнае забеспячэнне і сацыяльнае страхаванне, былі высокія і адвольныя штрафы.

Нарастанне магчымасці сацыяльнага канфлікту паміж рабочымі і ўладальнікамі прадпрыемстваў патрабавала крокаў па рэгламентацыі іх адносін. Першапачаткова становішча рабочых у фабрычна-заводскай вытворчасці не рэгулявалася ніякімі заканадаўчымі дакументамі. Пачатак быў пакладзены Законам ад 29 чэрвеня 1882 г., паводле якога забаранялася праца на фабрыках і заводах дзяцей ва ўзросце да 12 гадоў, а таксама начная работа непаўналетніх і жанчын. Працоўны дзень дзяцей ва ўзросце 12–15 гадоў абмяжоўваўся 8 гадзінамі. Для нагляду за тым, як прадпрымальнікі прытрымліваюцца фабрычнага заканадаўства, была створана інспекцыя. Яе кампетэнцыя на практыцы звычайна абмяжоўвалася цэнзавымі прадпрыемствамі – тымі, дзе працавала не менш за 30 рабочых пры адсутнасці паравога рухавіка ці не менш за 16 пры яго наяўнасці. Фактычна са сферы дзейнасці інспекцыі і прымянення фабрычна-заводскага заканадаўства выпадала асноўная частка дробных па сваіх памерах прамысловых прадпрыемстваў Беларусі. У 1884 г. беларускія губерні былі аднесены да Віленскай фабрычнай акругі.

Законам ад 3 чэрвеня 1885 г. на шкоднай вытворчасці забараняліся начныя работы жанчын і непаўналетніх ва ўзросце да 17 гадоў. Закон ад 3 чэрвеня 1886 г. устанаўліваў парадак прыёму на працу і звальнен-

ня рабочых. Кожнаму з іх пры найме выдавалася разліковая кніжка. Забаранялася разлічвацца ўмоўнымі знакамі, хлебам, таварамі і іншымі прадметамі, а таксама браць з рабочых працэнты за пазычаныя грошы. Не дазвалялася браць з наёмных работнікаў плату за медыцынскую дапамогу, асвятленне майстэрань і выкарыстанне абсталявання. Накладаць штрафы можна было толькі за няякасную працу, прагулы і парушэнне парадку. Агульная сума штрафаў не павінна была перавышаць трэцяй часткі заробку, а іх адлічэнні накіроўваліся на выплату дапамогі рабочым. Пашыраліся функцыі фабрычнай інспекцыі; на яе былі ўскладзены задачы кантролю за выкананнем норм заканадаўства, разгляд скаргаў рабочых, урэгуляванне працоўных канфліктаў. Забастоўкі не дазваляліся. Фабрычная інспекцыя ўстанаўлівала максімум платы з рабочых за найманне жылля, карыстанне лазнямі, а таксама пералік і кошт важнейшых тавараў у крамах пры фабрыках і заводах. Закон уводзіўся ў дзеянне паступова: з 1894 г. пашыраўся на Гродзенскую губерню, з 1896 г. – на Віленскую і Віцебскую, з 1897 г. – на Магілёўскую і Мінскую губерні. У 1894 г. былі прыняты новыя правілы, паводле якіх на фабрычных інспектараў ускладаліся дадатковыя абавязкі, звязаныя з аглядам і апісаннем фабрык і заводаў, тэхнічным кантролем, зборам статыстычных звестак і інш. Аднак колькасць фабрычных інспектараў была нязначнай, на кожнага з іх на мяжы XIX–XX стст. прыходзілася ў сярэднім 80 прадпрыемстваў і каля 5500 рабочых. У такіх умовах іх кантроль не мог быць дастаткова дзейсным і сістэматычным.

Законам ад 2 чэрвеня 1897 г. для дарослых рабочых устанаўліваўся максімальны працоўны дзень не болей за 11,5 гадзін, замацоўваліся нядзельныя і святочныя адпачынкі на працягу года. Штогадовыя адпачынкі для рабочых заканадаўствам не прадугледжваліся. Наогул фабрычна-заводскае заканадаўства Расійскай імперыі ўтрымлівала шмат невыразных фармулёвак, што нярэдка дазваляла прадпрымальнікам абыходзіць яго, вырашаць працоўныя канфлікты на сваю карысць.

## Развіццё гарадоў

Тэмпы ўрбанізацыі ў Беларусі былі адчувальнымі. Гарадское насельніцтва ў абсалютных лічбах за другую палову XIX ст. павялічылася ў 2,2 раза. Яго рост перавышаў тэмпы росту насельніцтва наогул.

Колькасць гараджан Беларусі ў 1858 г. склала 293,6 тыс. чалавек (9 % ад агульнай колькасці жыхароў), а ў 1897 г. – 655,1 тыс. чалавек (10,3 %). Каля 500 тыс. чалавек у канцы XIX ст. жылі ў мястэчках Беларусі. Больш значнымі тэмпамі працэсы ўрбанізацыі праходзілі ў 1860-х – першай палове 1880-х гг., калі гарадское насельніцтва павялічвалася за кошт шляхты, абеззямеленага сялянства і выгнаных з сельскіх паселішчаў яўрэяў. У другой палове 1880-х – 1890-я гг. назіралася змяншэнне тэмпаў росту гарадоў, што было звязана з іх перанаселенасцю, складанасцямі пераарыентацыі іх гандлёва-прамысловай спецыялізацыі на агульнарасійскі рынак. У цэлым на развіццё ўрбанізацыйных працэсаў у Беларусі другой паловы XIX ст. неспрыяльна паўплываў тагачасны стан эканомікі Беларусі, ва ўмовах якога найлепш развіваліся дробныя гарады і буйныя мястэчкі. У іх канцэнтравалася значная частка неземляробчага насельніцтва Беларусі. Структура вытворчасці ў такіх паселішчах найбольш адпавядала мясцоваму ўкладу жыцця. Беларускія гарады мелі перавагу над расійскімі ў сферы гандлю, які тут быў больш інтэнсіўным.

Мясцовае сялянства вельмі насцярожана ставілася да «гарадской цывілізацыі», выступала за кансервацыю патрыярхальнасці беларускай вёскі. Назіралася раз'яднанасць сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў у гарадах і вёсках Беларусі. Урадавая палітыка садзейнічала гэтаму. Абмежаванні ў рассяленні яўрэяў прывялі да іх штучнай канцэнтрацыі ў гарадах і мястэчках Беларусі і дэфармавалі нацыянальны і часткова саслоўны склад насельніцтва. Гэта сітуацыя ўскладнялася адноснай слабасцю і невялікімі патрэбамі гарадской прамысловасці ў наёмнай рабочай сіле. Сотні тысяч беларускіх сялян вымушаны былі знаходзіць сабе працу на прадпрыемствах і гаспадарках у сельскай мясцовасці ці перасяляцца ў іншыя рэгіёны Расійскай імперыі. У другой палове XIX – пачатку XX ст. існавала сялянская традыцыя пагардлівых адносін да гарадскога жыцця. На старонках «Мінскага лістка» наогул сцвярджалася, што горад не патрэбны селяніну.

Развіццё гарадоў мела рэгіянальныя асаблівасці. У пачатку 1860-х гг. узроўнем урбанізацыйных працэсаў вылучаліся захад і ўсход Беларусі. Самым значным па колькасці насельніцтва горадам быў Магілёў. У наступныя дзесяцігоддзі, асабліва калі распачалося чыгуначнае будаўніцтва, больш інтэнсіўна ішоў працэс развіцця гарадскога жыцця ў цэнтры і пазней на поўдні Беларусі. К пачатку XX ст. буйнейшымі гарадскімі цэнтрамі сталі Мінск, Віцебск, Гомель. Гарады Беларусі вылучаліся на фоне ўсёй Расійскай імперыі выразнай функцыяй гандлё-

вых цэнтраў. Гарадскі гандаль тут быў больш разнастайным, на што паўплывалі выгаднае геаграфічнае становішча гарадоў і актыўная прадпрымальніцкая дзейнасць яўрэяў.

Эканамічная інтэграцыя беларускіх гарадоў у сістэму агульнарасійскага рынку прыкметна пачала рэалізоўвацца ў 80–90-х гг. XIX ст. У выніку пераарыентацыі гаспадарчых сувязей Беларусі з Польшчы на Расію была страчана фактычна традыцыйная структура гарадскіх цэнтраў, узнікла новая, арыентаваная на агульнарасійскія эканамічныя патрэбы. Адна з прычын гэтага – інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва. Беларускія гарады станавіліся важнымі вузламі пасрэдніцкага гандлю. Іх значэнне ў дадзенай сферы было вышэй, чым у прамысловай, гандаль прыносіў большыя прыбыткі. Прамысловасць Беларусі наогул развівалася ў адпаведнасці з попытам мясцовага рынку, без уздзеяння мэтанакіраванай урадавай палітыкі.

Яшчэ адной асаблівасцю ўрбанізацыйных працэсаў у Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. з'яўлялася адсутнасць тут буйных гарадскіх цэнтраў. У канцы XIX ст. толькі ў Мінску і Віцебску налічвалася ад 50 да 100 тыс. жыхароў, а Брэст, Гродна, Гомель, Магілёў мелі ад 20 да 50 тыс. чалавек насельніцтва. Адной з прычын, якія перашкаджалі развіццю гарадоў на мяжы стагоддзяў, была сістэма зямельных адносін. У адрозненне ад велікарускіх губерняў, зямельная ўласнасць гараджан Беларусі мела вялікія памеры. У Мінску каля 85 % будынкаў знаходзілася на чужой арандаванай зямлі, у Віцебску – прыблізна 87 %. Адпаведна расійскаму заканадаўству тэрміны зямельнай арэнды звычайна не перавышалі 12 гадоў і неабавязкова было ўзнаўляць дагаворы аб арэндзе. Гэта ставіла арандатараў у залежнасць ад землеўласнікаў, прычым апошнія ў выпадку парушэння кантракта мелі права на яго скасаванне, і будынкі арандатараў пераходзілі да землеўладальнікаў. У сувязі з гэтым прадпрымальнікам былі патрэбны дадатковыя фінансавыя выдаткі для папярэдняга набыцця зямлі.

Попыт і кошт гарадскіх зямель у Беларусі былі высокімі. Да пачатку XX ст. у Беларусі захоўваліся прыватнаўласніцкія гарады. Сярод іх – Сянно, Нясвіж, Друя.

Мястэчкі займалі прамежкавае становішча паміж горадам і вёскай. Яны былі ўнікальнай з'явай для Расійскай імперыі. Мястэчкі не мелі заканадаўча аформленага дакладнага вызначэння. Гэта была спецыфічная з'ява, характэрная для заходніх губерняў Расійскай імперыі. На тэрыторыі Беларусі было сканцэнтравана каля 40 % мястэчак ад іх агульнай колькасці ў краіне. У Беларусі налічвалася, паводле даных

на 1863 г., 418 мястэчак, а к пачатку XX ст. іх колькасць скарацілася да 322. Страчвалі свае функцыі больш дробныя з іх. Расійскі ўрад не імкнуўся падтрымліваць мястэчкі, надаваць гэты статус буйным вёскам. Пад уплывам развіцця рыначных адносін некаторыя мястэчкі прыходзілі ў заняпад, іншыя (іх налічвалася каля трэці) уздымаліся да ўзроўню паселішчаў гарадскога тыпу. З іх 14 маглі прэтэндаваць на атрыманне статусу горада, паколькі мелі больш за 5 тыс. жыхароў, шматгаліновую прамысловую вытворчасць з гадавым абаротам звыш 100 тыс. руб. і гандаль з абаротам больш за 200 тыс. руб. Большасць мястэчак Беларусі мела характар гандлёвых цэнтраў. Яны адставалі ад гарадскіх паселішчаў па тэмпах развіцця прамысловасці. Тут у большай ступені было прадстаўлена беспрацоўе, наяўнасць лішніх рабочых рук. Мястэчкі арыентаваліся на мясцовы сялянскі рынак, які патрабаваў танных тавараў, пераважна рамесніцка-саматужнай вытворчасці. Вытворчая структура мястэчак у найбольшай ступені адпавядала вёсцы.

У 80-х гг. XIX ст. з'явілася неабходнасць размежавання мястэчак і сельскіх паселішчаў у сувязі з забаронай у 1882 г. яўрэям сяліцца паза межамі гарадоў і мястэчак. Апошнія мелі пераважна прыватнаўласніцкі характар і шматэтнічны склад насельніцтва. 82,5 % мястэчак Беларусі ў пачатку 60-х гг. XIX ст. знаходзілася на памешчыцкіх землях, астатнія – на дзяржаўных, у той час як вёскі стаялі пераважна на сялянскіх землях. У 1863 г. для мяшчан замест падушнага падатку быў уведзены падатак з нерухомай маёмасці. Разам з мяшчанамі гэты падатак павінны былі плаціць таксама і іншыя жыхары (у тым ліку сяляне) мястэчак. Акрамя таго, пасля 1875 г. з'явілася местачковае мяшчанскае самакіраванне. Мястэчкі адыгрывалі значную ролю ў эканамічным жыцці. Каля паловы ўсіх занятых у сферы прамысловасці Беларусі канцэнтравалася ў мястэчках, у гарадах – прыкладна 30 %, у сельскіх населеных пунктах – каля 18 %.

За другую палову XIX ст. толькі адно паселішча Беларусі атрымала афіцыйны статус горада. Гэта Горкі (1861), хоць шэраг мястэчак па сваіх памерах і гандлёва-прамысловым значэнні не ўступалі некаторым гарадам, а часам і пераўзыходзілі іх. Расійскі ўрад не спяшаўся надаваць гарадскі статус населеным пунктам Беларусі. Тыя, што былі афіцыйна прызнаны гарадамі, звычайна выконвалі пэўную адміністрацыйную функцыю. Сярод 44 беларускіх гарадоў налічваліся 4 губернскія цэнтры, 31 павятовы і толькі 9 пазаштатных, ці беспавятовых, гарадоў.

У гарадскіх цэнтрах Беларусі на працягу другой паловы XIX ст. паступова паляпшаліся бытавыя ўмовы жыцця і прадпрымальніцтва. Тут з'явіліся брукаваныя вуліцы, электраасвятленне, тэлефонная сувязь і г. д. Ужо з 1860 г. уздоўж шашэйных і чыгуначных дарог працягнуліся тэлеграфныя правады, якія злучылі многія населеныя пункты. З 1874 г. у Беларусі пачалі дзейнічаць водаправод (у Мінску), з 1889 г. – электраасвятленне (пры Добрушскай папяровай фабрыцы), з 1898 г. – трамвай (у Віцебску), які тут быў пушчаны раней, чым у Маскве і Пецярбургу.

У канцы XIX ст. на тэрыторыі Беларусі з'явіўся тэлефон. У 1882 г. быў дадзены дазвол на будаўніцтва тэлефонных ліній уладальніку гомельскага маёнтка І. Паскевічу. У Мінску ў 1890 г. была наладжана тэлефонная лінія для службовага карыстання. Першая ў Беларусі тэлефонная станцыя грамадскага карыстання была створана ў 1896 г. у Мінску.

## Транспарт і гандаль

Да 60-х гг. XIX ст. асноўнымі шляхамі зносін у Беларусі з'яўляліся водныя, шашэйныя і грунтавыя дарогі, якімі карысталіся для арганізацыі ўнутранага і замежнага гандлю. Водныя шляхі ў беларускіх губернях складалі ў сярэдзіне XIX ст. 5399 вёрст, паштовыя дарогі – 3816, шашэйныя дарогі – 1109 вёрст. Водныя шляхі ўтваралі рэкі басейнаў Дняпра, Заходняй Дзвіны і Нёмана, што Днепра-Бугскім, Агінскім і Бярэзінскім каналамі злучаліся ў адзіную транспартную сетку. У рачным суднаходстве за 60–90-я гг. XIX ст. значна ўзрасла роля параходаў. У 1900 г. на рэках Беларусі налічваліся 194 паравыя і 590 непаравых суднаў. Шырокая сетка паўнаводных рэк, спляценне прытокаў Дняпра, Заходняй Дзвіны, Нёмана забяспечвалі надзейную сувязь тэрыторыі Беларусі з сумежнымі рынкамі. За гэты ж перыяд прыкметна палепшылася якасць і павялічылася працягласць шашэйных дарог. У пачатку XX ст. у разліку на 100 кв. вёрст Беларусь іх мела ў два разы больш, чым у сярэднім па Еўрапейскай Расіі. Асаблівае значэнне мелі Пецярбургска-Кіеўская і Маскоўска-Варшаўская шашэйныя дарогі.

На эвалюцыю структуры гарадскіх паселішчаў, далейшае развіццё гандлёва-прамысловай дзейнасці істотны ўплыў аказала чыгуначнае будаўніцтва. Акрамя вырашэння ваенна-стратэгічных задач, яно адпавядала патрэбам агульнарасійскага рынку. Аднак правядзенне чыгуначных магістралей не ўлічвала патрэб развіцця беларускага ўнутранага рынку, структуры гарадскіх паселішчаў, змяніла транзітнае

становішча Беларусі ў гандлі Расіі з заходнімі краінамі. У сувязі з інтэнсіўным развіццём чыгуначнага транспарту істотна скарацілася будаўніцтва сухапутных шляхоў. Толькі ў канцы XIX ст. пачалася пракладка новых шашэйных дарог. Першая чыгунка праз Беларусь прайшла ў 1862 г. Гродзенскі кавалак пабудаванай Пецярбургска-Варшаўскай магістралі склаў 50 вёрст. У 1866 г. было завершана будаўніцтва Рыга-Арлоўскай чыгункі, якая прайшла праз паўночны ўсход Беларусі (Дзвінск – Полацк – Віцебск). У лістападзе 1871 г. быў адкрыты рух на беларускім адрэзку (праз Оршу, Барысаў, Мінск, Баранавічы) чыгуначнай магістралі Масква – Брэст. Праз два гады была здадзена ў эксплуатацыю Лібава-Роменская чыгунка, якая прайшла праз Маладзечна – Мінск – Бабруйск – Гомель. У 1880-х гг. пачаўся рух на палескіх чыгунках, якія складаліся з невялікіх участкаў (Вільня – Баранавічы – Лунінец, Гомель – Лунінец – Пінск – Жабінка, Баранавічы – Слонім – Ваўкавыск – Беласток). Да палескіх чыгунак былі далучаны ўчасткі, якія звязалі Брэст з Украінай, Гомель з Бранскам. У 1896 г. скончылася будаўніцтва лініі Асіповічы – Старыя Дарогі, а ў 1902 г. – Пецярбургска-Адэскай магістралі, якая пралягла праз Віцебск, Оршу, Магілёў, Жлобін. Да 1880-х гг. чыгункі на тэрыторыі Беларусі будавалі прыватныя акцыянерныя таварыствы з удзелам замежнага капіталу. За апошнія два дзесяцігоддзі XIX ст. у сувязі з рэарганізацыяй сістэмы чыгуначнага транспарту Расійскай імперыі ўсе асноўныя чыгункі Беларусі сталі дзяржаўнымі. За казённы кошт у далейшым вялося будаўніцтва новых шляхоў зносін.

Працягласць чыгунак да пачатку XX ст. амаль зраўнялася з даўжынёй суднаходных рэк. Велічыня грунтовых (шашэйных) (без палявых) дарог к канцу XIX ст. дасягала прыкладна 100 тыс. км. Віленская, Гродзенская і Магілёўская губерні ўваходзілі ў лік дзесяці найбольш забяспечаных гэтымі дарогамі губерняў Расійскай імперыі. Аднак адчувалася слабая разгалінаванасць асноўных магістралей, існавала патрэба ў дадатковых чыгуначных станцыях, прыпыначных пунктах, што стрымлівала развіццё мясцовага гандлю, з'яўленне новых гарадскіх цэнтраў. Аб гэтым сведчылі шматлікія хадайніцтвы прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі, землеўласнікаў, прадпрымальнікаў і інш. У 1889 г. расійскім урадам былі ўзняты чыгуначныя тарыфы да ўзроўню мытных з мэтай перашкоды пранікненню замежных прамысловых тавараў. Прыняцце гэтага рашэння азначала таксама павышэнне плацяжоў за правоз вырабаў беларускіх прадпрыемстваў ва ўнутраныя губерні Расіі. Адначасова былі зменшаны пудавёрстныя стаўкі пры павелічэнні

адлегласці перавозак. У выніку знізілася роля беларускіх гарадоў у замежным гандлі. Дыферэнцыраваныя чыгуначныя тарыфы некалькі пагоршылі ўмовы для эканамічнага развіцця Беларусі, канкурэнтаздольнасць мясцовых тавараў. Яны перашкаджалі выкарыстанню чыгунак для мясцовых грузаперавозак і ў той жа час зрабілі больш выгадным прывоз прамысловых вырабаў, зерня з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі. Праўда, у 1893 г. урад увёў паніжаныя тарыфы для кароткіх грузаперавозак да 320 вёрст, а ў 1896 г. гэта ільгота была пашырана на 450-верставы адрэзак.

Рэгіёны Беларусі, праз якія прайшлі чыгункі, атрымалі значны імпульс для эканамічнага росту. Грузаабарот чыгуначнага і воднага транспарту беларускіх губерняў за 1866–1900 гг. павялічыўся больш чым у 18 разоў, з 19,6 млн да 357,7 млн пудоў. У выніку чыгуначнага будаўніцтва асноўнымі вузламі і цэнтрамі транзітнага гандлю сталі Мінск, Гомель, Орша, Жлобін, Пінск, Мазыр, Слонім, Баранавічы, Лунінец і інш. Аднак на мясцовым рынку новыя чыгуначныя станцыі не адразу станавіліся гандлёвымі цэнтрамі. У 1860–90-х гг. паступова страчвалі сваю ролю кірмашы, затое актывізаваўся магазінна-крамны гандаль. У канцы XIX ст. на яго прыходзілася 95 % усяго ўнутранага абароту гарадоў. У 1860-х гг. прыйшоў у заняпад былы вядомы і буйны Зэльвенскі кірмаш, перасталі збірацца кірмашы ў Мінску, Магілёве, Гродне, Віцебску і інш. Пашырэнне стацыянарнага гандлю і сістэмы крэдытавання звузіла ролю кірмашоў у гарадах. Тут яны паступова збліжаліся з аднадзённымі базарамі, а некаторыя ператварыліся ў адну з разнавіднасцей спецыялізаванага аптовага гандлю. Напрыклад, Васільеўскі кірмаш у Гомелі ў канцы XIX ст. стаў важнейшым цэнтрам лясного гандлю ў Беларусі з гадавым абаротам каля трох мільёнаў рублёў. Кірмашы захоўваліся пераважна ў дробных гарадах і мястэчках, дзе арганізацыя стацыянарнага гандлю адбывалася больш павольна. Тут кірмашы і базары выконвалі важную функцыю зносін паміж горадам і вёскай. Тавараабарот у сельскай мясцовасці Беларусі быў дастаткова нізкім і значна адставаў ад гарадскога. У канцы XIX ст. у пераліку на душу насельніцтва розніца была сямікратнай.

Галоўным таварам на беларускім рынку ў канцы XIX ст. быў лес. Другое месца па значнасці ў грузаабароце займала група прадуктаў паляводства (зерневыя, плады, гародніна і г. д.). Аднак удзельная вага гэтых тавараў на працягу другой паловы XIX ст. скарачалася, асабліва ў сувязі з аграрным крызісам. Апошні прывёў да пераарыентацыі землеўласнікаў на мяса-малочную вытворчасць і, адпаведна, да росту

ўдзельнай вагі ў тавараабароце прадуктаў жывёлагадоўлі. У грузаабароце Беларусі былі тавары з мінеральнага паліва, будаўнічых матэрыялаў, металічных вырабаў, шкла, солі.

Прадукты сельскай гаспадаркі і вырабы прамысловасці, акрамя збыту на месцы, вывозіліся ў гарады Расіі, Украіны, Польшчы. Спірт вывозіўся ў Пецярбург, Кіеў, Адэсу, Маскву, Цвер. Прадукцыя запалкавых фабрык адпраўлялася ў Ромны, Палтаву, Харкаў, Варшаву, Баку; папера і кардон – у Кіеў, Екацярынаслаў, Адэсу, Рыгу. Вырабы шкляной і керамічнай прамысловасці збываліся ў Маскве, Кіеве, Адэсе. У выніку аграрнага крызісу ў замежным гандлі стала пераважаць драўніна. За 1880–1900 гг. абарот лясных грузаў на чыгунках Беларусі павялічыўся ў 23,4 раза. Плошча лясоў за гэты час скарацілася прыкладна на 30 %. Акрамя зерня і лесу, з Беларусі за мяжу вывозіліся лён, пянька, малочныя вырабы і інш. Мытная палітыка Расійскай імперыі характарызавалася высокімі ўвазнымі пошлінамі. З замежных краін найбольш актыўнымі ў прадпрымальнікаў беларускіх губерняў былі гандлёвыя сувязі з Германіяй.

Гандаль у Беларусі прыносіў большыя прыбыткі, чым у прамысловасці. Яны атрымліваліся вышэй, чым у сярэднім па Расійскай імперыі. У гандлі былі сканцэнтраваны самыя вялікія капіталы. З паляпшэннем шляхоў зносін вываз сыравіны з Беларусі прыносіў большы даход, чым яго апрацоўка на месцы.

## Фарміраванне фінансава-крэдытнай сістэмы

Фінансавая сістэма Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст. была не вельмі стабільнай. Курс рубля адрозніваўся няўстойлівасцю. Гэта не садзейнічала прытоку замежнага капіталу, агульнаму ажыўленню прадпрымальніцтва. Толькі ў канцы стагоддзя ў выніку рэалізацыі фінансавай рэформы С. Вітэ рубель стаў адной з самых устойлівых грашовых адзінак у свеце.

У сярэдзіне XIX ст. на тэрыторыі Беларусі пачалі з'яўляцца крэдытныя кааператывы, аб'яднанні дробных гандляроў, рамеснікаў, сялян і г. д. У 1870 г. у Гомелі, а затым у 1874 г. у Полацку, у 1882 г. у Віцебску былі адкрыты гарадскія грамадскія банкі, якія належалі органам гарадскога самакіравання. У 1873 г. быў створаны першы прыватны банк на тэрыторыі Беларусі – Мінскі камерцыйны банк. Ён займаўся пераважна крэдытаваннем гандлю сельскагаспадарчай прадукцыяй, лесам.

Аддзяленні банка дзейнічалі ў Гомелі, Магілёве, а таксама за межамі Беларусі – у Лібаве, Навазыбкаве. У 1881–1884 гг. у Мінску, Віцебску, Магілёве, Гродне пачалі працаваць аддзяленні Дзяржаўнага банка Расіі, які з'яўляўся буйнейшай крэдытнай установай краіны. Аддзяленні Дзяржаўнага банка ў Беларусі крэдытавалі пераважна гандаль лесам і зямлёй. Да пачатку XX ст. на долю Дзяржаўнага банка і яго філіялаў прыходзілася 46,7 % дысконтна-пазыковых аперацый беларускіх губерняў; у той жа час удзельная вага акцыянерных банкаў склала 25,3 %, таварыстваў узаемнага крэдыту – 21,8, гарадскіх банкаў – 6,2 %.

Да пачатку XX ст. на тэрыторыі беларускіх губерняў узнікла значная сетка ашчадных кас. Іх колькасць узрасла са 143 у 1890 г. да 429 у 1899 г. На мяжы XIX–XX стст. дробныя і сярэднія прадпрымальнікі праяўлялі дастаткова высокую актыўнасць у атрыманні грашовых сродкаў, аб'ядноўваючыся ў крэдытныя кааператывы. У гэты час іх пазыкі ў некалькі разоў перавышалі ўклады.

Ва ўсіх беларускіх губернях дзейнічалі аддзяленні Дваранскага зямельнага банка, які быў створаны для льготнага крэдытавання памешчыкаў пад заклад зямлі і будынкаў. Аднак яго паслугамі маглі карыстацца ў асноўным тыя, хто меў пасведчанне на права набыцця маёнткаў, якога былі пазбаўлены землеўласнікі каталіцкага веравызнання. У Мінску, Віцебску, Гродне і Магілёве былі адкрыты аддзяленні Сялянскага пазямельнага банка, куды, як і ў Дваранскі зямельны банк, доступ мелі толькі асобы праваслаўнага веравызнання. Сялянскі пазямельны банк быў заснаваны ў 1882 г. з мэтай выдачы сялянам доўгатэрміновых пазык для набыцця прыватнаўласніцкіх зямель. Да 1895 г. банк выдаваў пазыкі пад дастаткова высокія працэнты, аднак з яго дапамогай было рэалізавана больш за палову сялянскіх пакупак зямлі. Пасля прыняцця новага статута банка стаўка па плацяжах была зніжана. Акрамя таго, з 1895 г. ён атрымаў права набыцця памешчыцкіх уладанняў ва ўласны зямельны фонд. Паступова банк ператварыўся ў аднаго з найбольшых зямельных уласнікаў, які перапрадаваў свае землі сялянскім гаспадаркам і таварыствам. У 1874 г. з'явіліся Мінскае і Магілёўскае таварыствы ўзаемнага крэдыту, да канца XIX ст. іх колькасць павялічылася да дзевяці. Асобныя з іх мелі не меншы аб'ём аперацый, чым філіялы буйных агульнарасійскіх банкаў. Дробнае і кароткатэрміновае крэдытаванне ажыццяўлялі банкірскія і банкаўскія канторы. У канцы XIX ст. на тэрыторыі Беларусі існавала 37 такіх установаў, якія былі сканцэнтраваны ў 16 населеных пунктах.

Па крэдытных аперацыях у сярэдзіне XIX ст. Беларусь залежала ад Германіі і яе пасрэдніцы Польшчы. У апошняй чвэрці XIX ст. асноўны кірунак уплыву ў крэдытнай сферы перамясціўся з захаду на ўсход. У гэты час ужо склалася агульнарасійская крэдытная сістэма. Да канца XIX ст. прамысловае развіццё Беларусі стала ў значнай ступені падтрымлівацца за кошт выкарыстання крэдытных сродкаў з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі.

У 90-х гг. XIX ст. у гарадах Беларусі пачалі працаваць аддзяленні Маскоўскага міжнароднага гандлёвага банка (Віцебск, Брэст), Пецярбургска-Азоўскага (Мінск), Арлоўскага (Гомель, Орша, Бабруйск), Паўднёва-Рускага (Магілёў), Віленскага (Бабруйск), Паўднёвага (Гродна) камерцыйных банкаў. Усе беларускія губерні былі ўключаны ў раён дзейнасці Віленскага зямельнага банка. Акрамя таго, Віцебская, Магілёўская і Мінская губерні ўваходзілі ў сферу ўплыву Маскоўскага, а Віленская і Гродзенская – Пецярбургска-Тульскага зямельных банкаў. У беларускіх губернях недахоп камерцыйных банкаў паспяхова замянілі банкірскія дамы і канторы.

У другой палове XIX ст. характар і змест гандлёва-прамысловага развіцця Беларусі, станаўленне яе фінансава-крэдытнай сістэмы вызначаліся перш за ўсё ўплывам і запатрабаваннямі традыцыйных рыс мясцовага эканамічнага жыцця. Уздзеянне замежнага капіталу і пранікненне фінансава-прамысловых груп з цэнтральных губерняў і індустрыяльных цэнтраў Расійскай імперыі, адчувальныя к канцу XIX ст., не ўнеслі радыкальных змен у кірунак гаспадарчага развіцця беларускіх губерняў. Хутчэй наадварот: многія выхадцы з іх увайшлі ў шэраг буйнейшых прадпрымальнікаў Расійскай імперыі, удзельнічалі ў фарміраванні дзелавой культуры і выпрацоўцы спосабаў і прыёмаў вядзення камерцыйнай дзейнасці.

Тэма 7

# ПАЎСТАННЕ 1863 г. ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

**Паўстанне 1863 г.**
**Сялянскі рух.**
**Народніцкі рух.**
**Рабочы рух. Распаўсюджванне марксізму.**
**Ліберальная ідэалогія і рух у Беларусі.**
**Кансерватыўная плынь грамадскага жыцця.**

## Паўстанне 1863 г.

Канец 50-х – пачатак 60-х гг. XIX ст. вызначыліся новым уздымам польскага нацыянальна-вызваленчага руху, які ахапіў Польшчу, Беларусь і Літву. Яго кульмінацыяй стала паўстанне 1863 г. Напярэдадні ў патрыятычным асяродку афарміліся два крылы, за якімі замацаваліся назвы «белыя» і «чырвоныя». «Белыя» выступалі супраць паўстання як сродку вырашэння задач нацыянальнага руху, разлічвалі дасягнуць асноўнай мэты – аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. з уключэннем у яе склад Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны – шляхам дыпламатычнага націску заходнееўрапейскіх краін на расійскі ўрад. У адрозненне ад Польшчы, дзе «белыя» склада-

ліся са шляхты і буйных прадпрымальнікаў, у Беларусі ў гэты лагер уваходзілі амаль выключна землеўласнікі. Сярод «белых» у Беларусі вылучаліся постаці Я. Гейштара, А. Аскеркі, В. Стажэнскага, А. Яленскага і інш. Прадстаўнікі гэтага лагера выступалі за рэфарматарскія меры вырашэння сялянскага пытання.

«Чырвоныя», у адрозненне ад «белых», імкнуліся да ўздыму нацыянальна-вызваленчага паўстання. Яны ўяўлялі сабой стракаты ў сацыяльных і палітычных адносінах блок. Па метадах дасягнення мэты і праграмных разыходжаннях «чырвоныя» падзяляліся на памяркоўных (правых) і радыкальных (левых). Памяркоўныя вядучую ролю ў паўстанні адводзілі шляхце і вырашэнню нацыянальнага пытання. Аграрную праблему яны прапаноўвалі вырашыць шляхам надзялення сялян зямлёй праз канфіскацыю часткі зямлі ў памешчыкаў з адпаведнай грашовай кампенсацыяй за кошт дзяржавы. Радыкальныя «чырвоныя» прызнавалі вядучую ролю сялян у паўстанні і права на нацыянальнае самавызначэнне беларусаў, літоўцаў, украінцаў. Падзел на «белых» і «чырвоных» быў характэрны для тагачаснага грамадска-палітычнага жыцця Беларусі і Літвы.

Для падрыхтоўкі і кіраўніцтва паўстаннем «чырвоныя» вясной 1862 г. стварылі ў Варшаве Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК). Летам 1862 г. у Вільні быў арганізаваны Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК), які непасрэдна займаўся падрыхтоўкай паўстання ў Беларусі і Літве і фармальна быў падначалены ЦНК. ЛПК быў створаны на аснове Камітэта руху, які ўзнік яшчэ восенню 1861 г. на чале з капітанам Генеральнага штаба расійскай арміі Л. Звяждоўскім. У склад ЛПК, акрамя Л. Звяждоўскага, уваходзілі Я. Козел-Паклеўскі, Б. Длускі, З. Чаховіч, К. Каліноўскі і інш. У пачатку 1860-х гг. былі створаны мясцовыя рэвалюцыйныя арганізацыі: гродзенская, мінская, навагрудская і інш.

«Левую» частку паўстанцаў у Беларусі ўзначальваў Кастусь Каліноўскі (1838–1864). У час вучобы ў Пецярбургскім універсітэце ён з'яўляўся актыўным членам тайнага гуртка З. Серакоўскага. Разам з В. Урублеўскім і Ф. Ражанскім К. Каліноўскі ў 1862–1863 гг. выдаваў на беларускай мове лацінскім шрыфтам газету «Мужыцкая праўда» (усяго выйшла сем нумароў). Газета растлумачвала сялянам характар адмены прыгоннага права, заклікала іх не верыць цару і «з мужыкамі з-пад Варшавы... і ўсёй Расіі» са зброяй у руках ісці здабываць «сапраўдную волю і зямлю». Разам з тым газета агітавала сялян вярнуцца ў грэка-каталіцкую (уніяцкую) веру, якая была скасавана на Полацкім царкоўным саборы ў лютым 1839 г. Фактычна «Мужыцкая праў-

да» выступала ў якасці неафіцыйнага друкаванага органа ЛПК. З кастрычніка 1862 г. К. Каліноўскі ўзначаліў ЛПК. Ён актыўна адстойваў інтарэсы Беларусі і Літвы перад кіраўніцтвам ЦНК, марыў аб стварэнні Беларуска-Літоўскай Рэспублікі.

Нагодай для пачатку паўстання на тэрыторыі Царства Польскага стала распараджэнне намесніка імператара аб правядзенні тут чарговага рэкруцкага набору. Насуперак закону, які прадугледжваў набор у рэкруты па жэрабю, у Царстве Польскім было вырашана забіраць у войска па папярэдне вызначаным спісе, куды ўвайшлі толькі гараджане, на якіх у сваёй барацьбе абапіраліся «чырвоныя». Адразу ж Цэнтральны нацыянальны камітэт выступіў з пагрозай прымяніць сілу для супраціўлення правядзенню рэкруцкага набору.

Паўстанне было нечаканым для ўлад. Тактыка баявых дзеянняў, прынятая паўстанцамі, адрознівалася ад падзей 1830–1831 гг., калі расійскія войскі мелі справу з рэгулярнай арміяй, сфарміраванай польскім паўстанцкім урадам. У час паўстання 1863 г. расійскія ўзброеныя сілы сутыкнуліся з тактыкай партызанскай вайны. Асноўнай баявой адзінкай паўстанцаў выступаў невялікі атрад, выяўленне і знішчэнне якога ва ўмовах лясістай і балоцістай мясцовасці беларускіх губерняў было дастаткова складанай задачай. Заклапочанасць выклікалі і дыверсіі паўстанцаў у тыле расійскай рэгулярнай арміі. Занепакоенасць дапаўнялася верагоднасцю новай еўрапейскай вайны.

У самым пачатку Аляксандр II і яго акружэнне недаацанілі памеры паўстання. Цэнтральны нацыянальны камітэт, нягледзячы на недахоп зброі і невялікі вопыт арганізацыі баявых дзеянняў, меў надзейную агентуру, у тым ліку на пошце і чыгунцы, валодаў значнымі грашовымі сродкамі. Вялікі князь Канстанцін, намеснік Царства Польскага, некалькі пазней вымушаны быў прызнаць: «Рэвалюцыя, мяцеж і змова ахапілі ўсю нацыю. Яна ўся ў змове...». На тэрыторыі беларускіх губерняў удзельная вага шляхты сярод паўстанцаў была заўважна больш высокай, чым у Царстве Польскім.

Часовы паўстанцкі ўрад у Польшчы абвясціў волю і роўнасць усіх грамадзян, незалежна ад веравызнання і сацыяльнага паходжання. Сялянам былі абяцаны правы на зямлю, якую яны апрацоўвалі, і пазбаўленне ад павіннасцей на карысць землеўласнікаў. У асобных зваротах да сельскага насельніцтва Беларусі, Літвы, Правабярэжнай Украіны размова ішла аб поўным іх вызваленні і надзяленні зямлёй, да яўрэяў – аб добрасуседстве. Кіраўніцтвам паўстанцаў была зроблена спроба яднання шырокіх слаёў насельніцтва.

Паўстанне пачалося раней вызначанага патрыятычнымі арганізацыямі тэрміну, у студзені 1863 г. у Варшаве, што стала нечаканасцю таксама для рэвалюцыянераў Беларусі і Літвы. У спецыяльнай адозве ЦНК заклікаў насельніцтва Беларусі і Літвы далучыцца да руху. Паўстанне па сваіх задачах стала перш за ўсё нацыянальна-вызваленчым. З яго разгортваннем Англія, Францыя і Аўстрыя пачалі рыхтаваць дыпламатычную агрэсію супраць Расіі. Для папярэджання дыпламатычнага дэмаршу гэтых дзяржаў 12 красавіка 1863 г. былі выдадзены два царскія маніфесты аб амністыі ў Польшчы, Беларусі і Літве. Праз некалькі дзён, 17 красавіка, расійскаму ўраду былі ўручаны ноты з заклікам змяніць палітыку ў «польскім пытанні». Да гэтага дэмаршу далучыліся Іспанія, Партугалія, Англія, Швецыя, Нідэрланды, Данія, Турцыя і Папа Рымскі. 27 чэрвеня расійскаму ўраду былі ўручаны ноты ў больш рэзкай форме. Ва ўрадавых колах Расіі ноты расцэньваліся як папярэднікі новай вайны. З улікам гэтага ў раёне паўстання пачалася канцэнтрацыя расійскіх войскаў. Іх тут было сабрана значна больш, чым саміх паўстанцаў. Аднак дапамога еўрапейскіх дзяржаў аказалася вельмі ілюзорнай.

1 лютага 1863 г. ЛПК пасля дзесяцідзённага роздуму і ацэнкі сітуацыі звярнуўся да насельніцтва Беларусі і Літвы з заклікам узняцца на ўзброеную барацьбу і падтрымаць паўстанне ў Польшчы. У сваім маніфесце ён прадубліраваў праграмныя дакументы польскага кіраўніцтва. Усе жыхары абвяшчаліся вольнымі і раўнапраўнымі. Ва ўласнасць сялян бязвыплатна перадавалі зямельныя надзелы, якімі яны карысталіся. З памешчыкамі за страту зямлі разлічвалася дзяржава. Беззямельныя сяляне надзяляліся трыма маргамі зямлі (2,1 га) пры ўмове, што яны прымуць удзел ва ўзброенай барацьбе. Рэкруцкая павіннасць замянялася трохгадовай усеагульнай вайсковай службай, аднаўлялася ўніяцкая царква. Аднак гэтыя меры паўстанцкага кіраўніцтва не задаволілі большасць сялянства. ЛПК абвясціў сябе Часовым урадам Літвы і Беларусі на чале з К. Каліноўскім, у кожную губерню прызначыў паўстанцкага ваеннага кіраўніка і імкнуўся разгарнуць узброеную барацьбу з апорай на сялянства.

Першыя паўстанцкія атрады ў заходніх паветах Беларусі з'явіліся ў канцы студзеня 1863 г. з Царства Польскага. Некаторыя камандзіры, якія імкнуліся пашырыць паўстанне на ўсход, спрабавалі прайсці праз Гродзенскую і Мінскую губерні. Самым буйным атрадам, які паспяхова рухаўся на ўсход, было злучэнне Р. Рагінскага.

Мясцовыя фарміраванні пачалі ствараццa ў сакавіку – красавіку. Найбольш актыўна паўстанцы дзейнічалі на тэрыторыі Гродзенскай і Віленскай губерняў. У раёне Белавежскай пушчы паўстанцкі атрад стварыў В. Урублеўскі, які стаў военачальнікам Гродзенскай губерні. У Кобрынскім павеце ўзняў узброеную барацьбу Р. Траўгут – будучы дыктатар паўстанцаў у Польшчы. У Навагрудскім павеце дзейнічаў атрад У. Борзабагатага, на Міншчыне – А. Трусава і г. д. Аднак агульнага плана дзеяння паўстанцаў не было, адсутнічалі ўзаемадзеянне і ўзаемадапамога паміж атрадамі. Частка іх была знішчана царскімі войскамі яшчэ на стадыі фарміравання, іншыя бяздзейнічалі, не хапала зброі і г. д. Найбольшага поспеху дамогся атрад Л. Звяждоўскага, які ў ноч на 24 красавіка захапіў г. Горкі. Яго падтрымалі студэнты Горы-Горацкага земляробчага інстытута. Атрад захапіў зброю, грошы і днём пакінуў горад. Пазней Горы-Горацкі інстытут быў закрыты з-за таго, што студэнты дапамагалі паўстанцам.

На тэрыторыі Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў паўстанне не атрымала развіцця. Да канца вясны на ўсходзе Беларусі яно было задушана. Толькі ў Гродзенскай губерні паўстанцы працягвалі ўпарта супраціўляцца. Найбольш буйныя сутычкі адбыліся каля мястэчка Мілавіды Слонімскага павета, дзе да 20 мая сабралася некалькі атрадаў паўстанцаў – усяго каля 800 чалавек. Супраць іх было накіравана 5 рот салдат з гарматамі. Першы бой адбыўся 21 мая і працягваўся некалькі гадзін. Урадавыя войскі не здолелі ўзяць лагер і вымушаны былі адступіць з вялікімі стратамі. На наступны дзень, ноччу, паўстанцы непрыкметна пакінулі лагер. У Гродзенскай губерні змагары карысталіся падтрымкай сялян, дзейнічалі пераважна дробнымі атрадамі, часта былі няўлоўнымі для ўрадавых войскаў.

Вясной 1863 г. назіраўся найвышэйшы ўздым паўстання ў Беларусі і Літве. Але, нягледзячы на асобныя поспехі, паўстанцы нідзе не атрымалі рашучай перамогі. Яны перайшлі да тактыкі пазбягання адкрытых баёў з праціўнікам. Паўстанне атрымала шырокі рэзананс у Еўропе і Расіі. Некаторыя расійскія афіцэры і салдаты перайшлі на бок паўстанцаў, асобныя рэвалюцыянеры спрабавалі пашырыць узброеную барацьбу на цэнтральныя расійскія губерні, але няўдала. На тэрыторыі Беларусі з лютага па жнівень 1863 г. адбылося 46 баёў і сутычак паўстанцаў з урадавымі войскамі.

Сярод кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху адсутнічала адзінства, разгарнулася барацьба за ўладу. «Белыя», не жадаючы страчваць ініцыятыву, усталявалі кантроль над ЦНК, а затым пастараліся

адхіліць «чырвоных» на чале з К. Каліноўскім ад кіраўніцтва паўстаннем у Беларусі і Літве. У Вільні «белымі» пры падтрымцы былога прадстаўніка Варшавы ў ЛПК Н. Дзюлерана быў створаны Аддзел кіравання правінцыямі Літвы, які варшаўскі цэнтр прызнаў адзіным кіруючым органам у Беларусі і Літве. ЛПК быў распушчаны. К. Каліноўскі, радыкалізм і аўтарытэт якога не задавальнялі «белых», быў адхілены ад кіраўніцтва і напраўлены паўстанцкім камісарам у Гродзенскую губерню. Тут ён разгарнуў актыўную дзейнасць па пашырэнні ўзброенай барацьбы і прыцягненні на свой бок сялян.

Аддзел кіравання правінцыямі Літвы імкнуўся паралізаваць мерапрыемствы «чырвоных». Ад яго імя быў распаўсюджаны спецыяльны дэкрэт, якім абвяшчаліся несапраўднымі і адмяняліся «ўсе паўнамоцтвы і мандаты», выдадзеныя ЛПК. У склад мясцовых паўстанцкіх органаў былі ўведзены прыхільнікі «белых». Частка ўдзельнікаў патрыятычнага руху не была гатова весці самаахвярную барацьбу. Для іх больш прыцягальнай была рамантыка, жаданне заняць пасады ў рэвалюцыйных органах улады. Лік удзельнікаў у паўстанцкай адміністрацыі амаль раўняўся колькасці змагароў ва ўзброеных атрадах.

Расійскім урадам былі кінуты буйныя сілы для падаўлення паўстання. У маі 1863 г. замест больш ліберальнага У. І. Назімава віленскім генерал-губернатарам з неабмежаванымі паўнамоцтвамі быў прызначаны М. М. Мураўёў, які атрымаў прозвішча «вешальнік» за бязлітасную расправу з удзельнікамі паўстання. З яго прыездам узмацніліся рэпрэсіі, пачалося публічнае пакаранне смерцю ўдзельнікаў узброенай барацьбы, масавымі сталі высылкі без суда. Паралельна М. Мураўёў правёў шэраг мерапрыемстваў, якія павінны былі перацягнуць сялян на бок урада. Былі рэалізаваны значныя змены ва ўмовах адмены прыгоннага права ў беларускіх і літоўскіх губернях. Мясцовым органам улады забаранялася выкарыстоўваць супраць сялян узброеную сілу. Сялян сталі запрашаць да нагляду за «польскімі» памешчыкамі, паўстанцамі. Маёмасць рэпрэсіраваных змагароў часткова перадавалася сялянам. У сельскай мясцовасці з ліку сялян ствараліся ўзброеныя каравулы, у якія ўключаліся некалькі салдат на чале з унтэр-афіцэрам. Яны павінны былі правяраць праезджых, лавіць і праследаваць паўстанцаў. За іх выдачу сялянам назначаліся грашовыя ўзнагароды. Была разгорнута эфектыўная антыпаўстанцкая прапаганда.

Пачатак паўстання, мэты і лозунгі польскіх рэвалюцыянераў не знайшлі падтрымкі ў асноўнай часткі расійскай грамадскасці, выклікалі небывалы ўздым вялікадзяржаўнага шавінізму. Жорсткімі рэпрэ-

сіўнымі мерамі адміністрацыя віленскага генерал-губернатара прымусіла многіх мясцовых памешчыкаў і вышэйшае каталіцкае духавенства адмовіцца ад падтрымкі паўстання, а таксама падаваць вернападданніцкія адрасы на імя імператара.

У сваю чаргу, кіраўніцтва паўстаннем не зрабіла рэальных крокаў у бок сялянства з мэтай прыцягнуць яго ў шэрагі змагароў. Па сацыяльным складзе ўдзельнікаў паўстанне было шляхецкім. Сяляне не прынялі актыўнага ўдзелу ва ўзброенай барацьбе. Іх было толькі 18 % сярод паўстанцаў, і гэта былі пераважна дзяржаўныя сяляне.

У чэрвені 1863 г. былі арыштаваны многія члены Аддзела кіравання правінцыямі Літвы, некаторыя пакінулі свае пасады і эмігравалі. У склад Аддзела былі ўведзены К. Каліноўскі і І. Малахоўскі. Кіраўніцтва паўстаннем зноў перайшло ў рукі «чырвоных». Прыхільнікамі К. Каліноўскага быў створаны падпольны ўрад «Літоўска-Беларускі чырвоны жонд», мэтай якога стала спроба адрадзіць паўстанне. У мясцовыя паўстанцкія арганізацыі былі прызначаны новыя кіраўнікі, але рэальных поспехаў дасягнуць не ўдалося. У канцы жніўня 1863 г. варшаўскае кіраўніцтва прыняло рашэнне аб спыненні ваенных дзеянняў. Асобныя паўстанцы ў Беларусі працягвалі барацьбу яшчэ восенню 1863 г. Летам 1864 г. была ліквідавана апошняя паўстанцкая арганізацыя ў Навагрудскім павеце.

К. Каліноўскі планаваў зноў узняць паўстанне вясной 1864 г., але ў студзені ён быў арыштаваны, а ў сакавіку пакараны смерцю на Лукішскай плошчы ў Вільні. Знаходзячыся ў турме, К. Каліноўскі напісаў і перадаў на волю «Лісты з-пад шыбеніцы». Гэты дакумент уяўляў сабой палітычны запавет беларускаму народу, у якім крытыкавалася русіфікатарская палітыка царскага ўрада ў Беларусі. Сялян К. Каліноўскі заклікаў адстойваць свае правы, прычым любымі сродкамі.

Удзельнікі паўстання падвергліся жорсткім рэпрэсіям. Іх маёмасць была канфіскавана ці знішчана. Маёнткі памешчыкаў – удзельнікаў паўстання забіраліся ў казну. Чыноўнікі мясцовага паходжання былі звольнены са сваіх пасад. На тэрыторыі Беларусі і Літвы, па афіцыйных звестках, пакаралі смерцю 128 паўстанцаў, больш за 850 чалавек накіравалі на катаргу, каля 12,5 тыс. чалавек выслалі за межы Беларусі. Многія касцёлы і манастыры былі закрыты, польская мова выключана з грамадскага жыцця, навучальных і асветніцкіх устаноў. Пачалася палітыка ўзмоцненай русіфікацыі з мэтай знішчэння адрозненняў, якія існавалі ў Беларусі ў параўнанні з цэнтральнымі расійскімі губернямі.

Падзеі паўстання 1863 г. прымусілі расійскі ўрад пайсці на больш выгадныя для сялян умовы адмены прыгоннага права ў Беларусі і Літве. Паўстанне садзейнічала ажыўленню апазіцыйнага руху ў Расійскай імперыі і краінах Заходняй Еўропы, абуджэнню беларускага нацыянальнага руху. Яно стала паваротным момантам у фарміраванні расійскай урадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі.

## Сялянскі рух

Пасля адмены прыгоннага права сялянства доўга заставалася дастаткова кансерватыўнай сацыяльнай сілай. Самая шматлікая група, якая складала каля 75 % насельніцтва Беларусі, працяглы час захоўвала традыцыйныя рысы сацыяльнай псіхалогіі, менталітэту і вельмі павольна паддавалася трансфармацыйным працэсам, звязаным са станаўленнем буржуазнага грамадства.

Да рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. у асяроддзі сялянства захоўваліся рысы наіўнага манархізму, які спалучаўся з дастаткова пасіўнымі і малаарганізаванымі формамі сялянскага руху. Самымі пашыранымі з іх былі самавольнае выкарыстанне выганаў і выпасаў, высяканне лясоў, захоп ворыўных зямель, супраціўленне правядзенню межавых работ. Барацьбе за зямлю належала галоўнае месца. Другую пазіцыю па значнасці займалі выступленні супраць улад, але іх удзельная вага ў сялянскім руху ў Беларусі на працягу апошняй трэці XIX ст. зніжалася. Напружанымі былі сутычкі сялян з прадстаўнікамі ўлады пры выкананні судовых рашэнняў, пастаноў адміністрацыйных і міравых устаноў. Большасць сялянскіх выступленняў абмяжоўвалася прасторамі аднаго населенага пункта і была непрацяглай па часе. Даволі часта сяляне карысталіся легальнымі формамі супраціўлення – пачыналі супраць памешчыкаў судовыя справы, падавалі скаргі і прашэнні ў розныя ўстановы.

## Народніцкі рух

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. арганізаваны рэвалюцыйны рух у Беларусі пачаў адраджацца толькі ў сярэдзіне 70-х гг. XIX ст. Асноўнымі яго дзеячамі сталі народнікі. Ідэолагі народніцтва шукалі шляхі сацыяльнай перабудовы Расіі зыходзячы з асаблівасцей яе раз-

віцця. Яны верылі ў магчымасць непасрэднага пераходу, мінуючы капіталізм, да сацыялістычнага ладу праз сялянскую абшчыну. Радыкальна настроеная інтэлігенцыя ўспрымала ідэі сялянскага сацыялізму як заклік да непасрэднага рэвалюцыйнага руху, а больш памяркоўная яе частка – як праграму паступовых прагрэсіўных рэформ. Найвышэйшага ўздыму рэвалюцыйнае народніцтва дасягнула ў 70-я – пачатку 80-х гг. XIX ст. і праявілася ў трох праграмах: прапагандысцкай (галоўны ідэолаг П. Лаўроў), бунтарскай (М. Бакунін), змоўніцкай (П. Ткачоў).

Народніцтва знайшло сваё развіццё і сярод беларускай моладзі. Прыкметнае пашырэнне сацыялістычных ідэй на тэрыторыі Беларусі звязана з дзейнасцю «чайкоўцаў» – прапагандысцкіх гурткоў, якія існавалі ў пачатку 1870-х гг. у Пецярбургу і Маскве. Праз жыхароў Вільні А. Зундзялевіча і Я. Фінкельштэйна было наладжана сістэматычнае распаўсюджванне нелегальнай літаратуры на тэрыторыі Беларусі. Да 1875 г. гурткі самаадукацыі, якія працавалі па праграме «чайкоўцаў», існавалі амаль ва ўсіх гарадах Беларусі. Тэарэтычныя пазіцыі членаў гэтых гурткоў былі ў той час вельмі размытымі, часта спалучалі ідэі радыкальных сацыяльных пераўтварэнняў з думкамі аб аўтаноміі Польшчы, неабходнасці весці прапаганду на яўрэйскай мове і інш.

Выхадцы з Беларусі былі актыўнымі ўдзельнікамі агульнарасійскага руху. Сярод вядомых прапагандыстаў – удзельнікаў хаджэння ў народ на пачатку 1870-х гг. былі ўраджэнцы Беларусі С. Кавалік, М. Судзілоўскі, К. Брэшка-Брэшкоўская і інш. Першыя гурткі народніцкага кірунку, што ўжо на пачатку 1870-х гг. дзейнічалі ў Беларусі, займаліся ў асноўным культурна-асветніцкай працай. У 1874–1884 гг. зямляцтвы і нелегальныя групы беларускіх студэнтаў існавалі ў многіх вышэйшых навучальных установах Расіі. Члены гэтых арганізацый нярэдка былі кіраўнікамі народніцкіх гурткоў у Мінску, Магілёве, Віцебску, Пінску, Гродне, Слуцку і іншых гарадах Беларусі.

З узнікненнем у Пецярбургу ў 1876 г. агульнарасійскай арганізацыі «Зямля і воля» народніцкі рух у Беларусі стаў развівацца пад яе непасрэдным уплывам. Праграмныя ўстаноўкі землявольцаў перанялі члены віленскага гуртка І. Вітарта і А. Жангаловіча, горы-горацкага гуртка М. Выржыкоўскага, мінскага гуртка Я. Хургіна (1875–1877), магілёўскіх вучнёўскіх гурткоў (1877–1879). У 1877 г. у Мінску ўзнік гурток М. Велера. Адным з актывістаў створанага ў гэты час гуртка ў Магілёве быў Р. Ісаеў, які пазней стаў відным дзеячам народніцкага

руху ў Пецярбургу. Рэпрэсіі ўрада супраць «Зямлі і волі» прымусілі народнікаў перагледзець тактыку барацьбы з самадзяржаўем. У 1879 г. адбыўся раскол арганізацыі на дзве – «Чорны перадзел» і «Народную волю». Чорнаперадзельцы выступілі прыхільнікамі старой тактыкі, мелі галоўнай мэтай перадзел зямлі памешчыкаў паміж сялянамі. «Народная воля» адстойвала неабходнасць узмацнення палітычнай барацьбы супраць самадзяржаўя і прытрымлівалася тактыкі індывідуальнага тэрору.

Большасць народніцкіх гурткоў у Беларусі першапачаткова падтрымала праграму «Чорнага перадзелу». Мінск стаў адным з цэнтраў гэтай арганізацыі не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Расійскай імперыі. Сюды двойчы прыязджаў лідар «Чорнага перадзелу» Г. Пляханаў. У Мінску ў 1881 г. працавала падпольная друкарня, дзе былі выдадзены некалькі нумароў цэнтральнага органа гэтай арганізацыі. Пагроза правалу друкарні прывяла яе да самаліквідацыі. У пачатку 1882 г. «Чорны перадзел» распаўся. Большая частка прыхільнікаў гэтай арганізацыі перайшла на пазіцыі «Народнай волі». Значны аўтарытэт партыя атрымала пасля 1 сакавіка 1881 г., калі ўраджэнец Мінскай губерні І. Грынявіцкі забіў імператара Аляксандра II і сам пры гэтым загінуў.

У канцы 1881 – пачатку 1882 г. з разрозненых народніцкіх гурткоў была створана адзіная рэгіянальная арганізацыя Беларусі і Літвы. Яна атрымала назву «Паўночна-Заходняя арганізацыя "Народнай волі"». Яе кіруючая Цэнтральная група знаходзілася ў Вільні. Шматлікія правалы хутка паралізавалі яе дзейнасць, і да канца 1882 г. Цэнтральная група фактычна перастала існаваць. Засталіся асобныя гурткі, якія разгарнулі сваю дзейнасць сярод рабочай моладзі і навучэнцаў.

У пачатку 80-х гг. XIX ст. узнікла беларуская народніцкая арганізацыя ў Пецярбургу. Ініцыятарам выступіла беларускае зямляцтва пры ўніверсітэце. У 1881 г. ім быў падрыхтаваны зварот «Да беларускай моладзі», у якім інтэлігенцыя і студэнцтва заклікаліся да шырокай грамадскай дзейнасці на карысць Беларусі. З ліберальна-народніцкіх пазіцый былі падрыхтаваны і надрукаваны на гектографе пад псеўданімам Даніла Баравік «Лісты аб Беларусі» (снежань 1882 г.). Даніла Баравік лічыў, што інтэлігенцыя павінна быць рухавіком народа на шляху яго прагрэсіўнага развіцця пры дапамозе сродкаў, якія адпавядалі ўмовам жыцця людзей і дапамагалі хуткаму фарміраванню самасвядомасці і грамадзянскай волі. З гэтага сцвярджэння ён выводзіў асноўную задачу інтэлігенцыі Беларусі – культурна-асветніцкую, перш

за ўсё вывучэнне быту, звычаяў, традыцый, культуры, гісторыі беларускага народа. У адказ на «Лісты аб Беларусі» ў студзені 1884 г. з'явілася «Пасланне да землякоў-беларусаў», падпісанае псеўданімам Шчыры беларус, дзе ставілася задача барацьбы за звяржэнне самадзяржаўя. На думку аўтара гэтага публіцыстычнага твора, неабходна было пазбавіцца ад усіх перашкод, якія стварала расійскае самаўладства на шляху да новых ідэй, нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення Беларусі. У гэты час з мэтай аб'яднання ўсіх народніцкіх гурткоў Беларусі выступіла група «Гоман» у Пецярбургу, якая выпусціла два нумары аднайменнага перыядычнага органа. Арганізацыя ўтварылася па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам былых удзельнікаў Віцебскага рэвалюцыйнага гуртка А. Марчанкі і Х. Ратнера. У склад групы ўваходзілі М. Стацкевіч, У. Крупскі і інш. Яны падтрымлівалі сувязі з гурткамі Мінска, Магілёва, Віцебска і Гродна.

Гоманаўцы ўпершыню заявілі аб асобнасці беларускай нацыі і самастойных задачах беларускага нацыянальнага руху. Аўтарамі-выдаўцамі «Гомана» ў якасці цэнтральнай аб'яднальнай ідэі была прызнана задача абуджэння этнічнай самасвядомасці, нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення народа. «Вялікая і святая задача беларускай інтэлігенцыі, – адзначалася ў першым нумары "Гомана", – разварушыць магутныя сілы свайго народа, накіраваць прыпыненае прагрэсіўнае развіццё яго, даць яму магчымасць праявіць свой нацыянальны геній...».

У другой палове 80-х – пачатку 90-х гг. XIX ст. галоўнае месца ў народніцкім руху заняла яго ліберальная плынь, праграма якой мела рэфармісцкі характар і была разлічана на паляпшэнне становішча дробных вытворцаў пры захаванні асноў дзяржаўнага і грамадскага ладу. У той жа час сярод сацыялістаў народніцкага кірунку ў канцы 1880-х гг. вылучыліся дзве плыні: сацыяльна-рэвалюцыйная (былыя нарадавольцы Я. Хургін, А. Бонч-Асмалоўскі, Я. Гальперын) і сацыял-дэмакратычная (І. Гурвіч, В. Сяліцкі, С. Трусевіч). Аднак гэта размежаванне на тым этапе не прывяло да выпрацоўкі новых праграм ці стварэння арганізацый.

## Рабочы рух. Распаўсюджванне марксізму

Першыя выступленні наёмных работнікаў у Беларусі адбыліся на будаўніцтве чыгунак у 60-х гг. XIX ст. Некалькі пазней, на мяжы 70–80-х гг. XIX ст., рабочыя Беларусі пачалі выкарыстоўваць новую, па сутнасці пралетарскую форму барацьбы – забастоўкі, арганізаваныя

зноў жа найперш чыгуначнікамі. Цяжкае становішча рабочых, працяглы працоўны дзень, нізкая заработная плата, высокія і нерэгламентаваныя штрафы, адсутнасць страхавога і пенсійнага забеспячэння штурхалі рабочых на барацьбу для паляпшэння свайго становішча. Практычна ўсе выступленні рабочых на пачатковым этапе развіцця насілі абарончы характар і былі выкліканы эканамічнымі прычынамі. У 1885–1894 гг. на тэрыторыі Беларусі адбыліся 22 стачкі і 2 хваляванні рабочых, большасць якіх складалі акты пратэсту чыгуначнікаў. Мінскія рамесныя рабочыя ў гэты час стварылі першую ў краі стачачную касу, сродкі якой выкарыстаалі на падтрымку забастоўкі. Пашырэнне такіх кас стала зародкам з'яўлення прафесійных саюзаў. З сярэдзіны 1890-х гг. рабочыя Беларусі пачалі праводзіць маёўкі, святкаваць 1 Мая як Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных. Першымі гэту акцыю правялі пралетарыі Мінска.

Да часу першых забастовак рабочых Беларусі адносіцца стварэнне прапагандысцкіх гурткоў, якія спрабавалі займацца агітацыйнай дзейнасцю. Сярод наёмных работнікаў пашыраліся ідэі народніцкага сацыялізму, але ўжо ў 70-х гг. XIX ст. народнікі пачалі распаўсюджваць і папулярызаваць ідэі марксізму. Шмат для пашырэння марксізму ў Беларусі зрабілі польская партыя «Пралетарыят» і расійская група «Вызваленне працы», якія падтрымлівалі сувязь з сацыялістычнымі гурткамі на тэрыторыі Беларусі. Прапаганду марксізму ў Мінску ў 1884–1885 гг. праводзілі студэнт Дэрпцкага ўніверсітэта Э. Абрамовіч, былы чорнапераздзелец І. Гурвіч. Да ліку першых марксістаў у Беларусі належалі В. Сяліцкі, С. Трусевіч, Я. Спонці. Першапачаткова прапаганда марксізму ў рабочых гуртках ніяк не паўплывала на свядомасць мясцовых наёмных работнікаў, іх барацьба за паляпшэнне свайго становішча знаходзілася па-за межамі ўздзеяння сацыял-дэмакратаў. Аднак паступова ў рух рабочых былі ўнесены элементы арганізаванасці.

З першых дзён існавання актыўную працу на тэрыторыі Беларусі праводзіла Польская сацыялістычная партыя (ППС), якая арганізацыйна аформілася ў 1893 г. У адрозненне ад еўрапейскіх сацыял-дэмакратычных партый ППС галоўнае месца ў сваёй дзейнасці адводзіла нацыянальнаму пытанню і дзеля дасягнення незалежнасці Польшчы гатова была ісці на крайнія метады барацьбы.

Да канца XIX ст. актывізавалася дзейнасць сацыял-дэмакратычных гурткоў у Ашмянах, Брэсце, Віцебску, Мінску, Смаргоні і інш. Уздым рабочага руху садзейнічаў узмацненню кантактаў марксісцкіх груп роз-

ных гарадоў і ўзнікненню рэгіянальных рабочых арганізацый. У красавіку 1896 г. адбыўся з'езд сацыял-дэмакратаў Вільні, Мінска, Смаргоні і інш., які абвясціў стварэнне Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі (ЛСДП), вызначыў яе праграму і тактыку. Разумеючы назву «Літва» ў гістарычным сэнсе і адносячы яе да Віленскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў, партыя ў сваіх праграмных дакументах выказалася за стварэнне самастойнай дэмакратычнай рэспублікі. У рэзалюцыях з'езда канстатавалася поўнае супадзенне палітычных інтарэсаў пралетарыяту Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны, але не ставілася пытанне аб узаемадзеянні з расійскім пралетарыятам. Супраць такіх установак ЛСДП выступіў адзін з яе арганізатараў С. Трусевіч, расцаніўшы іх як сепаратысцкія. У маі 1896 г. у Вільні па яго ініцыятыве прайшоў з'езд прадстаўнікоў Віленскай, Мінскай і Смаргонскай рабочых арганізацый і абвясціў стварэнне Рабочага саюза Літвы, які прыняў праграму партыі. Яе лідарам стаў С. Трусевіч. Рабочы саюз Літвы, у адрозненне ад ППС і Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі, лічыў нацыянальнае пытанне непрынцыповым, а гэта не садзейнічала яго ператварэнню ў масавую партыю. У 1900 г. Рабочы саюз Літвы аб'яднаўся з Сацыял-дэмакратыяй Каралеўства Польскага і ўтварыў Сацыял-дэмакратыю Каралеўства Польскага і Літвы.

Адной з асноў аб'яднання яўрэйскага нацыянальнага руху стаў марксізм, які трактаваўся ў адпаведнасці з традыцыйнымі ўяўленнямі аб асобай місіі яўрэйскага народа. Была вылучана ідэя аб спецыфіцы яўрэйскага пралетарыяту, крайне бяспраўнага, і ў сувязі з гэтым створаны Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд), які ўзнік у верасні 1897 г. на з'ездзе ў Вільні і стаў самай буйной сацыял-дэмакратычнай арганізацыяй Расіі. У канцы XIX ст. на тэрыторыі Беларусі пашырылі сваю дзейнасць сіяністкія арганізацыі, яўрэйскія прафсаюзы, асветніцкія ўстановы.

На I з'ездзе ў Мінску ў сакавіку 1898 г. было абвешчана стварэнне Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП). На з'ездзе былі прадстаўлены Пецярбургскі, Маскоўскі, Кіеўскі, Екацярынаслаўскі саюзы барацьбы за вызваленне рабочага класа, кіеўская «Рабочая газета» і Бунд. Пры вырашэнні мясцовых пытанняў кожная з прадстаўленых арганізацый захавала сваю аўтаномію. Дэлегаты выбралі ЦК партыі, у агульных рысах сфарміравалі яе задачы. У выніку арыштаў у сакавіку і ліпені 1898 г. РСДРП і Бунд страцілі свае цэнтральныя органы. Бунд у 1899 г. правёў свой II з'езд, дзе ўдалося ад-

навіць дзейнасць кіраўніцтва. РСДРП у той час уступіла ў паласу ідэйна-арганізацыйнага крызісу, які завяршыўся правядзеннем II з'езда партыі ў 1903 г. Сацыялістычная ідэалогія стала таксама асновай узнікнення і арганізацыйнага афармлення беларускага нацыянальнага руху.

## Ліберальная ідэалогія і рух у Беларусі

У XIX ст. на тэрыторыі Беларусі атрымалі пашырэнне ліберальныя ідэі. Адпаведны ім рух не меў значнага ўплыву на мясцовае грамадска-палітычнае жыццё і наогул быў у той час даволі абмежаваны і непаслядоўны. Асобныя ідэі, характэрныя для лібералізму, былі вядомы ў Беларусі ў канцы XVIII ст. (напрыклад, ідэі натуральнага права з іх сцвярджэннем свабоды індывідаў у адносінах да ўлад).

Лібералізм не мае адназначнага вызначэння, тым больш што існуе шмат яго форм. Асноўнымі прынцыпамі, на якіх грунтуецца ліберальная тэорыя, з'яўляюцца: сцвярджэнне свабод індывідаў у адносінах да ўлад, бяспека, права на ўласнасць. Лібералізм – сістэма пераважна індывідуалістычная, якая дае чалавечай асобе і яе правам перавагу перад усім астатнім. Адпаведна ліберальнай тэорыі чалавек, асоба стаіць на першым месцы, а каштоўнасць грамадскіх груп ці ўстаноў вымяраецца выключна тым, у якой меры яны абараняюць правы і інтарэсы чалавека і спрыяюць рэалізацыі мэт асобных суб'ектаў.

На фарміраванне ліберальнай ідэалогіі ў Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. аказваў уздзеянне перш за ўсё Захад, і пераважна праз Польшчу; у другой палове XIX ст. значным стаў уплыў расійскага лібералізму. Па аналогіі з Расіяй у Беларусі асноўным носьбітам лібералізму была больш заможная шляхта, дваранства. Слабасць буржуазіі, нацыянальна-палітычны радыкалізм дробнай шляхты, палітычная інертнасць землеўласнікаў і большасці інтэлігенцыі, нешматлікасць і нацыянальная раз'яднанасць «сярэдніх» слаёў грамадства сталі прычынамі слабасці сацыяльнай базы лібералізму і, адпаведна, самога руху. Галоўным чынам праяўляўся эканамічны лібералізм, палітычныя ідэі дапаўнялі яго не вельмі выразна і пераважна ў час грамадска-палітычных зрухаў (напрыклад, у час паўстання 1863 г.). Ліберальная ідэалогія і рух Беларусі ў 60–90-х гг. XIX ст. мелі і пэўную нацыянальную афарбоўку: у іх асяроддзі можна вылучыць польскую, расійскую, яўрэйскую і ўласнабеларускую плыні, апошняя з якіх выйшла на шлях самавызначэння.

У сярэдзіне XIX ст. сфарміраваліся інтэлектуальныя асяродкі А. Кіркора ў Вільні, В. Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску, А. Вярыгі-Дарэўскага ў Віцебску. Беларуская інтэлігенцыя, якая гуртавалася вакол іх, па грамадска-палітычных поглядах знаходзілася пераважна на ліберальных пазіцыях. Па нацыянальна-культурнай праграме прадстаўнікі названых асяродкаў з'яўляліся прыхільнікамі «краёвага», беларускага па сваёй сутнасці, патрыятызму. Адна з найбольш яркіх асоб беларускага лібералізму А. Кіркор зведаў нападкі з боку прадстаўнікоў як польскага грамадскага руху, так і расійскага. Першыя абвінавачвалі яго ў здрадзе польскім нацыянальным інтарэсам, другія бачылі ў ім замаскіраванага ворага Расіі, які служыць польскім экстрэмістам. Адсюль відаць, у якіх умовах адбывалася нараджэнне беларускай плыні лібералізму.

У гэты ж час зараджаўся «заходнерусізм», які на самым пачатку свайго фарміравання як ідэалагічнай плыні меў пэўную ліберальную афарбоўку, што было звязана са спробай з боку рускамоўнага грамадска-культурнага асяродку даказаць няпольскасць беларусаў і тым самым аб'ектыўна садзейнічаць актывізацыі вырашэння пытання аб іх этнічным самавызначэнні. Асноўныя прынцыпы ідэалогіі «заходнерусізму» былі распрацаваны ў сярэдзіне XIX ст. І. Сямашкам, М. Каяловічам, а таксама знайшлі адлюстраванне на старонках часопіса «Вестник Западной России», які выдаваўся ў 60–70-я гг. XIX ст. К. Гаворскім. Зыходным пастулатам «заходнерусізму» было сцвярджэнне, што беларусы з'яўляюцца не самастойным этнасам, а заходнім адгалінаваннем рускага народа. Сярод прыхільнікаў гэтай ідэалогіі вылучыліся дзве плыні: больш памяркоўная, ліберальная (М. Каяловіч, А. Пшчолка), і кансерватыўная (К. Гаворскі). Прадстаўнікі першай прызнавалі рэальнасць існавання адметных этнакультурных рыс Беларусі, адзначалі самакаштоўнасць беларускай культуры, магчымасць яе вывучэння для ўзбагачэння агульнарускай, але лічылі справу фарміравання нацыянальнай супольнасці як палітычна шкодную. Прыхільнікі ліберальнай плыні «заходнерусізму» ўнеслі значны ўклад у вывучэнне гісторыі і культуры Беларусі, развіццё яе статыстыкі, вывучэнне гаспадарчага жыцця; выказвалі прапановы па рэарганізацыі сельскай гаспадаркі, прамысловасці, сістэмы падаткаабкладання. Нярэдка яны свядома імкнуліся сваёй дзейнасцю палепшыць дабрабыт насельніцтва, супрацьстаяць пашырэнню папулярных у той час сярод моладзі сацыялістычных ідэй. Сярод іх сустракаюцца імёны вядомых

даследчыкаў Я. Карскага, М. Нікіфароўскага і інш. Прадстаўнікі кансерватыўнай плыні лічылі этнічныя асаблівасці беларусаў лакальнадыялектнымі і вынікам польска-каталіцкай экспансіі, выступалі за іх знішчэнне для аднаўлення «рускага» характару краю.

Правядзенне буржуазных рэформ паслужыла штуршком для з'яўлення шэрагу праектаў і меркаванняў, у аснове якіх можна ўгледзець ліберальныя ідэі. Распаўсюджванне апошніх у беларускіх губернях у паслярэформенны перыяд было звязана не толькі з палітычным курсам самадзяржаўя, з няўвагай да думкі дваранства, але і з нацыянальным пытаннем, абмежаваннямі ў некаторых саслоўных правах мясцовага паланізаванага дваранства, маёмасных і грамадзянскіх правах католікаў, яўрэяў і інш.

У перыяд падрыхтоўкі адмены прыгоннага права большасць землеўладальнікаў Беларусі выказалася з кансерватыўных пазіцый за вызваленне сялян без зямлі з захаваннем іх абавязковай працы на памешчыкаў. Меншасць падзяляла ліберальную пазіцыю ў сялянскім пытанні. За перадачу сялянам зямлі ва ўласнасць за выкуп і пераўтварэнне сялянскіх гаспадарак у самастойныя выказваліся памешчык Магілёўскай губерні А. Мянжынскі, магілёўскі губернатар С. Галынскі. Апошні абгрунтоўваў неабходнасць перадачы сялянам зямельных надзелаў у памерах, якія б забяспечвалі іх жыццёвую патрэбу, з правядзеннем адначасовага іх поўнага выкупу. За ўтварэнне групы вольных арандатараў выступаў буйны землеўласнік В. Радзівіл; гродзенскія памешчыкі К. Аржэшка, А. Глязэр лічылі неабходным стварыць і ўмацоўваць слой заможных сялян. Ліберальных пазіцый у аграрным пытанні прытрымліваліся П. Баброўскі, М. Дубенскі, І. Зяленскі, А. Семянтоўскі. Але яны ўзнімалі больш шырокае кола эканамічных праблем паслярэформеннага развіцця Беларусі.

Грамадскія арганізацыі, якія пачалі актыўна стварацца ў 1870–90-х гг., сталі асноўнай сферай дзейнасці лібералаў. Ва ўмовах жорсткай цэнзуры, адсутнасці на тэрыторыі Беларусі незалежнай прэсы, вышэйшай школы і навуковых устаноў, невялікай колькасці перыядычных выданняў гэтыя аб'яднанні сваёй працай аб'ектыўна садзейнічалі пашырэнню новых, прагрэсіўных ідэй, стымулявалі самаарганізацыю грамадскіх сіл. У апошняй трэці XIX ст. на тэрыторыі Беларусі ўзнікла вялікая колькасць дабрачынных устаноў, праваслаўных брацтваў, таварыстваў цвярозасці і інш. Акрамя таго, у 1870–90-х гг. было створана 19 таварыстваў сельскай гаспадаркі, 5 медыцынскіх, 11 культурна-

асветніцкіх, 8 спартыўных аб'яднанняў і інш. Узніклі таксама крэдытныя, спажывецкія і вытворчыя кааператывы, якія к канцу стагоддзя ўсё больш разглядаліся мясцовай грамадскасцю як сродак змагання з пралетарызацыяй горада і вёскі. К канцу XIX ст. былі створаны касы і таварыствы ўзаемнай дапамогі рамеснікаў і рабочых у Мінску, Ашмянах, Смаргоні і інш.

Асяродкамі эканамічнага лібералізму ў Беларусі ў значнай ступені былі сельскагаспадарчыя таварыствы. Першымі і найбольш буйнымі з іх сталі заснаваныя ў 1876 г. Мінскае і Віцебскае. Яны аб'ядноўвалі мясцовых землеўладальнікаў, аграномаў, інжынераў і інш. На пасяджэннях таварыстваў абмяркоўваліся розныя эканамічныя пытанні і ствараліся практычныя праекты па развіцці гаспадаркі. Магілёўскі губернатар А. Дэмбавецкі, падзяляючы пазіцыі неабходнасці рэфармавання сельскай гаспадаркі, у сваіх апублікаваных працах даказваў, што ў Магілёўскай губерні трэба знішчыць абшчыну і даць беларускім сялянам магчымасць самастойна весці гаспадарку. Ён лічыў, што грамада не адпавядае іх звычаям, хоць у рускіх яна можа існаваць дзякуючы іх гістарычнаму імкненню да калектывізму.

У 1886 г. у Мінску пачала выдавацца першая ў Беларусі легальная неафіцыйная газета «Мінскі лісток». Яна ўяўляла сабой перыядычны орган пераважна ліберальнага кірунку, які аб'ядноўваў публіцыстаў адпаведнай пазіцыі. З газетай супрацоўнічалі вучоныя А. Багдановіч, М. Янчук, М. Доўнар-Запольскі і інш. Рэдакцыя «Мінскага лістка» прапагандавала ідэі аб развіцці спажывецкіх таварыстваў, таннага крэдыту, арцеляў, кас узаемнай дапамогі, папулярызавала дзейнасць дабрачынных арганізацый, выказвалася за пашырэнне грамадскага самакіравання, за права грамадства прымаць удзел у абмеркаванні розных пытанняў эканамічнага і палітычнага жыцця і г. д.

Асэнсаванне задач беларускай інтэлігенцыі з ліберальна-народніцкіх пазіцый давалася ў выдадзеных у 1882 г. «Лістах аб Беларусі», аўтар якіх выступіў пад псеўданімам Даніла Баравік. Ён выказваўся супраць радыкальных сацыяльных змен, лічыў найбольш мэтазгоднай асветніцкую дзейнасць сярод народа, што зможа падрыхтаваць Беларусь да пераўтварэнняў.

Пашырэнню ліберальных ідэй садзейнічала праца мінскага Таварыства прыгожых мастацтваў, створанага ў канцы 90-х гг. XIX ст. Шмат увагі прадстаўнікі ліберальнай інтэлігенцыі надавалі арганізацыі народных чытанняў. У канцы XIX ст. яны спрабавалі працаваць з рабо-

чымі, пашыраць сярод іх культурна-асветніцкую дзейнасць, ствараць гурткі пісьменнасці, а таксама шмат зрабілі для росту грамадзянскай свядомасці наёмных работнікаў.

У хуткім часе пасля задушэння паўстання 1863 г., у канцы 1860–80-х гг., у польскім грамадстве пашырылася новая ідэалагічная і грамадская плынь, якая атрымала назву «варшаўскі пазітывізм». Ён быў заснаваны на тэорыі «арганічнай працы», якая ставіла першачарговую задачу эканамічнага развіцця Польшчы для ўзбагачэння нацыі. Барацьба за нацыянальнае вызваленне адкладвалася на аддаленую перспектыву. Паказальнай стала брашура былога ўдзельніка віленскага грамадскага руху сярэдзіны XIX ст. І. Крашэўскага «Польская праграма», дзе ён прапанаваў шукаць кампраміснае пагадненне з расійскім урадам і ставіць бліжэйшую задачу «вытворчай працы» і народнага асветніцтва. Актыўнай прыхільніцай варшаўскага пазітывізму ў Беларусі была вядомая пісьменніца Э. Ажэшка. Яна аддавала перавагу развіццю гаспадаркі, узбагачэнню нацыі перад рэвалюцыйнай перабудовай грамадства. Прапагандавалі культ эканамічнага і тэхнічнага прагрэсу ў Беларусі вядомыя навукоўцы А. Ельскі, Я. Завіша, В. Шукевіч, Я. Карскі.

З вялікай урачыстасцю ў 1879 г. у Кракаве адбылося святкаванне 50-гадовага юбілею літаратурнай творчасці І. Крашэўскага. Яно ператварылася ў патрыятычную маніфестацыю. На юбілеі сярод іншых прысутнічалі дэлегацыі Віленскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. Паказальным было выступленне вядомага юрыста і грамадскага дзеяча У. Спасовіча, які заклікаў да пашырэння ў расійскім грамадстве ўсведамлення неабходнасці канстытуцыйнай рэформы. Ён быў выхадцам з Беларусі, адным з пачынальнікаў ліберальнага руху ў Расіі, прафесарам права. На працягу жыцця У. Спасовіч не парываў сувязі з грамадскім жыццём Беларусі і Польшчы.

У канцы 60–80-х гг. XIX ст., калі ў польскім грамадстве на першы план выйшлі эканамічныя задачы, у беларускім ва ўмовах узмоцненай русіфікатарскай палітыкі пашыраліся рускія грамадска-культурныя ўплывы, фарміраваўся беларускі нацыянальна-культурны рух. Аднак апошні ў 1860–90-х гг. рос пераважна ў межах і пад уплывам рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні. Лібералізм у Беларусі не стаў у той час канструктыўным рухам, часткай грамадскага жыцця, які аб'яднаў бы нацыянальную інтэлігенцыю, прадпрымальнікаў, па-рэфарматарску настроеных чыноўнікаў і інш.

## Кансерватыўная плынь грамадскага жыцця

У 1860–90-х гг. кансерватыўная плынь у Беларусі знайшла праяўленне галоўным чынам у грамадскай думцы, публіцыстыцы. Яе прадстаўнікі не лічылі грамадска-палітычную дзейнасць сродкам дасягнення сваіх мэт, выказвалі самадастатковасць уласных зваротаў з прапановамі да ўрада. Акрамя таго, у Беларусі пасля падаўлення паўстання 1863 г. адсутнічалі дваранскія сходы, якія ў Расійскай імперыі традыцыйна выступалі ў якасці асяродкаў кансерватыўна настроенага дваранства. Для яго важным было захаванне саслоўна-карпаратыўных форм арганізацыі грамадскага жыцця. Кансерватары крытыкавалі змест ліберальных канцэпцый, заснаваных на прынцыпах натуральнага права, грамадскага дагавору, ставілі пад сумненне ідэі суверэннасці праў чалавека. У другой палове XIX ст. яны адмовіліся ад рэлігійнага абскурантызму, але разглядалі рэлігію ў якасці інструмента захавання ў грамадстве пэўнага маральнага стану. Парадак і стабільнасць вызначаліся як асноўныя каштоўнасці кансерватызму.

У той жа час кансерватары, як і лібералы, выступалі за правядзенне шырокай культурна-асветніцкай працы сярод сялянства, пашырэнне перадавога вопыту вядзення гаспадарак. Яны прапаноўвалі лічыць сялянскі надзел недатыкальнай і неадчужальнай маёмасцю сельскай грамады, імкнуліся прадухіліць стварэнне абеззямеленага пралетарыяту, бескантрольныя міграцыі сельскіх жыхароў, затрымаць капіталістычную эвалюцыю паслярэформеннай вёскі, выказваліся за захаванне патрыярхальных адносін у сялянскай сям'і, а таксама дваранскай апекі над сельскімі жыхарамі. Адпаведныя настроі былі асабліва моцнымі ў кансерватыўных колах грамадскасці беларускіх губерняў.

У другой палове 1860-х гг. кансерватыўнае дваранства Беларусі выступала за ануляванне аграрных цыркуляраў віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва, ліквідацыю інстытута міравых пасрэднікаў. Прагматычна, у мэтах аптымізацыі мясцовага эканамічнага жыцця прадстаўнікі кансерватыўных колаў Беларусі нярэдка выказваліся за пашырэнне праў яўрэяў і католікаў. Яны выступалі прыхільнікамі шырокага мясцовага самакіравання, дзе галоўную ролю павінны былі адыгрываць заможныя і адукаваныя слаі грамадства. Характэрнай рысай кансерватыўнай ідэалогіі заставалася рэлігійнасць. Перавага надавалася праваслаўнай царкве, аднак кансерватыўныя колы ўстрымліваліся ад рэзкіх выпадаў супраць каталіцтва.

Беларусь у 60–90-х гг. XIX ст. стала арэнай вострага нацыянальна-палітычнага супрацьстаяння, актыўнага пошуку і выпрабавання расійскімі ўладамі сродкаў вырашэння «польскага» і «яўрэйскага» пытанняў. Менавіта гэты фактар шмат у чым вызначыў характар і змест грамадска-палітычнага жыцця на тэрыторыі беларускіх губерняў, а таксама ролю мясцовых арганізацый у агульнарасійскім рэвалюцыйна-дэмакратычным руху. Напрамак мясцовага грамадска-палітычнага жыцця стаў найбольш дынамічным, стымулюючым матывам змен сацыяльна-палітычных настрояў розных пластоў насельніцтва беларускіх губерняў, станаўлення пачаткаў грамадзянскай супольнасці.

Тэма 8

# КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў 1860–90-я гг. ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

**Асвета і адукацыя.**
**Развіццё навуковай думкі.**
**Станаўленне беларускай нацыянальнай літаратуры.**
**Перыядычны друк.**
**Тэатр і музыка.**
**Архітэктура і горадабудаўніцтва.**
**Выяўленчае мастацтва.**
**Умовы ўтварэння беларускай нацыі.**
**Тэрыторыя фарміравання беларускай нацыі.**
**Беларускі нацыянальна-культурны рух.**
**Станаўленне новай беларускай літаратурнай мовы.**

Другая палова XIX ст. (1860–90-я гг.) стала новым этапам у развіцці культуры Беларусі. Яго адметныя рысы вызначылі змены ў грамадска-палітычных умовах, перш за ўсё пераход да разгорнутай русіфікацыі, актывізацыю мадэрнізацыі ўсіх бакоў жыцця, якую суправаджалі інтэнсіўныя нацыянальна-культурныя працэсы, фарміраванне сучаснай беларускай нацыі, а таксама з'яўленне элементаў грамадзянскай супольнасці.

## Асвета і адукацыя

Змена прыярытэтаў ва ўрадавай палітыцы пасля падаўлення паўстання 1863 г. у першую чаргу адбілася на развіцці асветы і адукацыі. У 1863 г. былі прыняты «Часовыя правілы для народных школ у губернях Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай», паводле якіх прадугледжвалася выкладанне ўсіх дысцыплін у народных вучылішчах толькі на рускай мове. Русіфікатарскі кірунак, кантроль пачатковай школы з боку праваслаўнай царквы прадугледжвала рэалізацыя на тэрыторыі беларускіх губерняў школьнай рэформы 1864 г. У 1866 г. на тэрыторыі Віленскай навучальнай акругі дзейнічала 1251 навучальная ўстанова, з іх 130 падпарадкоўваліся Міністэрству народнай асветы, 956 – духоўнаму ведамству. Да канца XIX ст. колькасць школ значна павялічылася. Паводле даных 1899 г., на тэрыторыі Беларусі налічвалася 989 народных вучылішч, 5814 царкоўнапрыходскіх школ. Больш чым у 7 разоў узрасла колькасць навучэнцаў у іх. Тут не ўлічаны тайныя польскія і беларускія школы, рэпрэзентатыўныя звесткі аб якіх адсутнічаюць, а таксама яўрэйскія школы.

Аснову сістэмы адукацыі Беларусі ў 1860–90-х гг. складала пачатковая школа, якая ў сельскай мясцовасці была прадстаўлена народнымі вучылішчамі, царкоўнапрыходскімі школамі і школамі граматы, у гарадах – прыходскімі павятовымі і гарадскімі вучылішчамі. Ад 60 да 85 % усіх навучальных устаноў у беларускіх губернях складалі царкоўнапрыходскія школы і школы граматы. Вучобай у вясковых пачатковых школах было ахоплена каля 44 % дзяцей школьнага ўзросту. Падрыхтоўка настаўнікаў для іх ажыццяўлялася ў настаўніцкіх семінарыях. Першая ў Расійскай імперыі семінарыя пачала дзейнічаць у Маладзечне ў 1864 г., затым у Полацку (1872), Нясвіжы (1875), Свіслачы (1876). Навучальна-выхаваўчы працэс у іх быў арганізаваны для падрыхтоўкі адданых дзяржаве і манархіі вясковых настаўнікаў, здольных пашыраць і папулярызаваць русіфікатарскую палітыку ў народзе. На самай справе рэальнае значэнне настаўніцкіх семінарый далёка не заўсёды ўкладвалася ў афіцыйны кірунак і было значна шырэйшым. Сярод выкладчыкаў семінарый было шмат даследчыкаў і папулярызатараў матэрыяльнай і духоўнай спадчыны беларускага народа, такіх як М. Нікіфароўскі, Ю. Крачкоўскі і інш., а многія выпускнікі адзначыліся актыўным удзелам у рэвалюцыйным і нацыянальна-вызваленчым руху.

Сетка сярэдніх навучальных устаноў у беларускіх губернях павялічылася з 21 у 1863-м да 45 у 1899 г. За гэты перыяд колькасць вучняў у іх узрасла з 3,4 да 10,4 тыс. чалавек. Практычна ўсе сярэднія навучальныя ўстановы Беларусі былі сканцэнтраваны ў гарадах. У 60–90-х гг. XIX ст. на тэрыторыі Беларусі ва ўсіх губернскіх цэнтрах, а таксама ў Брэсце, Гомелі і Слуцку дзейнічалі мужчынскія гімназіі. У Бабруйску і Мазыры працавалі прагімназіі, рэальныя вучылішчы – у Мінску, Магілёве, Пінску, жаночая гімназія – у Гомелі. Пашырылася сетка прыватных навучальных устаноў, у тым ліку жаночых. Да канца стагоддзя яны з'явіліся ў Брэсце, Бабруйску, Віцебску, Гомелі, Магілёве, Мазыры, Слоніме, Слуцку.

Пасля закрыцця ў 1864 г. Горы-Горацкага земляробчага інстытута расійскі ўрад больш не дапускаў адкрыцця вышэйшых навучальных устаноў на тэрыторыі Беларусі, нягледзячы на шматлікія хадайніцтвы мясцовай грамадскасці аб адкрыцці ў тым ці іншым горадзе ўніверсітэта ці інстытута. Гэта было выклікана тым, што ўрадавыя колы непакоіліся аб патэнцыяльнай магчымасці пераўтварэння вышэйшай навучальнай установы ў цэнтр нацыянальна-вызваленчага руху. Моладзь Беларусі атрымлівала вышэйшую адукацыю пераважна ва ўніверсітэтах і інстытутах Пецярбурга, Масквы, Кіева, Харкава, Дэрпта, Варшавы і інш.

Паскарэнне мадэрнізацыі эканамічнага жыцця ў другой палове XIX ст. выклікала неабходнасць станаўлення сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. У 1860-я гг. на тэрыторыі Беларусі ў 21 народным вучылішчы ў элементарным выглядзе было арганізавана навучанне рамёствам. Згодна з «Палажэннем» ад 31 мая 1872 г. пры гарадскіх вучылішчах маглі ствараццa рамесныя класы. У 1872 г. было адкрыта Горацкае рамеснае вучылішча пры механічным заводзе, у 1878 г. – Гомельскае тэхнічнае чыгуначнае вучылішча. З 1878 г. пачала падрыхтоўку земляробаў і жывёлаводаў Мар'інагорская казённая сельскагаспадарчая школа. Найбольш актыўна рамесныя класы і вучылішчы пачалі ствараццa ў 1890-х гг.

Адукацыйна-асветніцкім цэнтрам Беларусі і Літвы выступала Вільня. Тут у 1864 г. адкрылася адна з буйнейшых у Расійскай імперыі публічная бібліятэка. Яе кніжны фонд дасягаў 200 тыс. кніг і папаўняўся за кошт бібліятэк канфіскаваных уладанняў удзельнікаў паўстання 1863 г., навучальных устаноў, зачыненых касцёлаў і манастыроў і г. д. Агульнадаступныя бібліятэкі былі створаны ў Гродне (1863) і Мін-

ску (1900), музеі – у Магілёве (1867 і 1899) і Віцебску (1895). Унікальныя музейныя калекцыі, сямейныя архівы, карцінныя галерэі і бібліятэкі захоўваліся ў сотнях землеўласніцкіх рэзідэнцый Беларусі. Пазней скарбы пераважнай іх часткі трапілі за межы Беларусі, у тым ліку намаганнямі саміх уладальнікаў і іх нашчадкаў.

## Развіццё навуковай думкі

У другой палове XIX ст. развіццё навуковай думкі ў Беларусі насіла супярэчлівы і складаны характар. У сярэдзіне 1860-х гг. адбылася змена пакаленняў вучоных. Шмат у чым гэта было абумоўлена пераглядам прыярытэтаў у грамадска-культурным развіцці Беларусі пасля падаўлення паўстання 1863 г., а таксама асабістымі абставінамі даследчыкаў.

Пазітыўны ўплыў на вывучэнне старажытнасцей у Беларусі аказала дзейнасць Маскоўскага археалагічнага таварыства, створанага ў 1867 г. Па ініцыятыве заснавальніка таварыства графа А. Уварава сталі праводзіцца археалагічныя з'езды, арганізацыя якіх стымулявала і кансалідавала палявыя навуковыя даследаванні, садзейнічала іх прафесіяналізацыі. Асаблівую актыўнасць усіх даследчыкаў беларускіх старажытнасцей выклікала падрыхтоўка і правядзенне IX Археалагічнага з'езда ў Вільні ў 1893 г. Вялікую ролю ў вывучэнні мовы, фальклору, матэрыяльнай культуры Беларусі адыграла Паўночна-Заходняе аддзяленне Рускага геаграфічнага таварыства. Яно працавала нядоўга – з 1867 па 1875 г. – і было створана з афіцыйнымі мэтамі абгрунтавання поглядаў на Беларусь як на неад'емную частку Расійскай імперыі, аднак згуртавала мясцовыя даследчыцкія сілы і заклала трывалы падмурак навуковага беларусазнаўства. Значную ролю ў гэтым кірунку адыграла дзейнасць Аддзялення рускай мовы і славеснасці Расійскай акадэміі навук, а таксама Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і прыродазнаўства пры Маскоўскім універсітэце, Вольнага эканамічнага таварыства і інш. Намаганнямі перш за ўсё даследчыкаўэнтузіястаў была апублікавана вялікая колькасць гістарычных крыніц, у тым ліку «Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России», «Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией» і інш.

У 60–80-х гг. XIX ст. прадоўжыў сваю шматгранную навуковую і грамадскую дзейнасць **А. Кіркор**. На старонках выдання «Живопис-

ная Россия» ў 1882 г. даследчык апублікаваў працы «Літоўскае Палессе» і «Беларускае Палессе» пра гісторыю і прыроду Беларусі, матэрыяльную і духоўную культуру беларускага народа. А. Кіркор напісаў нарыс развіцця беларускай літаратуры ў межах даследавання «Пра літаратуру братніх славянскіх народаў», некаторы час выдаваў газету «Виленский вестник», затым з'яўляўся адным са стваральнікаў газеты «Новое время» ў Пецярбургу.

У 60–70-х гг. XIX ст. у навуковае жыццё Беларусі прыйшлі такія вучоныя, як М. Кусцінскі, П. Шэйн, А. Семянтоўскі, І. Насовіч, Я. Завіша, Ю. Крачкоўскі, некалькі пазней – М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, М. Доўнар-Запольскі, М. Янчук, А. Сапуноў і інш. Па даручэнні Рускага геаграфічнага таварыства **І. Насовіч** на аснове збору актаў і грамат Заходняй Русі XIV–XVIII стст. падрыхтаваў «Гістарычны слоўнік беларускай мовы». Вучоны шмат папрацаваў пры падрыхтоўцы «Слоўніка беларускай гаворкі», выдадзенага ў 1870 г. Аб'ектыўным даследчыкам матэрыяльнай культуры беларускага народа праявіў сябе **Ю. Крачкоўскі**. Ён напісаў кнігі «Нарыс быту заходнерускага селяніна», «Быт заходнерускага селяніна», на старонках якіх змешчана шмат рэдкіх назіранняў. Надзвычай апантана займаўся краязнаўствам магілёўскі губернатар **А. Дэмбавецкі**. Ён стаў ініцыятарам і рэдактарам выдання трохтомнай калектыўнай працы «Вопыт апісання Магілёўскай губерні...». Тут упершыню на прыкладзе аднаго рэгіёна была змешчана цэлая галерэя гісторыка-геаграфічнага, этнаграфічнага і культуралагічнага матэрыялу.

Адну з першых праграм збірання помнікаў народнай творчасці стварыў **П. Шэйн**. З дапамогай шматлікіх карэспандэнтаў даследчык сабраў і выдаў вялікую колькасць фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў. Ён жа апублікаваў кнігі «Беларускія народныя песні», «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» і інш. Як карэспандэнт П. Шэйна пачынаў сваю навуковую дзейнасць **М. Нікіфароўскі**. У пачатку 1890-х гг. даследчык выступіў з самастойнымі працамі, прысвечанымі Віцебскай губерні. Самай буйной з іх з'яўляюцца «Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў побыту», выдадзеныя ў Віцебску ў 1895 г.

Яркі след у развіцці беларускай навукі пакінуў **Е. Раманаў.** Ён падрыхтаваў пятнаццацітомнае выданне «Беларускі зборнік», з іх даследчык паспеў выдаць толькі дзевяць, астатнія часткова страчаны. Ву-

чоны арганізаваў выпуск трох тамоў «Магілёўскай даўніны», а таксама «Матэрыялаў па этнаграфіі Гродзенскай губерні», «Матэрыялаў па гістарычнай тапаграфіі Віцебскай губерні. Веліжскі павет» і інш.

Вучоным-энцыклапедыстам па праву лічыцца **А. Сапуноў,** які падрыхтаваў працы «Рака Заходняя Дзвіна», «Матэрыялы па гісторыі і геаграфіі Дзісненскага і Вялейскага паветаў Віленскай губерні», «Віцебская даўніна» і інш. Значны ўклад у вывучэнне беларускіх старажытнасцей унеслі таксама **У. Завітневіч, Г. Татур, В. Шукевіч, А. Снітко, Н. Авенарыус** і інш.

Беларускія даследчыкі зрабілі шмат для развіцця і папулярызацыі прыродазнаўчых навук. З-за адсутнасці вышэйшых навучальных устаноў, афіцыйных даследчыцкіх цэнтраў прыродазнаўчая думка была засяроджана ў прыватных лабараторыях, фізічных кабінетах класічных гімназій і рэальных вучылішч. Значную ролю ў пашырэнні навуковых ведаў на тэрыторыі Беларусі адыграла заснаванне ў студзені 1898 г. Віленскага аддзялення Рускага тэхнічнага таварыства (РТТ). Вядучыя пазіцыі ў яго дзейнасці займалі інжынеры-чыгуначнікі, перш за ўсё такія вядомыя вынаходнікі, як **К. Андэрс, С. Бачманаў**. Цесную сувязь з таварыствам падтрымліваў Саюз папяровых фабрыкантаў у Расіі, які заснаваў дырэктар Добрушскай папяровай фабрыкі **А. Стульгінскі.** Па ініцыятыве Саюза пры РТТ была створана станцыя па выпрабаванні і даследаванні якасці паперы. А. Стульгінскі быў вядомым інжынерам, вынаходнікам, арганізатарам вытворчасці і грамадскім дзеячам. Па яго ініцыятыве ўпершыню ў Расійскай імперыі на Добрушскай папяровай фабрыцы быў уведзены васьмігадзінны працоўны дзень. А. Стульгінскі таксама стаў ініцыятарам пабудовы ў Добрушы першай на тэрыторыі Беларусі электрастанцыі, якая пачала сваю вытворчасць у 1889 г.

Шырокую вядомасць і прызнанне ў навуковай грамадскасці Еўропы ў канцы XIX ст. атрымалі працы ўраджэнца Беларусі **Я. Наркевіча-Ёдкі**. Вучоны доўгі час праводзіў эксперыменты ў сваім радавым маёнтку Наднёман. Ён вывучаў уплыў электрычнасці на расліны, праводзіў даследаванні па прыёме і перадачы электрычных сігналаў без дроту, прапанаваў метад кантролю фізічнага стану і здароўя чалавека, заснаваны на атрыманні электраграфічных адбіткаў, метад электратэрапіі паралізаваных і нервовых хворых.

Першы ў Расійскай імперыі навуковы фізіка-матэматычны часопіс выдаваў **К. Чаховіч**, які быў членам вядучых навуковых таварыстваў, вынаходнікам канструкцый даследчых і дэманстрацыйных пры-

лад, аўтарам прац па фізіцы электрычных і магнітных з'яў, оптыцы і спектраскапіі, метэаралогіі. Распрацоўшчыкам першага ў Расійскай імперыі вучэбнага курса практычнай механікі быў ураджэнец Рэчыцкага павета **М. Ястрэмбскі**. У маёнтку Нянькава Навагрудскага павета многія гады праводзіў даследаванні па заалогіі, батаніцы У. Дыбоўскі, працы якога мелі еўрапейскую вядомасць. Таленавітым даследчыкам быў ураджэнец Гомельшчыны заслужаны прафесар Кіеўскага ўніверсітэта В. Ермакоў. Яго імя было шырока вядома навуковай грамадскасці Еўропы дзякуючы працам і адкрыццям у галіне матэматыкі. Ён быў выдатным педагогам, аўтарам многіх падручнікаў, а таксама заснавальнікам і выдаўцом першага ў Расійскай імперыі «Часопіса элементарнай матэматыкі». Вялікі ўклад у развіццё эвалюцыйнай палеанталогіі зрабіў **У. Кавалеўскі,** а яго брат **А. Кавалеўскі** стаў заснавальнікам эвалюцыйнай эмбрыялогіі. Паспяховае развіццё крыягеннай тэхнікі немагчыма было б без грунтоўных даследаванняў **Ж. Урублеўскага.** Яго брат **Э. Урублеўскі** зрабіў шмат для вывучэння хімічнага складу газаў.

## Станаўленне беларускай нацыянальнай літаратуры

У другой палове XIX ст. беларускае друкаванае слова было вельмі абмежавана ў патэнцыяльных магчымасцях убачыць свет на старонках перыядычных ці асобных выданняў. Аднак у літаратуры адбываліся працэсы, звязаныя з умацаваннем дэмакратычных тэндэнцый, прынцыпаў крытычнага рэалізму. Адной з найбольш яркіх постацей беларускай літаратуры гэтага перыяду з'яўляецца **Ф. Багушэвіч.** У свае маладыя гады пісьменнік удзельнічаў у паўстанні 1863 г., што выклікала моцныя патрыятычныя матывы ў яго паэзіі. У пачатку 1890-х гг. Ф. Багушэвіч выдаў зборнікі «Дудка беларуская», «Смык беларускі». У яго паэзіі гучалі вострасацыяльныя матывы, тэма асэнсавання становішча простага чалавека, прыгнечанага селяніна, а таксама матывы нацыянальнага адраджэння. Паэт верыў ва ўзнаўленне гістарычнай свядомасці народа, звяртаў увагу чытачоў на шматвяковую гісторыю беларускай дзяржаўнасці.

У развіцці літаратуры асобнае месца займае рэвалюцыйная публіцыстыка **К. Каліноўскага,** але яна не мела непасрэднага ўплыву на грамадска-літаратурны працэс у Беларусі, паколькі знаходзілася пад за-

баронай. Публіцыстыка К. Каліноўскага, змешчаная на старонках «Мужыцкай праўды», увасобленая ў «Лістах з-пад шыбеніцы», не пазбаўлена літаратурна-мастацкіх вартасцей і стала адлюстраваннем пэўнай палітычнай ідэі. Тэматычна яна была звязана з падзеямі паўстання 1863 г., што было характэрна для літаратурных твораў многіх іншых аўтараў.

Паслядоўнікам Ф. Багушэвіча ў паэзіі стаў **А. Гурыновіч.** У перыяд вучобы ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце ён уваходзіў у склад і пэўны час узначальваў нелегальны «Гурток моладзі польска-літоўска-беларускай і маларускай». А. Гурыновіч верыў у жыццёвае прымяненне сацыялістычных ідэй, заклікаў да барацьбы з самадзяржаўем. Пісаў на беларускай, рускай, польскай мовах. Вядомы яго вершы «Дзякуй табе, браце Бурачок Мацею...», «Перш душылі паны...», «Што ты спіш, мужычок...», «Бор» і інш. А. Гурыновіч сабраў цікавы этнаграфічны матэрыял, зрабіў шмат запісаў беларускага фальклору.

Прыкметны ўклад у развіццё беларускай літаратуры ўнёс **Я. Лучына (І. Неслухоўскі).** Ён пісаў на беларускай, польскай, рускай мовах. Тэматычна яго творчасць была звязана пераважна з жыццём беларускай вёскі, галоўны яго герой – селянін як найбольш варты прадстаўнік бацькаўшчыны і носьбіт сапраўднай маральнасці. Я. Лучына верыў у тэхнічны прагрэс, сілу асветніцтва. Яго пяру належыць нарыс «З крывавых дзён», прысвечаны падзеям паўстання 1863 г. Я. Лучына займаўся збіраннем беларускага фальклору, перакладамі літаратурных твораў з польскай і рускай моў, быў добрым знаўцам айчыннай гісторыі і культуры. Беларускія вершы Я. Лучыны склалі кнігу «Вязанка», якая ўбачыла свет у Пецярбургу ў 1903 г.

У агульнадэмакратычным кірунку развівалася творчасць **А. Абуховіча**, **Ф. Тапчэўскага,** аднак іх літаратурная спадчына засталася невялікай. У канцы XIX ст. пачынаецца творчая дзейнасць **К. Каганца, Ядвігіна Ш.**, якая ў поўнай меры разгарнулася ў пачатку XX ст.

## Перыядычны друк

У другой палове XIX ст. ён быў прадстаўлены перш за ўсё афіцыйнымі выданнямі, такімі як «Губернские ведомости», «Епархиальные ведомости». Яны даводзілі чытачам урадавую думку, палітыку, але з гадамі на іх старонках усё часцей з'яўляліся краязнаўчыя, этнаграфічныя матэрыялы, публікацыі старажытных дакументаў на бела-

рускай мове і інш. У 1886 г. пачала выходзіць першая прыватная газета «Минский листок», якая праіснавала да 1902 г. Гэта выданне мела ліберальны кірунак, на яго старонках друкаваліся літаратурныя творы, рэцэнзіі, агляды культурнага жыцця. Змяшчаліся тут таксама даследаванні **М. Доўнар-Запольскага, М. Янчука** і інш. Газета садзейнічала яднанню мясцовай інтэлігенцыі, выступала ў якасці своеасаблівага арганізатара культурнага жыцця.

## Тэатр і музыка

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. былі забаронены тэатральныя пастаноўкі на польскай мове. Фактычна спыніліся сцэнічныя імпрэзы, якія наладжваліся В. Дунінbackup-Марцінкевічам. У 60–90-я гг. XIX ст. атрымалі пашырэнне аматарскія тэатральныя пастаноўкі. У 1892 г. ў Радашковічах была арганізавана спроба наладзіць спектакль на беларускай мове па п'есе Ядвігіна Ш. «Злодзей», але пастаноўка, якая мела дабрачынныя мэты, была забаронена ўладамі. Аматарскія тэатральныя гурткі існавалі ў Пінску, Слуцку, Полацку, Слоніме, Ашмянах і інш. Самадзейныя калектывы выкарыстоўвалі творы М. Гогаля, І. Катлярэўскага і інш. У 1880–90-х гг. аматарскія калектывы пачалі самаарганізоўвацца ў больш буйныя аб'яднанні – мастацка-творчыя гурткі і таварыствы, сярод якіх Мінскае музычна-літаратурнае таварыства, Гродзенскае літаратурна-музычнае таварыства, Полацкі музычна-драматычны гурток аматараў і інш. Найбольш значнай і шматбаковай была дзейнасць Мінскага таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, час плённай працы якога прыпадае на пачатак XX ст. У 1890 г. у Мінску адкрыўся гарадскі тэатр. Першай пастаноўкай стаў драматычны спектакль «Сфінкс» А. Фелье ў выкананні аматараў. У тэатры выступалі оперныя, драматычныя і аперэтачныя калектывы. У гарадах Беларусі гастралявалі рускія і ўкраінскія драматычныя трупы. Асаблівым поспехам карысталіся Маскоўскі Малы тэатр, украінскія трупы пад кіраўніцтвам М. Крапіўніцкага і М. Старыцкага.

Першая музычная школа ў Беларусі была адкрыта ў Мінску ў 1894 г. У развіцці песеннага мастацтва прыкметную ролю адыграла Мінскае вучылішча арганістаў, заснаванае ў 1871 г. Вялікую ролю для станаўлення музычнага мастацтва мелі гастролі вядомых кампазітараў і музыкантаў С. Рахманінава, Ф. Шаляпіна і інш. Расло майстэрства

мясцовых музыкантаў. З поспехам выступаў з канцэртамі на радзіме, у Кракаве, Франкфурце-на-Майне вядомы збіральнік народных песень і танцаў, кампазітар і скрыпач **М. Ельскі.** Шырокае прызнанне ў Беларусі мела творчасць гродзенскага арганіста **І. Глінскага.** У канцы XIX ст. пачалася музычная дзейнасць беларускіх кампазітараў **М. Чуркіна** і **В. Залатарова**.

## Архітэктура і горадабудаўніцтва

У другой палове XIX ст. у архітэктуры Беларусі шырокае распаўсюджванне атрымалі грамадзянскае дойлідства, прамысловае будаўніцтва. З'явіліся новыя тыпы будынкаў – заводы, вакзалы, гасцініцы, бальніцы і інш. Узвядзенне культавых будынкаў, сядзібна-паркавых ансамбляў прыкметна скарачалася. У гэты час панавала эклектыка. Рознастылёвасць у абліччы гарадоў залежала галоўным чынам ад мастацкіх густаў заказчыкаў. Эклектыка пераважала перш за ўсё ў пабудовах масавага прызначэння – даходных дамах, навучальных установах, вакзалах, банках і інш. Большасць будынкаў, узведзеных у гэты перыяд, вызначалася лаканічнасцю дэкору, і гэтым беларуская архітэктура адрознівалася ад рускай. Элементы готыкі прымяняліся пры пабудове касцёла Св. Роха ў Мінску, Халяўшчынскага касцёла ў Раўбічах. «Рускі» стыль знайшоў увасабленне ў будаўніцтве шэрагу праваслаўных храмаў (сабор Аляксандра Неўскага ў Барысаве, Ільінская царква ў Бешанковічах і інш.), а таксама ў жыллёвым і грамадзянскім дойлідстве (будынкі Віленскага вакзала, жаночай гімназіі і рэальнага вучылішча ў Мінску, гарадскога тэатра ў Магілёве, гарадской думы ў Гомелі і інш.). Прыёмы неаготыкі былі выкарыстаны пры пабудове сядзіб у Расонах, Станькаве і інш. Рацыяналізм і прагматызм запатрабаванняў часу і жыцця перыяду разгортвання мадэрнізацыйных працэсаў, станаўлення і актыўнага развіцця буржуазных адносін выявіліся ў з'яўленні на мяжы XIX–XX стст. прынцыпова новага стылявога кірунку ў архітэктуры – мадэрну. Новы стыль стаў адыходам ад пераймальніцтва і кампілятывізму папярэдняга перыяду развіцця дойлідства, звязанага з панаваннем эклектызму і гістарызму. Сацыяльнае сталенне прадпрымальніцкіх колаў выявілася таксама ў спробах самавызначэння і ў культуры, з'яўленні ў ёй пластоў, адпаведных іх ладу жыцця. На ўсталяванне мадэрну значны ўплыў аказа-

ла фарміраванне капіталістычнага рынку, запатрабаванасць эстэтыкі, адпаведнай індывідуальным густам і звычкам заказчыка. Галоўным прынцыпам мадэрну стала адлюстраванне асаблівасцей сучаснасці ў нязвыклых стылявых формах. Яскравым прыкладам пабудовы ў стылі мадэрн быў сядзібны дом у в. Чырвоны Бераг.

## Выяўленчае мастацтва

У другой палове XIX ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі не было мастацкіх навучальных устаноў. Адпаведную адукацыю атрымлівалі ў Пецярбургу, Маскве, Варшаве і інш. Прыкметную ролю ў развіцці беларускага мастацтва адыграла Віленская рысавальная школа, заснаваная ў 1886 г. Выяўленчае мастацтва ў гэты перыяд характарызавалася нарастаннем рэалістычных тэндэнцый, якія прыйшлі на змену класіцызму і рамантызму папярэдняга часу.

У развіцці жывапісу Беларусі ў 60–90-х гг. XIX ст. адным з прыярытэтных з'яўляўся гістарычны жанр. Прызнаным майстрам гістарычных палотнаў стаў **К. Альхімовіч.** У маладыя гады ён удзельнічаў у паўстанні 1863 г. і ў сувязі з гэтым значную частку свайго жыцця правёў па-за межамі радзімы, атрымаў і ўдасканальваў мастацкую адукацыю ў Вільні, Варшаве, Мюнхене, Парыжы. У яго гістарычных кампазіцыях прысутнічаюць патрыятычныя матывы, выкліканыя асабістымі адносінамі да падзей мінулага. У сваіх работах К. Альхімовіч узнавіў многія сюжэты гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і паўстання 1863 г. Вядомасць атрымалі яго палотны «Пахаванне Гедыміна», «Пасля бітвы», «Хрысціянскія пакутнікі», «На этапе», «Смерць Глінскага ў турме» і інш. Працаваў К. Альхімовіч і ў бытавым жанры («Жніво», «Дажынкі» і інш.), і як графік (ілюстрацыі да твораў А. Міцкевіча, Ю. Славацкага). У гістарычным жанры засведчыў сябе сын вядомага кампазітара С. Манюшкі жывапісец **Я. Манюшка.** Найбольш вядомая яго карціна – «Шлюб Зігфрыда». Вялікую цікавасць да гістарычнай тэматыкі, асабліва старажытнасцей Вялікага Княства Літоўскага, праяўляў **Ф. Дмахоўскі.** Яму належаць кампазіцыйныя партрэты беларуска-літоўскіх князёў, выкананыя ў тэхніцы літаграфіі, а таксама выявы гербаў Полацка і Віцебска.

Значнае развіццё атрымаў бытавы жанр. У гэтым кірунку вылучаюцца работы **Н. Сілівановіча.** Выхаванец Пецярбургскай акадэміі

мастацтваў, ён ніколі не парываў з радзімай. Многія яго працы звязаны з роднай вёскай Цынцавічы, што на Маладзечаншчыне. У іх ліку «Партрэт бацькі», «Партрэт яўрэя» і інш. Н. Сіліванович удзельнічаў у стварэнні мазаічнай кампазіцыі «Тайная вячэра» для галоўнага іканастаса Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу. За гэту работу яму было прысвоена званне акадэміка. Мастак шмат падарожнічаў па Беларусі, адкуль прывозіў матэрыял для сваіх бытавых кампазіцый. Па матэрыялах паездак ім былі напісаны карціны «Дзеці ў двары», «У школу» і інш. У бытавым жанры працаваў **Д. Баркоўскі,** але захаваліся нешматлікія яго работы. У іх ліку акварэльны эскіз карціны «Беларуская карчма». Як партрэтыст працаваў **Б. Русецкі.** З яго творчай спадчыны найбольш вядомы «Аўтапартрэт», «Жаночы партрэт» і інш. Амаль ва ўсіх відах і жанрах выяўленчага мастацтва пакінуў след **А. Ромер.** Ён быў выдатным жывапісцам, графікам, скульптарам, мастацтвазнаўцам. Удзельнічаў у паўстанні 1863 г., за што быў зняволены, а пасля жыў за мяжой. У 1874 г. вярнуўся на радзіму. Найбольш поўна здольнасці А. Ромера праявіліся ў партрэтным мастацтве. Ён стварыў вялікую колькасць партрэтаў сучаснікаў. Сярод яго работ вылучаюцца «Аўтапартрэт», «Партрэт бацькі», «Партрэт маці», «Партрэт скульптара Яцунскага» і інш.

У развіцці жывапісу Беларусі ў другой палове XIX ст. важнае месца займаў пейзажны жанр. Выдатным яго прадстаўніком быў **А. Гараўскі.** Ужо студэнцкія яго работы ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў атрымалі прызнанне і былі адзначаны медалямі. Найбольш значныя карціны мастака прысвечаны роднай Міншчыне. Сярод іх – «Вечар у Мінскай губерні», «Бераг ракі Свіслач», «Ліпы», «На Бацькаўшчыне» і інш. Будучы патрыётам Беларусі, А. Гараўскі шанаваў культуру і мову народа.

Значны след у развіцці выяўленчага мастацтва Беларусі пакінуў выдатны графік, музыкант **Н. Орда.** У сувязі з удзелам у паўстанні 1830–1831 гг. ён вымушаны быў эмігравацъ. У Парыжы Н. Орда вучыўся кампазітарскаму майстэрству ў Ф. Шапэна, стаў аўтарам некалькіх паланэзаў. Яго музычныя здольнасці вельмі высока ацаніў Ф. Ліст. Але больш увагі Н. Орда надаваў выяўленчаму мастацтву. Пасля вяртання ў 1856 г. на радзіму з планшэтам і алоўкам абышоў амаль усю Беларусь. Пакінуў накіды і акварэльныя замалёўкі многіх гістарычных помнікаў і месцаў. Каля 40 акварэляў прысвяціў Гродну, 20 малюнкаў – Мінску, шмат работ – Магілёву і яго ваколіцам і г. д.

Адным з буйнейшых мастакоў-графікаў з'яўляўся **М. Андрыёлі.** Удзельнік паўстання 1863 г., ён быў вымушаны, пазбягаючы заключэння ў турму, эміграваць. Жывучы ў выгнанні, стварыў шмат графічных лістоў, у якіх адлюстраваў падзеі паўстання. У 1871 г. вярнуўся з эміграцыі, але мусіў доўгі час жыць і працаваць у Варшаве. М. Андрыёлі многія работы прысвяціў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Асаблівую цікавасць выклікаюць «Смерць Кейстута», «Сутычка ліцвінаў з крыжаносцамі», «Гусляр» і інш.

У 1890-я гг. адбываўся ўздым у развіцці мастацкага жыцця ў Беларусі, ствараліся прыватныя мастацкія школы ў Віцебску і Мінску. На гэты перыяд прыпадае пачатак творчай дзейнасці новага пакалення мастакоў – **Ю. Пэна, Ф. Рушчыца, Я. Кругера, В. Бялыніцкага-Бірулі**.

## Умовы ўтварэння беларускай нацыі

Еўрапейскія краіны ў XIX ст. у поўнай меры закранулі працэсы этнічнай эмансіпацыі народаў, росту нацыянальных рухаў. Іх істотнай перадумовай была сацыяльная мабілізацыя грамадства ў выніку разлажэння феадальна-саслоўнай сістэмы. Беларускі этнас прайшоў складаны шлях да станаўлення нацыі сучаснага тыпу. Супярэчлівасць гэтага шляху, ваганне працэсаў развіцця этнічнай свядомасці і нацыянальнай культуры паміж заходняй і ўсходняй цывілізацыямі абцяжарвалі вызначэнне інтэлігенцыяй свайго месца, гістарычных абрысаў нацыянальнай ідэі і ўвогуле самавызначэнне беларускай нацыі. Аб'ектыўна працэс яе фарміравання ў XIX – пачатку XX ст. быў абумоўлены асаблівасцямі і характарам сацыяльна-эканамічнай мадэрнізацыі краіны, запаволенасцю мабілізацыі сацыяльнай структуры грамадства, кірункам і вынікамі палітыкі расійскага ўрада ў Беларусі, традыцыйнымі рысамі нацыянальна-культурнага развіцця, недастатковымі тэмпамі пашырэння пісьменнасці. Этнагенез беларусаў у XIX ст., асабліва ў яго апошнія дзесяцігоддзі, прайшоў у сваёй эвалюцыі праз шэраг складаных этапаў і на пачатку XX ст. значна паскорыўся і выйшаў на стадыю станаўлення нацыі сучаснага тыпу.

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. царызм канчаткова пазбавіўся ілюзій наконт польскіх культурна-палітычных уплываў на тэрыторыі Беларусі і перайшоў на шлях інтэнсіўнай русіфікацыі. Асноўныя прынцыпы гэтай палітыкі на новым этапе былі закладзены ў 1863–1865 гг. віленскім генерал-губернатарам М. М. Мураўёвым, з якім звязана

жорсткае падаўленне паўстання 1863 г. Стваралася сацыяльная база новай палітыкі – пашыралася расійскае землеўласніцтва. Спрыяльнай глебай для русіфікацыі ў афіцыйных колах лічылася таксама шматлікае беларускае праваслаўнае сялянства. У грамадска-культурным жыцці на тэрыторыі Беларусі месца польскай мовы пастунова займала руская. Гэты працэс падмацоўваўся рэпрэсіўнымі мерапрыемствамі ўрада супраць шляхты, прадстаўнікоў польскага нацыянальнага руху, а таксама зменамі ў самім польскім грамадстве пад уплывам інтэнсіўнага росту буржуазных адносін. Школа цалкам была пераведзена на рускую мову навучання. Вышэйшыя навучальныя ўстановы і беларускамоўны друк адсутнічалі. Выкарыстанне беларускай мовы не дапускалася ні ў школе, ні ў дзяржаўных установах, ні ў друку, за выключэннем толькі этнаграфічных публікацый. Прычым і настаўнік, і праваслаўны святар, і дзяржаўны чыноўнік, і афіцыйная газета настойліва і паслядоўна даказвалі беларусам, што яны – рускія і не маюць ніякіх адрозненняў, акрамя лакальна-дыялектных. Адпаведным чынам пісалася і беларуская гісторыя.

Станаўленне буржуазнага грамадства другой паловы XIX ст. мела ў Беларусі шэраг спецыфічных рыс. Забарона яўрэям сяліцца па-за межамі гарадоў і мястэчак, эканамічная слабасць гарадоў, немагчымасць знайсці ў іх працу для вялікай колькасці беззямельных і малазямельных сялян, стрымліванне разлажэння памешчыцкага землеўладання адмоўна адбіліся на працэсах фарміравання сацыяльнай структуры буржуазнага грамадства, дэфармавалі нацыянальны склад гарадскога насельніцтва і ў канчатковым выніку стрымлівалі станаўленне беларускай нацыі. Прычым беларуская нацыянальная буржуазія знаходзілася яшчэ на стадыі станаўлення і ўяўляла сабой найбольш нязначную частку мясцовай шматнацыянальнай буржуазіі. Асноўныя капіталы края знаходзіліся ў распараджэнні польскіх і рускіх памешчыкаў, яўрэйскіх купцоў і прамыслоўцаў. Беларуская аграрная буржуазія, падзеленая па веравызнанні на праваслаўных і католікаў, да канца не ўсвядоміла свайго нацыянальнага адзінства і часта індыферэнтна ставілася да праяў беларускага нацыянальнага руху.

Слабасць эканамічнай эліты, буржуазіі і дваранства стала прычынай нешматлікасці і павольнага сталення нацыянальнай інтэлігенцыі. Эліта беларускага грамадства фактычна не дарасла да асэнсавання сваіх уласных дзяржаўна-палітычных ідэалаў. Адна з асаблівасцей працэсаў фарміравання беларускай інтэлігенцыі – гэта страта пераемнасці паміж рознымі пакаленнямі з-за прычын перш за ўсё палітычнага

характару (рэпрэсіі ў сувязі з актыўным удзелам яе прадстаўнікоў у вызваленчых паўстаннях, дзейнасці нелегальных арганізацый і г. д.). Неспрыяльныя ўмовы развіцця нацыянальнай культуры абумовілі наяўнасць яшчэ адной спецыфічнай рысы інтэлігенцыі Беларусі – яна стала донарам развіцця культур суседніх народаў, прычым гэта функцыя прывяла фактычна да страты пераважнай часткі ўласнай культурнай эліты, збяднення інтэлектуальнага жыцця. Донарская функцыя інтэлігенцыі – гэта шмат у чым нерэалізаваная магчымасць растучай сацыяльнай мабільнасці на радзіме, шанс павысіць свой сацыяльны статус на чужбіне. Беларуская інтэлігенцыя была двух-, а нярэдка і трохмоўнай. Да пачатку ХХ ст. працы беларускіх даследчыкаў і публіцыстаў выдаваліся перш за ўсё на польскай ці рускай мовах, і толькі ў «нашаніўскі» перыяд з'яўляюцца работы, напісаныя па-беларуску.

Адным з істотных фактараў станаўлення беларускай нацыі былі міграцыйныя працэсы. У канцы ХІХ – пачатку ХХ ст. яны ў значнай ступені ахапілі сялянства. Гэта і сезонныя перамяшчэнні з мэтай знайсці заробак, і больш сталая працоўная дзейнасць на прамысловых прадпрыемствах цэнтральнай часткі Расіі, шахтах і рудніках Данбаса, партах Рыгі і Адэсы і г. д. У працэсе працоўнай дзейнасці ажыццяўляўся пастаянны абмен этнакультурнай інфармацыяй. У канцы ХІХ ст. за межамі кампактнага рассялення беларусаў пражывала звыш 540 тыс. чалавек. Тут не ўлічаны тыя, хто выехаў для працы на прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Амерыкі, Заходняй Еўропы і Аўстраліі. У Пецярбургу беларусы на мяжы ХІХ–ХХ стст. і пазней складалі найбуйнейшую групу іншаэтнічнага насельніцтва. Звыш 30 тыс. рабочых (без уліку членаў іх сямей) працавалі на прадпрыемствах Масквы і Адэсы. Уплывовай была знешняя міграцыя ў Беларусь. Гэта былі чыноўнікі, ваеннаслужачыя, памешчыкі, прадстаўнікі вольных прафесій і г. д. У канцы ХІХ ст. яны складалі больш за 2 % насельніцтва і былі выхадцамі пераважна з цэнтральных губерняў Расіі, Прыбалтыкі, Украіны.

Складванню нацыі аб'ектыўна садзейнічала стварэнне адзінага эканамічнага рэгіёна ў межах этнагенетычных працэсаў. Пашырэнне гандлёва-эканамічных сувязей паміж рознымі часткамі Беларусі дазволіла прадстаўнікам карэннай нацыянальнасці лепш самаўсвядоміць сваю этнічную агульнасць. Паскарэнне тэмпаў эканамічнага развіцця, пашырэнне капіталістычнага прадпрымальніцтва ў прамысловасці, пераарыентацыя памешчыцкіх гаспадарак на рынак, развіццё гандлю і шляхоў зносін, інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва спрыялі

стварэнню на тэрыторыі Беларусі адзінага эканамічнага рэгіёна. Аднак гэты аб'ектыўны працэс стрымліваўся агульным кірункам палітыкі ўрада.

Сацыяльнай асновай станаўлення беларускай нацыі ў сучасным яе разуменні сталі тыя колы грамадства, якія ўзняліся да неабходнасці разумення сваёй саматоеснасці і ўжо разумелі і падкрэслівалі сваю адметнасць ад палякаў, насуперак часам старашляхецкай традыцыі. Гэтыя памкненні ў некаторых выпадках знаходзілі падтрымку з боку асобных расійскіх чыноўнікаў, якія бачылі неабходнасць пашырэння сярод беларусаў разумення асобнасці ад палякаў, але ў якасці сродку вырашэння гэтай задачы разглядалі невысокую эфектыўнасць гвалтоўнай русіфікацыі. На гэта паўплывала таксама і агітацыя з боку мясцовай дэмакратычнай інтэлігенцыі, сацыялістычнай моладзі, якія імкнуліся адасобіць сябе ад старашляхецкай традыцыі. Прыярытэтным шляхам станаўлення беларускай нацыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. стаў той, што быў заснаваны на этнапалітычнай эмансіпацыі беларускага сялянства, выкарыстанні традыцыйных пластоў народнай культуры.

Істотнае ўзмацненне русіфікацыі пасля падаўлення паўстання 1863 г. стала штуршком для пошукаў самаідэнтыфікацыі сярод інтэлігенцыі Беларусі. Нават мясцовыя праваслаўныя чыноўнікі, сутыкнуўшыся з калегамі, якія прыбылі з велікарускіх губерняў, усприымалі сваю этнічную адметнасць. У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. сярод беларускай інтэлігенцыі ішла работа па фарміраванні беларускай нацыянальнай ідэі як асновы развіцця нацыянальна-культурнага руху, ідэалагічнай асновы нацыятворчых працэсаў. У той жа час на мяжы XIX–XX стст. вызначэнне этнічнай прыналежнасці беларускім сялянствам ускладнялася наяўнасцю некаторых стэрэатыпаў, звязаных з неабходнасцю засваення рускай ці польскай моў, з якімі звязвалася магчымасць сацыяльнага поспеху. Для многіх сялян уяўлялася бясспрэчнай перавага рускай і польскай культур над іх вясковай культурай і простай мовай. Гэта часам выклікала насмешлівае стаўленне да ўсяго свайго вясковага, асабліва сярод тых, хто змог узняцца па сацыяльнай лесвіцы. У той жа час дзеячы беларускага нацыянальнага руху апелявалі да этнічнай культуры, мовы простага народа як важнейшых каштоўнасцей, абгрунтоўвалі неабходнасць адраджэння іх высокага статусу. Нацыянальная агітацыя ўскладнялася таксама недастатковай развітасцю сродкаў камунікацыі.

## Тэрыторыя фарміравання беларускай нацыі

Станаўленне беларускай нацыі адбывалася ў асноўным на тэрыторыі пяці губерняў: Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай. Паводле даных перапісу насельніцтва 1897 г., у беларускіх губернях 63,5 % ад агульнай колькасці насельніцтва складалі беларусы, 5,8 % – рускія, 5,0 – палякі, 14,1 – яўрэі, 11,6 % – украінцы, літоўцы, латышы і інш. Істотна адрозніваўся нацыянальны склад гарадскіх і сельскіх жыхароў. Прадстаўнікі этнічнай большасці ў гарадскіх паселішчах беларускіх губерняў складалі толькі 13,2 %, рускія – 17,8, палякі – 11,8, яўрэі – 53,2, іншыя – 4,0 %. Сярод вясковых жыхароў удзельная вага беларусаў налічвала 70,5 %, рускіх – 4,1, палякаў – 4,0, яўрэяў – 8,7, украінцаў, літоўцаў, латышоў і іншых – 12,7 %. Па кожнай з беларускіх губерняў назіралася адчувальная варыятыўнасць паказчыкаў нацыянальнага складу насельніцтва. Удзельная вага беларусаў найбольшай была ў Магілёўскай губерні (82,4 %), найменшай – у Гродзенскай (44,0 %). Прычым у гарадах Магілёўскай губерні беларусы мелі параўнальна з іншымі губернямі максімальную ўдзельную вагу – 30 %, а мінімальную – у гарадах Віленскай.

Атлас А. Ф. Рыціхіна і складзеная ім «Этнаграфічная карта Еўрапейскай Расіі» акрэслівалі тэрыторыю рассялення беларусаў: «на захадзе ад Сувалак і Беластока далей па рэках Нараў, Ясельда, Прыпяць да яе ўпадзення ў Днепр, на поўнач і ўсход паўночней Вільні, далей на Свянцяны, Люцын, Вялікія Лукі на захад ад Вязьмы і Мгліна, далей па Дняпры да вусця Прыпяці». Я. Ф. Карскі, М. В. Доўнар-Запольскі, члены Маскоўскай дыялекталагічнай камісіі на аснове этналінгвістычных прыкмет пашыралі этнічную тэрыторыю беларусаў на правабярэжжа Прыпяці, а на ўсходзе – да Ржэва і Бранска.

Галоўным арэалам кансалідацыі беларускай нацыі былі цэнтральная і паўночна-заходняя часткі Беларусі. Тут адзначаўся найвышэйшы працэнт пісьменнага насельніцтва (да 70 % у 1913 г. сярод мужчын) і пражывала каля 70 % карэспандэнтаў газеты «Наша ніва». Марудна этнакансалідацыйны працэс адбываўся ў паўночна-ўсходняй і ўсходняй частках Беларусі. Значная доля беларусаў была (паводле даных перапісу насельніцтва 1897 г. аб роднай мове) у Веліжскім (87,5 %), Невельскім (84,0 %), Себежскім (47, 1 %) паветах Віцебскай губерні, Крас-

ненскім (90,0 %) павеце Смаленскай губерні, Суражскім (каля 70 %) павеце Чарнігаўскай губерні і некаторых іншых, што знаходзяцца па-за межамі тэрыторыі сучаснай беларускай дзяржавы. На прасторы апошняй удзельная вага прадстаўнікоў карэннай нацыянальнасці перавышала 73 %.

У канцы XIX – пачатку XX ст. тэрмін «Беларусь», этнонім «беларусы» замацоўваліся за ўсёй этнічнай тэрыторыяй беларусаў і паступова выцеснілі ўсе іншыя агульныя для Беларусі назвы. Аднак гэты працэс быў супярэчлівым і незавершаным. Саманазва беларусаў не набыла ў той час выразнага агульнанацыянальнага зместу. Поруч з ёй ужываліся канфесіяналізмы «рускія» і «палякі» адпаведна падзелу на праваслаўных і католікаў, а частка насельніцтва Беларусі называла сябе тутэйшымі. Нярэдка ўжываўся тэрмін «ліцвіны», асабліва ў заходніх раёнах Беларусі. У некаторых мясцовасцях існавалі рэгіянальныя назвы, якія адносіліся да значных тэрыторый, – «палешукі» для ўсяго Палесся, «пінчукі», «брашчане» – для яго асобных частак. Тым не менш адбыліся істотныя зрухі ў этнічнай самасвядомасці беларусаў. Паводле даных перапісу 1897 г. аб роднай мове, 51,8 % агульнай колькасці прадстаўнікоў спадчыннага дваранства прызнавалі сябе беларусамі. З ліку асабістых дваран 25,9 % назвалі сваёй роднай мовай беларускую. Каля 20 % урачоў і 21 % настаўнікаў таксама лічылі роднай мовай беларускую. Сялянства, пралетарыят і паўпралетарскія слаі грамадства ў Беларусі складаліся пераважна з прадстаўнікоў карэннага этнасу. Але адной са спецыфічных рыс станаўлення беларускай нацыі з'яўлялася тое, што звыш 90 % яе прадстаўнікоў пражывала ў сельскай мясцовасці. Горад па этнічным складзе жыхароў быў пераважна небеларускім. У другой палове XIX – пачатку XX ст. формай этнічнай самасвядомасці некаторай часткі гарадскога насельніцтва, асабліва ва ўсходняй Беларусі, быў «заходнерусізм».

## Беларускі нацыянальна-культурны рух

Паводле аднаго вобразнага параўнання, нацыянальна-культурны рух Беларусі ўзрастаў паміж спрэчкамі расійскіх і польскіх шавіністаў за ідэалагічна-культурнае і эканамічнае панаванне на тэрыторыі краю. Гэтыя спрэчкі абудзілі ў пачынальнікаў беларускай нацыянальнай ідэалогіі пытанне: а хто такія беларусы?

У 1817 г. з'явілася першая навуковая публікацыя, прысвечаная беларускай народнай культуры. У 1822 г. **К. Ф. Калайдовіч** надрукаваў у «Трудах общества любителей российской словесности» артыкул «О белорусском наречии», у якім адзначаў асобнасць беларускай мовы ад рускай. Вядомы чэшскі славіст **П. Шафарык** у 1842 г. выдаў даследаванне «Славянскі народапіс», дзе ўпершыню пазначыў тэрыторыю пашырэння беларускай мовы. У сваёй кнізе «Путешествие по Полесью и Белорусскому краю» **П. Шпілеўскі** акрэсліў ідэю аб чысціні беларускай мовы, яе блізкасці да старажытнай славянскай, пазбаўленасці іншамоўных уплываў.

Па ініцыятыве кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі ў 1863 г. была выдадзена кніга «Рассказы на белорусском наречии», якая прызначалася для выкарыстання ў вучэбным працэсе ў народных вучылішчах. Яна была напісана на беларускай мове і ўяўляла сабой адзіную спробу выкарыстання ўрадавымі органамі мовы ў школе. У кнізе прысутнічала найбольш грунтоўная для XIX ст. канцэпцыя гісторыі беларусаў як асобнага народа, абгрунтаванне таго, што беларус незалежна ад канфесійнай прыналежнасці з'яўляецца беларусам, пералічаны яго адрозненні ад паляка. Напярэдадні паўстання 1863 г. урадавымі органамі распрацоўваліся праекты выкарыстання беларускай мовы ў школе ў мэтах адлучэння беларусаў ад ідэі польскасці.

Беларусаў у XIX – пачатку XX ст. можна ў пэўнай меры аднесці да ліку маладых нацый, якія мелі няпоўную сацыяльную структуру, дзе звычайна адсутнічалі ўласныя эліты, а нярэдка і сярэднія гарадскія слаі. «Маладыя» нацыі ў мінулым ці ніколі не сфарміроўвалі ўласныя палітычная структуры, ці іх традыцыі сярэдневяковай дзяржаўнасці былі разбураны на пачатку Новага часу. Акрамя беларусаў, у Расійскай імперыі да гэтай катэгорыі этнічных груп адносіліся ўкраінцы, літоўцы, эстонцы, латышы і інш. У сапраўднасці нельга вылучыць ідэальны тып «старой» ці «маладой» нацыі, ёсць мноства змешаных і пераходных форм з захаваннем рэшткаў уласных эліт і высокаразвітых культур.

Беларусы выйшлі на першую фазу сваёй нацыянальнай эмансіпацыі ў пачатку XIX ст. поруч з украінцамі і літоўцамі і апярэдзілі фінаў, эстонцаў і латышоў. У пачатку XIX ст. інтэлектуальнае жыццё Беларусі развівалася пераважна пад уплывам польскай культуры. Цэнтрам яго, як і ў Літве, выступаў Віленскі ўніверсітэт. У асяроддзі яго выкладчыкаў і студэнтаў у 1810-х – пачатку 1820-х гг. пачалі з'яўляцца

парасткі ідэй будучага беларускага нацыянальнага адраджэння. Прафесары Віленскага ўніверсітэта **М. Баброўскі**, **І. Даніловіч** паклалі пачатак збірання і вывучэння помнікаў беларускага пісьменства XVI–XVII стст. Для іх і блізкіх да іх па светапоглядзе віленскіх інтэлігентаў зразумелымі і папулярнымі былі ідэі аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага і дзяржаўнасці беларускай мовы. Яны садзейнічалі абуджэнню цікавасці да гісторыі, культуры, вуснай народнай творчасці беларусаў-студэнтаў – сяброў таварystваў філаматаў і філарэтаў, перш за ўсё **Я. Чачота**, **Т. Зана** і інш. Беларуская інтэлігенцыя таго часу фарміравалася пераважна з выхадцаў духавенства і збяднелай шляхты.

10 снежня 1831 г. у Парыжы было створана Таварыства літоўскае і рускіх зямель, у склад якога ўваходзілі **А. Міцкевіч**, **І. Дамейка**. Мэтай таварыства было вывучэнне мінуўшчыны і гаспадаркі Беларусі, Літвы і Валыні, дэманстрацыя сусветнай супольнасці таго, што насельніцтва былога Вялікага Княства Літоўскага застаецца «адным з народаў Еўропы...». У сярэдзіне XIX ст. адчувальным стаў уплыў беларускай ліберальнай думкі, прадстаўленай гурткамі **А. Кіркора** ў Вільні, **В. Дуніна-Марцінкевіча** ў Мінску, **А. Вярыгі-Дарэўскага** ў Віцебску. Асобныя творы на беларускай мове ў гэты час стварылі **Я. Чачот**, **Я. Баршчэўскі**, **А. Рыпінскі**, **У. Сыракомля**. Беларуская мова стала асноўнай для творчасці **В. Дуніна-Марцінкевіча**. Творчасць і погляды гэтага кола інтэлігенцыі не заўсёды мелі акрэслены нацыянальны змест, але аб'ектыўна садзейнічалі развіццю нацыянальнай культуры і свядомасці.

Сярод дэмакратычнай інтэлігенцыі ў 60-я гг. XIX ст. сфарміравалася адносна невялікая група, для якой абсалютна зразумелым было ўяўленне, што Беларусь мае ўсе ўмовы для самастойнага развіцця. Лідарам гэтай групы быў **К. Каліноўскі**, які ўскосна выказаў ідэю аб самастойнасці Беларуска-Літоўскай Рэспублікі. Першыя спробы нацыянальнай агітацыі былі вельмі эфемернымі і кароткачасовымі. Станаўленне беларускай інтэлігенцыі было цесна звязана з узнікненнем і развіццём нацыянальнага руху. Вялікае значэнне для абуджэння нацыянальнай самасвядомасці мела дзейнасць шматлікіх збіральнікаў і даследчыкаў фальклору, лінгвістаў, гісторыкаў, этнографаў. У другой палове XIX – пачатку XX ст. з'явіліся грунтоўныя працы **І. Насовіча**, **М. Нікіфароўскага**, **Е. Раманава**, **Я. Карскага**, **М. Доўнар-Запольскага** і інш., з выдання якіх пачалося развіццё навуковага беларусазнаўства. Стадыя нацыянальнай агітацыі, звязаная з распаўсюджаннем нацыя-

нальнай свядомасці ў шырокія слаі насельніцтва, пачалася ў 80-х гг. XIX ст., найперш з дзейнасці народніцкай сацыяльна-рэвалюцыйнай арганізацыі «Гоман» і выдання аднайменнага гектаграфічнага часопіса (1884), беларускіх студэнцкіх арганізацый у Пецярбургу, Маскве. У публікацыях на старонках «Гомана» («Лісты аб Беларусі», «Пасланне да землякоў-беларусаў») дадзена тэарэтычнае абгрунтаванне самастойнасці, асобнасці беларускага этнасу, асэнсаванне складанасці яго гістарычнага шляху і нацыянальнай кансалідацыі. Гоманаўцы сцвярджалі самастойныя задачы беларускага нацыянальнага руху і ідэю свабоднага федэратыўнага пагаднення Беларусі з іншымі народамі дэмакратызаванай Расіі, а таксама вылучылі перад інтэлігенцыяй задачы па пашырэнні нацыянальнай самасвядомасці. Дачыненне да выдання «Гомана» мелі студэнты – ураджэнцы Беларусі А. Марчанка, Х. Ратнер і інш.

Фундаментам ідэалогіі беларускага вызваленчага руху стала публіцыстыка **Ф. Багушэвіча**. У прадмове да зборніка «Дудка беларуская», іншых творах ім дадзена гісторыка-філасофскае і мастацкае асэнсаванне лёсу беларускага народа, падкрэслена пераемнасць багатых дзяржаўна-палітычных традыцый Вялікага Княства Літоўскага з тагачаснымі задачамі сацыяльнага і палітычнага вызвалення і культурнага адраджэння беларускага народа.

На пачатку 90-х гг. XIX ст. у Маскве і Пецярбургу дзейнічалі арганізацыі беларускага студэнцтва пад кіраўніцтвам А. Гурыновіча, М. Абрамовіча і інш. Вялікую ролю адыграла літаратурна-грамадская дзейнасць **К. Каганца**, **А. Абуховіча** і інш., краязнаўча-збіральніцкая праца **Б. Эпімах-Шыпілы** і г. д. Існавалі Гурток моладзі польска-літоўскай, беларускай і маларускай, Кружок беларускай народнай прасветы і культуры. Былі спробы выпуску нелегальнай газеты «Свабода», заснавання Рэвалюцыйнай партыі Белай Русі. У 1902–1903 гг. на аснове гурткоў **В. Іваноўскага**, братоў **А. і І. Луцкевічаў** адбылася палітычная самаарганізацыя беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Была створана Беларуская рэвалюцыйная грамада, якая некалькі пазней стала называцца Беларускай сацыялістычнай грамадой.

Глыбокія якасныя змены адбыліся ў нацыянальным руху ў час рэвалюцыі 1905–1907 гг. Са з'яўленнем беларускамоўнага легальнага друку («Наша доля», «Наша ніва», пазней «Беларус», «Лучынка» і інш.), пашырэннем прафесійных, грамадска-культурных аб'яднанняў і гурткоў (Беларускі настаўніцкі саюз, Гродзенскі гурток беларускай

моладзі, Беларускі музычна-драматычны гурток і г. д.), заснаваннем выдавецкіх суполак, нацыянальных тэатральных калектываў узраслі новыя формы і кірункі нацыянальна-культурнага руху. Пад уплывам «Нашай нівы», рэдакцыя якой пасля паражэння рэвалюцыі 1905–1907 гг. стала арганізацыйным цэнтрам нацыянальнага руху, зарадзіўся беларускі нацыянальна-рэлігійны рух.

У 1913 г. у Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута **А. Сапуноў** пачаў чытаць курс лекцый па гісторыі Беларусі. **В. Ластоўскі** ў 1910 г. выдаў першы абагульняючы нарыс «Кароткая гісторыя Беларусі», дзе даў канцэптуальнае выяўленне нацыянальнай гісторыі. У пачатку XX ст. этнічная свядомасць знайшла навуковае абгрунтаванне ў фундаментальнай працы **Я. Карскага** «Беларусы» (Т. 1–3. 1903–1922), даследаваннях М. Доўнар-Запольскага і інш.

Асэнсаванне агульнага гістарычнага мінулага, звязанага з Вялікім Княствам Літоўскім, спрыяла пашырэнню сярод часткі беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, асабліва ў час Першай сусветнай вайны, ідэі стварэння беларуска-літоўскай дзяржаўнасці. Акрамя таго, беларускі нацыянальны рух, таксама як і ўкраінскі, літоўскі, пад уплывам польскага, яўрэйскага, расійскага сацыялістычных рухаў спрабаваў у мэтах перацягнення на свой бок сялянства аб'яднаць нацыянальныя і аграрна-рэвалюцыйныя задачы. Агульнарасійскія рэвалюцыйныя партыі нярэдка выступалі ў якасці паспяховых канкурэнтаў нацыянальных арганізацый, схіляючы да сябе многіх маладых прадстаўнікоў інтэлектуальных асяродкаў.

Беларускі нацыянальны рух набыў больш масавы характар у час Першай сусветнай вайны. Сацыяльныя ўзрушэнні аказалі значны ўплыў на працэсы этнічнай кансалідацыі. Шматлікія арганізацыі бежанцаў адыгралі вялікую ролю ў абуджэнні нацыянальнай свядомасці. Цікавасць да беларускага руху актывізавалася сярод землеўласнікаў, вышэйшых чыноўнікаў, афіцэраў, кіраўніцтва праваслаўнай і каталіцкай цэркваў у Беларусі. Узрос нацыянальны рух і на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. У Вільні быў створаны Беларускі народны камітэт, адкрыты беларускія школы, настаўніцкая семінарыя ў Свіслачы і г. д.

Пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. паўстала надзённае пытанне аб утварэнні беларускай дзяржаўнасці. Яно знайшло і падтрымку значнай часткі беларускага насельніцтва, і шляхі рэалізацыі спачатку ў абвяшчэнні Беларускай Народнай Рэспублікі, а затым у больш

пэўным утварэнні БССР. Палітыка «беларусізацыі» 20-х гг. XX ст., якая рэалізоўвалася кіраўніцтвам савецкай Беларусі, непараўнальна паскорыла этнакультурныя працэсы і сцвердзіла пытанне аб існаванні беларускай нацыі як бясспрэчнае і незваротнае.

## Станаўленне новай беларускай літаратурнай мовы

Асаблівасцю гэтага працэсу, які адбываўся з пачатку XIX ст., была адсутнасць пераемнасці новай беларускай літаратурнай мовы з пісьмовай старабеларускай мовай і яе складванне на народна-гутарковай аснове. Фарміраванне літаратурнай мовы ў гэты час адбывалася пераважна ў жанрах мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. Пісьменнікі арыентаваліся на свае родныя гаворкі. Гэта не дазваляла развіваць усебакова слоўнік літаратурнай мовы, у якім, акрамя слоў, звязаных з паняццямі штодзённага побыту, іншыя пласты лексікі былі развіты слаба. Не далі жаданых вынікаў і спробы скласці граматыку і правапіс беларускай мовы, якія пачалі рабіцца з сярэдзіны XIX ст. Граматыкі П. Шпілеўскага 1846 г. і К. Нядзвецкага 1854 г. засталіся ў рукапісах. У 1862 г. у Варшаве мінскі маршалак А. Аскерка выдаў беларускі лемантар (буквар). Першай друкаванай кнігай на новай беларускай мове было выданне рэлігійнага зместу «Кароткі збор хрысціянскай навукі» (Вільня, 1835). Пры друкаванні беларускіх кніг выкарыстоўвалася пераважна лацінка. Гэтым алфавітам былі надрукаваны творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, газета «Мужыцкая праўда», гутарка «Дзядзька Антон...» і інш. У канцы XIX ст. лацінку паступова пачала выцясняць кірыліца. Пасля ўвядзення Закона аб свабодзе друку ў 1905 г. і з'яўлення беларускіх легальных выданняў, асабліва «Нашай нівы», фарміраванне літаратурнай мовы, выпрацоўка яе навуковай тэрміналогіі пайшлі хутчэй.

З працэсам фарміравання беларускай нацыі звязана развіццё культуры Беларусі. Беларуская плынь у прафесійнай культуры Беларусі ўзрасла ад эпізадычных з'яў у першай палове XIX ст. да прыкметнага, шматграннага кірунку на пачатку XX ст.

Беларускія гісторыкі, этнографы на мяжы XX–XXI стст. нярэдка яшчэ спрачаліся аб характары, ступені завершанасці працэсу станаўлення беларускай нацыі, выказваючы часам сумненні, але не робячы

дэталёвага аналізу адзначанага працэсу. Тым не менш у пачатку XX ст. ступень этнічнай кансалідацыі, развіцця самасвядомасці, нацыянальна-культурнага руху беларусаў, фарміраванне адзінага эканамічнага рэгіёна ў Беларусі са сваімі адметнымі рысамі выйшлі на якасна новы ўзровень, які прынцыпова адрозніваўся ад папярэдніх этапаў станаўлення беларускай этнічнай супольнасці. Усё гэта дае падставы сцвярджаць, што ў пачатку XX ст. беларусы сталі маладой нацыяй сучаснага тыпу нараўне з літоўцамі, украінцамі, латышамі і інш.

Тэма 9

# БЕЛАРУСЬ НА МЯЖЫ XIX–XX стст.

**Эканамічная і нацыянальная палітыка ўрада ў Беларусі. Аграрная перанаселенасць, міграцыя вясковага насельніцтва. Прамысловы крызіс у Беларусі 1900–1903 гг. Рост гарадоў. Рост акцыянернага капіталу. Банкі Беларусі. Транспарт і гандаль. Павелічэнне колькасці рабочага класа, яго нацыянальны і сацыяльны склад. Станаўленне буржуазіі. Рабочы рух, з'яўленне палітычных партый і арганізацый. Польскі і яўрэйскі нацыянальныя рухі. Утварэнне і дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады.**

## Эканамічная і нацыянальная палітыка ўрада ў Беларусі

У пачатку XX ст. былі зроблены асобныя паслабленні ў функцыянаванні рэжыму абмежавальных законаў у дачыненні да яўрэяў і католікаў, але ён не быў скасаваны, нягледзячы на шматлікія крытычныя ацэнкі яго эфектыўнасці нават ва ўрадавых колах. Па прапанове Камітэта міністраў 27 студзеня 1901 г. была ўведзена максімальная норма зямельных уладанняў сялян-католікаў на тэрыторыі заходніх губерняў. Пры атрыманні дазволу на набыццё зямлі з улікам надзельнай і раней купленай нерухомай

маёмасці сумарна не павінна было быць больш за 60 дзесяцін зямлі на адну гаспадарку. У той жа час ва ўрадавых колах і сярод мясцовай адміністрацыі ў беларускіх губернях была пашырана думка аб агульным падыходзе да асоб каталіцкага веравызнання пры вырашэнні пытанняў уласнасці на нерухомую маёмасць, незалежна ад саслоўнай прыналежнасці.

Указам імператара ад 12 снежня 1904 г. дэкларававаліся ўніфікацыя заканадаўства аб сялянах, перагляд сферы дзейнасці абмежавальнага заканадаўства, захаванне толькі тых абмежаванняў праў іншародцаў і «ўраджэнцаў асобных мясцовасцей імперыі», дзейнасць якіх была абумоўлена «надзённымі патрэбамі дзяржавы». 11 жніўня 1904 г. указам Мікалая II былі адменены «Часовыя правілы» 1882 г. аб яўрэях. Апошнім было дазволена сяліцца ў сельскай мясцовасці па-за межамі рысы аседласці, а таксама набываць там нерухомую маёмасць. Аднак гэта не перашкаджала расійскаму ўраду захаваць за сабой і мясцовай адміністрацыяй функцыі рэгулявання пазямельных адносін у заходніх губернях. У прыватнасці, дырэктар Дэпартамента паліцыі МУС у канфідэнцыяльным паведамленні віцебскаму губернатару Б. Гершаву-Флотаву ад 27 жніўня 1911 г. папярэджваў аб актывізацыі ў беларускіх і літоўскіх губернях незаконнай дзейнасці яўрэйскіх прадпрымальнікаў, якія «ў абход абмежавальных законаў скупляюць на чужое імя вялікую колькасць зямлі... бязлітасна знішчаюць лясы, усяляк спекулірУюць зямельнымі ўгоддзямі...».

Указам імператара ад 1 мая 1905 г. асобам польскага паходжання дазвалялася ў межах дзевяці заходніх губерняў арандаваць, набываць, прымаць у заклад зямельныя ўладанні ад асоб польскага паходжання. Акрамя таго, з адабрэння губернатара яны маглі па-за межамі гарадоў і мястэчак набываць нерухомую маёмасць у мэтах ліквідацыі цераспалосіцы і «гаспадарчага акруглення меж», а таксама купляць зямельныя ўчасткі памерам не больш як 60 дзесяцін пад прамысловыя прадпрыемствы. 21 чэрвеня 1910 г. урадам было выдадзена дадатковае тлумачэнне да Закона ад 1 мая 1905 г., у сувязі з якім толькі генерал-губернатар і губернатар маглі вырашаць спрэчныя зямельныя справы. Цыркулярны дакумент нацэльваў, што выраз «асоба польскага паходжання» трэба разумець не ў этнаграфічным, а ў культурна-палітычным сэнсе. У дакуменце давалася спасылка на вызначэнне, зацверджанае 10 лістапада 1865 г. імператарам: «пад выразам "асоба польскага паходжання" трэба разумець не наогул католікаў, а толькі

палякаў і тых заходніх ураджэнцаў, якія засвоілі польскую нацыянальнасць». У сувязі з гэтым канстатавалася, што «мясцовыя ўраджэнцы літоўцы, жмудзіны, беларусы і г. д. могуць быць прызнаны асобамі польскага паходжання, раз яны засвоілі польскую нацыянальнасць». І далей адзначалася, што «ўжыванне ў хатнім побыце польскай мовы давала дастаткова падстаў аднесці да ліку асоб польскага паходжання». У адпаведнасці з указам імператара Сенат 8 сакавіка 1910 г. пастанавіў, што асобы праваслаўнага веравызнання, лютэране, татары маглі набываць зямлю без прадстаўлення пасведчання ад генерал-губернатара ці губернатара.

Адзін з найбольш кансерватыўных расійскіх чыноўнікаў мінскі губернатар (1905–1907) П. Курлаў падкрэсліваў неадпаведнасць і неэфектыўнасць абмежавальных мерапрыемстваў у дачыненні да яўрэяў і католікаў: «Акрамя незадаволенасці, якая выклікана сярод яўрэяў, мерапрыемствы ўрада мелі і іншы кепскі бок, разбэшчваючы адміністрацыю, у руках якой былі сканцэнтраваны яўрэйскія справы, і падтрымліваючы сярод мясцовага насельніцтва варожасць да яўрэяў». У сваіх успамінах П. Курлаў адзначаў: «Азнаёміўшыся на практыцы са становішчам яўрэйскага пытання, я прыйшоў да пераканання, што палітыка ўрада ў гэтым пытанні немэтазгодная і цягне за сабой толькі адмоўныя вынікі... Роўным чынам выклікалі маё здзіўленне, пры азнаямленні на практыцы, адносіны ўрада да польскага і, адпаведна, каталіцкага пытанняў».

Пазітыўным крокам ва ўрадавай сацыяльнай палітыцы стала паступовае прымяненне страхавання для наёмных работнікаў. У 1903 г. была ўведзена рэгламентацыя адказнасці прадпрымальнікаў за няшчасныя выпадкі з рабочымі падчас працы. Пацярпелым ці членам іх сямей павінна была выплачвацца грашовая дапамога ў залежнасці ад ступені страты працаздольнасці. Наступным крокам у сферы страхавання рабочых стала прыняцце 23 чэрвеня 1912 г. пакета законаў аб забеспячэнні рабочых у сувязі з няшчаснымі выпадкамі і па хваробе. Грашовыя дапамогі і пенсіі па прычыне няшчасных выпадкаў выплачваліся па новым законе страхавымі таварыствамі, у склад якіх абавязкова ўваходзілі ўладальнікі прадпрыемстваў. Выплаты па хваробе здзяйсняліся бальнічнымі касамі, членамі якіх былі рабочыя і служачыя. Прадпрымальнікі павінны былі забяспечыць першую ўрачэбную дапамогу, аплаціць лячэнне. Уздым рабочага руху ў перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. прымусіў урадавыя органы больш

дзейсна клапаціцца і аб бытавых умовах працы і жыцця наёмных работнікаў. У прыватнасці, у цыркуляры Міністэрства фінансаў ад 22 лютага 1905 г. прапаноўвалася «вызначыць тыя мясцовыя меры, якія прамыслоўцы маглі б і згодны былі б прыняць супольна, тэрмінова для заспакаення разважлівай часткі рабочых у сэнсе магчымага паляпшэння іх быту».

У пачатку XX ст. ва ўрадавай палітыцы акрэслілася новая тэндэнцыя надання сялянству палітычных і грамадзянскіх праў. Указам імператара ад 5 кастрычніка 1906 г. асобы былых падатковых саслоўяў атрымалі права свабоды перамяшчэння па тэрыторыі дзяржавы, магчымасць атрымліваць бестэрміновыя пашпарты. Акрамя таго, указам для ўсіх расійскіх падданых, незалежна ад паходжання, але акрамя іншародцаў, дэкларааваліся аднолькавыя ў дачыненні да дзяржаўнай службы правы, скасоўваліся ўсе асаблівыя саслоўныя перавагі па заняцці пасад. Сельскія абывацелі і прадстаўнікі іншых падатковых саслоўяў вызваляліся ад неабходнасці пры паступленні на дзяржаўную службу і ў навучальныя ўстановы прадстаўляць звальніцельныя пасведчанні, а таксама выконваць асабістыя натуральныя павіннасці, несці грамадскую службу на час вучобы і знаходжання на дзяржаўнай пасадзе. Адмянялася абавязковае выключэнне іх з адпаведных саслоўных таварыстваў пры паступленні на грамадзянскую службу, атрыманні чыну ці ордэна, па заканчэнні навучальнай установы, атрыманні вучоных ступеней і званняў, вышэйшых праў саслоўя. Яны атрымлівалі магчымасць добраахвотна вырашаць пытанне аб выхадзе з падатковага саслоўя і прылічацца да іншага саслоўнага таварыства адпаведна набытым правам. Сельскім абывацелям было дазволена захоўваць прыналежнасць да сельскай грамады нават пры ўмове прылічэння да іншага сельскага таварыства. Адначасова яны атрымлівалі магчымасць бесперашкодна адлічацца з сельскай грамады ў выпадку адмаўлення ад карыстання ці валодання зямельнай уласнасцю.

На тэрыторыі беларускіх губерняў працэс надання сялянству палітычных і грамадзянскіх праў набыў спецыфічную афарбоўку ў адпаведнасці з мясцовай этнаканфесійнай сітуацыяй і неабходнасцю ўлічваць традыцыйныя ўстоі беларускай вёскі. Сялянства захоўвала свае адметныя саслоўныя рысы, нягледзячы на нівеліроўку ў заканадаўстве ўнутры- і міжсаслоўных меж. Больш таго, у паслярэформенныя дзесяцігоддзі адбылася кансалідацыя розных груп сялянства ў межах аднаго саслоўя. З другога боку, паглыбленне ў канцы XIX – па-

чатку XX ст. сацыяльна-маёмаснага размежавання сялянства Беларусі, пашырэнне яго міграцыйнай і сацыяльнай актыўнасці аб'ектыўна садзейнічалі разлажэнню яго як саслоўя і пераўтварэнню ў сацыяльна-прафесійную групу, звязаную з сельскагаспадарчай вытворчасцю, выхадцы з якой папаўнялі шэрагі класаў буржуазнага грамадства.

## Аграрная перанаселенасць, міграцыя вясковага насельніцтва

У канцы XIX ст. беларускія губерні па глыбіні аграрнай перанаселенасці пераўзыходзілі ўзровень еўрапейскай часткі Расійскай імперыі ў 1,6 раза. Адносная аграрная перанаселенасць была выклікана вычарпанасцю магчымасцей панаваўшай у той час экстэнсіўнай сістэмы арганізацыі сельскай гаспадаркі і характарызавалася недахопам зямлі, выйсце з якога было магчымым шляхам пераходу да інтэнсіўнага вядзення гаспадаркі ці перасяленняў у раёны з наяўнасцю вялікіх абшараў вольных зямель.

На мяжы XIX–XX стст. у міграцыйныя працэсы было ўключана 1455,4 тыс. жыхароў і ўраджэнцаў беларускіх губерняў (каля 17,0 % іх насельніцтва). Тут не ўлічаны тыя, хто накіроўваўся на сезонныя адыходныя промыслы. Паводле даных перапісу насельніцтва 1897 г., 685,7 тыс. ураджэнцаў беларускіх губерняў пражывалі ў Расійскай імперыі па-за межамі сваёй роднай губерні. Асноўная іх маса (82,9 %, 568,2 тыс. чалавек) пасялілася ў еўрапейскай частцы дзяржавы, 9,4 % (64,5 тыс. чалавек) – у прывісленскіх губернях, 4,9 % (33,9 тыс. чалавек) – у Сібіры і на Далёкім Усходзе, 2,1 % (14,4 тыс. чалавек) – на Каўказе, 0,7 % (4,7 тыс. чалавек) – у Сярэдняй Азіі.

На мяжы XIX–XX стст. напрамак і памеры міграцыйных рухаў насельніцтва Беларусі змяніліся. Гэта было абумоўлена перш за ўсё структурнымі зменамі ў фарміраванні рынку працоўнай сілы ў Расійскай імперыі і ў падыходах да вызначэння прыярытэтаў па міграцыйным пытанні ва ўрадавай палітыцы. Міграцыі працоўных былі выкліканы найбольш эканамічнымі прычынамі. Бурны рост насельніцтва ва ўмовах экстэнсіўнага развіцця эканомікі, асабліва сельскай гаспадаркі, прывёў да ўзмацнення міграцыйных працэсаў.

Разам з перасяленнем на пастаяннае месца жыхарства адзіны ў сваёй аснове працэс пашырэння тэрытарыяльнай мабільнасці насельніцтва адлюстроўвалі адыходныя промыслы, якія ўяўлялі сабой часовую за-

нятасць сельскіх жыхароў за межамі ўласнай гаспадаркі, у тым ліку наёмную працу ў гарадах, работу на прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемствах свайго ці іншых рэгіёнаў краіны, часовы адыход на працу за мяжу. Па сваім характары яны падзяляліся на земляробчыя і неземляробчыя. Да ліку першых адносіліся сезонныя сельскагаспадарчыя работы, да другіх – праца ў сферах прамысловасці, будаўніцтва, гандлю, абслугоўвання. Беларускія губерні па памерах пашырэння адыходных промыслаў адставалі ад многіх іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі. Невялікія аб'ёмы пашырэння адыходніцтва ў Беларусі тлумачыліся нязначным попытам на рабочую сілу ў мясцовых гарадах і мястэчках, аддаленасцю беларускіх губерняў ад важнейшых рынкаў найму, невысокім узроўнем кваліфікацыі адыходнікаў і слабымі традыцыямі адыходу. У канцы XIX ст. па ўсіх беларускіх губернях скарацілася ўдзельная вага сельскагаспадарчых работ у агульнай структуры промыслаў. Такая тэндэнцыя знайшла працяг у пачатку XX ст., калі адыходнымі промысламі было занята 6,5 % сельскага насельніцтва Беларусі, а з улікам толькі працаздольнай яго часткі – каля 13 %. Адыходныя промыслы не толькі прыносілі пэўны грашовы прыбытак, але суправаджаліся пазнаннем сялянамі іншых традыцый, ладу жыцця, пашыралі іх светапогляд.

Сельскія жыхары перасяляліся ў Сібір і на Далёкі Усход, як правіла, на пастаяннае жыхарства, што адрознівала гэты кірунак міграцыі ад руху насельніцтва ў межах еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, які насіў пераважна характар часовага адыходу на заробкі. Разгортванне міграцый беларускага сялянства за Урал прыпадае на час, калі расійскі ўрад перайшоў да заахвочвальных мерапрыемстваў у перасяленчай палітыцы. Да гэтага этапу міграцыі на ўсход краіны з тэрыторыі Беларусі не мелі масавага характару, разгортваліся час ад часу, як правіла пашыраючыся на некалькі суседніх паветаў, прычым нярэдка пад уздзеяннем чутак і агітацыі. Аграрныя міграцыі ў Сібір ахоплівалі пераважна рускае, беларускае і ўкраінскае сялянства, і гэта адпавядала стратэгічным мэтам расійскага ўрада ў азіяцкай частцы краіны. У апошнія гады XIX ст. істотна павялічылася колькасць перасяленцаў з беларускіх губерняў у Сібір. Удзельная вага іх з Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Ковенскай губерняў, якая да 1895 г. складала менш за 1 % ад агульнай колькасці сібірскіх перасяленцаў, у 1898 г. павялічылася да 14,7 %, што складала большую частку выхадцаў з нечарназёмнай паласы еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. Перасяленні ў Сібір былі больш пашыраны ва ўсходніх ра-

ёнах Беларусі. З Гродзенскай губерні за 1885–1904 гг. выехалі за Урал 13 672 чалавекі, з Віленскай – 21 643, Мінскай – 24 838, Віцебскай – 56 361, Магілёўскай – 58 223 чалавекі. Рэгіянальнае адрозненне ў разгортванні міграцыйных працэсаў стала яшчэ больш выразным у наступнае дзесяцігоддзе. З Гродзенскай губерні ў 1905–1914 гг. на ўсход Расійскай імперыі выехалі 14 434 чалавекі, з Віленскай – 17 817 чалавек, Мінскай – 66 652, Віцебскай – 89 647, Магілёўскай – 166 246 чалавек.

На мяжы XIX–XX стст. масавай стала міграцыя беларускага сялянства за мяжу, якая ахапіла спачатку Віленскую і Гродзенскую губерні і атрымала характар часовага адыходу. Законы Расійскай імперыі не прызнавалі магчымасці эміграцыі, было забаронена адмаўленне ад расійскага грамадзянства, караліся тыя, хто не вяртаўся на радзіму паводле распараджэнняў урадавых органаў. Расійскім заканадаўствам прызнавалася законным толькі часовае знаходжанне падданага краіны за мяжой. Большасць эмігрантаў пакідалі краіну нелегальна. Гэта было абумоўлена адсутнасцю афіцыйных звестак аб маршрутах выезду, страхам застацца адзінокім на шляху ў Амерыку і трапіць пад урадавыя рэпрэсіі, наяўнасцю вопытных нелегальных агентаў і адсутнасцю адказных урадавых органаў. Аднак ад легальных шляхоў эміграцыі ў першую чаргу адштурхоўвала складаная, забюракратызаваная і дарагая па кошце працэдура атрымання замежнага пашпарта.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у шэрагу населеных пунктаў Беларусі дзейнічалі тайныя агенты, якія актыўна агітавалі сялян на працу за мяжу, найперш у Амерыку, якая вабіла працоўных эмігрантаў магчымасцю атрымання больш высокай аплаты працы, шансам зарабіць сродкі для паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту і ўмацавання гаспадаркі на радзіме. Эміграцыя з Усходняй Еўропы, у тым ліку і з Беларусі, адбывалася пераважна праз парты Германіі. Для гэтага былі добра распрацаваны маршруты руху эмігрантаў. Для кожнай губерні, павета існавалі асобныя месцы збору. У наладжванні перапраўкі эмігрантаў былі задзейнічаны мясцовыя жыхары. Ніхто з іх не адважваўся дапамагаць паліцыі змагацца супраць нелегальнай эміграцыі, паколькі баяліся помсты з боку агентаў і суседзяў, занятых у прыбыльным промысле. Да пачатку Першай сусветнай вайны расійскім уладам не ўдалося не толькі спыніць тайную эміграцыю, але нават і скараціць яе памеры.

Суседняя Германія фактычна была зацікаўлена ў эмігрантах з Расійскай імперыі. Германскія параходныя таварыствы атрымлівалі значныя прыбыткі ад пасажырскага транзіту. Беларусы-эмігранты

па паходжанні з'яўляліся пераважна сялянамі, якія не мелі ўласнай гаспадаркі, былі малазямельнымі, ці беззямельнымі, ці членамі шматдзетных заможных сямей. На заробкі ў Амерыку накіроўваліся пераважна мужчыны ва ўзросце 18–40 гадоў, звычайна на 3–4 гады. Працавалі яны ў ЗША на прамысловых прадпрыемствах ці рудніках. Большасць эмігрантаў пражывалі ў антысанітарных умовах, у трушчобах, на гарадскіх ускраінах. Усё гэта нярэдка побач з адсутнасцю належнай аховы працы адмоўна сказвалася на фізічным стане эмігрантаў. Выхадцы з Беларусі фактычна займалі адну з ніжэйшых прыступак сярод рабочых, занятых у амерыканскай прамысловасці. Эмігранты часта атрымлівалі на працы траўмы, часам гінулі. Умовы працы былі вельмі цяжкія. Толькі прыбыўшых эмігрантаў агенты і наймальнікі называлі ў той час «грынеры» (зялёныя). Эксплуатацыя іх праводзілася самым жорсткім чынам.

З сярэдзіны першага дзесяцігоддзя XX ст. працоўная эміграцыя ў Амерыку набыла ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях масавы характар. Толькі з Віленскай губерні за 1908–1910 гг. выехалі за мяжу 17,7 тыс. чалавек. Зробленыя сродкі эмігрантамі, якія вярталіся дамоў, укладаліся ў паляпшэнне ці пашырэнне гаспадаркі. Акрамя таго, рээмігранты атрымлівалі карысны працоўны вопыт, іншае грамадзянскае ўсведамленне і павагу да чужой уласнасці, закона. Рэдка эмігранты пакідалі сельскую гаспадарку і пачыналі займацца гандлем, промысламі. Перасяленні на хутары ў час правядзення Сталыпінскай рэформы сталі магчымымі ў значнай ступені праз прыцягненне грашовых сродкаў «амерыканцаў». Працоўная эміграцыя ў краіны Захаду ахапіла каля 600–800 тыс. сельскіх жыхароў Беларусі.

## Прамысловы крызіс у Беларусі 1900–1903 гг. Рост гарадоў

Першыя гады XX ст. вызначыліся прамысловым крызісам. Папярэднікам эканамічнага стаў грашовы крызіс, які пачаўся ў сярэдзіне 1899 г. У 1900 г. эканамічная кан'юнктура ў Расіі значна пагоршылася. Падзенне цэн доўжылася да 1902 г., калі эканамічны крызіс дасягнуў найбольшай глыбіні. У Беларусі крызіс праявіў сябе перш за ўсё ў грашова-крэдытнай сферы, захапіў гандаль лесам, які быў цесна звязаны з агульнарасійскім і замежным рынкам. Прамысловасць ён закрануў пазней і ў меншай ступені. Некаторае ажыўленне ў прамысловасці

Беларусі назіралася ўжо з другой паловы 1902 г. Пасля прамысловага крызісу пачатку ХХ ст. выразна прасочвалася тэндэнцыя пашырэння перапрацоўкі сыравіны, якая раней пастаўлялася на продаж у неапрацаваным выглядзе, актывізавалася развіццё дрэваапрацоўкі.

У апошнія дзесяцігоддзі ХІХ ст. узровень развіцця прамысловасці ў заходніх раёнах Беларусі быў вышэйшым, чым ва ўсходніх. Аб'ём выpабленай прадукцыі на душу насельніцтва ва ўсходняй частцы Беларусі на 34,6 % быў ніжэйшым, чым у заходняй. У пачатку ХХ ст. тэмпы развіцця прамысловасці ва ўсходняй частцы Беларусі былі значна большымі, і перад пачаткам Першай сусветнай вайны ўзровень развіцця ў абедзвюх частках Беларусі прыкладна зраўняўся. Паказальна, што ў прамысловым сектары эканомікі Беларусі былі сканцэнтраваны значна меншыя капіталы, чым у гандлі.

Сярод 44 беларускіх гарадоў на мяжы ХІХ–ХХ стст. налічваліся 4 губернскія цэнтры, 31 павятовы і толькі 9 пазаштатных, ці беспавятовых, гарадоў. Указам імператара ад 6 чэрвеня 1904 г. да ліку беспавятовых гарадоў было аднесена мястэчка Смаргонь. У 1914 г. удзельная вага гарадскога насельніцтва ў беларускіх губернях склала 13,4 %, у межах 35 паветаў – 10,9 %. Гэты паказчык ужо быў некалькі ніжэй за сярэдні па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі – 14,4 %. Больш высокая ўдзельная вага гарадскога насельніцтва была характэрнай для Гродзенскай (18,1 %) і Віцебскай (16,7 %) губерняў. Найменшая ступень урбанізаванасці назіралася ў Мінскай губерні (9,8 %). Колькасць гараджан Беларусі ў 1863 г. склала 335,6 тыс. чалавек, а ў 1914 г. – 974,6 тыс. чалавек. У 1913 г. тры беларускія гарады – Мінск, Віцебск і Гомель – мелі колькасць насельніцтва звыш 100 тыс. чалавек. Некаторыя мястэчкі і чыгуначныя станцыі па ўзроўні развіцця набліжаліся да гарадоў.

Развіццю гарадоў садзейнічала актывізацыя сацыяльна-эканамічнага жыцця ў Беларусі. У пачатку ХХ ст. значнымі прамысловымі цэнтрамі сталі Мінск, Віцебск, Гродна, Пінск, Гомель, Бабруйск, Барысаў і інш. Аднак у большай ступені гарады Беларусі заставаліся адміністрацыйна-гандлёвымі цэнтрамі. Па стане на 1900 г. у беларускіх гарадах выpабляўся толькі 31 % прамысловай прадукцыі. Фабрычна-заводская прамысловасць па-ранейшаму размяшчалася пераважна ў сельскай мясцовасці – бліжэй да сыравіны і таннай сялянскай рабочай сілы. Акрамя таго, сказвалася традыцыя, калі першыя мануфактуры і фабрыкі ў Беларусі ўзнікалі ў сельскай мясцовасці, у памешчыцкіх маёнтках, далей ад канкурэнцыі з боку рамесніцкіх арганізацый.

Да 80 % гарадскіх будынкаў складалі аднапавярховыя жылыя дамы. Паводле даных на 1910 г., вадаправод дзейнічаў у сямі гарадах Беларусі – Мінску, Віцебску, Магілёве, Гродне, Гомелі, Мазыры, Слоніме.

## Рост акцыянернага капіталу. Банкі Беларусі. Транспарт і гандаль

У канцы XIX – пачатку XX ст. актывізацыя прамысловага развіцця Беларусі забяспечвалася ў вялікай ступені за кошт прыцягнення крэдытных рэсурсаў з-за меж рэгіёна. Беларускія аддзяленні Дзяржаўнага банка ўклалі ў фінансавыя аперацыі ў восем разоў больш сродкаў, чым збіралі на месцы на бягучых рахунках і ўкладах. Філіялы маскоўскіх і пецярбургскіх банкаў у Беларусі толькі 58 % аперацый праводзілі за кошт мясцовых фінансавых рэсурсаў. Акрамя таго, прамысловы ўздым 80–90-х гг. XIX ст. у значнай ступені быў абумоўлены прытокам замежнага капіталу, што тлумачыць з'яўленне сучасных вытворчасцей пры дастаткова адсталай сельскай гаспадарцы і нізкай пакупальніцкай здольнасці селяніна.

Да пачатку XX ст. у Беларусі склалася сістэма банкаўска-крэдытных устаноў. Яна дастаткова эфектыўна абслугоўвала патрэбы дзяржаўных арганізацый і эканомікі. У губернях дзейнічалі аддзяленні Дзяржаўнага банка, якія таксама ажыццяўлялі крэдытаванне на камерцыйнай аснове для прадпрымальнікаў. Аднак яны ў адпаведнасці з урадавай палітыкай устрымліваліся ад крэдытавання землеўласнікаў каталіцкага веравызнання, а таксама яўрэйскіх прадпрымальнікаў. Прыватны банкаўскі капітал у Беларусі быў прадстаўлены Мінскім камерцыйным банкам і філіяламі расійскіх акцыянерных банкаў, перш за ўсё пецярбургскіх і маскоўскіх: Руска-Азіяцкага, Азоўска-Данскога, Злучанага і інш. У 1912 г. Мінскі камерцыйны банк пасля няўдалых спроб вывесці яго з крызісу быў ліквідаваны, а актывы ўстановы перайшлі да Азоўска-Данскога банка. Беларускія губерні займалі першае месца ў Расійскай імперыі па колькасці банкірскіх кантор, якія з'яўляліся пасрэднікамі паміж буйным банкаўскім і прамысловым капіталам. Некаторыя банкірскія канторы канцэнтравалі значныя грашовыя сродкі. У прыватнасці, кантора Поляка і Вейсбрэма акумулявала ў 1913 г. 39,5 % улічаных грашовых абаротаў Мінска. У пачатку XX ст. у Магілёве было зарэгістравана таварыства «Банкірскі дом Ф. Ратнер і Ко», якое мела капітал у памеры 250 тыс. руб. Уладальнікаў дробных прадпрыемстваў, майстэрань, дробных гандляроў, землеўласнікаў аб'яд-

ноўвалі таварыствы ўзаемнага крэдыту. У 1914 г. іх колькасць у Беларусі дасягала 74. Дзейнічала мноства дысканцёраў, якія выступалі ў ролі пасрэднікаў для банкаў і карысталіся іх крэдытам. Аднак у сувязі з імклівым эканамічным уздымам напярэдадні Першай сусветнай вайны ўсе вольныя грашовыя сродкі на мясцовым рынку паглыналіся прамысловасцю ці рэалізацыяй прадуктаў вытворчасці. Гэта прывяло да разарэння часткі дысканцёраў ці да пераходу іх у сферу прамысловасці, гандлю. Толькі нямногія працягвалі займацца пасрэдніцкімі грашовымі аперацыямі.

У 1895 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 255 ашчадных кас, да 1913 г. іх колькасць павялічылася да 422. За два дзесяцігоддзі, з 1895 да 1915 г., сума ўкладаў павялічылася ў 8 разоў, у тым ліку грашовых – у 7 разоў, у працэнтных паперах – у 12,6 раза. Тэмпы росту ўкладаў у ашчадныя касы на тэрыторыі Беларусі былі вышэйшымі, чым наогул па Расійскай імперыі. Па родзе сваіх заняткаў найбольшую колькасць укладчыкаў грашовых сродкаў складалі тыя, хто займаўся земляробствам і сельскай прамысловасцю (у 1914 г. 43,1 % укладчыкаў і 49,4 % укладзеных сродкаў), грамадзянскай і прыватнай службай (адпаведна 17,3 і 17,0 %), гарадскімі промысламі (7,7 і 6,7 %), гандлем (7,5 і 7,4 %).

На мяжы XIX–XX стст. больш інтэнсіўнымі сталі гандлёва-эканамічныя сувязі беларускіх губерняў з суседнімі рэгіёнамі Расійскай імперыі і замежнымі краінамі, уплыў на фінансава-гаспадарчую дзейнасць міжнародных палітычных працэсаў. У пратаколе пасяджэння Другой мінскай раскладачнай прысутнасці ад 9 лістапада 1912 г. адзначалася пазітыўнае ўздзеянне росту вытворчасці жалеза на поўдні Расійскай імперыі на становішча адпаведнай галіны на тэрыторыі беларускіх губерняў. Аднак узгадвалася, што ўскладненне палітычнай сітуацыі на Балканах у 1912 г. адразу ж адмоўна паўплывала на гандлёвыя аперацыі на расійскіх біржах, прывяло да стрыманай крэдытнай палітыкі банкаў, што, у сваю чаргу, негатыўна адбілася на мясцовай гандлёва-прамысловай дзейнасці.

Беларусь на агульнарасійскім і замежным рынку выступала як пастаўшчык драўніны і тавараў, якія былі звязаны з яе перапрацоўкай, – запалак, фанеры, паперы, а таксама прадуктаў сельскай гаспадаркі, перш за ўсё жывёлагадоўлі, крухмалу, спірту і інш. Аптовы гандаль у Беларусі ўсё больш кантраляваўся агульнарасійскімі манапалістычнымі аб'яднаннямі, акцыянернымі таварыствамі, буйнымі гандлёвымі дамамі. На беларускім рынку былі прадстаўлены такія аб'яднанні, як «Продамет», «Кампанія Зінгер», нафтапрамысловае

і гандлёвае таварыства «Мазут» і інш. У рознічным гандлі таксама атрымалі пашырэнне манапалістычныя формы гаспадарання. Сярод гандляроў гумавымі вырабамі, газай, паперай, запалкамі, цукрам, мясам, соллю ўтвараліся сіндыкаты, калі прадстаўнік буйнога гандлёвага капіталу даваў у крэдыт тавар дробным гандлярам і тыя знаходзіліся ад яго ў залежнасці. Дзейнасць такіх аб'яднанняў прыводзіла да іх кантролю над цэнамі тавараў першай неабходнасці, што выклікала клопат мясцовых улад, органаў гарадскога кіравання. Са значным спазненнем на тэрыторыі Беларусі пачаў развівацца біржавы гандаль. У 1909 г. у Мінску ўзнікла лясная біржа, напярэдадні Першай сусветнай вайны – гандлёвая біржа ў Віцебску. Захоўвалі сваё значэнне ярмаркі, што выступалі ў якасці асноўнай формы эканамічных сувязей паміж сялянамі і рамеснікамі.

У пачатку XX ст. працягнулася чыгуначнае будаўніцтва. У 1902 г. чыгунка прайшла праз Віцебск, Жлобін, Магілёў. У 1907 г. была здадзена ў эксплуатацыю чыгуначная лінія Полацк – Сядлец. Для гэтага часу характэрна будаўніцтва чыгуначных адгалінаванняў ад асноўных магістралей для абслугоўвання мясцовых патрэб. Былі пабудаваны веткі Асіповічы – Старыя Дарогі – Урэчча, Вярэйцы – Градзянка, Васілевічы – Хойнікі. Адначасова ішлі мадэрнізацыя ўжо існаваўшых чыгуначных ліній, будаўніцтва дадатковых пуцей, станцый і прыпыначных пунктаў. Беларусь па насычанасці чыгункамі па стане на 1913 г. у 1,8 раза пераўзыходзіла сярэднія паказчыкі па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі. Пашырылася тэлефонная сувязь. У 1910 г. ёю маглі карыстацца жыхары 12 беларускіх гарадоў. Пэўная ўвага была нададзена развіццю воднага транспарту. У беларускіх губернях напярэдадні Першай сусветнай вайны на 1 тыс. квадратных вёрст прыходзілася 46 вёрст водных шляхоў (па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі – 19 вёрст). Новым сродкам транспарту стаў аўтамабіль.

## Павелічэнне колькасці рабочага класа, яго нацыянальны і сацыяльны склад. Станаўленне буржуазіі

Крызісныя з'явы ўносілі карэктыву ў дынаміку колькасці рабочых. У перыяд крызісу 1901–1903 гг. беспрацоўе сярод рабочых Беларусі дасягнула 18,8 %. За 1904 г. у параўнанні з папярэднім годам колькасць наёмных работнікаў зменшылася на 4 %, у 1905 г. – яшчэ на 2,2 %.

Пэўнае ажыўленне прамысловай вытворчасці ў 1906 г. выклікала рост колькасці рабочых на 2,5 %. На працягу 1907 г. колькасць рабочых зноў паменшылася ў параўнанні з 1906 г. на 3,7 %. У 1908 г. у многіх галінах вытворчасці назіралася заўважнае ажыўленне.

Агульная колькасць пастаянных наёмных работнікаў у Беларусі напярэдадні Першай сусветнай вайны складала 519 тыс. чалавек, у тым ліку 55 тыс. рабочых, занятых у фабрычна-заводскай прамысловасці, 94 тыс. – на дробных прамысловых прадпрыемствах і ў саматужна-рамесніцкай вытворчасці, 40 тыс. – на чыгуначным транспарце, 200 тыс. – у сельскай гаспадарцы, каля 86 тыс. будаўнікоў, чарнарабочых, рабочых лесанарыхтовак, 44 тыс. наёмных работнікаў у сферах гандлю, сувязі, камунальнага і бытавога абслугоўвання. Рабочыя складалі ў 1913 г. каля 5,6 % насельніцтва Беларусі, для параўнання па Расійскай імперыі – 8,8 %. Удзельная вага наёмных работнікаў Беларусі ў складзе расійскага пралетарыяту была дастаткова невысокай – 2,7 %. Структура рабочага класа Беларусі мела заўважныя адрозненні ад яго структуры па Расійскай імперыі, перш за ўсё вызначалася меншай удзельнай вагой фабрычна-заводскіх рабочых сярод наёмных работнікаў і ў агульнай масе насельніцтва. Апошні колькасны паказчык па Беларусі складаў каля 0,6 %, па Расійскай імперыі – 2,0 %. Нават сельскагаспадарчы пралетарыят Беларусі меў невысокі паказчык удзельнай вагі сярод аналагічнай групы расійскіх рабочых – 3,2 %. Сярод рабочых, якія ў 1911 г. у Расійскай імперыі накіроўваліся на заробкі на будаўнічыя і дарожныя работы, 2,2 % складалі выхадцы з Віцебскай губерні (53,9 тыс. чалавек), 1,6 % – Магілёўскай (40,6 тыс. чалавек). Больш значным было прадстаўніцтва беларускіх губерняў сярод землякопаў. Тут у 1911 г. 9,1 % рабочых было з Віцебскай губерні, 2,6 % – Віленскай, 2,4 – Гродзенскай, 2,0 – Магілёўскай, 1,7 % – з Мінскай.

Фабрычна-заводскія рабочыя сялянскага паходжання ў пачатку XX ст. захоўвалі сувязь з сельскагаспадарчымі заняткамі. Дастаткова часта наёмныя работнікі мелі ў сваім уладанні кавалкі зямлі ў вёсцы. Сяляне, накіроўваючыся на заробкі, якія працягваліся гадамі, нават на фабрыкі і заводы ў гарадах, звычайна не мянялі сваёй саслоўнай прыналежнасці. Многія кадравыя рабочыя буйных гарадскіх прадпрыемстваў заставаліся па сваім сацыяльным стане сялянамі. Часовы адыход у горад не патрабаваў выключэння з сельскай грамады, абавязковай ліквідацыі вясковай гаспадаркі. Адыход на промыслы, пошук дадатко-

вых заробкаў паступова прывучалі сельскіх жыхароў да неабходнасці ўлічваць кан'юнктуру рынку працоўнай сілы, шукаць інфармацыю аб месцах найбольшага попыту на наёмных работнікаў, разлічваць аптымальныя маршруты адыходу з мэтай больш эфектыўнага найму.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у эканоміцы Расійскай імперыі назіралася эвалюцыя арганізацыйных форм прадпрымальніцтва ад адзінаасобнага прадпрыемства да гандлёвага дома (поўнага таварыства ці таварыства на веры) і ад апошняга да акцыянернай кампаніі (у выглядзе таварыства на паях ці акцыянернага таварыства). Для беларускіх губерняў была характэрна істотна больш высокая за сярэднюю па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі ўдзельная вага прадпрыемстваў з індывідуальнай формай уладання – 82 %. Колькасныя суадносіны індывідуальных і асацыіраваных уладальнікаў змяняліся на карысць апошніх па меры ўзрастання аб'ёму вытворчасці.

У Беларусі гандлёвая буржуазія па велічыні зваротных капіталаў пераважала над прамысловай. У гандлі было сканцэнтравана 76,08 % зваротных капіталаў, у прамысловасці – 23,92 %. У сярэднім па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі гэтыя суадносіны былі прадстаўлены адпаведна 62,97 і 37,03 %. Купцы і мяшчане паступова выцяснялі з прамысловасці дваран, якія ў пачатку XX ст. саступілі ім свае вядучыя пазіцыі. Ва ўласнасці купцоў і мяшчан знаходзілася тытунёвая вытворчасць Беларусі, 89 % ільноперапрацоўчых прадпрыемстваў, 84 % друкарняў і слясарных майстэрань, 73 % запалкавых прадпрыемстваў. Удзел мяшчан заходніх губерняў у арганізацыі фабрычна-заводскай сферы вытворчасці ў пачатку XX ст. быў вышэй за сярэдні па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі. Прамысловы перапіс 1908 г. выявіў рэзкае ўзрастанне ў параўнанні з абследаваннем 1900 г. удзельнай вагі мяшчан заходніх губерняў сярод мясцовых прамысловых прадпрымальнікаў, а таксама мяшчан-прадпрымальнікаў Расійскай імперыі. Мяшчанам належалі пераважна дробныя прадпрыемствы. Заходнія губерні вылучаліся слабым удзелам сялянства ў прамысловым прадпрымальніцтве.

Прадпрымальнікі Беларусі сталі ініцыятарамі стварэння агульнарасійскага запалкавага сіндыката, які сканцэнтраваў вытворчасць і рэалізацыю запалак у Расійскай імперыі і нават за мяжой. У чэрвені 1905 г. у Мінску пры аддзяленні Паўночнага камерцыйнага банка быў заснаваны Камітэт запалкавых фабрыкантаў Заходняга краю, які выступіў адным з заснавальнікаў у 1907 г. Рускага таварыства запалкава-

га гандлю. Прадпрымальнікі Беларусі ўваходзілі таксама ў склад Саюза лесапрамыслоўцаў Паўночна-Заходняга краю, які быў створаны ў 1907 г. У 1905 г. быў заснаваны сіндыкат кафельных фабрыкантаў у Копысі Магілёўскай губерні, у 1906 г. – сіндыкат піваварных заводчыкаў Паўночна-Заходняга краю ў Оршы, у 1911 г. – сіндыкат «Продакон», які кантраляваў вытворчасць канвертных фабрык Брэста, Вільні і Адэсы.

Купецтва Беларусі прымала ўдзел у заснаванні і дзейнасці акцыянерных таварыстваў, выступала ў якасці прадстаўнікоў і агентаў замежных акцыянерных аб'яднанняў, а таксама арганізацый з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі. Сярод немясцовага паходжання першагільдзейскіх капіталаў Масквы ў 1898 г. каля 80 % складалі капіталы ўраджэнцаў заходніх губерняў. Вялікую цікавасць купцы Беларусі праяўлялі да банкаўскай сферы, а таксама да прамысловых і страхавых кампаній. Стабільным заставаўся ўдзел беларускіх прадпрымальнікаў у рэалізацыі дзяржаўных заказаў у сферах гарадскога будаўніцтва і пашырэння сеткі шляхоў зносін. Дастаткова слаба мясцовыя прадпрымальнікі ўдзельнічалі ў будаўніцтве чыгунак. Яны на мяжы XIX–XX стст. абмяжоўваліся падрадамі на земляныя работы, пастаўкамі будаўнічых матэрыялаў, стварэннем інфраструктуры каля чыгуначных шляхоў.

## Рабочы рух, з'яўленне палітычных партый і арганізацый

На мяжы XIX–XX стст. назіралася актывізацыя рабочага руху. У 1898–1900 гг. у Беларусі было зарэгістравана 178 забастовак, дзе пераважалі эканамічныя патрабаванні. Большасць з іх адбылася ў Віцебску, Гомелі, Мінску, Гродне і ахоплівала пераважна дробныя прадпрыемствы. Агульная колькасць удзельнікаў забастовак дасягала 6,4 тыс. чалавек. Канфлікты з уласнікамі прадпрыемстваў і ўладамі ў час эканамічных выступленняў нярэдка выліваліся ў вулічныя дэманстрацыі і маніфестацыі, асабліва ў сувязі са святкаваннем 1 Мая. У 1899–1900 гг. у Беларусі адбыліся тры палітычныя забастоўкі, дзевяць дэманстрацый. Амаль усе яны насілі напаўстыхійны характар. Рабочыя часам выкарыстоўвалі жорсткія метады барацьбы супраць прадпрымальнікаў і штрэйкбрэхераў. Сацыяльную напружанасць вы-

карыстоўвалі ў сваёй дзейнасці рэвалюцыянеры, прадстаўнікі сацыял-дэмакратычных арганізацый, нацыянальных партый.

Эканамічныя складанасці пачатку XX ст. выклікалі рост беспрацоўя, адмоўна паўплывалі на рынак працы і ўмовы найму работнікаў. Прадпрымальнікі памяншалі аплату працы рабочым, павялічвалі працягласць працоўнага дня, дыктавалі свае ўмовы найму, звальнялі тых, хто пратэставаў. Ва ўмовах нарастання сацыяльнай напружанасці ў дзейнасці ўрадавых органаў выявіліся пэўныя хістанні ў вырашэнні рабочага пытання, што знайшло праяўленне ў так званым «паліцэйскім сацыялізме» (зубатаўшчыне). Найбольш дальнабачныя паліцэйскія чыноўнікі разумелі, што рэпрэсіўныя метады не прыносяць поспеху. Яны прапаноўвалі ўрадавым органам ускласці на сябе клопат пра задавальненне элементарных эканамічных і культурна-асветніцкіх патрабаванняў рабочых з мэтай ізаляцыі іх ад агітацыі рэвалюцыянераў і ліквідацыі глебы для антыўрадавай дзейнасці. Ініцыятарам такой тактыкі выступіў начальнік Маскоўскага ахоўнага аддзялення С. Зубатаў, які разлічваў, што ў выпадку рэалізацыі яго прапаноў рабочыя адмовяцца ад палітычных форм барацьбы. Сярод арыштаваных у Мінску асобных бундаўцаў С. Зубатаў знайшоў сваіх прыхільнікаў, якія згадзіліся праводзіць адпаведную прапагандысцкую дзейнасць сярод рабочых. Найбольш актыўнай сярод іх была М. Вільбушэвіч, якая ў 1900 г. дзейнічала ў Гродне, а з пачатку 1901 г. – у Мінску. Тут зубатаўцаў апекаваў начальнік губернскага жандарскага ўпраўлення палкоўнік Васільеў.

У маі 1901 г. мінскія зубатаўцы ўмяшаліся ў забастоўку рабочых слясарных майстэрань і з дапамогай палкоўніка Васільева прымусілі іх гаспадароў выканаць патрабаванне наёмных работнікаў – увесці 12-гадзінны працоўны дзень. Першы поспех дазволіў зубатаўцам на пэўны час стаць галоўнымі арбітрамі ў канфліктах паміж прадпрымальнікамі і рабочымі. Тактыку «паліцэйскага сацыялізму» падхапіла створаная ў ліпені 1901 г. у Мінску Яўрэйская незалежная рабочая партыя (ЯНРП), якая фактычна паралізавала дзейнасць мясцовай арганізацыі Бунда. ЯНРП арганізоўвала культурна-асветніцкія вечары, чытанні, лекцыі. У 1902 г. арганізацыі гэтай партыі аформіліся ў Вільні і Адэсе. Аднак урад не прыняў рэкамендацыі С. Зубатава, які быў адпраўлены ў адстаўку, а без яго падтрымкі летам 1903 г. ЯНРП самараспусцілася. Пад кіраўніцтвам Бунда рабочы рух у Беларусі ў 1903 г. набыў больш выразны палітычны характар.

У канцы 1901 – пачатку 1902 г. у выніку аб'яднання шэрагу народніцкіх груп і гурткоў узнікла Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Адразу ж арганізацыі эсэраў пачалі актыўную дзейнасць на тэрыторыі Беларусі, дзе фактычна знаходзіўся адзін з цэнтраў стварэння самой партыі. Арганізацыі эсэраў напярэдадні рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. праявілі актыўнасць у Мінску, Віцебску, Гомелі, Бабруйску і шэрагу іншых гарадоў. Вясной 1904 г. для каардынацыі іх працы быў створаны Паўночна-Заходні абласны камітэт. Самай законспіраванай часткай партыі эсэраў была яе Баявая арганізацыя. Кіраўнікі гэтай арганізацыі Р. Гершуні (1901–1903) і Е. Азеф (1903–1908), якія сваім месцам нараджэння ці рэвалюцыйнай дзейнасцю былі звязаны з Беларуссю, адносіліся да ліку самых уплывовых членаў партыі.

Працэс выпрацоўкі адзінай праграмы, кансалідацыі эсэраў як партыі ў першыя гады яе існавання ішоў складана. Праграма партыі была прынята на яе з'ездзе ў канцы 1905 – пачатку 1906 г. Сялянству эсэрамі адводзілася асаблівая роля. У захаванасці традыцый грамады ў вёсцы яны бачылі адну з перадумоў шляху да сацыялізму. Працоўнае сялянства і пралетарыят эсэры адносілі да адзінага рабочага класа. Усвядоміць ім сваё адзінства павінна была дапамагчы інтэлігенцыя. Эсэры выступалі за дасягненне шырокіх палітычных праў і свабод, увядзенне васьмігадзіннага працоўнага дня, звяржэнне самадзяржаўя, усталяванне ў Расіі дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі і інш. Яны патрабавалі сацыялізацыі зямлі, што азначала адмену прыватнай уласнасці на яе і перадачу ўсёй зямлі ў распараджэнне цэнтральных і мясцовых органаў самакіравання. Карыстанне зямлёй павінна было быць ураўняльна-працоўным у адпаведнасці са спажывецкай нормай на аснове прыкладання ўласнай працы. Акрамя іншых форм і метадаў барацьбы, эсэры прызнавалі індывідуальны тэрор эфектыўным сродкам палітычнай дзейнасці.

## Польскі і яўрэйскі нацыянальныя рухі. Утварэнне і дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады

Пашырэнне сацыялістычнай ідэалогіі, яе палітызацыя вызначылі змены ў арганізацыйных формах рэвалюцыйнага руху ў Расійскай імперыі. На мяжы XIX–XX стст. замест арганізацыйна неаформленых марксісцкіх гурткоў прыйшлі сацыял-дэмакратычныя партыі, струк-

тура якіх вызначалася цэнтралізацыяй, абавязкам іх членаў актыўна ўдзельнічаць у працы арганізацыі. Узнік новы тып аб'яднанняў – нацыянальныя палітычныя партыі – Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ), Бунд, БСГ і інш.

Актыўную дзейнасць на тэрыторыі Беларусі праводзіла Польская сацыялістычная партыя (ППС). Партыя паслядоўна прытрымлівалася праграмнага патрабавання стварэння незалежнай польскай дзяржавы. У сувязі з гэтым не ўдалося наладзіць дзейснае супрацоўніцтва з РСДРП, СДКПіЛ, Бундам. У пачатку XX ст. кіраўніцтва імкнулася пераўтварыць ППС у масавую палітычную партыю. На VI з'ездзе ППС у чэрвені 1902 г. былі створаны пяць партыйных акруг, якія мелі пэўную самастойнасць. Сярод іх была Літоўская акруга, больш вядомая як ППС на Літве. Кіраўніцтва акругі для павышэння эфектыўнасці дзейнасці павінна было ўлічваць нацыянальна-культурную адметнасць Беларусі і Літвы. У 1902–1903 гг. ППС былі выдадзены тры брашуры на беларускай мове, чым выявілася яе імкненне мець ініцыятыву ў разгортванні прапагандысцкай дзейнасці сярод беларусаў. Кіраўніцтва партыі непакоіла магчымасць нацыянальна-культурнай і палітычнай эмансіпацыі беларусаў. Яно імкнулася цалкам падначаліць сабе беларускі палітычны рух. Адзін з лідараў ППС Л. Васілеўскі не бачыў перспектыў у развіцці беларускай культуры. Для ажыццяўлення сваіх планаў кіраўнікі ППС разлічвалі на створаную ў 1904 г. на базе гродзенскай арганізацыі партыі Сацыялістычную партыю Белай Русі. Яе лідарамі сталі М. Фальскі, Ф. Завадскі і інш. Партыя спрабавала наладзіць супрацоўніцтва з БСГ з мэтай далейшага іх аб'яднання, але гэтыя планы не былі рэалізаваны. У канцы 1905 г. Сацыялістычная партыя Белай Русі перастала існаваць. На VIII з'ездзе ППС у лютым 1906 г. было дазволена дзейнічаць самастойна ППС на Літве. У хуткім часе ППС на Літве аб'ядналася з Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыяй. Агульная партыя атрымала назву Сацыял-дэмакратычнай партыі Літвы, якая ўжо не мела арганізацыйных сувязей з ППС.

У пачатку XX ст. практычна ва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі дзейнічалі арганізацыі Бунда, які ўяўляў сабой параўнальна ўплывовую палітычную сілу ў межах аседласці яўрэяў. Ён карыстаўся падтрымкай значнай часткі рамеснікаў, рабочых і інтэлігенцыі, выступаў за звяржэнне самадзяржаўя і патрабаваў шырокіх дэмакратычных

свабод. Бунд быў цэнтралізаванай арганізацыяй, меў сетку прапагандысцкіх груп для вядзення агітацыі сярод рабочых. Партыя шмат зрабіла для абароны эканамічных і грамадзянскіх праў яўрэяў, але і імкнулася пашырыць свой уплыў на рабочых і сялян хрысціянскіх канфесій. Бунд разглядаў сябе як частку агульнарасійскай сацыял-дэмакратыі, аднак патрабаваў экстэрытарыяльнай нацыянальнай аўтаноміі для яўрэяў. На II з'ездзе РСДРП (1903) Бунд намагаўся прызнання сябе ў якасці адзінага прадстаўніка яўрэйскага пралетарыяту. Не атрымаўшы станоўчага рашэння, яго дэлегацыя заявіла аб выхадзе Бунда са складу РСДРП.

У 1901–1902 гг. у Вільні, Віцебску і некаторых іншых населеных пунктах Беларусі ўзніклі арганізацыі сіяністаў-сацыялістаў «Паалей-Цыён». Першапачаткова яны не мелі пэўнай праграмы і арганізацыйных сувязей паміж сабой. Асобныя з іх аб'яўлялі сябе марксісцкімі, іншыя – народніцкімі ці выступалі за сацыял-рэфармізм. Значная частка арганізацый сіяністаў-сацыялістаў імкнулася да стварэння самастойнай яўрэйскай дзяржавы ў Палесціне.

Зімой 1902–1903 гг. на базе нацыянальна-асветніцкіх гурткоў беларускай вучнёўскай і студэнцкай моладзі была створана Беларуская рэвалюцыйная грамада. Яе стваральнікамі і кіраўнікамі выступілі браты Антон і Іван Луцкевічы, Э. Пашкевіч, А. Бурбіс, К. Каганец (К. Кастравіцкі), В. Іваноўскі і інш. У снежні 1903 г. адбыўся I з'езд Грамады, дзе яна характарызавалася як сацыяльна-палітычная арганізацыя беларускага працоўнага народа, атрымала назву Беларуская сацыялістычная грамада. Партыя выступала за звяржэнне самадзяржаўя ў Расіі, каб «усе народы мелі найбольшую свабоду». Было вырашана дабівацца для Беларусі краёвай аўтаноміі з сеймам у Вільні. У праграме партыі, якая абмяркоўвалася на з'ездзе, выкарыстоўваліся праграмныя палажэнні ППС, Бунда, эсэраў. БСГ у сваёй дзейнасці абапіралася на беларускую вёску, апелявала да вясковай інтэлігенцыі, сялян, сельскагаспадарчых рабочых, выступала за ліквідацыю прыватнай уласнасці на зямлю, увядзенне васьмігадзіннага працоўнага дня, дзяржаўнага страхавання ад няшчасных выпадкаў і інш.

На мяжы XIX–XX стст. вызначэнне этнічнай прыналежнасці беларускім сялянствам ускладнялася наяўнасцю некаторых стэрэатыпаў, звязаных з неабходнасцю засваення рускай ці польскай моў, з якімі асацыявалася магчымасць сацыяльнага поспеху. Для многіх сялян

уяўлялася бясспрэчнай перавага рускай і польскай культур над іх вясковай культурай і простай мовай. Гэта часам выклікала насмешлівае стаўленне да ўсяго свайго вясковага, асабліва сярод тых, хто змог узняцца па сацыяльнай лесвіцы. У той жа час дзеячы беларускага нацыянальнага руху апелявалі да этнічнай культуры, мовы простага народа як да важнейшых каштоўнасцей, абгрунтоўвалі неабходнасць адраджэння іх высокага статусу. Нацыянальная агітацыя ўскладнялася таксама недастатковай развітасцю сродкаў камунікацыі.

Тэма 10

# РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ПАДЗЕІ 1905–1907 гг. У БЕЛАРУСІ

**Пачатак рэвалюцыі. Уздым выступленняў рабочых, сялян і салдат у студзені – верасні 1905 г.**
**Кастрычніцкая палітычная стачка ў гарадах і мястэчках Беларусі.**
**Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. Курлоўскі расстрэл у Мінску.**
**Дыферэнцыяцыя грамадска-палітычных сіл. Кансерватыўныя партыі і саюзы, ліберальныя партыі, сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў Беларусі і характар іх дзейнасці.**
**Выбары ў I і II Дзяржаўную Думу Расіі, дзейнасць дэпутатаў ад беларускіх губерняў.**
**Рабочы, сялянскі і салдацкі рух вясной – летам 1906 г., змены ў іх дынаміцы і характары.**
**Беларускі нацыянальны рух у перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг., роля БСГ.**
**Прычыны паражэння Першай расійскай рэвалюцыі і яе значэнне для Беларусі.**

## Пачатак рэвалюцыі. Уздым выступленняў рабочых, сялян і салдат у студзені – верасні 1905 г.

У канцы 1904 г. у Расійскай імперыі абвастрылася палітычная барацьба. Абвешчаны ўрадам, які ўзначальваў П. Д. Святаполк-Мірскі, курс на давер да грамадства прывёў да актывізацыі апазіцыі. У верасні 1904 г. адбыла-

ся Парыжская канферэнцыя, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі найбольш уплывовага ліберальнага «Саюза вызвалення» і шэрагу рэвалюцыйных партый, у тым ліку Беларускай сацыялістычнай грамады. На канферэнцыі абмяркоўвалася пытанне аб сумеснай барацьбе супраць самадзяржаўя. У лістападзе 1904 г. па ініцыятыве «Саюза вызвалення» адбыўся Земскі з'езд, які высунуў патрабаванні народнага прадстаўніцтва і прадстаўлення насельніцтву грамадзянскіх свабод. Рэвалюцыйныя партыі падтрымалі патрабаванні ліберальнай апазіцыі. У лістападзе – снежні 1904 г. у палітычную барацьбу ўступіла рабочая арганізацыя «Сход рускіх фабрычна-заводскіх рабочых Санкт-Пецярбурга», якую ўзначальваў святар Г. Гапон. Кіраўніцтва гэтай арганізацыі 2 студзеня 1905 г. вырашыла пачаць забастоўку на Пуцілаўскім заводзе, якая 7–8 студзеня перакінулася на іншыя прадпрыемствы Пецярбурга.

Пачатак рэвалюцыі непасрэдна звязаны з расстрэлам 9 студзеня 1905 г. у Пецярбургу масавага мірнага шэсця рабочых, якія накіроўваліся да Зімовага палаца з петыцыяй аб паляпшэнні свайго становішча. Гэта падзея адразу ж знайшла водгук на тэрыторыі Беларусі, дзе студзеньскія палітычныя стачкі, у якіх удзельнічалі больш за 33 тыс. рабочых, ахапілі 25 гарадоў і мястэчак. Акрамя таго, адбыліся 22 вулічныя дэманстрацыі, 44 масавыя сходы, якія часам суправаджаліся ўзброенымі сутычкамі з паліцыяй і вайсковымі патрулямі. З улікам усіх выступленняў антыўрадавы рух ахапіў 30 гарадоў і мястэчак. Ужо 11–17 студзеня прайшлі акцыі пратэсту ў Мінску. Яны ахапілі большасць фабрык і заводаў горада, прыватныя друкарні і рамесніцкія майстэрні. З 12 студзеня пачаліся сходы і мітынгі ў Гомелі. 16 студзеня забастоўка тут набыла агульнагарадскі размах, аднак да яе не далучыліся рабочыя самага вялікага прадпрыемства – чыгуначных майстэрань. Усяго ў горадзе баставала каля 4 тыс. чалавек. Большасцю выступленняў кіравалі мясцовыя арганізацыі РСДРП і Бунда, якія на кааліцыйнай аснове стваралі стачачныя камісіі. У Смаргоні па закліку такой камісіі 13 студзеня забаставала каля 3 тыс. чалавек. Агульнагарадскія стачкі адбыліся таксама ў Гродне, Брэсце, Мазыры, Ашмянах і інш.

У лютым – сакавіку 1905 г. хваля палітычных выступленняў знізілася, пераважалі забастоўкі з эканамічнымі патрабаваннямі. Новы ўздым палітычнага рабочага руху быў звязаны са святкаваннем 1 Мая. У красавіку – чэрвені ён ахапіў 56 гарадоў і мястэчак Беларусі. Колькасць удзельнікаў палітычных забастовак дасягнула 100 тыс. чалавек. Больш настойлівай у гэты час стала і эканамічная барацьба пра-

цоўных. У многіх выпадках наёмныя работнікі дабіваліся скарачэння працоўнага дня да 9–10 гадзін, істотнага павелічэння заработнай платы і інш. Летам 1905 г. адбыліся палітычныя стачкі ў Мінску, Гомелі, Бабруйску, Брэсце, Гродне.

Разгарнуўся таксама сялянскі рух. У студзені – сакавіку 1905 г. адбыліся 53 сялянскія выступленні. Іх колькасць павялічылася ў параўнанні з 1901–1904 гг., калі штогод адбывалася ў сярэднім 28 выступленняў. Аднак іх формы засталіся большай часткай традыцыйнымі, пераважалі парубкі панскіх лясоў. У чэрвені 1905 г. адбылося ўжо 175 сялянскіх выступленняў. Першым найбольш буйным з іх была стачка сялян-падзёншчыкаў і парабкаў у чэрвені 1905 г., якая ахапіла амаль усе маёнткі Навагрудскага павета. Шырокі размах набылі забастоўкі сельскагаспадарчых рабочых у Мінскім, Бабруйскім, Рэчыцкім, Слуцкім, Брэсцкім паветах і інш.

У ліпені 1905 г. салдаты Баранавіцкага чыгуначнага батальёна ў Мінску арганізавалі пратэст супраць адпраўкі іх на Далёкі Усход. Сацыял-дэмакраты вялі агітацыю сярод салдат у гарнізонах Бабруйска, Брэста, Гродна і некаторых іншых гарадоў.

## Кастрычніцкая палітычная стачка ў гарадах і мястэчках Беларусі. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. Курлоўскі расстрэл у Мінску

Восенню 1905 г. назіраўся чарговы ўздым рабочага руху. У кастрычніку 1905 г. адбылася палітычная стачка, якая ахапіла амаль усю Расійскую імперыю. Актыўна яе падтрымалі чыгуначнікі – спыніўся рух цягнікоў на 26 магістралях. Стачка суправаджалася мітынгамі, сходамі, дэманстрацыямі. У Беларусі рэвалюцыйны рух падтрымалі перш за ўсё чыгуначнікі і рабочыя буйных прадпрыемстваў. Арганізавана разгортваліся падзеі ў Мінску. 6 кастрычніка тут былі заўважаны першыя спробы правесці дэманстрацыі, якія былі разагнаны паліцыяй. Новы імпульс рабочы рух у Мінску атрымаў, калі да стачкі далучыліся чыгуначнікі. 11 кастрычніка спыніўся рух на Маскоўска-Брэсцкай чыгунцы, 12 кастрычніка – на Лібава-Роменскай. Для кіраўніцтва стачкай быў створаны камітэт, куды ўвайшлі прадстаўнікі РСДРП, Бунда і эсэраў. З 12 кастрычніка штодзённа на прывакзальнай плошчы

і ў памяшканні вакзала адбываліся мітынгі. На іх былі сфарміраваны патрабаванні ўвядзення васьмігадзіннага працоўнага дня, свабоды слова, друку, сходак, саюзаў, усеагульнага выбарчага права, бясплатнага навучання, медыцынскай дапамогі і г. д.

Амаль адначасова з рабочымі і навучэнцамі Мінска ў стачку ўключыліся чыгуначнікі Оршы, рабочыя Гомеля. 13 кастрычніка стачка ў Гомелі стала ўсеагульнай. Увесь час у горадзе адбываліся мітынгі і дэманстрацыі. 14 кастрычніка ў выніку сутычак дэманстрантаў і паліцыі загінула 7 рабочых. У стачачную барацьбу ўключыліся таксама і чыгуначнікі Пінска, Баранавічаў, Лунінца. Для кіраўніцтва рухам выбіраліся стачачныя камітэты. 17–19 кастрычніка да стачкі далучыліся рабочыя Магілёва, Віцебска, Гродна, Брэста.

Кастрычніцкая палітычная стачка прымусіла ўрад пайсці па шляху рэфармавання дзяржаўнага ладу. 8 кастрычніка 1905 г. кіраўнік ураду С. Ю. Вітэ выступіў перад імператарам з прапановамі рэформ. Мікалай II даручыў С. Ю. Вітэ падрыхтаваць тэкст Маніфеста, які быў падпісаны 17 кастрычніка. У дакуменце прадугледжвалася прадстаўленне насельніцтву свабоды слова, сумлення, саюзаў і сходаў. Пашыралася кола тых, хто мог удзельнічаць у выбарах у Дзяржаўную Думу. Фактычна ствараўся парламент з правам заканадаўчай ініцыятывы, без адабрэння якога не мог мець сілу ні адзін закон. За імператарам захоўвалася права распускаць Думу і накладваць вета на яе рашэнні. Акрамя Дзяржаўнай Думы, Маніфест змяніў функцыі і іншых вышэйшых дзяржаўных устаноў імперыі. Указам ад 19 кастрычніка 1905 г. Савет Міністраў пераўтвараўся ў пастаянна дзеючы орган, які быў адказны перад імператарам. Дзяржаўны Савет указам ад 20 лютага 1906 г. станавіўся фактычна верхняй палатай парламента. З гэтага часу палова членаў Савета і яго кіраўніцтва прызначаліся імператарам, астатняя частка выбіралася земствамі, дваранскімі сходамі і з ліку прадстаўнікоў ад універсітэтаў.

Яшчэ да выдання Маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. быў выдадзены ўказ «Аб умацаванні пачаткаў верацярпімасці», які знайшоў працяг у палажэннях 7-й главы Звода асноўных дзяржаўных законаў ад 23 красавіка 1906 г. Паводле абазначаных заканадаўчых дакументаў праваслаўным дазвалялася пераходзіць у іншыя веравызнанні, а прадстаўнікам іншых канфесій і замежным грамадзянам вольна займацца богаслужэннем у адпаведнасці з уласнымі канфесійнымі абрадамі. Гэта прывяло да з'яўлення ў Расійскай імперыі вялікай колькасці місіянераў, стварэння розных сект.

Адразу пасля падпісання Маніфеста 17 кастрычніка да насельніцтва Беларусі дайшлі чуткі аб дараваных свабодах. У Мінску 18 кастрычніка на плошчы Віленскага вакзала быў арганізаваны мітынг, куды сабраліся каля 15–20 тыс. маніфестантаў. Мітынг быў расстраляны з санкцыі мінскага губернатара П. Курлова, загінула да 100 чалавек, паранена каля 300 чалавек. У сувязі з гэтымі трагічнымі падзеямі Мінскі кааліцыйны савет прыняў рашэнне аб працягу палітычнай забастоўкі і абвясціў ураду патрабаванне пачаць судовае следства супраць тых, хто меў дачыненне да крывавай бойні. Раніцай 18 кастрычніка адбыўся мітынг у Віцебску, удзельнікі якога патрабавалі ад улад пазнаёміць з тэкстам Маніфеста. У выніку мітынг быў разагнаны з прымяненнем агнястрэльнай зброі, 7 чалавек былі забіты, 4 – паранены. У той жа дзень у Віцебску адбылася дэманстрацыя пратэсту. На наступны дзень амаль 40 тыс. жыхароў горада прынялі ўдзел у пахаванні забітых.

Кастрычніцкая палітычная стачка ахапіла ў Беларусі 32 населеныя пункты, колькасць стачачнікаў толькі ў прамысловасці дасягнула 66 тыс. чалавек. Яна знайшла падтрымку ў вёсцы, але некалькі пазней – у лістападзе, калі адбыліся 154 сялянскія выступленні. Найбольшы ўздым барацьбы ў вёсцы назіраўся ў снежні – 286 выступленняў. У гэты час прыкметна павялічылася колькасць падпалаў панскіх маёнткаў, сутыкненняў з паліцыяй, палітычных сходаў і мітынгаў. Колькасць забастовак сельскагаспадарчых рабочых у той жа час знізілася. Восенню 1905 г. значныя выступленні салдат адбыліся ў Гродне, Бабруйску, Брэсце. Выступленне салдат прайшло ў снежні 1905 г. у Баранавічах. Аднак у цэлым хваляванні салдат мелі разрознены характар.

Па закліку РСДРП, эсэраў і Бунда 7 снежня 1905 г. у Маскве пачалася ўсеагульная палітычная стачка, якая ў ноч на 10 снежня перарасла ва ўзброенае паўстанне. Усерасійскую стачку з 7 снежня аб'явілі чыгуначнікі, якую ў Беларусі першымі падтрымалі таксама чыгуначнікі. Адначасова Мінскі кааліцыйны савет, Гомельскі рэвалюцыйны, Пінскі, Мазырскі стачачныя камітэты заклікалі працоўных да палітычнай забастоўкі. У ноч на 9 снежня ў Мінску адбыліся арышты рэвалюцыянераў, у горадзе і губерні было аб'яўлена становішча надзвычайнай аховы, закрыта газета «Северо-Западный край», якая фактычна з'яўлялася перыядычным органам мясцовай групы РСДРП. У Баранавічах намаганнямі мясцовага стачачнага камітэта рух цягнікоў спыніўся 9 снежня. Праз тры дні горад быў аб'яўлены на ваенным становішчы. Сюды накіравалі карныя падраздзяленні, якім удалося праз некалькі дзён аднавіць чыгуначны рух. У Гомель таксама былі

накіраваны вайсковыя сілы, якія падавілі стачку чыгуначнікаў. Снежаньская палітычная стачка ахапіла ў Беларусі 17 гарадоў і мястэчак, аднак нідзе справа не дайшла да ўзброенага паўстання. У цэлым размах рэвалюцыйнага руху ў снежні скараціўся ў параўнанні з кастрычнікам у два разы.

У канцы 1905 г. пад уздзеяннем Снежаньскага ўзброенага паўстання ў Маскве быў узмоцнены рэпрэсіўны апарат. Былі павялічаны штаты губернскіх жандарскіх упраўленняў, фарміраваліся атрады паліцэйскай варты. Толькі ў Мінскай губерні размяшчалася звыш тысячы чалавек паліцэйскай варты. У пачатку 1906 г. дадатковыя вайсковыя сілы былі накіраваны ў Віленскую губерню. У Гродзенскай губерні былі размешчаны 18 рот пяхоты, 3 эскадроны і паўсотня кавалерыі.

## Дыферэнцыяцыя грамадска-палітычных сіл. Кансерватыўныя партыі і саюзы, ліберальныя партыі, сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў Беларусі і характар іх дзейнасці

Восенню 1905 г. на тэрыторыі Беларусі пашырылі і ўзмацнілі сваю дзейнасць агульнарасійскія крайне манархічныя партыі і арганізацыі. Сярод найбольш актыўных і ўплывовых аказаліся Саюз рускага народа, Рускі народны саюз імя Міхаіла Архангела, Саюз рускага народа – абнаўленчы, Усерасійскі Дубровінскі Саюз рускага народа, Усерасійскі нацыянальны саюз, якія ў грамадстве атрымалі больш вядомасць як чарнасоценцы. Найбольшы ўздым іх актыўнасці супаў з завяршальным этапам рэвалюцыі 1905–1907 гг. Аднак у хуткім часе папулярнасць і уплыў манархістаў у грамадстве пачалі заўважна зніжацца, а для самога манархічнага руху наступіў перыяд унутранага крызісу і расколу.

Выданне Маніфеста 17 кастрычніка, дараванне асобных дэмакратычных свабод, разгортванне рэвалюцыйных падзей, уцягненне ў палітычныя працэсы шырокіх слаёў насельніцтва садзейнічалі росту іх грамадскай актыўнасці, неабходнасці самаарганізацыі і дыферэнцыяцыі палітычных сіл. У лістападзе 1905 – лютым 1906 г. адбылося арганізацыйнае афармленне праваліберальнай партыі «Саюз 17 кастрычніка». На тэрыторыі Беларусі арганізацыі акцябрыстаў былі створаны ў Гродне, Вілейцы, Віцебску, Мінску, Бабруйску і інш. Найбольш актыўнай з іх была мінская, якая аб'яднала вакол сябе каля ты-

сячы чалавек, у тым ліку сялян Мінскага павета. Яе ўзначальвалі чыноўнікі Г. Шміт, І. Чыгіроў, А. Бяляеў, святар В. Успенскі. Мясцовыя акцябрысты выдавалі штодзённую газету «Минская речь». У беларускіх губернях акцябрысты, у адрозненне ад кіраўніцтва партыі, цалкам падтрымлівалі рэпрэсіўную ўнутраную палітыку ўрада, прытрымліваліся вялікадзяржаўнай ідэалогіі, чым збліжаліся з праваманархічнымі, чарнасоценнымі арганізацыямі. На з'ездзе «Саюза 17 кастрычніка» ў Маскве ў лютым 1906 г. дэлегаты ад беларускіх арганізацый разам з прыбалтыйскімі і польскімі не падтрымалі рэзалюцыю, у якой крытыкавалася ўнутраная ўрадавая палітыка. Адначасова яны заяўлялі аб неабходнасці хадайнічаць перад імператарам аб асобным адміністрацыйным прадстаўніцтве праваслаўнага насельніцтва заходніх губерняў у Дзяржаўнай Думе.

У кастрычніку 1905 г. адбыўся ўстаноўчы з'езд Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі. Ён прыняў праграму і статут партыі, выбраў яе кіруючыя органы. Канчатковае афармленне партыі адбылося на другім з'ездзе ў студзені 1906 г. Пераважна ў партыю кадэтаў уваходзілі прадстаўнікі інтэлігенцыі, землеўласнікі, прадпрымальнікі, але нямала было выхадцаў з сацыяльных нізоў – рабочых, сялян, рамеснікаў. Праграма кадэтаў прадугледжвала роўнасць усіх грамадзян перад законам. Яны выступалі за эвалюцыйны шлях развіцця грамадства, супраць гвалтоўных сацыяльных пераваротаў. Патрабавалі замены самадзяржаўя канстытуцыйна-парламенцкай манархіяй. Кадэты лічылі неабходным увядзенне ў Расійскай імперыі ўсеагульнага выбарчага права, ажыццяўленне дэмакратычных свабод, выступалі за права культурна-нацыянальнага самавызначэння для ўсіх народаў, якія насялялі Расійскую імперыю, але пры ўмове захавання яе як унітарнай дзяржавы. Яны прапаноўвалі надзяліць зямлёй беззямельных і малазямельных сялян за кошт дзяржаўных, удзельных, кабінецкіх, манастырскіх, а таксама часткі прыватнаўласніцкіх зямель, выкупленых дзяржавай «па справядлівай» цане. Асноўная маса арганізацый кадэтаў на тэрыторыі Беларусі ўзнікла ў перыяд выбараў у І Думу. На працягу 1905–1906 гг. арганізацыі Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі былі створаны на тэрыторыі Беларусі: у Віцебску, Ашмянах, Гродне, Брэсце, Дрысе, Мінску, Магілёве, Капаткевічах і інш. У іх склад уваходзілі пераважна прадстаўнікі інтэлігенцыі, але таксама і землеўласнікі, чыноўнікі, заможныя сяляне. Колькасна асобныя з арганізацый кадэтаў (Мінск, Магілёў) дасягалі 300 чалавек.

Напярэдадні выбараў у Дзяржаўную Думу, 7 лютага 1906 г., на ўстаноўчым сходзе ў Вільні было абвешчана стварэнне Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі. Яе арганізатарам і лідарам стаў віленскі каталіцкі епіскап барон Э. Роп. Праграма партыі ўтрымлівала патрабаванні абласнога самакіравання для Беларусі і Літвы, бясплатнай народнай школы з навучаннем на роднай мове і абавязковым вывучэннем рэлігіі, агучвала падтрымку стварэння хутарскіх гаспадарак і ліквідацыю цераспалосіцы.

У канцы 1905 – пачатку 1906 г. аформілася Краёвая партыя Літвы і Беларусі. Яна прадстаўляла тую частку грамадства, свядомасць якой укладвалася ў формулу: «Літвін па паходжанні, паляк па нацыянальнасці». Лідарамі ліберальнай плыні партыі выступалі Л. Абрамовіч, М. Ромер, Т. Урублеўскі. Яны падтрымлівалі сувязь з кадэтамі. Больш кансерватыўнае крыло арганізацыі ўзначальвалі буйныя землеўласнікі Э. Вайніловіч, І. Корвін-Мілеўскі, Р. Скірмунт. Апошні з іх у лістападзе 1905 г. апублікаваў зварот, які фактычна ўяўляў сабой праграму Краёвай партыі Літвы і Беларусі. Дакумент дэклараваў увядзенне грамадзянскіх свабод, краёвага самакіравання, прынцып недатыкальнасці прыватнай уласнасці.

## Выбары ў I і II Дзяржаўную Думу Расіі, дзейнасць дэпутатаў ад беларускіх губерняў

Рэвалюцыйны націск 1905 г., актывізацыя грамадскіх сіл, у тым ліку ліберальнай апазіцыі, прымусілі Мікалая II пайсці на саступкі і зацвердзіць 6 жніўня 1905 г. праект стварэння Дзяржаўнай Думы, якая павінна была папярэдне распрацоўваць і абмяркоўваць заканадаўчыя прапановы, якія затым перадаваліся ў Дзяржаўны Савет і далей на разгляд імператара. Праект быў распрацаваны ў Міністэрстве ўнутраных спраў пад кіраўніцтвам міністра А. Р. Булыгіна – адсюль і яго назва. Праект Булыгінскай думы прадугледжваў шматступенчатыя выбары, высокі маёмасны і ўзроставы цэнз. Рабочыя, жанчыны, салдаты, навучэнцы, асобы, маладзейшыя за 25 гадоў, да ўдзелу ў выбарах не дапускаліся. Фактычна праект Булыгінскай думы быў своеасаблівым манеўрам расійскага ўрада ва ўмовах уздыму рэвалюцыйных настрояў у краіне, аднак ён не меў поспеху. Абмежаваная ў сваіх паўнамоцтвах Дума, урэзаныя выбарчыя правы не задаволілі грамадства. Пад націскам кастрычніцкай палітычнай стачкі 1905 г. урад быў вымушаны перагледзець праект.

Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г. прадугледжвалася пашырэнне кола выбаршчыкаў і наданне Думе права заканадаўчай ініцыятывы. 11 снежня 1905 г. Мікалай II зацвердзіў указ «Аб змяненні Палажэння аб выбарах у Дзяржаўную Думу». Да трох ранейшых выбарчых курый – землеўласніцкай, гарадской і сялянскай – дабаўлялася яшчэ адна – рабочая. У апошняй курыі выбарчым правам карысталіся рабочыя прадпрыемстваў, дзе колькасць працуючых мужчын ва ўзросце звыш 25 гадоў перавышала 25 чалавек. У такім выпадку ў Беларусі толькі 10–15 % рабочых атрымалі выбарчае права.

У канцы 1905 – пачатку 1906 г. разгарнулася палітычная барацьба розных партый і груп у сувязі з выбарамі ў I Дзяржаўную Думу. Урадавыя пазіцыі адстойвалі манархічныя партыі, найбольш уплывовай з якіх быў чарнасоценны «Саюз рускага народа». Яго рэгіянальныя арганізацыі імкнуліся пашырыць свой уплыў сярод сялянства, рабочых. Яны карысталіся шырокай падтрымкай праваслаўных святароў. Агітацыя чарнасоценцаў карысталася поспехам у рэгіёнах са шматнацыянальным складам насельніцтва, да ліку якіх адносіліся беларускія губерні. У пачатку 1906 г. арганізацыі чарнасоценцаў дзейнічалі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Оршы і інш. Актыўную агітацыю ў «истинно-русском духе» ў час выбараў у I Дзяржаўную Думу праводзіла рэдакцыя газеты «Окраины России». Задачу аб'яднання «рускіх» людзей ставіла перад сабой Паўночна-Заходняе рускае веча, якое было створана ў снежні 1905 г. у Вільні. Аднак нягледзячы на падтрымку мясцовай адміністрацыі і праваслаўнай царквы, крайне правыя ў час выбараў не атрымалі значнага поспеху.

У саюзе з чарнасоценцамі на выбарах у Думу ў беларускіх губернях выступалі акцябрысты і звязаныя з імі Прагрэсіўная партыя і Партыя прававога парадку. У пачатку 1906 г. акцябрысты беларускіх, прыбалтыйскіх і польскіх губерняў стварылі апазіцыйны да цэнтральнага кіраўніцтва партыі «Окраинный союз 17 октября», які свае палітычныя пазіцыі фактычна акрэсліваў лозунгам неабходнасці абароны «рускага насельніцтва» заходніх губерняў ад уціску з боку палякаў і яўрэяў.

Вельмі актыўна выбарчую кампанію праводзілі кадэты. Яны прадстаўлялі сабой самую левую з легальных палітычных партый, выступалі з апазіцыйнымі заявамі ў дачыненні да ўрада, не скупіліся на абяцанні рабочым і сялянам. У беларускіх губернях кадэты ўступалі ў перадвыбарчыя аб'яднанні з польскімі, яўрэйскімі, літоўскімі арганізацыямі. У Мінскай губерні быў утвораны Прагрэсіўны блок, у які ўвайшлі кадэты, Польская незалежная партыя, Беларуска-літоўская

партыя, Перадвыбарчы камітэт землеўласнікаў Мінскай губерні. У Магілёве кадэты выступалі адным блокам з «Саюзам дасягнення раўнапраўя яўрэяў», а таксама ўваходзілі ў склад Віленскага яўрэйскага выбарчага камітэта.

У выбары актыўна ўключылася таксама Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі. Ёй удалося правесці сваіх прадстаўнікоў у склад выбаршчыкаў Віленскай і Гродзенскай губерняў. Непакоячыся з нагоды ўплыву партыі на каталіцкае насельніцтва, улады забаранілі яе сходы ў межах Віленскага генерал-губернатарства.

Сацыялістычныя, рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі, якія спадзяваліся на новы рэвалюцыйны ўздым, выступілі з тактыкай байкоту выбараў у І Дзяржаўную Думу. Гэтай жа пазіцыі прытрымлівалася і Беларуская сацыялістычная грамада. Ініцыятыва байкоту належала бальшавікам. Меншавікі былі за выкарыстанне тых магчымасцей, якія даваў Маніфест 17 кастрычніка, за адмаўленне ад паўстання як сродку барацьбы. Арганізацыі РСДРП у Беларусі падтрымлівалі бальшавісцкую пазіцыю. Канферэнцыя Бунда ў лютым 1906 г. прыняла рашэнне аб байкоце Думы з мэтай яе дыскрэдытацыі. Лідары Бунда разлічвалі на падтрымку сваёй пазіцыі з боку яўрэйскіх рабочых. Тактыка байкоту выбараў з боку левых партый прывяла да таго, што рабочыя буйных прадпрыемстваў у Мінску, Мазыры, Пінску, Бабруйску, Гродне, Слоніме, Магілёве і некаторых іншых гарадах не ўдзельнічалі ў выбарах, нягледзячы на забарону гэтага з боку улад. Аднак у большасці выпадкаў гараджане і сяляне пайшлі на выбары.

Выбары ў І Дзяржаўную Думу адбываліся ва ўмовах масавых рэпрэсій з боку ўрада ў сувязі са снежаньскімі рэвалюцыйнымі выступленнямі. Урад абапіраўся на падтрымку з боку праваслаўнага духавенства і манархічных партый. Першымі ў выбарчую кампанію ўключыліся сяляне. Выбары былі для іх чатырохступеннымі. Спачатку сельская грамада выбірала сваіх прадстаўнікоў на валасны сход, які накіроўваў двух упаўнаважаных на павятовы сялянскі з'езд, што, у сваю чаргу, вызначаў выбаршчыкаў для ўдзелу ў рабоце губернскага сходу, дзе сумесна з прадстаўнікамі ад землеўласніцкага, гарадскога і рабочага з'ездаў выбіраліся дэпутаты ў Думу. Сяляне-выбаршчыкі ад кожнай губерні выбіралі аднаго дэпутата са свайго асяроддзя. Выбары выявілі нізкую палітычную свядомасць сялян, якія пайшлі на выбары, аднак многія з іх не бачылі сэнсу ўдзельнічаць у выбарчых сходах. На павятовых землеўласніцкіх выбарчых з'ездах перавагу атрымалі больш заможныя ўладальнікі.

Перамогу на выбарах у І Дзяржаўную Думу атрымалі кадэты. З 36 дэпутатаў, выбраных ад беларускіх губерняў, прыхільнікамі кадэтаў былі 29 чалавек. У іх лік уключаны таксама прадстаўнікі Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі і сіяністаў. Астатнія дэпутаты былі сялянамі па сацыяльным паходжанні, з іх пяць адносілі сябе да беспартыйных, адзін – да правых і адзін – да сацыял-дэмакратаў.

Дзейнасць Дзяржаўнай Думы пачалася 27 красавіка 1906 г. У ходзе работы Думы пад уплывам вострай палемікі змяніліся палітычныя пазіцыі большасці дэпутатаў ад беларускіх губерняў. Толькі 8 дэпутатаў уступілі ў фракцыю кадэтаў, 13 дэпутатаў – прыхільнікаў Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі разышліся з кадэтамі па аграрным пытанні і далучыліся да фракцыі аўтанамістаў, 7 сялянскіх дэпутатаў лічылі сябе беспартыйнымі і ў залежнасці ад пазіцыі па абмяркоўваемым пытанні падтрымлівалі пры галасаванні кадэтаў, аўтанамістаў ці манархістаў. Паводле звестак Дэпартамента паліцыі, 8 дэпутатаў ад беларускіх губерняў лічыліся трудавікамі. У пачатку мая дэпутаты ад Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі стварылі самастойную тэрытарыяльна-нацыянальную групу «Тэрытарыяльнае кола», якую ўзначалілі князь І. Друцкі-Любецкі, А. Лядніцкі, Ч. Янкоўскі.

Адным з найбольш вострых пытанняў у рабоце Думы стала аграрнае. Аўтанамісты з беларускіх губерняў Р. Скірмунт, Н. Сангайла, Б. Ялавецкі адстойвалі неабходнасць захавання памешчыцкай і сялянскай уласнасці на зямлю. Князь І. Друцкі-Любецкі, які падтрымліваў у Думе кадэтаў, выступіў супраць законапраекта сваіх аднапартыйцаў, лічыў немэтазгодным прымаць агульны для ўсёй Расійскай імперыі аграрны закон, падкрэсліваў асаблівае стаўленне беларускіх сялян да зямельнай уласнасці. Прадстаўнікі Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі таксама заяўлялі, што аграрнае пытанне павінна было вырашацца ў кожнай вобласці з улікам мясцовых традыцый. Для гэтага мэтазгодным было прадстаўленне ім аўтаноміі ці абласнога самакіравання.

У палітычных пытаннях польскія і беларускія аўтанамісты па сваіх пазіцыях у Думе былі блізкімі да кадэтаў. Для Беларусі і Літвы прадстаўнікі Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі патрабавалі мясцовага самакіравання.

Нязгоду Дзяржаўнай Думы і жаданне яе дэпутатаў звярнуцца непасрэдна да народа выклікала публікацыя ўрадам 20 чэрвеня 1906 г.

сваёй праграмы вырашэння аграрнага пытання, якая прадугледжвала перадачу малазямельным сялянам усіх прыгодных для земляробства казённых зямель, добраахвотны продаж памешчыцкай зямлі праз Сялянскі банк, павелічэнне дапамогі перасяленцам і інш. Не чакаючы пратэсту дэпутатаў, Мікалай II указам ад 9 ліпеня 1906 г. распусціў Дзяржаўную Думу і прызначыў новыя выбары.

У канцы 1906 – пачатку 1907 г. разгарнулася барацьба вакол выбараў у II Дзяржаўную Думу. Улады імкнуліся не дапусціць у новы склад Думы экс-дэпутатаў. Спад рэвалюцыйнай барацьбы, узмацненне ўрадавых рэпрэсіўных мерапрыемстваў далі магчымасць умацаваць свае пазіцыі ў беларускіх губернях акцябрыстам і «Саюзу рускага народа». Прадстаўнікі дадзеных арганізацый у кастрычніку 1906 г. на з'ездзе ў Вільні ўтварылі «Рускі ўскраінны саюз». Фактычна гэта быў перадвыбарны блок, які выступіў пад лозунгам «Расія для рускіх і толькі рускія павінны кіраваць ёю». Сваю дзейнасць ён скіраваў супраць яўрэйскіх і польскіх уплываў у беларускіх губернях. «Рускі ўскраінны саюз» патрабаваў пазбавіць палякаў і яўрэяў выбарчых праў, не прызнаваў асобнасць беларускага народа, а беларускі нацыянальны рух лічыў польскай інтрыгай.

Кадэты на тэрыторыі Беларусі ў час выбараў страцілі падтрымку мясцовых аўтанамістаў. Супраць пазіцыі кадэтаў у Думе выступілі сельскагаспадарчыя таварыствы ў Мінску і Вільні, а таксама Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі, якая ў другой палове 1906 г. спыніла сваю палітычную дзейнасць. У перадвыбарчую кампанію на тэрыторыі Беларусі актыўна ўцягнуліся мясцовыя аўтанамісты, якія крытыкавалі палітыку ўрада па нацыянальным і канфесійным пытаннях, звязвалі вырашэнне ўсіх мясцовых праблем з дасягненнем шырокага самакіравання ў краі.

Сацыялістычныя партыі перагледзелі сваё стаўленне да выбараў у Думу. Ва ўмовах спаду рэвалюцыйнай барацьбы байкот выбараў страціў свой сэнс. З мэтай больш паспяховай канкурэнцыі з прадстаўнікамі манархічных партый у некаторых гарадах яны заключылі пагадненні аб вылучэнні агульнага кандыдата. У Мінску перадвыбарны блок утварылі мясцовыя арганізацыі РСДРП, Бунда, ППС, БСГ і шэрагу прафсаюзаў. Дзякуючы гэтаму аб'яднанню ім удалося ў студзені 1907 г. атрымаць перамогу на гарадскіх выбарах, вылучыць на губернскі сход сваіх выбаршчыкаў. Аднак вынікі выбараў былі адменены ўладамі.

Перамогу на выбарах у II Дзяржаўную Думу ад беларускіх губерняў атрымалі два блокі: з аднаго боку – саюз акцябрыстаў і правама-

нархічных (чарнасоценных) арганізацый (15 месцаў), з другога – аўтанамісты (11 месцаў). Левыя (народніцкія і сацыял-дэмакратычныя) партыі ў Беларусі пацярпелі паражэнне. Наогул жа па Расійскай імперыі вынікі выбараў прынцыпова адрозніваліся – левыя партыі і кадэты заваявалі большасць месцаў у Думе. Дума другога склікання аказалася больш радыкальнай, чым першая. Відавочна, што на сітуацыю ў Беларусі паўплываў нацыянальна-канфесійны фактар. Рускім і польскім нацыяналістычным арганізацыям пры дапамозе праваслаўнага і каталіцкага духавенства ўдалося больш паспяхова ўздзейнічаць на пазіцыі сельскіх выбаршчыкаў.

Дзейнасць Дзяржаўнай Думы другога склікання пачалася 20 лютага 1907 г. Галоўным у яе працы, як і ў Думе папярэдняга складу, стала аграрнае пытанне. Дэпутаты-аўтанамісты з Беларусі падтрымалі сваіх калег з Каралеўства Польскага, якія ўтварылі «Польскае кола» на чале з Р. Дмоўскім. Аўтанамісты па-ранейшаму звязвалі вырашэнне аграрнага пытання з атрыманнем шырокага мясцовага самакіравання. Нязгоду з імі выказвалі дэпутаты-сяляне з беларускіх, асабліва Мінскай, губерняў, якія з'яўляліся членамі «Рускага ўскраіннага саюза». Яны бачылі ў ініцыятывах аўтанамістаў імкненне падпарадкаваць уладзе польскіх землеўласнікаў праваслаўных сялян. Разам з тым сяляне-дэпутаты скардзіліся на малазямелле і лічылі неабходным дадаткова забяспечыць вясковых працаўнікоў зямлёй. Правыя дэпутаты з Беларусі не пагаджаліся таксама і з аграрнымі праектамі кадэтаў і трудавікоў, аднак іх пазіцыі не адлюстроўвалі настроі большасці сялянства.

Манархічныя партыі амаль з пачатку працы II Думы выказвалі незадаволенасць моцнымі пазіцыямі ў яе складзе левых партый і кадэтаў, патрабавалі яе роспуску і замены выбарчага закона. Вялікую актыўнасць у гэтым кірунку праяўляў «Рускі ўскраінны саюз».

## Рабочы, сялянскі і салдацкі рух вясной – летам 1906 г., змены ў іх дынаміцы і характары

Узмацненне рэпрэсіўных мерапрыемстваў з боку ўрада не спыніла рэвалюцыйнага руху, аднак значна яго аслабіла. Па закліку сацыял-дэмакратаў рабочыя 13 гарадоў і мястэчак Беларусі 9 студзеня 1906 г. адзначылі гадавіну рэвалюцыі палітычнымі забастоўкамі, у якіх прынялі ўдзел каля 23 тыс. чалавек. У некаторых гарадах і мястэчках адбы-

ліся вулічныя дэманстрацыі і мітынгі. У лютым і сакавіку 1906 г. назіраўся рэзкі спад рабочага руху. Адносна высокім заставаўся ўзровень сялянскага руху, аднак і ён у студзені 1906 г. у параўнанні з папярэднім месяцам знізіўся ўдвая, яшчэ больш – у лютым і сакавіку 1906 г.

У красавіку 1906 г. пачаўся новы ўздым рэвалюцыйнага руху. У 40 населеных пунктах Беларусі адбыліся першамайскія стачкі рабочых. Выступленні рабочых у большасці выпадкаў мелі наступальны характар, аднак актывізавалася перш за ўсё эканамічная барацьба, вылучаліся патрабаванні ўвядзення васьмігадзіннага працоўнага дня, павышэння заработнай платы, устанаўлення рабочага кантролю за наймам і звальненнем, аплаты забастовачнага часу і інш. Рабочы рух вясной і летам 1906 г. быў намнога слабейшым у параўнанні з адпаведным перыядам у 1905 г. Знізілася колькасць палітычных выступленняў, вулічныя дэманстрацыі наогул не праводзіліся.

У адпаведнасці з указам ад 4 сакавіка 1906 г. у Расійскай імперыі дазвалялася стварэнне прафесійных саюзаў наёмных работнікаў і служачых у прамысловасці і гандлі з мэтай абароны іх эканамічных інтарэсаў, паляпшэння ўмоў працы і побыту. Палітычная дзейнасць прафсаюзаў, а таксама стварэнне іх аб'яднанняў забараняліся. На практыцы афіцыйна зарэгістраваць прафесійную арганізацыю нават пасля выдання ўказа аказалася няпроста. У Магілёўскай і Гродзенскай губернях за 1906 г. ні адзін прафсаюз не атрымаў дазволу на дзейнасць. У той жа час у Віцебску ў чэрвені – ліпені 1906 г. пачалі легальную працу 13 прафесійных арганізацый. У Беларусі прафсаюзы дзейнічалі, як правіла, пад пэўным кантролем з боку РСДРП і Бунда.

У сялянскім руху ў маі – ліпені 1906 г. назіраўся ўздым, нават большы, чым за аналагічны час у 1905 г. Пашыранымі формамі руху былі забастоўкі падзёншчыкаў, збіццё прышлых работнікаў у панскіх маёнтках. У выніку барацьбы ўдалося дамагчыся ад памешчыкаў павелічэння падзённай аплаты ў сярэднім на 10–17 %. Больш актыўна, чым у 1905 г., у беларускай вёсцы гучалі палітычныя патрабаванні.

Антыўрадавая агітацыя вялася ў 1906 г. і ў гарнізонах Гродна, Брэста, Баранавічаў, Мінска, Гомеля і інш. Рэвалюцыйныя арганізацыі выдавалі адозвы да салдат, газеты «Солдатская доля», «Солдатская жизнь». Асаблівую актыўнасць праяўлялі мясцовыя групы РСДРП. Летам 1906 г. адбыліся хваляванні ў 2-й сапёрнай брыгадзе ў Гродне, 151-м пяхотным Пяцігорскім палку ў Картуз-Бярозе і інш.

## Беларускі нацыянальны рух у перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг., роля БСГ

Час рэвалюцыйных падзей стаў важным этапам самавызначэння і арганізацыйна-палітычнага сталення беларускага нацыянальнага руху, магчымасці непасрэднай агітацыі сярод шырокіх слаёў насельніцтва. Беларуская сацыялістычная грамада выступіла яго лідарам. Яна адразу адгукнулася на падзеі рэвалюцыі. У гэты перыяд у яе дзейнасці спалучаліся сацыяльныя і нацыянальныя матывы, аднак выразна дамінаваў сацыяльны кампанент. Ужо ў студзені 1905 г. БСГ выпусціла лістоўку «Царова жніво», у якой заклікала падтрымаць барацьбу пецярбургскіх рабочых. БСГ выступала за ліквідацыю самадзяржаўя і перадачу ўлады Канстытуцыйнаму сходу, выбранаму агульным, роўным і тайным галасаваннем. У сакавіку 1905 г. Грамада разам з эсэрамі арганізавала сялянскі з'езд, дэлегаты якога выказаліся за ўсенароднае ўзброенае паўстанне, пераход улады на тэрыторыі Беларусі да сейма-сходу народных прадстаўнікоў.

Вясной і летам 1905 г. БСГ актывізавала агітацыю сярод сялян, заклікала сельскагаспадарчых рабочых да забастовак. Акрамя таго, яна паступова пашырала сваю дзейнасць сярод рабочых прамысловых прадпрыемстваў, на якіх працавалі выхадцы з беларускай вёскі. У дні кастрычніцкай стачкі ў Мінску сярод рабочых працаваў І. Луцкевіч. У Вільні актыўна дзейнічала, выступала на мітынгах А. Пашкевіч (Цётка). Выдатным арганізатарам рэвалюцыйнай барацьбы праявіў сябе А. Бурбіс. У лістападзе – снежні 1905 г. пад яго кіраўніцтвам у Мейшагольскай воласці Віленскага павета была створана «Мейшагольская рэспубліка». А. Бурбіс самаахвярна збіраў сходы, дзе заклікаў сялян не выконваць распараджэнні ўлад, сілай адбіраць у памешчыкаў зямлю. «Мейшагольская рэспубліка» па распараджэнні губернатара была разагнана казакамі. Самому А. Бурбісу ўдалося пазбегнуць арышту.

У пачатку студзеня 1906 г. II з'езд БСГ перагледзеў праграму партыі, паводле якой БСГ заявіла сябе арганізацыяй працоўнай беднаты Беларускага краю без адрознення нацыянальнай прыналежнасці. Такім чынам, яна фактычна абвяшчалася інтэрнацыянальнай краёвай партыяй, а не выключна нацыянальнай беларускай. Вылучалася патрабаванне тэрытарыяльна-дзяржаўнай аўтаноміі ў складзе Расійскай Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі для Беларускага краю з сеймам

у Вільні. У чэрвені 1906 г. адбылася канферэнцыя БСГ, на якой былі разгледжаны пытанні арганізацыйна-тактычнай дзейнасці партыі, а таксама прынята рашэнне аб адмове ад магчымага аб'яднання з ППС на Літве.

У верасні – снежні 1906 г. БСГ выдавала свой першы перыядычны орган – газету «Наша доля». Афіцыйным рэдактарам-выдаўцом з'яўляўся І. Тукеркес, фактычна газету рэдагавалі браты Антон і Іван Луцкевічы, Цётка і Ф. Умястоўскі. Нягледзячы на завуаліраванасць падачы матэрыялу для пераадолення цэнзурных бар'ераў, па сваім змесце, ідэйнай сутнасці газета насіла рэвалюцыйна-дэмакратычны, антыўрадавы характар. Чатыры з шасці выдадзеных нумароў «Нашай долі» былі канфіскаваны, а ў студзені 1907 г. яе выданне забаронена ўладамі.

З лістапада 1906 г. кіраўнікі БСГ арганізавалі выданне новай штотыднёвай газеты «Наша ніва». У перадавым артыкуле першага нумара рэдакцыя абазначыла сваю праграмную пазіцыю, якая заключалася ў абароне нацыянальных інтарэсаў прыгнечанага беларускага народа і яго аб'яднанні на аснове нацыянальнай ідэі. Аднак шматлікія матэрыялы, апублікаваныя ў газеце, сведчылі аб тым, што рэдкалегія арыентавалася перш за ўсё на працоўныя масы народа. Ідэйныя пазіцыі «Нашай нівы» сталі дамінантнымі ў беларускім нацыянальным руху, шмат у чым вызначальнымі для фарміравання беларускай ідэнтычнасці.

У канцы 1906 – першай палове 1907 г. БСГ праводзіла нелегальную палітычную дзейнасць у абмежаваных памерах, у прыватнасці агітавала за свае ідэі сельскіх рабочых і сялян-падзёншчыкаў. Уплыў БСГ на рабочы рух у гарадах, за выключэннем Вільні і Мінска, амаль не адчуваўся. У падпольным выдавецтве «Грамада» ў Пецярбургу ў перыяд рэвалюцыі былі апублікаваны некалькі брашур рэвалюцыйна-дэмакратычнага зместу.

У ліпені 1906 г. у вёсцы Мікалаеўшчыне адбыўся нелегальны з'езд настаўнікаў Мінскай губерні, у якім актыўны ўдзел прыняў Якуб Колас. Удзельнікі з'езда вырашылі далучыцца да Усерасійскага саюза настаўнікаў, выказаліся за ўключэнне настаўнікаў у вызваленчую барацьбу з тым, каб «садзейнічаць хутчэйшаму падзенню самадзяржаўнага рэжыму». Прынялі зварот да настаўнікаў з заклікам уздзейнічаць на сялянства для яго прыцягнення да вызваленчага руху. З'езд быў выкрыты паліцыяй, а яго ўдзельнікі звольнены з пасад. Трое з іх, у тым ліку Я. Колас, трапілі пад суд.

На з'ездзе народных настаўнікаў у Вільні ў маі 1907 г. быў створаны Беларускі настаўніцкі саюз, які выказаўся за дэмакратызацыю школы і выкладанне на роднай мове. Аналагічныя патрабаванні высунуў таксама з'езд настаўнікаў Вілейскага павета ў ліпені 1907 г. У 1906 г. у Вільні была створана беларуская выдавецкая суполка «Наша хата», у Пецярбургу – выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца», якія зрабілі вельмі шмат для пашырэння нацыянальнай культурна-асветніцкай працы.

## Прычыны паражэння Першай расійскай рэвалюцыі і яе значэнне для Беларусі

У другой палове 1906 г. назіраўся спад рабочага руху, адбыліся толькі тры палітычныя стачкі. Эканамічная барацьба аднак працягвала быць выніковай, заканчвалася ў асноўным на карысць рабочых. У жніўні – верасні 1906 г. прыблізна напалову скарацілася колькасць сялянскіх выступленняў. Сярод іх пераважала такая форма, як падпалы панскіх сядзіб і гумнаў з сабраным ураджаем. У кастрычніку – снежні 1906 г. на тэрыторыі Беларусі адбылося толькі 16 сялянскіх выступленняў.

У пачатку 1907 г. паглыбіўся спад у рабочым руху. Палітычных выступленняў не было зафіксавана, выніковасць эканамічных знізілася. Прадпрымальнікі ўсё часцей аб'яўлялі лакаўты. Пры адхіленні іх патрабаванняў з боку рабочых закрывалі прадпрыемствы. У выніку расло беспрацоўе, зніжалася колькасць стачак і іх удзельнікаў. Толькі святкаванне 1 Мая выклікала хвалю аднадзённых забастовак.

У студзені – сакавіку 1907 г. было зафіксавана 39 сялянскіх выступленняў, у наступныя тры месяцы іх колькасць вырасла да 84. Большасць з гэтых выступленняў адбылася ў Гродзенскай і Мінскай губернях. У Магілёўскай і Віцебскай губернях сялянскі рух у 1907 г. практычна спыніўся. Знізілася колькасць забастовак падзёншчыкаў, сярод форм сялянскага пратэсту пераважалі парубкі лесу, выпас жывёлы на панскіх землях, адмовы ад выплаты падаткаў і інш. Прыкметна павялічылася колькасць падпалаў. Фактычна вёска вярнулася да ранейшых, дарэвалюцыйных форм пратэсту.

У 1907 г. назіраліся стомленасць і расчараванне шырокіх народных мас рэвалюцыйным рухам, яго вынікамі. Ва ўмовах спаду сацыяльных пратэстаў урад вырашыў распусціць Думу і змяніць без яе зго-

ды выбарчы закон. Прычынай гэтага стала немагчымасць наладзіць канструктыўнае ўзаемадзеянне паміж урадам, які ўзначальваў П. Сталыпін, і Думай. Апошняя адхіляла ўсе ўрадавыя законапраекты. Падставай для разгону Думы стала сфабрыкаванае ўрадам абвінавачанне фракцыі сацыял-дэмакратаў у змове супраць існуючага дзяржаўнага ладу. З гэтай нагоды была створана думская камісія. Аднак, не чакаючы яе высноў, 3 чэрвеня 1907 г. Мікалай II распусціў Думу і аднačасова насуперак палажэнням уласнага Маніфеста 17 кастрычніка, а таксама Асноўных законаў Расійскай імперыі змяніў выбарчы закон. Паводле Маніфеста ад 3 чэрвеня, права адмяняць выбарчыя законы і выдаваць новыя захоўвалася за імператарам. Гэта падзея апазіцыйнымі сіламі была расцэнена як дзяржаўны пераварот і стала завяршэннем рэвалюцыі. У сувязі з разгонам II Думы і змяненнем выбарчага закона 70 % губерняў Расійскай імперыі заставаліся ці былі аб'яўлены на становішчы «ўзмоцненай аховы».

Рэвалюцыя надала новы імпульс сацыяльным працэсам, пакінула адчувальны след у свядомасці шырокіх слаёў насельніцтва, выклікала змены ў дзяржаўна-палітычным уладкаванні Расійскай імперыі. Нягледзячы на абмежаванасць, былі ўведзены дэмакратычныя правы і свабоды, з'явіўся вопыт парламенцкай дзейнасці і палітычнай арганізацыі. Непасрэдным вынікам рэвалюцыйнай актыўнасці рабочых стала павелічэнне іх заработнай платы, скарачэнне працоўнага дня, зніжэнне штрафаў і ў канчатковым выніку з'яўленне сацыяльнага страхавання работнікаў. Былі легалізаваны прафсаюзы. Урад вымушаны быў пайсці па шляху рэфармавання вёскі, былі адменены некаторыя саслоўныя абмежаванні для сялянства. Гады паміж рэвалюцыяй і Першай сусветнай вайной вызначыліся хуткім сацыяльна-эканамічным ростам беларускіх губерняў. Уплыў рэвалюцыі закрануў і сацыяльна-культурную сферу: пашырыліся магчымасці камунікацыі, больш даступнымі для насельніцтва і запатрабаванымі сталі здабыткі культуры. У паслярэвалюцыйныя гады ў Беларусі, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы і абмежаванні для развіцця беларускай нацыянальнай культуры, імкліва расла колькасць школ, перыядычных выданняў, бібліятэк, з'явіўся кінематограф і інш.

Тэма 11

# СТАЛЫПІНСКІЯ РЭФОРМЫ Ў БЕЛАРУСІ

**Мэты і задачы правядзення аграрнай рэформы.**
**Скасаванне сельскай абшчыны. Пашырэнне хутароў і адрубоў.**
**Перасяленне сялян у азіяцкую частку Расійскай імперыі.**
**Далейшая спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.**
**Вынікі Сталыпінскай аграрнай рэформы для Беларусі.**
**Прычыны і мэты правядзення земскай рэформы ў беларускіх губернях, яе асаблівасці.**
**Значэнне ўвядзення земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях.**

## Мэты і задачы правядзення аграрнай рэформы

Аграрнае пытанне займала цэнтральнае месца ва ўнутранай палітыцы ўрада Расійскай імперыі. Змяншэнне сялянскіх надзелаў, асабліва ў выніку сямейных раздзелаў, абеззямельванне часткі сялян суправаджаліся імклівым ростам насельніцтва. Развіццё гарадоў, урбанізацыйныя працэсы не былі настолькі інтэнсіўнымі, каб кампенсаваць павелічэнне колькасці насельніцтва ў вёсцы. Мабілізацыя зямельных рэсурсаў, продаж памешчыцкіх зямель адста-

валі па сваіх памерах ад узрастаючай патрэбнасці ў забеспячэнні сялян зямлёй. Сітуацыя з павелічэннем шчыльнасці сельскага насельніцтва і змяншэннем яго забяспечанасці зямлёй сучаснікамі часта ўспрымалася як запусценне вёскі. Назіралася павелічэнне разрыву ў стандартах жыцця гарадскога насельніцтва і сялянства.

Цяжкая сітуацыя ў вёсцы, рост незадаволенасці сялянства сталі прадметам абмеркавання шэрагу ўрадавых нарад на мяжы XIX–XX стст., але не мелі пэўнага выніку. З вясны 1905 г. узмацніліся сялянскія хваляванні. У лістападзе 1905 г. у якасці тэрміновай меры расійскі ўрад адмяніў выкупныя плацяжы. На фоне ўзмацнення аграрных хваляванняў у сакавіку 1906 г. былі створаны землеўпарадкавальныя камісіі, аднак яны не мелі дастатковых і добра прадуманых паўнамоцтваў.

Сталыпінская аграрная рэформа стала збіральнай назвай для шырокага комплексу мерапрыемстваў у сферы сельскай гаспадаркі, якія праводзіліся ўрадам Расійскай імперыі пачынаючы з 1906 г. На рэформу ўрадавыя колы ўскладвалі вялікія надзеі. Асноўнымі яе кірункамі былі скасаванне абшчыны, перадача надзельных зямель ва ўласнасць сялян, землеўпарадкаванне сялянскіх гаспадарак праз ліквідацыю цераспалосіцы, заахвочванне стварэння сялянамі-ўласнікамі хутарскіх і водрубных гаспадарак, стымуляванне куплі сялянамі прыватнаўласніцкіх зямель, перш за ўсё памешчыцкіх, праз розныя аперацыі Сялянскага пазямельнага банка, арганізацыя агранамічнай дапамогі (асветніцкія мерапрыемствы, стварэнне ўзорных гаспадарак, паказальных хутароў, гандаль сельскагаспадарчым абсталяваннем і ўгнаеннямі) і інш. Прадугледжвалася таксама скасаванне састарэлых саслоўных грамадзянска-прававых абмежаванняў, якія перашкаджалі эфектыўнай гаспадарчай дзейнасці сялян. Рэформа мела фактычна дзве мэты: у кароткатэрміновай перспектыве – вырашэнне аграрнага пытання, перш за ўсё зямельнага, як прычыны масавай незадаволенасці і хваляванняў сельскіх жыхароў, у тым ліку праз перасяленні сельскіх жыхароў у Сібір і іншыя ўсходнія рэгіёны Расійскай імперыі, дзе было шмат слабазаселеных і неасвоеных зямель; у доўгатэрміновай – устойлівае развіццё сельскай гаспадаркі, інтэграцыя сялянства ў рыначную эканоміку.

Пачатак правядзення рэформы фактычна паклаў указ ад 9 лістапада 1906 г., які юрыдычна санкцыянаваў права выхаду сялян з абшчыны. Згодна з указам кожны селянін, які карыстаўся абшчыннай надзельнай зямлёй, мог патрабаваць яе замацавання ў асабістую ўлас-

насць. Выхад з абшчыны адбываўся на працягу месяца з часу падачы заявы рашэннем большасці агульнага сходу сялян-гаспадароў. Калі сельская грамада каму-небудзь такой згоды не давала, то дазвол на выхад з абшчыны мог даць земскі начальнік. Пры выхадзе з абшчыны за селянінам заставалася права карыстання землямі, якія заставаліся ў агульным уладанні: выганамі,ляснымі і іншымі ўгоддзямі. У кастрычніку 1908 г. указ ад 9 лістапада 1906 г. быў унесены на разгляд Дзяржаўнай Думы і пасля яе адабрэння зацверджаны ў новай рэдакцыі Мікалаем II у якасці Закона ад 14 чэрвеня 1910 г. Паводле новага закона для выхаду на хутары і адрубы ўжо не патрабавалася згода большасці сялян сельскай грамады. Дастаткова было дамовіцца з 1/5 яе часткай.

## Скасаванне сельскай абшчыны. Пашырэнне хутароў і адрубоў

Асноўнымі перашкодамі землеўпарадкавання індывідуальных зямельных гаспадарак на тэрыторыі беларускіх губерняў стала малазямелле сялянства, захаванне сервітутаў і наяўнасць цераспалосіцы. Справы па размеркаванні сервітутаў і ліквідацыі цераспалосіцы былі вельмі працяглымі па часе і не вырашаліся, пакуль зацікаўленыя бакі не прыходзілі да згоды.

Непасрэднай рэалізацыяй рэформы займаліся губернскія і павятовыя землеўпарадкавальныя камісіі, якія былі створаны паводле ўказа Сената ад 4 сакавіка 1906 г. У маі 1911 г. урадам была прынята пастанова, якая істотна пашырала правы землеўпарадкавальных камісій. Яны атрымалі магчымасць прымусова рассяляць на хутары і адрубы, не лічачыся з меркаваннем грамады. Вялікую практычную работу праводзілі каморнікі, у дапамогу якім прызначаліся межавыя тэхнікі. Значна садзейнічалі ажыццяўленню аграрнай рэформы земскія ўстановы.

Выхад з абшчыны стаў першым мерапрыемствам у працэсе рэалізацыі рэформы. У Беларусі сельская абшчына ў пачатку XX ст. працягвала існаваць у Віцебскай і Магілёўскай губернях, у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай яе практычна не было. Разбурэнне абшчыны на тэрыторыі Беларусі ішло больш хуткімі тэмпамі, чым у іншых рэгіёнах Расійскай імперыі. Найбольш інтэнсіўна гэты працэс адбываўся ў 1908–1909 гг. Да 1916 г. па Магілёўскай губерні з абшчыны выйшла

56,8 % сялян-абшчыннікаў, у Віцебскай – 28,9 %, у сярэднім па Расійскай імперыі – 22 %. Беларускія губерні належалі да тых рэгіёнаў Расійскай імперыі, дзе землеўпарадкавальныя работы адбываліся паскоранымі тэмпамі.

Хутары на тэрыторыі Беларусі ўяўлялі сабой аднадворныя сельскія паселішчы, калі на адасобленым участку зямлі знаходзілася ўся сялянская сядзіба або неабходная частка пабудоў і інвентару. Водруб уяўляў сабой адасоблены зямельны ўчастак, які выдзяляўся з абшчыннай зямлі ў асабістую сялянскую ўласнасць, але, у адрозненне ад хутароў, без пераносу сядзібы з вёскі на ўчастак. Адрубы мелі меншае распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі, чым хутары. Вытокі стварэння хутарскіх гаспадарак на тэрыторыі Беларусі адносяцца да часу правядзення валочнай памеры. Непасрэднае пашырэнне яны атрымалі ўжо пасля адмены прыгоннага права, асабліва на мяжы XIX–XX стст.

У Мінскай губерні ў выніку рэалізацыі аграрнай рэформы было створана 65 паказальных хутароў і звыш 1600 паказальных участкаў. Для сялян арганізоўваліся экскурсіі, вялася прапаганда передавога вопыту праз газеты і часопісы. Будаваліся сельскагаспадарчыя склады, пракатныя зернеачышчальныя пункты, племянныя расаднікі жывёлы, пункты ветэрынарнай дапамогі, арганізоўваліся сельскагаспадарчыя, спажывецкія, малочныя кааператыўныя таварыствы і суполкі. У 1914 г. на тэрыторыі Мінскай губерні дзейнічалі 87 зернеачышчальных пунктаў і машынапракатных станцый, у Віленскай – 190. Сялянскім гаспадаркам аказвалася грашовая дапамога на агранамічныя мэты і тэхнічнае забеспячэнне. Для сялян арганізоўваліся курсы і лекцыі па пытаннях выкарыстання шматпольнага севазвароту, удасканаленай тэхнікі і ўгнаенняў, палепшаных сартоў насення і інш. Да 1906 г., напрыклад, у Віцебскай губерні не было ніводнага земляробчага таварыства і гурткоў. У 1913 г. тут ужо працавалі 20 сельскагаспарчых таварыстваў і 122 гурткі.

У кожнай з губерняў вылучаліся свае мясцовыя асаблівасці мабілізацыі індывідуальнай зямельнай уласнасці сялян. У Магілёўскай губерні па колькасці створаных хутароў і адрубоў вылучаўся Аршанскі павет, у Мінскай – Рэчыцкі і Бабруйскі паветы, у Гродзенскай – Брэсцкі, Кобрынскі і Слонімскі паветы.

У выніку рэалізацыі Сталыпінскай аграрнай рэформы на працягу 1907–1916 гг. на тэрыторыі беларускіх губерняў на сялянскай надзельнай зямлі было створана 113,8 тыс. хутароў і адрубоў агульнай плошчай 1147,2 тыс. дзесяцін зямлі. Гэта складала 10 % ад агульнай колькасці ся-

лянскіх двароў і 18,7 % плошчы надзельнага землеўладання беларускіх губерняў. Акрамя таго, значную дапамогу ў рэалізацыі аграрнай рэформы аказаў Сялянскі пазямельны банк, які для стварэння хутароў і адрубоў прадаў 228,7 тыс. дзесяцін уласных зямель. На гэтых угоддзях узнікла 13,5 тыс. гаспадарак. Сялянскім пазямельным банкам у 1907–1910 гг. было прададзена пад стварэнне хутарскіх гаспадарак у Віленскай губерні 66 % ад усёй рэалізаванай банкам зямлі, у Віцебскай – 69,2 %, Гродзенскай – 59,4, Мінскай – 74,7, Магілёўскай – 73,7 %. Сялянам была прададзена ў гэты час параўнальна невялікая колькасць казённай зямлі (5,4 тыс. дзесяцін), што дало магчымасць для стварэння 813 хутароў і адрубоў. Усяго на тэрыторыі беларускіх губерняў узнікла 128,1 тыс. адрубоў і хутароў. Тут удзельная вага сялянскіх гаспадарак, якія выйшлі на хутары і адрубы, была некалькі вышэй, чым у сярэднім па Расійскай імперыі. Працэс іх стварэння на тэрыторыі Беларусі быў больш просты і хуткі ў сувязі з распаўсюджанасцю тут падворнага сялянскага землеўладання. У той жа час варта адзначыць, што больш за 60 % усіх хутароў і адрубоў, створаных на тэрыторыі беларускіх губерняў у 1907–1910 гг., прыходзілася на долю Віцебскай і Магілёўскай губерняў.

Паралельна частка сялян, пераважна ўладальнікі дробных гаспадарак, прадавалі замацаваную за імі зямлю. У 1907–1914 гг. было прададзена 16,3 % усёй хутарской і водрубнай зямлі. У сярэднім на аднаго прадаўца прыпадала каля 4,6 дзесяціны зямлі.

Адной з важнейшых частак рэалізацыі Сталыпінскай аграрнай рэформы сталі марапрыемствы па вогнеўстойлівым будаўніцтве ў вёсках з мэтай стварэння перашкод ад спусташальных пажараў, якія былі нярэдкай з'явай і наносілі адчувальны ўрон. Толькі ў Мінскай губерні ў 1909 г. адбылося 1048 пажараў, у 1911 г. – 1047, 1912 г. – 846. Агульны кошт матэрыяльных страт ад іх склаў 4825 тыс. руб. На практыцы ў сувязі з вогнеўстойлівым будаўніцтвам выдаваліся грашовыя пазыкі для яго рэалізацыі, наладжвалася вытворчасць адпаведных будаўнічых матэрыялаў, з мэтай асветы арганізоўваліся чытанні і курсы. Вогнеўстойлівае будаўніцтва, напрыклад, у Мінскай губерні на працягу 1906–1912 гг. было праведзена ў 769 населеных пунктах. Перш за ўсё, узводзіліся вогнеўстойлівыя дахі. Зрухі з вогнеўстойлівым будаўніцтвам назіраліся таксама ў Віленскай і Гродзенскай губернях. У верасні 1908 г. у Гродне былі адкрыты курсы для падрыхтоўкі інструктараў сельскага вогнеўстойлівага будаўніцтва, колькасць навучэнцаў на якіх дасягала 150 чалавек. Арганізоўваліся курсы, на якіх вучылі вырабу чарапіцы, цэглы, пабудове глінабітных дамоў і інш.

У рамках Сталыпінскай аграрнай рэформы былі прыняты дадатковыя меры для правядзення гідратэхнічных работ, якія з 1909 г. рэалізоўваліся на сялянскіх землях, выдзеленых пад хутарскія гаспадаркі, за кошт дзяржавы. Будаваліся асушальныя каналы, вадасцёкі, масты, студні.

Вялікую ролю ў мабілізацыі зямельнай уласнасці, арганізацыі яе куплі-продажу, у тым ліку пад хутарскія гаспадаркі, адыграў Сялянскі пазямельны банк. На працягу 1908–1915 гг. у беларускіх губернях банк выдаў пазыкі 71 805 гаспадарам на агульную суму 32,6 млн руб. Часта ва ўзаемадзеянні з земскімі органамі самакіравання аддзяленні Сялянскага пазямельнага банка выдзялялі грашовыя сродкі на арганізацыю паказальных хутароў, аказанне агранамічнай дапамогі сялянам, стварэнне сельскагаспадарчых складоў, забеспячэнне вясковых жыхароў новай сельскагаспадарчай тэхнікай і палепшаным угнаеннем, арганізоўвалі бясплатныя чытанні з мэтай пашырэння агранамічных ведаў. Сялянскі пазямельны банк нават распрацаваў сістэму ільгот, якая выкарыстоўвалася пры выдачы і вяртанні грашовых пазык для сялянскіх гаспадарак.

## Перасяленне сялян у азіяцкую частку Расійскай імперыі. Далейшая спецыялізацыя сельскай гаспадаркі

Адным з важнейшых кірункаў рэалізацыі аграрнай рэформы стала мэтанакіраванае перасяленне часткі сялян у Сібір, на Далёкі Усход, у Казахстан, на Каўказ, у Сярэднюю Азію і іншыя ўскраінныя рэгіёны імперыі. Расійская ўрадавая палітыка ў перасяленчым пытанні ў гэты час была скіравана на павелічэнне перасяленняў, а адміністрацыйнае рэгуляванне хвалі міграцыі мела мэту замацавання навасёлаў у Сібіры. У перыяд рэалізацыі Сталыпінскай рэформы ставілася задача засялення Сібіры добрымі гаспадарамі. Змены ўрадавай палітыкі адбываліся ў тым ліку пад уплывам геапалітычных фактараў, звязаных з неабходнасцю замацавання за Расіяй далёкаўсходніх ускраін, куды адбывалася самавольнае пранікненне кітайскіх, карэйскіх і японскіх перасяленцаў. Арганізацыя пераезду перасяленцаў была дасканала прадумана.

Галоўнае ўпраўленне землярobства і землеўладкавання сваім цыркулярам ад 4 жніўня 1907 г. устанавіла правілы больш выніковага накіравання хадакоў і перасялення сялян на ўскраіны імперыі. Рэкамен-

давалася пасылаць хадакоў ад той грамады, дзе планавала перасяліцца не менш за 10 сямей. Для больш трывалага замацавання перасяленцаў на новым месцы лічылася мэтазгодным ствараць пасёлкі з людзей, якія паходзілі з адной мясцовасці. У той жа час магілёўскі губернатар сваім цыркулярам ад 23 сакавіка 1907 г. абавязваў земскіх начальнікаў тлумачыць сельскім жыхарам неабходнасць крайне асцярожна адносіцца да перасяленняў, паколькі, нягледзячы на ўрадавыя тарыфныя льготы, іх чакалі значныя ўласныя грашовыя выдаткі, звязаныя з пераездам і ўладкаваннем. У верасні 1911 г. Перасяленчым упраўленнем МУС у Вільні было створана Даведачнае рабочае бюро, якое распаўсюдзіла сваю дзейнасць на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую і Ковенскую губерні. Бюро павінна было садзейнічаць перасяленням, сезоннаму найму на працу мясцовага насельніцтва на Далёкім Усходзе. Перасяленчае ўпраўленне 22 лютага 1913 г. звяртала ўвагу на неабходнасць ільготнай перавозкі на Далёкі Усход спецыялістаў, рамеснікаў, якія пажадаюць перасяліцца, паколькі ў іх адчувалася вострая патрэба. Яно рыхтавала прапагандысцкія матэрыялы для мігрантаў. Папулярызацыі перасяленняў у Сібір служыла выпушчаная ў Мінску ў 1907 г. земскім начальнікам І. Струкоўскім «Кніжка для сялян аб тым, як па-сапраўднаму трэба перасяляцца ў Сібір».

У ліпені 1907 г. была апублікавана нататка аб перасяленні ў Сібір сямі гаспадароў з вёскі Кабыльшчызны Барысаўскага павета. Спачатку яны як хадакі замацавалі за сабой зямельныя ўчасткі ў Сібіры, а на наступны год выехалі на новае месца разам з сем'ямі, распрадаўшы сваю зямлю і маёмасць. Дарога была цяжкай, у час пераезду яны пахавалі палову дзяцей. Прыбыўшы на новае месца, перасяленцы даведаліся, што іх землі ўжо перададзены іншым гаспадарам. Толькі патраціўшы шмат часу, удалося атрымаць іншыя ўчасткі, але значна горшыя. Арганізаваць на іх гаспадарку не ўдалося, і ўсе сем гаспадароў вярнуліся на радзіму, але тут абсалютна не мелі сродкаў для існавання. У карэспандэнцыях «Нашай нівы» нярэдка адзначалася, што ў Сібіры перасяленцам з Беларусі нялёгка, многія вяртаюцца праз год і больш. Атрымаць лепшы ўчастак зямлі можна было нярэдка праз «падзяку» мясцовым чыноўнікам.

Перасяленні ў Сібір былі больш пашыраны ва ўсходніх раёнах Беларусі. З Гродзенскай губерні ў 1905–1914 гг. на ўсход Расійскай імперыі выехалі 14 434 чалавекі, з Віленскай – 17 817 чалавек, Мінскай – 66 652, Віцебскай – 89 647, з Магілёўскай – 166 246 чалавек. У 1908 г.

Магілёўская губерня выйшла на другую пазіцыю ў Расійскай імперыі па колькасці перасяленцаў у Сібір (48 638 чалавек) пасля Палтаўскай (53 657 перасяленцаў). Віцебская (24 465 перасяленцаў) і Мінская (21 285 перасяленцаў) губерні займалі адпаведна дзясятую і дванаццатую пазіцыі. Астатнія беларускія губерні далі менш чым па 4 тыс. перасяленцаў кожная. У 1909–1913 гг. з беларускіх губерняў на ўскраіны Расійскай імперыі накіраваўся 25 951 перасяленец, а таксама 4396 хадакоў. За гэты час вярнулася на радзіму па розных прычынах, найперш з-за няўдалых спроб уладкавацца на новым месцы, 5406 перасяленцаў (20,8 % ад ліку перасяліўшыхся) і 3451 хадок (78,5 % ад колькасці хадакоў за абазначаны час). Для параўнання: з еўрапейскай часткі Расійскай імперыі ў гэты ж час на ўсход краіны накіраваліся 301 944 перасяленцы і 61 220 хадакоў, вярнуліся на радзіму 80 602 перасяленцы (26,7 %) і 44 044 хадакі (71,9 %). Беларускія губерні сумарна па колькасці перасяленцаў саступалі Палтаўскай губерні і складалі па ўдзельнай вазе 8,6 % ад агульнай перасяленчай плыні з еўрапейскай часткі Расійскай імперыі.

## Вынікі Сталыпінскай аграрнай рэформы для Беларусі

Пад уплывам рэформы адбыліся заўважныя зрухі ў развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі. Замацаванне ў выніку Сталыпінскай аграрнай рэформы за сялянамі права прыватнай уласнасці на зямлю спрыяла інтэнсіфікацыі земляробства. Акрамя таго, значна вырасла прымяненне сельскагаспадарчых машын і палепшанага абсталявання, павялічылася вытворчасць працы, паскорылася развіццё гандлёвага земляробства, паглыбілася спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Пашырылася выкарыстанне шматпольнага севазвароту, ужыванне штучных угнаенняў, дасягненняў аграномічнай навукі. Сталыпінская аграрная рэформа садзейнічала мабілізацыі зямельнай уласнасці, больш свабоднай яе куплі-продажу. Павялічыліся тэмпы скарачэння дваранскага землеўладання.

Сталыпінская аграрная рэформа, якая значна паглыбіла дух прадпрымальніцтва ў вёсцы, прымусіла землеўласнікаў пераўладкоўваць свае гаспадаркі з улікам зменлівай рыначнай кан'юнктуры. Аднак многія з іх не адчувалі магчымасці ці неабходнасці праводзіць рэарганізацыю сваіх маёнткаў на гандлёва-прамысловых пачатках, што

павялічвала іх запазычанасць, неканкурэнтаздольнасць і паскарала ліквідацыю зямельных уладанняў. У 1905–1910 гг. аб'ёмы продажу зямельных угоддзяў у беларускіх губернях павялічыліся на 77,3 %. За гэты час аб'ёмы дваранскага саслоўнага землеўладання скараціліся на 7,2 %. Працэсы мабілізацыі землеўладання асабліва паскорыліся ў 1911–1914 гг. З пераходам сялян на хутары былі павялічаны плошчы пад пасевы траў і караняплодаў, а разам з тым палепшана малочная жывёлагадоўля. Вырошчванне садавіны ў заможных сельскіх гаспадароў набыло гандлёвы характар. Напрыклад, у 1914 г. у Магілёўскай губерні было нямала хутароў, сады пры якіх займалі 2–3 дзесяціны. Аднак меншае пашырэнне сярод сялян на хутарах атрымаў выраб таварнай гародніны.

Правядзенне Сталыпінскай аграрнай рэформы паскорыла стварэнне кааператыўных таварыстваў – сельскагаспадарчых, крэдытных і пазыкова-ашчадных кас і інш. У беларускіх губернях напярэдадні Першай сусветнай вайны налічвалася звыш 900 кааператыўных устаноў рознага тыпу.У выніку рэформы ў Беларусі назіраўся рост таварнасці сялянскай гаспадаркі.

Значную ролю ў рэалізацыі Сталыпінскай аграрнай рэформы адыгралі земскія ўстановы, якія дапамагалі ў арганізацыі агранамічнай падтрымкі сялянства, забяспечвалі новай тэхнікай, стваралі сельскагаспадарчыя склады, займаліся будаўніцтвам і інш.

## Прычыны і мэты правядзення земскай рэформы ў беларускіх губернях, яе асаблівасці

Земская рэформа, якая была праведзена ў 1864 г. у Расійскай імперыі, не мела пашырэння на тэрыторыі беларускіх губерняў. Толькі ў 1903 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях былі створаны ўпраўленні па справах земскай гаспадаркі. Новаўтвораныя ўстановы мелі асноўныя функцыі земскіх органаў, аднак былі пазбаўлены выбарнасці. Дадзеныя ўпраўленні займаліся пераважна пытаннямі аховы здароўя і народнай асветы, а таксама нярэдка сацыяльнай дапамогі насельніцтву. Установы дзейнічалі да 1911 г., калі Палажэннем ад 14 сакавіка 1911 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях былі ўведзены выбарныя земствы. Для гэтага Мікалаю II па патрабаванню П. А. Сталыпіна давялося на тры дні распусціць Дзяржаўную Думу

і Дзяржаўны Савет і прыняць адпаведны закон у надзвычайным парадку. Нягледзячы на тое што ўпраўленні па справах земскай гаспадаркі займаліся пытаннямі арганізацыі пераходу да працы новых выбарных установ, пераемнасці ў іх дзейнасці практычна не захавалася.

Рэвалюцыйныя падзеі 1905 г., як адзначалася вышэй, сталі каталізатарам распрацоўкі праектаў рэформ у Расійскай імперыі. Закранулі яны і пытанні мясцовага самакіравання. П. А. Сталыпін, які ўзначаліў Савет Міністраў, лічыў магчымым пашырыць кампетэнцыі земскіх органаў самакіравання, у тым ліку распаўсюдзіўшы іх дзейнасць на заходнія губерні. У верасні 1905 г. пры віленскім генерал-губернатары пачала працаваць камісія аб увядзенні земскіх установ у Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях. Члены камісіі адзначалі, што стварэнне ўпраўленняў па справах земскай гаспадаркі ўзору 1903 г. аказалася няўдалым і не апраўдала сябе. Камісія прапанавала тэрмінова ўвесці ў заходніх губернях выбарныя земствы, якія павінны былі ўлічваць мясцовыя асаблівасці краю. Аднак такія меркаванні не адпавядалі ўрадавым уяўленням аб земствах і ў чарговы раз пераканалі ўлады ў нясвоечасовасці правядзення тут рэформы мясцовага самакіравання.

Да пытання аб увядзенні выбарных земстваў у заходніх губернях урадавыя колы Расійскай імперыі звярнуліся непасрэдна ў 1909 г., калі абмяркоўваўся праект змен у парадку выбараў у Дзяржаўны Савет ад заходніх губерняў. Прычынай гэтага стала сітуацыя, калі ў сувязі з адсутнасцю выбарных земстваў у заходніх губернях выбары ў Дзяржаўны Савет праводзілі дваранскія сходы, дзе колькасна пераважалі католікі, «асобы польскага паходжання». Меркавалася, што з увядзеннем выбраных на аснове нацыянальных курый земстваў удасца пазбавіцца ад празмернага польскага прадстаўніцтва. Для забеспячэння перавагі асоб рускага паходжання замест саслоўных уводзіліся нацыянальныя курыі. Да «рускай» курыі было аднесена праваслаўнае беларускае сялянства, і такім чынам забяспечвалася яе перавага на выбарах. У Віленскай і Гродзенскай губернях не толькі дваранства, але і сялянства ў значнай ступені былі католікамі. Гэта давала тут перавагу «польскай» курыі і стала прычынай пазбаўлення названых губерняў выбарных земстваў.

Земскія ўстановы ствараліся на губернскім і павятовым узроўнях. Асобным пунктам Палажэння 1911 г. губернскі горад Мінск вылучаўся ў самастойную адзінку земскага самакіравання. Апарат земстваў складаўся з распарадчых і выканаўчых органаў. Распарадчым органам гу-

бернскага і павятовага земства быў земскі сход, выканаўчым – земская ўправа. Земскі павятовы сход складаўся з галосных, якія выбіраліся павятовым выбарчым сходам і валаснымі сходамі, прадстаўніка ведамства землеўладкавання і земляробства, дэпутата ад духоўнага ведамства, гарадскога галавы, інспектара сельскай гаспадаркі. Губернскі земскі сход складаўся з галосных, якія выбіраліся павятовымі земскімі сходамі з ліку галосных гэтых сходаў, павятовых прадвадзіцеляў дваранства, старшынь павятовых земскіх упраў, прадстаўнікоў духоўнага ведамства, упраўлення землеўладкавання і земляробства. У беларускіх губернях у склад губернскіх земскіх сходаў уваходзіў таксама кіраўнік аддзялення Сялянскага пазямельнага банка.

Земскія сходы збіраліся звычайна раз у год, калі не было надзвычайных абставін. Яны абіралі на тры гады земскія ўправы, зацвярджалі земскі бюджэт, размяркоўвалі земскія павіннасці, вызначалі памер земскіх збораў, наладжвалі мясцовыя выставы, накіроўвалі ўраду праз губернатараў хадайніцтвы аб мясцовых патрэбах і інш. Праца і працягласць земскіх сходаў рэгламентаваліся: губернскі сход мог працаваць не больш за 20 дзён, павятовы – 10 дзён. Губернскія земскія сходы адкрываліся і закрываліся асабіста губернатарам, павятовыя – мясцовым прадвадзіцелем дваранства. Іх пастановы перадаваліся губернатару, частка з іх ім жа і зацвярджалася, частка – міністрам унутраных спраў. Да іх афіцыйнага зацвярджэння пастановы не маглі прымацца да выканання. Калі губернатар не зацвярджаў пастанову земскага сходу, пытанне перадавалася на разгляд губернскай па земскіх і гарадскіх справах прысутнасці. Калі большасць членаў прысутнасці пагаджаліся з губернатарам, пастанова лічылася несапраўднай, калі не – канфліктную сітуацыю разбіраў міністр унутраных спраў.

Паўсядзённай працай на пастаяннай аснове займаліся земскія ўправы. Старшыню губернскай управы зацвярджаў міністр унутраных спраў, павятовай – губернатар. Указам ад 14 сакавіка 1911 г. прадугледжвалася, што ў заходніх, у тым ліку беларускіх, губернях старшыня і не менш за палову членаў земскіх упраў павінны былі быць асобамі рускага паходжання. Акрамя таго, абмяжоўвалася прадстаўніцтва ад сялян і павялічвалася – ад праваслаўнага духавенства. Земскія ўправы займаліся пытаннямі развіцця адукацыі, сістэмы аховы здароўя, харчовага забеспячэння, будаўніцтвам і рамонтам мясцовых дарог, пашырэннем агранамічных ведаў, паляпшэннем саматужнай вытворчасці, арганізацыяй пазямельнага крэдыту і земскай статыстыкі, кіравалі мясцовымі дабрачыннымі ўстановамі і інш.

## Значэнне ўвядзення земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях

Галосныя і служачыя земстваў беларускіх губерняў успрымалі іх дзейнасць як працу гаспадарча-эканамічнага органа, які павінен быў вырашаць мясцовыя праблемы. Гэтым яны адрозніваліся ад прадстаўнікоў земстваў цэнтральных расійскіх губерняў, што разглядалі свае функцыі пераважна як дзейнасць грамадска-палітычных устаноў і шмат часу праводзілі ў дыскусіях на адпаведныя тэмы. Адным з важнейшых кірункаў дзейнасці земстваў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў стала арганізацыя агранамічнай дапамогі сельскім жыхарам. У 1912 г. у Мінску былі створаны месячныя сельскагаспадарчыя курсы, а таксама адкрыты сельскагаспадарчы музей. У 1914 г. мінскім земствам былі арганізаваны экскурсіі сялян у Данію і Швецыю з мэтай азнаямлення з вопытам земляробчай працы. У 1913 г. пры Мінскай губернскай земскай управе было арганізавана культурна-гідратэхнічнае бюро з мэтай правядзення меліяратыўных работ. У 1912 г. па ініцыятыве земства ў Віцебску былі адкрыты курсы па ільнаводстве. У гэты час ствараліся сельскагаспадарчыя земскія склады, зернеачышчальныя пункты, машынапракатныя станцыі, сельскагаспадарчыя таварыствы, пашыраўся кааператыўны рух.

Ад трэцяй часткі да паловы сваіх бюджэтаў земскія ўстановы беларускіх губерняў трацілі на развіццё адукацыі. У 1914 г. Мінскае губернскае земства выступіла з ініцыятывай адкрыцця настаўніцкіх семінарый у Бабруйску, Барысаве, Пінску, а таксама сельскагаспадарчага інстытута ў Мінску. Пры падтрымцы земства ў Мінску быў адкрыты настаўніцкі інстытут. У Віцебску ў 1913 г. пачалі працу ветэрынарна-заалагічны музей і ветэрынарная бактэрыялагічная лабараторыя. Земскія ўстановы пакінулі значны след у навуковым вывучэнні эканомікі краю, займаліся публікацыяй статыстычных матэрыялаў аб становішчы сялянскіх гаспадарак губерняў. Яшчэ больш роля земстваў узрасла ў перыяд Першай сусветнай вайны, асабліва ў арганізацыі дапамогі пацярпелым ад ваенных дзеянняў.

Тэма 12

# ЭКАНАМІЧНАЕ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ БЕЛАРУСІ Ў 1907–1914 гг.

**Уздым прамысловасці. Рост канцэнтрацыі вытворчасці.**
**Сельская гаспадарка. Сацыяльныя зрухі ў вёсцы.**
**Выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. і асаблівасці яго ажыццяўлення ў Беларусі.**
**Ліберальны рух. Аслабленне рэвалюцыйных партый і арганізацый.**
**Дынаміка і характар рабочага і сялянскага рухаў.**
**Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў час выбараў у III і IV Дзяржаўную Думу, дзейнасць дэпутатаў ад беларускіх губерняў.**
**Беларускі нацыянальны рух. «Наша ніва».**

## Уздым прамысловасці. Рост канцэнтрацыі вытворчасці

Пасля прамысловага крызісу пачатку XX ст. выразна прасочвалася тэндэнцыя пашырэння перапрацоўкі сыравіны, якая раней пастаўлялася на продаж у неапрацаваным выглядзе, актывізавалася развіццё дрэваапрацоўкі. З 1910 г. пачаўся інтэнсіўны пад'ём прамысловай вытворчасці Беларусі, калі прырост аб'ёму вырабляемай пра-

дукцыі быў у 1,9 раза вышэй, чым за папярэдні васьмігадовы перыяд. У 1908–1913 гг. сярэднегадавы прырост прамысловай вытворчасці Беларусі складаў каля 14 %. Нягледзячы на імклівы эканамічны рост, удзельная вага прамысловай вытворчасці беларускіх і літоўскіх губерняў у агульнай суме прамысловай вытворчасці Расійскай імперыі за 1908–1912 гг. зменшылася з 1,9 да 1,7 %. На тэрыторыі беларускіх і літоўскіх губерняў, паводле даных прамысловага перапісу 1908 г., знаходзілася 9,9 % цэнзавых прамысловых прадпрыемстваў Расійскай імперыі, на якіх працавала 2,6 % занятых тут рабочых і выраблялася 2,2 % прадукцыі.

У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. узровень развіцця прамысловасці ў заходніх раёнах Беларусі быў вышэйшым, чым ва ўсходніх. Аб'ём выработанай прадукцыі на душу насельніцтва ва ўсходняй частцы Беларусі на 34,6 % быў ніжэйшым, чым у заходняй. У пачатку XX ст. тэмпы развіцця прамысловасці ва ўсходняй частцы Беларусі былі значна большымі, і перад пачаткам Першай сусветнай вайны ўзровень развіцця ў абедзвюх частках Беларусі прыкладна зраўняўся.

Гады паміж рэвалюцыяй 1905–1907 гг. і Першай сусветнай вайной сталі часам імклівых перамен у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі. Завяршэнне да пачатку XX ст. прамыслова-тэхнічнага перавароту знайшло працяг у далейшай тэхнічнай мадэрнізацыі фабрычна-заводскай вытворчасці. Ва ўсіх галінах прамысловасці адбываўся рост энергаўзбраення праз выкарыстанне паравых, электрычных машын, рухавікоў унутранага згарання.

За 1908–1913 гг. у Беларусі на 27,2 % павялічылася колькасць буйных (цэнзавых) прадпрыемстваў, аб'ём вытворчасці на іх за гэты час вырас на 67,5 %. Паралельна імпульс да росту выявіла і дробная вытворчасць, якая арыентавалася перш за ўсё на мясцовага спажыўца і была звязана галоўным чынам са сферай абслугоўвання і вырабам тавараў масавага спажывання. Колькасць рамесна-саматужных прадпрыемстваў Беларусі ў 1908–1913 гг. павялічылася на 25,4 %, аб'ём вытворчасці на іх – на 43,1 %, аднак удзельная вага ў прамысловасці знізілася з 49,6 да 47,3 %.

У 1908–1914 гг. прыкметна павялічылася роля акцыянернага капіталу. Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў Беларусі дзейнічалі 34 акцыянерныя прадпрыемствы, палова з іх узнікла ў 1908–1914 гг. Праз акцыянерны капітал у эканоміку Беларусі ішлі замежныя інвестыцыі. У прыватнасці, бельгійскім таварыствам належалі віцебскі трамвай і льнопрадзільная фабрыка «Дзвіна». Французскі капітал валодаў шоў-

какруцільнымі фабрыкамі ў Мінску. Буйная нямецкая фірма «Фрыц Шульц» пабудавала ў Бабруйскім павеце лесапільна-фанерны завод, дзе працавалі больш за 400 рабочых. Нямецкі капітал заўважны быў у дрэваапрацоўцы. Аб'ём вытворчасці на прадпрыемствах, якія належалі замежным, змешаным па ўласнасці акцыянерным таварыствам, замежным грамадзянам, павялічыўся ў 11,6 раза. Нярэдка нават дробныя прадпрыемствы ў гарадах і мястэчках Беларусі, асабліва харчасмакавай галіны вытворчасці, належалі замежным грамадзянам.

Трэцяя частка валавой прадукцыі прамысловасці Беларусі прыпадала на лесанарыхтоўчую і дрэваапрацоўчую галіны. Паралельна з вывазам лясной сыравіны ў сырым выглядзе імкліва і найбольш дынамічна развівалася шматгаліновая перапрацоўка драўніны. Да ліку параўнальна развітых належала кардонна-папяровая вытворчасць. Найбольш буйнымі ў гэтай галіне былі Добрушская і Шклоўская папяровыя фабрыкі. З 1902 г. у Гродне дзейнічала акцыянернае таварыства па вырабе канторскіх кніг. Наогул у Беларусі выраблялася 4,5 % папяровай прадукцыі Расійскай імперыі.

Значнага развіцця ў Беларусі дасягнула запалкавая вытворчасць, у якой пануючае становішча займаў буйны капітал. Запалкавыя фабрыкі дзейнічалі ў Пінску, Мазыры, Барысаве, Слоніме, Бабруйску і інш. У агульным аб'ёме запалкавай вытворчасці Расійскай імперыі 12 % належала беларускім прадпрыемствам. На долю мясцовых вытворчасцей прыпадала 18 % прадукцыі лесахімічнай прамысловасці Расійскай імперыі. Адным з буйнейшых быў Выдрыцкі завод сухой перагонкі драўніны ў Аршанскім павеце. Узнікалі таксама і спецыялізаваныя фабрыкі і асобныя цэхі па вырабе фанеры.

У гады імклівага прамысловага ўздыму напярэдадні Першай сусветнай вайны ўзмацніўся прыток капіталаў у вытворчасць будаўнічых матэрыялаў. Акцыянерным таварыствам «Валынь» быў пабудаваны цэментны завод у Ваўкавыскім павеце. Створаны акцыянернае таварыства кафляна-маёлікавых заводаў у Віцебску, акцыянернае таварыства цагельных заводаў у Гомелі і інш.

За 1908–1913 гг. на 30 % павялічыўся аб'ём вытворчасці на чыгуначных майстэрнях. Акрамя таго, на металаапрацоўчых прадпрыемствах Беларусі ў 2,4 раза вырасла вытворчасць цвікоў, дроту, нескладаных сельскагаспадарчых машын, абсталявання і інш. Металаапрацоўчая вытворчасць Беларусі выкарыстоўвала прывазную сыравіну, аднак попыт на прадукцыю быў настолькі вялікі, што выдаткі цалкам акупляліся. Асабліва вялікае значэнне тут набыла вытворчасць прадметаў

бытавога прызначэння. У гады прамысловага ўздыму ўзнікла фабрычная вытворчасць шпалераў у Мінску. Чатыры мясцовыя прадпрыемствы ў 1912 г. давалі 14,5 % прадукцыі шпалераў ва ўсёй Расійскай імперыі. Новай з'явай у прамысловым развіцці Беларусі стала імклівае развіццё перапрацоўкі льну. Буйныя льнопрадзільныя прадпрыемствы дзейнічалі ў Віцебску і Аршанскім павеце.

У пачатку XX ст. у прамысловай вытворчасці Беларусі з'явіліся манапалістычныя аб'яднанні і сіндыкаты. У 1905 г. быў створаны сіндыкат кафельных заводчыкаў у Копысі, у 1906 г. – сіндыкат піваварных заводчыкаў Паўночна-Заходняга краю ў Оршы, у 1911 г. – сіндыкат «Продакон». У Мінску ў чэрвені 1905 г. арганізацыйна аформіўся «Камітэт запалкавых фабрыкантаў Заходняга краю». Здаралася, што беларускія прадпрымальнікі станавіліся ініцыятарамі стварэння агульнарасійскіх манапалістычных аб'яднанняў.

## Сельская гаспадарка. Сацыяльныя зрухі ў вёсцы

Нягледзячы на поспехі ў развіцці прамысловасці, Беларусь у пачатку XX ст. заставалася аграрным рэгіёнам Расійскай імперыі. Каля 80 % даходу прыносіла сельская гаспадарка. У 1907–1914 гг. сяляне Беларусі ў сваёй гаспадарчай дзейнасці пераважна сутыкаліся з тымі ж праблемамі, што і раней. Аднак адчувальнымі сталі і перамены. Так, аграномічная і тэхнічная дапамога з боку земскіх і ўрадавых устаноў, якая істотна павялічылася ў выніку правядзення Сталыпінскай аграрнай рэформы, станоўча паўплывала на культуру земляробства і жывёлагадоўлі. Актывізавалася роля Сялянскага пазямельнага банка. У 1907–1909 гг. ён выдаў сялянам беларускіх губерняў 5148 пазык, з дапамогай якіх былі набыты 183 310 дзесяцін зямлі. У 1910–1912 гг. колькасць пазык ужо павялічылася да 13 394, а набытых зямельных угоддзяў – да 313 549 дзесяцін. Памеры зямельных уладанняў, якія належалі дваранам і чыноўнікам, за перыяд з 1897 па 1911 г. паменшыліся на 15,8 %. У гэты час зямельныя ўладанні сялян павялічыліся на 100,5 %. Тым не менш дваранам беларускіх губерняў у 1910 г. належала 36,1 % усіх зямельных уладанняў. Больш таго, нерухомая ўласнасць вышэйшага саслоўя тут памяншалася больш марудна, чым у іншых рэгіёнах Расійскай імперыі. Паступова, але заўважныя змены пачалі адбывацца ў бытавой культуры сялянства. Спачатку заможная яго частка, а за імі і іншыя мянялі лапці на боты, замест лучыны ўсё больш актыўна выкарыстоўвалі газоўку, саламяную страху замянілі на чарапічны дах.

Рост сялянскага зямельнага фонду, пашырэнне хутароў садзейнічалі паляпшэнню агракультуры. Усё больш уводзіліся чатырохпольныя севазвароты з пасадкай бульбы, а таксама шматпольныя з пасевам кармавых траў. Паляпшалася тэхнічнае абсталяванне гаспадарак. Нярэдкім было выкарыстанне жалезных плугоў розных сістэм, малатарань, веялак, сенакасілак і інш. Сохі, драўляныя плугі і бароны паступова выцясняліся палепшанымі прыладамі. У 1910 г. у памешчыцкіх гаспадарках Беларусі жалезныя плугі складалі 46,9 % усіх прылад для ворыва, жалезныя бароны і бароны з жалезнымі зубамі – 68,3 % іх агульнай колькасці, у сялянскіх – адпаведна 36,4 і 34 %. У гэты перыяд расла ўраджайнасць (напрыклад, збожжавых культур у сярэднім на 25,7 %), прычым на прыватнаўласніцкіх землях больш высокімі тэмпамі, чым на надзельных. Варта згадаць, што ў Беларусі 1909, 1910, 1912 і 1913 гады былі ўраджайнымі.

Вядучай галіной сельскай гаспадаркі Беларусі заставалася земляробства, развіццё якога суправаджалася пашырэннем пасяўных плошчаў, у першую чаргу за кошт павелічэння пасеваў тэхнічных і кармавых культур. Сярод іх вялікую долю займала бульба, пасевы якой у 1907–1913 гг. выраслі на 22 %. Павялічыліся таксама пасевы льну, але нязначна. На ўнутраным і знешнім рынках панізіліся цэны на льновалакно, і гэты фактар выклікаў пэўны застой у развіцці льнаводства. У 1907–1913 гг. на 8,9 % пашырыліся пасевы збожжавых, аднак іх удзельная вага ў агульнай плошчы пасеваў знізілася. Паралельна адбываўся рост ураджайнасці жыта – у пачатку XX ст. на 18,7 % у сялян і на 22,9 % у памешчыцкіх маёнтках.

Назіраўся ўздым кааператыўнага руху. У 1907 г. на тэрыторыі беларускіх губерняў дзейнічалі 112 устаноў дробнага крэдыту, якія аб'ядноўвалі 54 168 чалавек. Да 1911 г. іх колькасць павялічылася да 447, а склад – да 206 020 чалавек. Развівалася таксама сельскагаспадарчая і спажывецкая кааперацыя.

Змены ў эканамічных паводзінах сялянства ў пачатку XX ст. характарызавалі таксама рост іх укладаў у ашчадныя касы і павелічэнне памераў пазык, выдадзеных крэдытнымі і пазыкова-ашчаднымі таварыствамі. У 1906–1915 гг. колькасць ашчадных кніжак у сялян Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў павялічылася ў 2,5 раза, а сума грашовых укладаў – амаль у 3 разы. Памер пазык, выдадзеных сялянам беларускіх губерняў, у 1907–1911 гг. павялічыўся ў 3,9 раза. Грашовыя сродкі ішлі на набыццё зямлі, сельскагаспадарчых машын, інвентару. На беларускія губерні пашырала сваю дзейнасць Таварыства

садзейнічання ўздыму земляробства, сельскай гаспадаркі і народнай працаздольнасці, заснаванае ў 1908 г. Яно накіроўвала маладых здаровых сялян у Маравію, Данію, прыбалтыйскія губерні на практыцы асвойваць новыя прыёмы земляробства. Навучанне доўжылася 8 месяцаў. Пазней таварыства пачало арганізоўваць для сельскіх гаспадароў экскурсіі ў краіны і рэгіёны з перадавой сельскай гаспадаркай.

Пашыраліся рынычныя сувязі сельскай гаспадаркі Беларусі. У пачатку XX ст. вываз, напрыклад, ільновалакна павялічыўся на 18 %, мяса, птушкі і дзічыны – у 2,1 раза. Беларусь стала дастаткова буйным экспарцёрам мяса, масла, сыра, яек, яблыкаў. Актыўнасць у продажы на знешні рынак сельскагаспадарчай прадукцыі стала праяўляць сялянства. Інтэнсіўна развівалася вінакурства. Колькасць бровараў павялічылася на 30,1 %. Мінская і Віленская губерні ў пачатку XX ст. вызначаліся развіццём мяса-малочнай жывёлагадоўлі, якая трывала арыентавалася на рынак. У гэтым кірунку Магілёўская і Віцебская губерні адставалі.

У той жа час значная частка сялян не магла забяспечыць сваё існаванне ў поўнай меры, а тым больш развіццё ўласнай гаспадаркі, без дадатковых заробкаў па-за яе межамі. Паводле даных за 1907 г., каля 75 % сялян Гродзенскай губерні звярталіся да дадатковых заробкаў. «Ніхто не падумаў аб тым, што гэтыя людзі з даўных пор маюцца добра, а да таго яшчэ і самі стараннем прыбаўляюць к бацькаўскаму дабру: косяць на старане сена, калі свайго мала, купляюць салому, прыпускаюць больш скаціны, унаважываюць добра зямлю, дык і ня дзіва, што хоць у двух гаспадароў пароўну зямлі, ды адзін з паўвалокі яшчэ сабе купляе хлеб, а другі прадае збожжа.»

## Выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. і асаблівасці яго ажыццяўлення ў Беларусі

Выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. павялічваў прадстаўніцтва ў Дзяржаўнай Думе тых слаёў насельніцтва, якія ўспрымаліся ўрадам як сацыяльная апора існуючага дзяржаўнага ладу, перш за ўсё курыі землеўласнікаў. Яны атрымлівалі 51 % ад агульнай колькасці выбаршчыкаў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. Пашыралі свае выбарчыя правы заможныя гараджане. Адначасова значна скарачалася прадстаўніцтва ад рабочага класа. У той жа час у беларускіх губернях захоўвалася адносна большае, чым у еўрапейскай частцы Расійскай

імперыі ў цэлым, прадстаўніцтва ад сялянства. Гэта было звязана з імкненнем аслабіць на выбарах у Думу пазіцыі польскага, каталіцкага дваранства. Землеўласнікі атрымлівалі большасць па новай выбарчай сістэме толькі ў Мінскай і Магілёўскай губернях. Памешчыкі Віленскай губерні выбіралі толькі 48 % выбаршчыкаў, Віцебскай – 45,3 %, Гродзенскай – 41,1 %. Па новым выбарчым законе ў асобных мясцовасцях Расійскай імперыі былі ўтвораны «рускія» курыі. Такое права было дадзена праваслаўнаму насельніцтву Віленскай і Ковенскай губерняў. Так, у Віленскай губерні праваслаўныя землеўласнікі атрымалі 47,2 % месцаў выбаршчыкаў.

Выбарчы закон даваў міністру ўнутраных спраў права дзяліць павятовыя з'езды землеўласнікаў і гарадскіх выбаршчыкаў па нацыянальнай прыкмеце і такім чынам размяркоўваць колькасць выбаршчыкаў у інтарэсах «аховы праў карэннага рускага насельніцтва». Гэта было асабліва актуальна для заходніх ускраін, у тым ліку беларускіх губерняў, Расійскай імперыі. У прыватнасці, у Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і шэрагу паветаў Віцебскай губерні з'езды землеўласнікаў былі падзелены на «рускае» і «польскае» аддзяленні. У Мінскай губерні першая гарадская курыя (больш заможныя гараджане) раздзялялася на тры аддзяленні: «рускае», «польскае» і «яўрэйскае». Кожнае з іх незалежна ад колькасці насельніцтва выбірала па адным выбаршчыку. У больш зручным становішчы аказвалася «руская» частка, куды адносілі праваслаўных беларусаў. Такім чынам, змены ў выбарчы закон забяспечвалі перавагу «рускага» насельніцтва Беларусі, куды адносілі праваслаўных беларусаў, немцаў, татар і інш.

## Ліберальны рух. Аслабленне рэвалюцыйных партый і арганізацый

Стратэгія і тактыка ліберальных, народніцкіх і сацыял-дэмакратычных партый пасля рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. вызначаліся іх ацэнкай палітычнай сітуацыі, тых працэсаў, якія адбываліся ў краіне, перспектыў далейшай рэвалюцыйнай дзейнасці. Пасля 3 чэрвеня 1907 г. былі разгромлены шматлікія арганізацыі, якія ўзніклі ў гады рэвалюцыі. У Беларусі былі зачынены каля 40 буйных прафсаюзаў. Распаліся арганізацыі кадэтаў у Беларусі. Нешматлікія іх групы засталіся толькі ў Мінску, Вільні, Віцебску. Кіраўніцтва партыі кадэтаў звярнулася да мясцовых арганізацый з заклікам, каб яны не шукалі саюзнікаў ні злева, ні справа, ні сярод рэвалюцыйных сіл, ні сярод урадавых партый.

Намаганнямі паліцыі былі разгромлены ці аслаблены арганізацыі РСДРП у Мінску, Гомелі, Віцебску, Оршы, Магілёве, Смаргоні і інш. Да канца верасня 1907 г. удалося аднавіць дзейнасць мінскай арганізацыі сацыял-дэмакратаў. Галоўнай формай работы партыйных устаноў стала вусная прапаганда і распаўсюджванне лістовак. Мінская сялянская арганізацыя пры РСДРП у другой палове 1907 г. вяла прапагандысцкую дзейнасць у вёсках Навагрудскага і Ігуменскага паветаў.

Пасля паражэння рэвалюцыі паглыбілася рознае бачанне перспектыў і тактыкі далейшай дзейнасці ўнутры РСДРП. Бальшавікі выступалі пераважна за працяг актыўнай рэвалюцыйнай дзейнасці, захоўваючы яе нелегальныя формы. Пазней сярод іх мелі пэўнае пашырэнне ідэі «адзавістаў», якія лічылі бессэнсоўнымі легальныя формы працы ў прафсаюзах, рабочых клубах, прапаноўвалі адклікаць сацыял-дэмакратычную фракцыю ў III Дзяржаўнай Думе. Гэта пагражала партыі палітычнай ізаляцыяй. Лідары меншавікоў не верылі ў магчымасці нелегальнай дзейнасці і выступалі за легальнае існаванне сацыял-дэмакратыі, ліквідацыю падпольных арганізацый (ліквідатары). Ідэйна-арганізацыйны раскол у РСДРП завяршыўся ў 1912 г. афармленнем на Пражскай і Венскай канферэнцыях партый бальшавікоў і меншавікоў, кожная з якіх працягвала карыстацца назвай РСДРП. Бунд у гэтай сітуацыі выступіў саюзнікам меншавікоў. Бальшавікоў падтрымаў Палескі камітэт РСДРП, які дзейнічаў на аснове адной гарадской арганізацыі ў Гомелі.

У беларускіх губернях ліквідатарства прытрымліваліся, акрамя меншавікоў, бундаўскія арганізацыі. Галоўная ўвага імі адводзілася легальнай культурна-асветніцкай дзейнасці ў нацыянальным духу, перш за ўсё арганізацыі клубаў, таварыстваў адукацыі, працы ў легальных прафсаюзах і інш. Асобныя лідары Бунда (Р. Абрамовіч, М. Лібер) падтрымлівалі ідэю спалучэння метадаў падпольнай і нелегальнай дзейнасці, аднак такая пазіцыя не была дамінантнай.

У ліпені 1907 г. адбыўся III Савет партыі эсэраў, які адзначыў, што пасля паражэння рэвалюцыі трэба «пачынаць спачатку» палітычную працу і вярнуцца да ранейшых форм і сродкаў барацьбы. Эсэры прынялі рашэнне байкатаваць выбары ў III Дзяржаўную Думу і абвясцілі здраднікамі тых, хто ўдзелам у выбарах сыходзіў з рэвалюцыйнага шляху. Гэту пазіцыю цалкам падтрымаў VII з'езд Паўночна-Заходняй арганізацыі эсэраў, які прайшоў у ліпені 1907 г. Восенню 1907 г. паліцыяй была заўважана дзейнасць ваенна-рэвалюцыйных арганізацый эсэраў у Вільні і Лідзе. Аднак большасць з тых эсэраўскіх арганізацый,

якія захаваліся ў паслярэвалюцыйныя гады, не праяўлялі актыўнасці, у тым ліку Паўночна-Заходні абласны камітэт, які нават не падтрымліваў сувязь з кіраўніцтвам партыі. Колькасць членаў мясцовых арганізацый была нязначнай. Некаторае іх ажыўленне назіралася ў 1911 – пачатку 1912 г., але з крызіснага стану эсэры ў Беларусі ў гэты час не выйшлі.

Пасля 3 чэрвеня 1907 г. БСГ фактычна спыніла сваю нелегальную дзейнасць і партыя часова перастала існаваць. Лідары БСГ засяродзіліся на культурна-асветніцкай дзейнасці, перш за ўсё на выданні газеты «Наша ніва».

## Дынаміка і характар рабочага і сялянскага рухаў

Узмацненне рэпрэсіўных мерапрыемстваў у паслярэвалюцыйны час змяніла характар і памеры рабочага руху. Агульная колькасць удзельнікаў стачак у другой палове 1907 г. зменшылася больш чым у 4 разы ў параўнанні з першай паловай года. Найбольшы спад рабочага руху назіраўся ў 1909–1910 гг. Перш за ўсё ён закрануў палітычныя формы барацьбы. Практычна немагчымым стала правядзенне вулічных дэманстрацый, мітынгаў і маніфестацый. Крайне рэдка адбываліся і палітычныя стачкі. Першамайскія стачкі адзначаны ў 1908 г. у Смаргоні, Слоніме, Гродне і Хоцімску, а ў 1909 г. ніякіх палітычных выступленняў рабочых Беларусі не было. Шэраг выступленняў у 1907–1909 гг. быў звязаны з пратэстам работнікаў супраць спроб гаспадароў аднавіць дарэвалюцыйныя ўмовы найму. З чэрвеня 1907 г. да канца 1910 г. у стачках на тэрыторыі Беларусі прынялі ўдзел 22 тыс. рабочых, у 1911 – першай палове 1914 г. – 18,4 тыс. рабочых. Наёмныя работнікі Беларусі ў гэты час не ўдзельнічалі ў стачках салідарнасці, агульнарасійскіх палітычных выступленнях. Мітынгі і дэманстрацыі рабочых да пачатку Першай сусветнай вайны так і не аднавіліся. Толькі з 1913 г. больш наступальны характар набыў эканамічны рух рабочых.

Глыбокае расчараванне вынікамі рэвалюцыі, крах надзей на спрыяльнае вырашэнне аграрнага пытання моцна паўплывалі на сялянскі рух у Беларусі. Колькасць выступленняў сельскіх жыхароў у 1908–1910 гг. у параўнанні з 1905–1907 гг. скарацілася больш чым у пяць разоў. У паслярэвалюцыйны час зменшылася ўдзельная вага выступленняў супраць улад і памешчыкаў. У межах дадзенага віду пратэстаў

скараціліся забастоўкі, факты супраціўлення паліцыі і ўладам, адмоў ад выканання павіннасцей, выплаты падаткаў, палітычных выступленняў, павялічылася доля выступленняў супраць сельскай буржуазіі і хутарызацыі, падпалаў маёмасці, захопаў зямель, лугоў і пашы. Агульная колькасць сялянскіх выступленняў за 1911 – першую палову 1914 г. склала 468 зарэгістраваных фактаў. Гэта некалькі больш, чым за аднолькавы па працягласці час – другая палова 1907–1910 г. (357 выступленняў). Аднак якасны ўзровень сялянскіх выступленняў знізіўся. Крайне рэдкімі сталі забастоўкі сялян-падзёншчыкаў. Палітычных пратэстаў вясковых жыхароў Беларусі ў 1908–1914 гг. зафіксавана не было.

## Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў час выбараў у III і IV Дзяржаўную Думу, дзейнасць дэпутатаў ад беларускіх губерняў

У другой палове 1907 г. выбарчая кампанія ў III Дзяржаўную Думу была ў цэнтры ўвагі палітычных сіл і партый у Расійскай імперыі. З сацыялістычных партый толькі эсэры байкатавалі выбары. Іх пазіцыю раздзялялі анархісты. Бальшавікі, наадварот, імкнуліся выкарыстаць выбары для пашырэння сваёй дзейнасці, палітычнага ўплыву. У час перадвыбарчай кампаніі аслабленым быў ліберальна-апазіцыйны лагер. Кадэтаў у беларускіх губернях падтрымлівалі яўрэйскія нацыянальныя арганізацыі і, з пэўнымі агаворкамі, Краёвая партыя Літвы і Беларусі.

Прапольскія землеўласнікі і каталіцкія святары на з'ездзе ў ліпені 1907 г. утварылі «Польскі дэмакратычны саюз Беларусі». Яго заснавальнікі былі прыхільнікамі польскай нацыяналістычнай партыі «нарадовых дэмакратаў», лідарам якіх з'яўляўся Р. Дмоўскі. З'езд заклікаў дабівацца шырокага мясцовага самакіравання ў заходніх губернях з гарантыяй выбарчых праў «польскага» насельніцтва. «Польскі дэмакратычны саюз Беларусі» пад сцягам абароны праў каталіцкай царквы намагаўся аб'яднаць пад сваім кіраўніцтвам сялян-католікаў.

Вельмі актыўна і наступальна ўключыліся ў выбары праваманархічныя партыі і арганізацыі, а разам з імі «Саюз 17 кастрычніка». У беларускіх губернях узмацніў дзейнасць «Рускі ўскраінны саюз», які ўзначальвалі архіепіскап Мінскі і Тураўскі Міхаіл, І. Паўловіч, Г. Шміт,

Д. Скрынчанка і інш. Для манархічных груповак Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Ковенскай губерняў і Царства Польскага была выпрацавана асобная выбарчая платформа, накіраваная на ўзмоцненую барацьбу супраць палякаў і яўрэяў. Лідары «Рускага ўскраіннага саюза» праз газеты «Новое время», «Окраины России», «Минское слово», «Могилевский вестник», часопіс «Крестьянин» і іншыя выданні патрабавалі русіфікацыі беларускіх губерняў, выступаючы за «адзіную і непадзельную Расію». Асаблівую ўвагу чарнасоценныя арганізацыі і акцябрысты надавалі працы сярод сялянства. Актывісты з «Саюза рускага народа», «Рускага ўскраіннага саюза», праваслаўных брацтваў абыходзілі вясковыя хаты і ўказвалі сельскім жыхарам, за каго падаваць галасы.

Вынік выбарчай кампаніі аказаўся фактычна запраграмаваным. З абраных ад беларускіх губерняў 36 дэпутатаў III Думы было 12 землеўласнікаў, 7 прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства, 5 чыноўнікаў, 11 сялян і 1 каталіцкі святар. З іх 19 чалавек увайшлі ў фракцыю думскіх правых, 7 – памяркоўна-правых, 4 – акцябрыстаў, адзін – міраабнаўленцаў, 6 – польска-літоўска-беларускай групы. У цэлым склад новай Думы адпавядаў урадавым інтарэсам, большасць атрымалі праўрадавыя партыі (61 %). Ад беларускіх губерняў прадстаўніцтва гэтага блока было больш значным – 80,5 %.

Дзяржаўная Дума III склікання пачала сваю працу 1 лістапада 1907 г. Ні адна з думскіх фракцый не валодала большасцю месц. Парламенцкая большасць фарміравалася пры галасаванні ў залежнасці ад таго, з кім блакіраваліся акцябрысты – з чарнасоценцамі або кадэтамі. Такое становішча было вельмі зручным для ўрада, давала яму магчымасць лавіравання і складала галоўную асаблівасць трэцячэрвеньскай сістэмы.

Як і раней, аграрнае пытанне займала значнае месца ў працы III Думы. Акцябрысцка-чарнасоценная большасць цалкам падтрымала ўказ ад 9 лістапада 1906 г., правядзенне Сталыпінскай аграрнай рэформы. Дэпутаты ад беларускіх губерняў, якія адносіліся да думскіх правых, выказвалі меркаванне, што ўказ ад 9 лістапада даў адзіны магчымы шлях вырашэння аграрнага пытання і выратавання ад рэвалюцыі. Большасцю III Думы 8 мая 1909 г. быў адобраны праект закона згодна з указам ад 9 лістапада 1906 г.

Правыя дэпутаты ад беларускіх губерняў падтрымалі вялікадзяржаўную нацыянальную палітыку ўрада. Асабліва гэта праявілася пры разглядзе ў Думе «Палажэння аб пачатковых вучылішчах». Яны вы-

казваліся за тое, каб руская мова была адзінай мовай навучання ў беларускіх губернях, не дапускалі магчымасці выкарыстання польскай, беларускай, яўрэйскай моў. Бурныя дыскусіі выклікала абмеркаванне пытання аб увядзенні выбарных земстваў у заходніх губернях. Праўрадавыя дэпутаты, у тым ліку з беларускіх губерняў, большасцю галасоў падтрымалі праект рэформы. Яны акцэнтавалі ўвагу на неабходнасці правядзення выбараў у земскія органы самакіравання па нацыянальных курыях, што дазволіла б не дапусціць манаполію польскага прадстаўніцтва. Аднак адобраны Думай законапраект быў адхілены Дзяржаўным Саветам. У такім выпадку Мікалай II на тры дні распусціў Дзяржаўную Думу і Дзяржаўны Савет і ў надзвычайным парадку падпісаў законапраект.

Лідарамі кампаніі па выбарах у IV Дзяржаўную Думу, якія адбыліся восенню 1912 г., выступалі праваманархічныя сілы і праваслаўныя брацтвы. Характэрнай рысай дадзенай выбарчай кампаніі, у параўнанні з папярэднімі, быў найбольш выразны абсентэізм выбаршчыкаў. Абыякавасць праявілі дробныя землеўласнікі. Ад беларускіх губерняў былі абраны дэпутаты, якія па сваёй партыйна-палітычнай прыналежнасці размеркаваліся наступным чынам: 27 мандатаў – прыхільнікі праваманархічных (чарнасоценных) партый і арганізацый, 6 – акцябрысты і 6 –лібералы. Дзейнасць IV Думы пачалася 15 лістапада 1912 г. Правыя дэпутаты ад беларускіх губерняў неаднаразова крытыкавалі ўрад за адсутнасць праграмы дзеянняў, лічылі, што шлях думскага і канстытуцыйнага развіцця прывядзе да гібелі манархіі. Некаторыя з іх (Г. Замыслоўскі, К. Акаловіч) патрабавалі ад урада рашучых мер супраць «засілля» палякаў і яўрэяў у заходніх губернях. Спробы кадэтаў аб'яднаць думскую апазіцыю з мэтай ціску на ўрад для рэалізацыі праграмы рэформ не мелі поспеху.

## Беларускі нацыянальны рух. «Наша ніва»

Вызначальнай рысай урадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі пасля падаўлення рэвалюцыі стаў вялікадзяржаўны імперскі шавінізм, ідэолагі і мясцовыя прапагандысты якога не дапускалі існавання самастойнай беларускай нацыі. Падзел яе праводзіўся па канфесійнай прыкмеце: праваслаўны – рускі, католік – паляк. Звод Асноўных дзяржаўных законаў Расійскай імперыі ад 23 красавіка 1906 г. дапускаў навучанне ў народных школах на роднай мове вучняў, аднак сваім ра-

шэннем Дзяржаўная Дума аднесла беларусаў і ўкраінцаў да рускіх і палічыла неабходным вучыць іх па-руску. Дума вырашыла таксама перавесці выкладанне Закона Божага ў школах для беларусаў-католікаў з польскай мовы на рускую, тым самым падштурхнуўшы іх запісвацца палякамі.

У такіх умовах беларускі нацыянальны рух вымушаны быў адстойваць сваё права на існаванне, абараняцца ад націску расійскіх манархістаў і польскіх нацыяналістаў. Сферай яго актыўнасці была перш за ўсё культурна-асветніцкая дзейнасць. Фактычна ролю ідэйнага і арганізацыйнага цэнтра руху для многіх беларускіх культурна-асветніцкіх таварыстваў выконвала «Наша ніва», якая стала галоўнай мішэнню для цкавання, розных нападак і абвінавачванняў з боку расійскай і польскай рэакцыйнай прэсы. Насуперак абмежаванням папулярнасць і сувязі з падпісчыкамі ў «Нашай нівы» раслі. Яна знаходзіла водгук сярод вясковых і гарадскіх чытачоў.

Да рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. беларускі нацыянальны рух ахопліваў пераважна нешматлікіх прадстаўнікоў вучнёўскай і студэнцкай моладзі. За час рэвалюцыі і пасля яе да руху далучылася пэўная частка сялянства, рабочых, аднак па сваім сацыяльным складзе ён заставаўся дэмакратычным, практычна без падтрымкі прадстаўнікоў сацыяльнай эліты. Толькі асобныя з іх аказвалі фінансавую падтрымку беларускаму нацыянальнаму руху, засноўвалі ў сваіх маёнтках беларускія школы. У прыватнасці, княгіня М. Радзівіл аплаціла выданне шэрагу беларускамоўных кніг, аказвала фінансавую падтрымку навучэнцам. Уладальніца маёнтка ў Сенненскім павеце Т. Гардзялкаўская падтрымлівала «Нашу ніву», адкрыла беларускую школу, фінансавала выданне зборніка Я. Коласа.

Лідары беларускага руху першачарговую ўвагу надавалі нацыянальна-культурнаму адраджэнню, пашырэнню сферы ўжытку беларускай мовы. Тэарэтычным абгрунтаваннем і практычнай рэалізацыяй гэтай задачы займалася «Наша ніва». На старонках выдання прапагандаваліся нацыянальная свядомасць, ідэі еднасці беларусаў – як праваслаўных, так і католікаў. У той жа час выдаўцы «Нашай нівы» выразна дыстанцыяваліся ад мясцовай дваранскай, шляхецкай інтэлектуальнай эліты, разлічвалі на фарміраванне новай інтэлігенцыі, перш за ўсё з ліку выхадцаў з сялянства, народных нізоў.

У 1910 г. намаганнямі нашаніўцаў пачаў выходзіць «Беларускі каляндар», які быў дастаткова папулярным сярод вясковых жыхароў. Тыраж яго дасягаў 20 тыс. экзэмпляраў. На аснове сельскагаспадарчага

аддзела «Нашай нівы» ў 1912 г. стаў выдавацца часопіс «Саха», рэдактарам якога быў А. Уласаў. З выданнем супрацоўнічалі вучоныя-спецыялісты і гаспадары-практыкі, якія давалі свае парады і каментарыі па ўсіх галінах сельскай гаспадаркі. «Саха» атрымала прызнанне і ўзнагароды на сельскагаспадарчых выстаўках у Вільні і Мінску. У 1913 г. рэдакцыяй «Нашай нівы» ў Мінску стаў выдавацца літаратурны штомесячнік для моладзі «Лучынка», які рэдагавала Цётка. У Вільні ў студзені 1913 г. пад рэдакцыяй А. Бычкоўскага і Б. Пачобкі пачала выходзіць беларускамоўная штотыднёвая газета «Беларус». Друкавалася яна лацінкай. Газета імкнулася пераадолець рэлігійны раскол беларусаў, давесці, што «ўсе яны – адно племя, адзін народ». У цэлым у 1908–1914 гг. былі выдадзены 77 беларускамоўных кніг агульным тыражом 226 660 экзэмпляраў.

У 1909 г. былі створаны «Гродзенскі гурток беларускай моладзі» і беларускі гурток сярод студэнтаў Юр'еўскага ўніверсітэта, у 1911 г. – Беларускі музычна-драматычны гурток. Узніклі таксама Беларускі літаратурна-навуковы гурток студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта, Гурток беларусаў у Капылі, Гурток аматараў «Нашай нівы» ў Мінскай духоўнай семінарыі, пашырэнне атрымалі аматарскія і прафесійныя беларускія тэатральныя пастаноўкі і многае іншае. Намаганнямі І. Луцкевіча пры рэдакцыі «Нашай нівы» паступова ствараўся Беларускі музей, дзе былі сабраны многія ўнікальныя экспанаты. Усе гэтыя арганізацыі, культурна-асветніцкія мерапрыемствы былі звязаны паміж сабой духоўна і з'яўляліся сведчаннем росту творчых і інстытуцыянальных кантактаў прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, разгортвання беларускага нацыянальна-культурнага руху.

Тэма 13

# КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX ст.

Умовы і асаблівасці культурнага развіцця Беларусі.
Асвета і адукацыя.
Навуковыя даследаванні. Развіццё беларусазнаўства.
Перыядычны друк і выдавецкая справа.
Развіццё літаратуры.
Выяўленчае мастацтва.
Архітэктура.
Беларускі тэатр і музыка.

## Умовы і асаблівасці культурнага развіцця Беларусі

Культура Беларусі ў пачатку XX ст. развівалася пад уплывам дынамічных сацыяльных перамен. Нарастанне пратэсных настрояў, актывізацыя грамадскага жыцця, рэвалюцыйныя падзеі 1905–1907 гг., безумоўна, наклалі адбітак на многія пласты культуры, асабліва тыя, што чэрпалі свае сюжэты з тагачаснай сацыяльнай рэчаіснасці, аператыўна рэагавалі на змены грамадскіх настрояў. Яны пакінулі свой заўважны след нават тады, калі адбылася стабілізацыя палітычнага рэжыму ў Расійскай імперыі

ў 1907–1914 гг., непараўнальна ўзмацніўся ўрадавы ціск на грамадства, на дзейнасць палітычных партый і грамадскіх арганізацый, пашырыліся апатычныя настроі сярод многіх з іх у бачанні перспектыў сацыяльных пераўтварэнняў, здзяйсненні рэвалюцыйных планаў. Палітычны ціск на грамадства і рэпрэсіі ў дачыненні да рэвалюцыйных партый супалі з імклівым эканамічным уздымам, пэўным ростам матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва. Апошняе стала адным з фактараў таго, што нават сярод сацыяльна актыўных наёмных работнікаў на першы план выйшлі эканамічныя патрабаванні, жаданне атрымаць сацыяльныя гарантыі.

Актывізацыя нацыянальна-культурных рухаў, перш за ўсё беларускага, напярэдадні і ў час рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг., узмацненне іх сувязі з сацыялістычнымі партыямі змяніліся імкненнем іх удзельнікаў абмежавацца пераважна легальнымі формамі і сродкамі дзейнасці, з'яўленнем сярод асобных прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі песімістычных настрояў у бачанні перспектыў нацыянальна-культурнага адраджэння. Мадэрнізацыя розных бакоў жыцця ў сферы культуры выявілася ва ўніфікацыі, якая ў дадзеным выпадку суправаджалася ўзмоцненай русіфікацыяй. Апошняя стала адным з галоўных кірункаў і клопатаў расійскай урадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі. Тым не менш, нягледзячы на гэтыя складаныя і супярэчлівыя сацыяльна-палітычныя працэсы, сярод многіх груп беларускага грамадства не знікла жаданне і гатоўнасць да перамен. Змяніліся густы і запатрабаванасць многіх сфер культуры, асабліва гэта закранула адукацыю і навуку, грамадскую думку, літаратуру, выяўленчае мастацтва. Імкліва пашыраліся тыя яе элементы, якія арыентаваліся на масавага спажыўца. Цікавасць да культурнага жыцця, да яго здабыткаў пачаў праяўляць селянін. У той жа час адной з галоўных прыкмет класавай прыналежнасці і адрозненняў дзелавой эліты стаў спорт. Удзел у дзейнасці клубаў, заняцце спортам дапамагалі ўстанаўліваць трывалыя нефармальныя сувязі ў дзелавой сферы. Асабліва гэта датычылася стварэння яхт-клубаў. Сваімі статутнымі мэтамі многія з іх ставілі пашырэнне здаровага ладу жыцця, правядзенне тэматычных вечарын і выстаў. Цікавасць сярод гарадскіх жыхароў у той час выклікаў веласпорт. У пачатку XX ст. у гарадах Беларусі вялікую папулярнасць мелі аматарскія літаратурныя, музычныя, тэатральныя таварыствы, якія арганізоўвалі публічныя лекцыі, канцэрты, літаратурна-драматычныя вечарыны. Шырока практыкавалася адкрыццё бібліятэк, чайных, пра-

вядзенне народных чытанняў і гулянняў. Папулярнасць атрымалі падтрымка дабрачынных таварыстваў, удзел у дзейнасці мясцовых аддзяленняў Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа і інш.

Беларусы вызначаліся ў еўрапейскай частцы Расійскай імперыі найбольшай удзельнай вагой тых, хто быў заняты ў сельскай гаспадарцы, і мінімальнай – у прамысловасці. Аднак працэс станаўлення класаў і сацыяльных груп буржуазнага грамадства ў Беларусі да Першай сусветнай вайны не завяршыўся. На тэрыторыі беларускіх губерняў ён значна ўскладняўся этнаканфесійнымі і саслоўнымі асаблівасцямі розных груп насельніцтва, абмежавальнымі мерапрыемствамі ўрада. Рабочы клас, які дынамічна рос, складаўся ў значнай ступені з сялян, якія не парывалі свае сувязі з вёскай. Спадчынных рабочых было вельмі мала. Фабрычна-заводскі пралетарыят меў невысокую ўдзельную вагу сярод насельніцтва. У другой палове XIX – пачатку XX ст. у Беларусі паступова складвалася новая сацыяльная група прадпрымальнікаў. Аднак дадзены працэс стрымлівалі спецыфічная структура мясцовага эканамічнага жыцця, раз'яднанасць вытворчасцей і капіталаў па дробных прадпрыемствах. Склад і колькасць чыноўніцтва і інтэлігенцыі Беларусі як сацыяльна-прафесійных груп адлюстроўвалі кірунак і выніковасць урадавых мерапрыемстваў. У сувязі з ускладненнем задач па іх рэалізацыі, пашырэннем сацыяльна-культурнай сферы адбыліся рост дадзеных груп, папаўненне за кошт адукаваных выхадцаў з падатковых саслоўяў. Інтэлігенцыя Беларусі, нягледзячы на параўнальна невялікую колькасць, шматнацыянальны склад, абмежаваныя магчымасці сацыяльнай актыўнасці і самарэалізацыі на радзіме, выступіла носьбітам сацыяльна-культурнай складаючай трансфармацыйных працэсаў. Адной з галоўных спецыфічных рыс фарміравання гэтай групы стала страта пераемнасці паміж яе рознымі пакаленнямі.

Глыбокія якасныя змены ў фарміраванні беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі адбыліся ў час і пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. З пашырэннем легальнага і з'яўленнем беларускамоўнага друку, распаўсюджваннем прафесійных, грамадска-культурных аб'яднанняў і гурткоў, заснаваннем выдавецкіх суполак, нацыянальных тэатральных калектываў узраслі новыя формы і кірункі інтэлектуальнага жыцця. На гэтым этапе беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, аднак, не ўдалося атрымаць дастатковы ўзровень сацыяльнай сталасці для рэалізацыі ў поўнай меры сваіх дзяржаўна-палітычных і культурна-асветніцкіх ідэалаў.

## Асвета і адукацыя

На мяжы XIX–XX стст. сацыяльна-культурныя змены ў Беларусі набылі заўважны дынамізм. Значную зацікаўленасць у атрыманні адукацыі выявілі сяляне. Акрамя таго, змясціліся рэгіянальныя прыярытэты пашырэння пісьменнасці. У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. найбольшымі поспехамі вызначаліся заходнія раёны Беларусі, у пачатку XX ст. па тэмпах пашырэння пісьменнасці на першы план выйшлі Магілёўская і Віцебская губерні.

У канцы XIX ст. заходнія раёны Беларусі заўважна апераджалі ўсходнія па ўзроўні пісьменнасці насельніцтва. У пачатку XX ст. сітуацыя змянілася. Па стане на 1911 г. на першае месца па ўдзельнай вазе вучняў пачатковых школ сярод насельніцтва выйшла Магілёўская губерня (5,6 %), а ў Гродзенскай яна складала 4,4 %, у Віленскай – 3,9 %. Удзельная вага навучэнцаў у агульнай колькасці насельніцтва ў Мінскай губерні павялічылася за 1898–1913 гг. з 3,5 да 6,0 %.

Вучні пачатковых школ Беларусі ў 1910 г. склалі 4,6 % ад агульнай колькасці насельніцтва. Тут працавалі 6926 школ і вучыліся 391 606 хлопчыкаў і дзяўчат. Апошнія складалі 26,4 % вучняў пачатковых школ. У 1894–1898 гг. у беларускіх губернях было адкрыта 497 школ, у 1899–1903 гг. – 1157, у 1904–1908 гг. – 2054, а за два гады – 1909–1910 гг. – 1776. Ва ўсіх без выключэння беларускіх губернях у 1907–1910 гг. назіраўся школьны бум. Колькасць адкрываемых штогод у гэты перыяд навучальных устаноў у тры – сем разоў перавышала аналагічны паказчык за папярэднія гады.

Пэўную альтэрнатыву пачатковым школам, якія дзейнічалі афіцыйна, стваралі «тайныя» школы. Яны запаўнялі недахоп у навучальных установах, у магчымасці засвоіць хаця б элементарную грамату. «Тайныя» школы адрозніваліся ў залежнасці ад нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасці вучняў і іх бацькоў. Сярод праваслаўнага насельніцтва былі распаўсюджаны руска-беларускія школы. У Гродзенскай губерні, дзе была значнай удзельная вага каталіцкага насельніцтва, атрымала пашырэнне «тайнае» польскае навучанне.

Паспяхова развівалася і сетка сярэдніх навучальных устаноў. У 1908 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 10 мужчынскіх і 12 жаночых гімназій, 1 камерцыйнае, 5 рэальных вучылішч, 1 мужчынская прагімназія, а таксама 16 мужчынскіх і 47 жаночых прыватных навучальных устаноў. У іх сценах вучылася 22 810 чалавек. Паводле даных

на 1914 г., у Беларусі ўжо працавалі 13 мужчынскіх і 17 жаночых гімназій, 7 рэальных і 1 камерцыйнае вучылішча, а таксама 21 мужчынская і 63 жаночыя прыватныя навучальныя ўстановы. Усяго ў іх атрымлівалі адукацыю 31 328 чалавек.

Пашыралася таксама і сетка спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. У яе рамках рыхтавалі ніжэйшых спецыялістаў для сельскай гаспадаркі, рабочых для чыгуначных рамонтных майстэрань, агульнатэхнічнага профілю (сталяроў, токараў, слесараў і інш.). У 1914 г. на тэрыторыі Беларусі працавалі 18 рамесных аддзяленняў з 741 навучэнцам, а таксама 52 ніжэйшыя прафесійныя ўстановы, дзе розным прафесіям навучаліся 3,6 тыс. чалавек. Асобнае месца займалі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы – фельчарскія школы, настаўніцкія семінарыі. Падрыхтоўка сярэдняга медыцынскага персаналу праводзілася ў Магілёўскай і Гродзенскай фельчарска-акушэрскіх школах. У пачатку XX ст. дзейнічала і некалькі прыватных медыцынскіх навучальных устаноў, а таксама праводзілася падрыхтоўка аптэкарскіх работнікаў. Вышэйшых навучальных устаноў да рэвалюцыйных падзей 1917 г. на тэрыторыі Беларусі, нягледзячы на неаднаразовыя грамадскія ініцыятывы па іх адкрыцці, не было.

Рост колькасці навучальных устаноў на мяжы XIX–XX стст. быў запатрабаваны зменай адносін розных пластоў насельніцтва да магчымасці атрымаць адукацыю. Змяніўся таксама змест паняцця «пісьменны чалавек», расла ступень адукаванасці сялян. Сярод іх сталі часцей сустракацца людзі, якім удалося атрымаць сярэднюю і часам вышэйшую адукацыю. Карэспандэнт «Нашай нівы» М. Крапіўка ў лістападзе 1906 г. падкрэсліваў пашырэнне сярод сялянства ўсведамлення першаступеннай важнасці атрымання адукацыі для таго, каб «палепшыць цяжкое жыццё ўсіх працуючых». Авалоданне адукацыяй уплывала на паводзіны людзей, садзейнічала іх рацыяналізацыі, арыентацыі на дасягненне максімальнага выніку.

Імклівае пашырэнне сеткі навучальных устаноў, рост запатрабаванасці ў адукацыі суправаджаліся ўзмацненнем абмежавальных мерапрыемстваў у дачыненні да асобных груп насельніцтва. Урадавым палажэннем 16 верасня 1908 г. уводзіліся працэнтныя нормы пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы для яўрэяў: 3 % – у сталіцах, 5 – у іншых рэгіёнах імперыі па-за межамі рысы аседласці, 10 % – у 9 заходніх губернях. Праз год аналагічныя абмежаванні былі прыняты пры паступленні ў сярэднія навучальныя ўстановы:

5 % – у сталічных навучальных установах, 10 – у іншых мясцовасцях, 15 % – для рысы аседласці.

У пачатку XX ст. урадавыя органы і грамадскасць перайшлі да рэалізацыі практычных мерапрыемстваў па ўвядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі. У 1908 г. Дзяржаўная Дума прыняла закон аб паступовым, на працягу 10 гадоў, увядзенні ўсеагульнай абавязковай пачатковай адукацыі. Падобныя праекты абмяркоўваліся ў беларускіх губернях у больш ранні перыяд. Мінскі гарадскі галава К. Э. Чапскі 3 снежня 1898 г. звярнуўся да кіраўніцтва Міністэрства народнай асветы з прапановай увесці ў Мінску бясплатнае абавязковае пачатковае навучанне, але яна не была падтрымана.

У беларускіх губернях назіраліся несупадзенне параўнальна невялікіх расходаў дзяржавы на развіццё адукацыі і часам вышэйшы за сярэдні па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі працэнт ахопу дзяцей школьнага ўзросту рознымі формамі адукацыі. Адно з тлумачэнняў гэтай з'явы – больш высокая актыўнасць і зацікаўленасць прыватных асоб, укладанне імі, у тым ліку сялянамі, асабістых сродкаў у навучанне грамаце дзяцей.

У сувязі з імклівым ростам колькасці пачатковых навучальных устаноў востра паўстала пытанне аб падрыхтоўцы настаўнікаў. У пачатку XX ст. былі адкрыты пяць новых настаўніцкіх семінарый: дзве мужчынскія – Рагачоўская (1909), Гомельская (1915) – і тры жаночыя – Аршанская (1911), Барысаўская (1915), Бабруйская (1916). Акрамя таго, былі арганізаваны тры настаўніцкія інстытуты – Віцебскі (1910), Магілёўскі (1913), Мінскі (1914), якія не давалі вышэйшай адукацыі, па змесце і аб'ёме навучальных праграм набліжаліся да ўзроўню гімназій і рэальных вучылішч. У настаўніцкіх інстытутах рыхтавалі педагогаў для пачатковых школ, гарадскіх вучылішч. Настаўнікамі маглі быць таксама выпускнікі праваслаўных духоўных семінарый Мінска, Магілёва, Віцебска.

Для пашырэння асветы інтэлігенцыя Беларусі выступала ініцыятарам стварэння грамадскіх бібліятэк. У пачатку XX ст. такія ўстановы былі адкрыты ў Мінску, Віцебску, Полацку, Оршы, Бабруйску. Найбольш буйной з іх была Мінская публічная бібліятэка імя А. Пушкіна, якая ўзнікла ў 1900 г. Акрамя грамадскіх бібліятэк, дзейнічалі бібліятэкі розных ведамстваў, асветніцкіх таварыстваў, вайсковых частак, размешчаных на тэрыторыі Беларусі.

## Навуковыя даследаванні. Развіццё беларусазнаўства

На мяжы XIX–XX стст. новы імпульс атрымала вывучэнне археалогіі і традыцыйнай культуры Беларусі. На гэтым этапе быў зроблены важкі ўклад у аднаўленне сапраўднай карціны гісторыка-культурнага шляху беларусаў, сцвярджэнне самабытнасці іх як народа з арыгінальнай культурай, складанай і супярэчлівай гісторыяй. Археалагічныя помнікі беларуска-літоўскага памежжа вывучаў **В. Шукевіч**. Ён вёў таксама запісы мясцовага фальклору. Частку археалагічных знаходак В. Шукевіч змяшчаў у сваім хатнім музеі, частку ахвяраваў іншым музеям. Матэрыяльную і духоўную культуру старажытнай Беларусі даследаваў **У. Завітневіч**. У пачатку XX ст. ён працягнуў вывучэнне археалагічных помнікаў Мінскай губерні, перш за ўсё курганоў дрыгавічоў. Глыбока гісторыю Полацкай зямлі даследаваў **Д. Леанардаў**. Не страціла навуковага значэння да сёння яго праца «Полацкі князь Усяслаў і яго час» (1912–1916).

Першынство ў развіцці навуковага беларусазнаўства ў пачатку XX ст. меў **Я. Карскі**. Ён стаў заснавальнікам беларускай філалогіі, першым зрабіў перыядызацыю працэсаў этнагенезу беларусаў, аргументавана даказаў самабытнасць беларускай культуры. У 1903 г. Я. Карскі выдаў першы том сваёй працы «Беларусы», дзе даў аналіз беларускай вуснай народнай творчасці, паказаў сістэму яе жанраў, ідэйна-тэматычны змест, мастацкія асаблівасці. У гэты час даследчык на сродкі Акадэміі навук аб'ехаў межы распаўсюджвання беларускіх гаворак, што дало магчымасць змясціць у першым томе «Беларусаў» «Этнаграфічную карту беларускага племені».

Вялікі ўклад у вывучэнне гісторыі і культуры Беларусі ўнёс **М. Доўнар-Запольскі**. Ён цікавіўся археалогіяй, вёў этнаграфічныя назіранні, запісваў фальклор, распрацоўваў праблему паходжання беларускай народнасці, пытанні гісторыі дзяржаўнасці, сацыяльна-эканамічнага развіцця Вялікага Княства Літоўскага. Выдаў працы «Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах» (1901), «Нарысы па арганізацыі заходнярускага сялянства ў XVI ст.» (1905). Даследаваў этнаграфію Беларусі, вывучаў і збіраў археалагічныя і этнаграфічныя матэрыялы вядомы фалькларыст, аўтар шматтомнай працы «Люд беларускі», гісторыка-этнаграфічнага даследавання «Віцебск і Віцебшчына» **М. Федароўскі**. У пачатку XX ст. да вывучэння матэ-

рыяльных і духоўных каштоўнасцей Беларусі прыступілі Д. Даўгяла, І. Сербаў, А. Сержпутоўскі, В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі і інш. **Д. Даўгяла** праявіў сябе як выдатны гісторык, археограф, архівіст, крыніцазнавец. З'яўляўся складальнікам і рэдактарам шэрагу тамоў «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў», удзельнічаў у выданні «Актаў Віленскай камісіі», «Археаграфічнага зборніка дакументаў».

У Віцебску былі створаны і дзейнічалі вучоная архіўная камісія (1909–1918), архіў старажытных актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерняў (1862–1903). У 1909–1916 гг. ішло выданне перыядычнага зборніка дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Падзвіння «Полацка-Віцебская даўніна». У 1911–1922 гг. працавала Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута.

Прыхільнікаў і энтузіястаў вывучэння беларускай даўніны аб'ядноўвалі «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў» (1898–1906), «Таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі» (1912). Апошняе падтрымлівала навуковыя кантакты з Археалагічнай камісіяй у Пецярбургу, Казанскім універсітэтам, Рускім геаграфічным таварыствам і інш. Дзейнічалі Магілёўскае таварыства вывучэння беларускага краю і Таварыства вывучэння Магілёўскай губерні (1913), Гродзенскі царкоўна-гістарычны (пазней – гісторыка-археалагічны) камітэт (з 1904) і інш. У Мінску царкоўна-гістарычны камітэт выпускаў выданне пад назвай «Мінская старына». Заўважную навукова-асветніцкую працу праводзіў Мінскі царкоўна-археалагічны музей (1908–1915), асабліва калі яго кіраўніком быў археолаг, археограф і мастацтвазнаўца **А. Снітка**. Ён арганізоўваў экспедыцыі па выяўленні і збіранні помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Актыўную дапамогу яму аказваў вядомы культурны дзеяч **А. Уласаў**, які ўзвёў для музея спецыяльны будынак, арганізоўваў археалагічныя, фальклорныя і этнаграфічныя экспедыцыі. Намаганнямі **І. Луцкевіча** быў створаны Віленскі беларускі музей. Ён жа меў дачыненне да стварэння ў 1907 г. і дзейнасці «Таварыства аматараў навук», мэтай якога было даследаванне гісторыі і культуры Беларусі і Літвы.

У пачатку XX ст. прадоўжыў сваю актыўную навуковую дзейнасць фалькларыст, археолаг і этнограф **Е. Раманаў**. Да гэтага часу адносіцца выхад шэрагу выпускаў падрыхтаванага ім «Беларускага зборніка» (1886–1912). У выданні даследчык сабраў каштоўныя калекцыі вуснапаэтычных твораў розных жанраў. Е. Раманаў выдаў «Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерні» (1911–1912), тры выпускі «Магілёўскай старыны» (1900–1903), «Пад польскім ігам» (1907). За сваё жыццё ён

абышоў і аб'ехаў амаль усю Беларусь, правёў раскопкі амаль тысячы курганоў і іншых археалагічных помнікаў, мноства аб'ектаў зафіксаваў у сваёй археалагічнай карце. Аб актыўнасці Е. Раманава як даследчыка сведчыць тое, што толькі ў 1907–1914 гг. ён апублікаваў 34 навуковыя працы па беларускай археалогіі, этнаграфіі, фалькларыстыцы. У 1902 г. па яго ініцыятыве ў Магілёве было створана «Таварыства па вывучэнні Беларускага краю».

Фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы збіраў **І. Сербаў**. Па даручэнні Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства, які аднавіў сваю дзейнасць у 1910 г., ён некалькі разоў выязджаў у археалагічна-этнаграфічныя экспедыцыі. У 1915 г. І. Сербаў выдаў кнігу «Беларусы-сакуны», у якой даў гісторыка-этнаграфічную характарыстыку жыхароў Палесся. Пачынаючы з 1906 г. некалькі экспедыцый з мэтай вывучэння быта і культуры цэнтральнай часткі Палесся зрабіў **А. Сержпутоўскі**. Вынікам іх стала падрыхтоўка манаграфіі «Беларусы-палешукі (этнаграфічны нарыс). Пабудовы, заняткі і павер'і сялян паўночнай палавіны Мазырскага і паўднёвай часткі Слуцкага паветаў Мінскай губерні (38 чарцяжоў і малюнкаў)». Народнае дойлідства беларусаў вывучалі **А. Харузін** («Славянскае жыллё ў Паўночна-Заходнім краі») і **М. Косіч** («Аб пабудовах беларускага селяніна Чарнігаўскай губерні Мглінскага павета сяла Расухі, вёскі Барадзінкі»). Духоўнай культуры беларусаў прысвечана чацвёртая частка «Смаленскага этнаграфічнага зборніка» (1903), падрыхтаванага да друку **У. Дабравольскім**, а таксама праца **М. Нікіфароўскага** «Збор простанародных у Віцебскай губерні сказанняў аб нячыстай сіле».

Даследаванне народнай культуры, археалагічнай спадчыны рабіла абсалютна неабходным вывучэнне гісторыі Беларусі. Першай кнігай па айчыннай гісторыі стала «Кароткая гісторыя Беларусі», якую ў 1910 г. выдаў **В. Ластоўскі**.

Акрамя беларускіх даследчыкаў, да вывучэння быту і культуры беларускага народа звярталіся спецыялісты Акадэміі навук, Маскоўскага і Пецярбургскага ўніверсітэтаў, у сценах якіх працавалі такія вядомыя прадстаўнікі беларусазнаўства, як **А. Шахматаў**, **А. Сабалеўскі**, **М. Янчук**. У іх даследаваннях разглядаліся пытанні этнагенезу, развіцця мовы беларусаў.

Вялікі матэрыял па флоры Беларусі сабраў батанік-аматар **К. Шафнагль**, які вывучаў наваколле Ашмян, Смаргоні, Нарачы і інш. У Мінскай губерні вёў даследаванні батанік **К. Прушынскі**. Ён сабраў вялізны гербарны матэрыял. У 1907–1915 гг. мікрафлору Бе-

ларусі вывучаў **А. Ячэўскі**. У пачатку XX ст. былі створаны два невялікія даследчыцкія цэнтры, у працы якіх удзельнічалі маладыя таленавітыя батанікі-даследчыкі. Пры агранамічным аддзеле Магілёўскага губернскага земства была створана лабараторыя па выкарыстанні і культываванні балот, а ў Мінску – першая ў Расійскай імперыі балотная станцыя (1911). Апошняя выпускала зборнікі сваіх прац. Магілёўская лабараторыя штогод праводзіла геабатанічныя экспедыцыі. Арніталагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі рабілі **А. Фядзюшын, В. Біянкі, Я. Даманеўскі**.

У аграрных навуках у Беларусі пачатку XX ст. ініцыятыва ў арганізацыі даследаванняў належала сельскагаспадарчым таварыствам. У 1903 г. на базе Мар'інагорскай сельскагаспадарчай школы было арганізавана доследнае поле. Адначасова з ім у Навагрудскім павеце створана Тугановіцкая доследная ферма для вывучэння ўплыву мінеральных угнаенняў на ўраджайнасць бульбы. Пазней ферма была рэарганізавана ў Навагрудскае доследнае поле Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Віленскім таварыствам у 1910 г. у мястэчку Беняконі Лідскага павета створана доследная станцыя, якая займалася прымяненнем новай тэхнікі, удасканаленнем мясцовых сартоў зернявых культур. Адначасова ў маёнтку Скокі былі арганізаваны Брэсцкае, Гродзенскае, Ваўкавыскае доследныя палі. У 1913 г. пачала дзейнасць Віцебская ветэрынарна-бактэрыялагічная лабараторыя, якая выдавала часопіс «Ветэрынарная хроніка Віцебскай губерні».

Трывалыя традыцыі дзейнасці на тэрыторыі Беларусі мелі медыцынскія таварыствы. На мяжы XIX–XX стст. яны існавалі ў губернскіх і шэрагу павятовых (Гомель, Брэст, Бабруйск) цэнтраў. Медыцынскія таварыствы займаліся вывучэннем санітарнага стану населеных пунктаў, распрацоўвалі меры па перадухіленні захворванняў іх жыхароў, распаўсюджвалі сярод насельніцтва санітарна-гігіенічныя веды. Пры актыўным садзейнічанні з боку таварystваў у Мінску, Магілёве, Гродне, Бабруйску былі створаны мясцовыя аддзяленні Лігі барацьбы з сухотамі.

## Перыядычны друк і выдавецкая справа

Развіццё друкаванага слова ў пачатку XX ст. адбывалася ў складаных умовах. Да 1906 г. беларускамоўны друк фактычна не існаваў. Тым не менш у гэты час у гарадах Беларусі выдавалася звыш 60 газет

і часопісаў. Акрамя афіцыйных губернскіх і епархіяльных ведамасцей, пачалі выходзіць грамадска-палітычныя і літаратурныя выданні. Пераважная іх частка выдавалася на рускай мове і ў Вільні і звязана пачаткам сваёй дзейнасці з перыядам рэвалюцыйнага ўздыму 1905–1907 гг. У 1913 г. у беларускіх губернях выдавалася ўжо звыш 100 газет і часопісаў, з іх толькі тры на беларускай мове. Большая частка неафіцыйных выданняў існавала непрацяглы час, нярэдка гэта былі адзін ці некалькі нумароў газет і часопісаў.

На тэрыторыі Беларусі быў прадстаўлены друк рознай палітычнай і нацыянальна-культурнай арыентацыі. Прысутнічалі выданні ліберальнай накіраванасці («Северо-западное слово» (1898–1905), «Северо-западный голос» (1905–1915), «Окраина» (1907–1908), «Наше утро» (1912–1914) і інш.), а таксама праваманархічнай, чарнасоценнай – «Белорусский вестник» (1904–1905), «Минское слово» (1906–1912), «Крестьянин» (1906–1914), «Северо-западная жизнь» (1911–1915) і інш. Акрамя таго, на тэрыторыі беларускіх губерняў выходзіла 28 выданняў на польскай мове, 12 – на яўрэйскай, 13 – на літоўскай.

Першым легальным перыядычным выданнем на беларускай мове стала газета «Наша доля», якая выходзіла з верасня да снежня 1906 г. Фактычна яна з'яўлялася органам друку нелегальнай Беларускай сацыялістычнай грамады. У праграмным артыкуле «Да чытачоў» выказвалася жаданне змагацца за сацыяльныя і нацыянальныя свабоды, адукацыю на роднай мове, сацыяльнае і культурнае адраджэнне краю. З шасці нумароў газеты чатыры былі канфіскаваны ўладамі. У студзені 1907 г. яе выданне было забаронена, а рэдактар І. Тукеркес прыгавораны да турэмнага зняволення.

З лістапада 1906 г. да жніўня 1915 г. у Вільні выдавалася штотыднёвая газета «Наша ніва», якая склала цэлую эпоху ў фарміраванні беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, выпрацоўцы ідэалогіі нацыянальнага руху. Газета была заснавана братамі А. і І. Луцкевічамі, А. Уласавым, А. Пашкевіч (Цёткай) і інш. Выданне мела шырокую карэспандэнцкую сетку ва ўсіх кутках Беларусі, у многіх рэгіёнах Расіі, за мяжой. Вакол «Нашай нівы» аб'ядналіся аўтары розных веравызнанняў, палітычных поглядаў, якіх аб'ядноўвала жаданне нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. Тут апублікавалі свае першыя творы многія беларускія пісьменнікі. Рэдакцыя стала месцам, куды прыходзілі мастакі, даследчыкі, музычныя і тэатральныя дзеячы і інш. Тэматыка і характар апублікаваных у газеце матэрыялаў былі вельмі

разнастайнымі. Яна адгукалася на самыя розныя пытанні, асвятляла дзейнасць Дзяржаўнай Думы, судоў, паліцыі, правядзенне аграрных рэформ, жыццё сялянства, наёмных работнікаў, культурныя навінкі і многае іншае. Рэдакцыяй «Нашай нівы» была пакладзена аснова сістэматычнага выдання беларускіх кніг. Як своеасаблівыя дадаткі да газеты выходзілі «Календары», брашуры, зборнікі. У 1914–1915 гг. рэдактарам-выдаўцом «Нашай нівы» быў Я. Купала.

На беларускай мове ў 1912–1914 гг. выдаваліся часопісы, больш спецыялізаваныя па сваёй накіраванасці: літаратурны «Маладая Беларусь», сельскагаспадарчы «Саха», сатырычны «Крапіва», дзіцячы «Лучынка». Для беларусаў-католікаў у 1913–1915 гг. у Вільні выходзіла штотыднёвая грамадска-палітычная і літаратурна-мастацкая газета «Беларус». У чэрвені 1914 г. у Пецярбургу быў выдадзены адзіны нумар часопіса беларускай студэнцкай моладзі «Раніца».

У 1908–1911 гг. у Вільні дзейнічала беларускае выдавецкае таварыства «Наша хата», у 1906–1914 гг. – выдавецтвы «Мінчук», «Палачанін», «Саха», «Вясёлка». Аднак найбольш заўважны ўклад у развіццё беларускай выдавецкай справы ў той час унесла суполка «Загляне сонца і ў наша аконца», якая была створана вясной 1906 г. у Пецярбургу. Ужо ў 1906 г. яе намаганнямі былі выдадзены «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання», «Першае чытанне для дзетак беларусаў». Характэрнай асаблівасцю беларускага нацыянальнага друку была параўнальна слабая дыферэнцыяцыя супрацоўнікаў па грамадска-палітычнай прыкмеце. У адных выданнях працавалі разам і сацыялісты, і лібералы, і будучыя хрысціянскія дэмакраты і інш. Усіх іх яднала прыналежнасць да беларускага нацыянальна-культурнага руху, агульнасць яго задач.

## Развіццё літаратуры

Літаратура займала вядучае месца ў беларускай нацыянальнай культуры ў пачатку XX ст. Яна паўплывала на развіццё іншых галін духоўнага жыцця. На яе станаўленні моцна адбілася дынаміка сацыяльных змен, якія ў той перыяд сталі ўсеабдымнымі. Галоўнымі тэмамі беларускай літаратуры гэтага часу былі сцвярджэнне праў народа на годнае гістарычнае развіццё, праблема нацыянальна-культурнага адраджэння Бацькаўшчыны, сацыяльнага разняволення і абароны

чалавечай годнасці селяніна. Аднак адметнай рысай літаратуры ў пачатку XX ст. стала перавага нацыянальных матываў над усімі астатнімі сюжэтамі.

Нацыянальна-патрыятычныя матывы выразна прысутнічалі ў творчасці **Янкі Купалы**, які ў гісторыю беларускай літаратуры ўвайшоў як адзін з яе пачынальнікаў, найбольш выдатных прадстаўнікоў. Першы верш Я. Купалы «Мужык» быў надрукаваны ў 1905 г., а першы зборнік вершаў «Жалейка» – у 1908 г. Затым былі выдадзены зборнікі «Гусляр» (1910), «Шляхам жыцця» (1913). Моцнае выяўленне ў творчасці Я. Купалы знайшлі сацыяльныя матывы, перш за ўсё абарона праў працоўнага селяніна, выкрыццё яго прыгнечанага становішча. Да гісторыі народа ён звяртаецца ў творах «Курган», «З мінуўшых дзён», «Магіла льва», «Бандароўна».

Да ліку найбольш яркіх прадстаўнікоў беларускай літаратуры пачатку XX ст. адносіцца **Якуб Колас**. Яго першае выступленне ў друку звязана з публікацыяй у 1906 г. на старонках газеты «Наша доля» верша «Наш родны край». Я. Колас вельмі актыўна друкаваў вершы ў «Нашай ніве». Першы зборнік «Песні-жальбы» выйшаў у 1910 г. У 1912 г. быў надрукаваны першы зборнік празаічных твораў Я. Коласа «Апавяданні», а ў 1914 г. – «Родныя з'явы». У гэты час ён пачаў працу над сваімі класічнымі творамі «Новая зямля» і «Сымон-музыка». У 1909 г. Я. Колас выдаў «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». За ўдзел у арганізацыі нелегальнага настаўніцкага з'езда быў прыгавораны да турэмнага зняволення, якое адбываў у мінскай турме (1908–1911). Я. Колас у сваёй творчасці спыняўся перш за ўсё на тым, што акружала беларускага мужыка, спадарожнічала яму ў жыцці. Часта ён звяртаўся да тэмы непаўторнай красы роднай зямлі, асэнсавання гістарычнага вопыту народа.

Адным са стваральнікаў беларускай літаратуры і сучаснай беларускай літаратурнай мовы справядліва лічыцца **Максім Багдановіч**. Яго першым значным мастацкім творам стала апавяданне «Музыка», апублікаванае ў 1907 г. на старонках «Нашай нівы». У гэтай жа газеце з'явіліся і першыя вершы М. Багдановіча «Над магілай» і «Прыйдзе вясна» (1909). Асноўную частку жыцця М. Багдановіч правёў па-за межамі Беларусі – у Ніжнім Ноўгарадзе і Яраслаўлі, дзе атрымаў адукацыю і пачаў цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі. Важнай падзеяй у жыцці паэта стала паездка ў Беларусь летам 1911 г., калі ён некалькі месяцаў пражыў у фальварку Ракуцёўшчына недалёка ад

Маладзечна. Тут ён напісаў творы, якія пазней склалі паэтычныя цыклы «Старая Беларусь», «Места» і «Мадонны». У канцы 1913 г. у Вільні выйшаў адзіны прыжыццёвы збор твораў М. Багдановіча – паэтычны зборнік «Вянок». У шэрагу вершаў («Слуцкія ткачыхі» (1912), «Новая интеллигенция» (1914), «Пагоня» (1917) і інш.) ён звяртаўся да гістарычнага мінулага беларускага народа, вытокаў яго культуры.

Літаратурная творчасць **Цёткі** (А. Пашкевіч) разгортвалася пад уплывам яе актыўнага ўдзелу ў рэвалюцыйным і беларускім культурна-асветніцкім руху. Яе вершы «Хрэст на свабоду», «Мора», «Пад штандарам» распаўсюджваліся як рэвалюцыйныя пракламацыі. У 1906 г. Цётка выдала ў Аўстра-Венгрыі зборнікі вершаў «Хрэст на свабоду», «Скрыпка беларуская». У першым нумары газеты «Наша доля» быў апублікаваны яе твор «Прысяга над крывавымі разорамі». У гэты час у Пецярбургу выйшла яе ж «Першае чытанне для дзетак беларусаў». Гастралявала разам з тэатрам І. Буйніцкага па Беларусі. У 1914 г. Цётка заснавала і рэдагавала першы беларускі часопіс для моладзі і дзяцей «Лучынка».

Як крытык і літаратуразнавец у 1909 г. дэбютаваў на старонках «Нашай нівы» **С. Палуян**. Ён, як і М. Багдановіч, пражыў вельмі кароткае жыццё. Сваёй публіцыстыкай С. Палуян пакінуў цэласную канцэпцыю нацыянальнага адраджэння беларусаў, у аснове якой – вызначэнне месца і ролі мовы ў грамадскім жыцці. У гэты час з'явіліся публіцыстычныя творы А. Навіны (А. Луцкевіча), В. Ластоўскага, Л. Гмырака.

У 1910 г. апублікаваў у «Нашай ніве» свой першы твор на беларускай мове **З. Бядуля**. У 1913 г. ён выдаў першы зборнік твораў «Абразкі». У «Нашай ніве» надрукавала свае першыя вершы таксама **К. Буйло**, а ў 1914 г. у Вільні выйшаў яе зборнік «Курганная кветка». З 1912 г. пачаў друкаваць свае карэспандэнцыі, фельетоны **М. Гарэцкі**, у 1913 г. у «Нашай ніве» з'явілася яго першае апавяданне, а ў 1914 г. выйшаў зборнік твораў «Рунь». Газета «Наша ніва» аказала вялікі ўплыў на літаратурную дзейнасць **Ц. Гартнага**, які ў 1913 г. выдаў зборнік «Песні». Яго творчасць у гэты час была непарыўна звязана з рэвалюцыйнай дзейнасцю, удзелам у беларускім нацыянальным руху.

Адным з заснавальнікаў беларускай прозы ў пачатку XX ст. быў **Ядвігін Ш.** (А. Лявіцкі). У 1912 г. выйшаў з друку зборнік яго апавяданняў «Бярозка», а ў 1914 г. – «Васількі», якія ў той час прынеслі аўтару шырокую вядомасць.

## Выяўленчае мастацтва

Самым распаўсюджаным жанрам беларускага жывапісу ў пачатку XX ст. быў пейзаж. Сярод мастакоў у гэты час з'явіліся новыя імёны – Ф. Рушчыц, Г. Вейсенгоф, К. Стаброўскі, В. Бялыніцкі-Біруля. **Ф. Рушчыц** пасля заканчэння Пецярбургскай акадэміі мастацтваў працяглы час жыў у маёнтку Багданаў Ашмянскага павета. Тут ён напісаў свае лепшыя творы: «У свет», «Эмігранты», «Вадзяны млын», «Лясны ручай», «Зіма» і інш. Творы Ф. Рушчыца экспанаваліся на выстаўках у Пецярбургу, Варшаве. Мастак часта наведваў Вільню, дзе ўдзельнічаў у стварэнні тэатральных дэкарацый.

Рознабаковасцю вызначалася творчасць жывапісца, графіка, скульптара **Г. Вейсенгофа**, які таксама быў выхаванцам Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Вядомасць атрымалі яго работы «Прадчуванне», «Гусі», «Сплін», «Від Палесся» і інш. Пастаянным удзельнікам выставак у Парыжы, Мюнхене, Венецыі быў **К. Стаброўскі**. Шырокую вядомасць атрымала серыя яго палотнаў «Шэсце навальніцы». Адной з найбольш яркіх старонак у гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва стала творчасць **В. Бялыніцкага-Бірулі**. Яго карціны карысталіся вялікім поспехам. Іх набывалі вядомыя калекцыянеры і збіральнікі. На выстаўках у Парыжы, Вене палотны В. Бялыніцкага-Бірулі былі адзначаны медалямі. У 1908 г. яму было прысвоена званне акадэміка жывапісу. Цікавасць выклікаюць работы мастака «Вечныя снягі», «Сакавіцкае змярканне», «Зімовы пейзаж» і інш.

Заўважны ўплыў на развіццё беларускага пейзажа аказалі рускія мастакі, якія пэўны час жылі і працавалі ў Беларусі. Свае работы «Асенні букет», «Дуэль» **І. Рэпін** стварыў у Здраўнёве пад Віцебскам. Многія творы напісалі ў Беларусі **І. Шышкін**, **І. Пахітонаў**, **А. Мяшчэрскі** і інш.

Развіццё атрымаў і бытавы жанр у жывапісе. Найбольш буйным яго прадстаўніком стаў **Ю. Пэн**. Ім створана цэлая галерэя работ – «Гадзіншчык», «Стары кравец», «Жабрак», «Стары салдат» і інш. Ю. Пэн арганізаваў прыватную мастацкую школу ў Віцебску, сярод таленавітых вучняў якой – М. Шагал, С. Юдовін і інш. Мастацка-выкладчыцкай дзейнасцю ў Мінску займаўся **Я. Кругер**. Ім створаны шэраг палотнаў: «На суд прафесара», «Пісьманосец», «Апавяданне», «Дзяўчынка ў чырвоным» і інш.

Паскарэнне ў пачатку XX ст. сацыяльнай дынамікі, імкненне аператыўна адклікацца на падзеі тагачаснага грамадскага жыцця, ад-

люстраваць іх абумовілі развіццё графікі як жанру выяўленчага мастацтва. Як графікі перш за ўсё праявілі сябе ў мастацтве К. Каганец, Я. Драздовіч. У іх творчасці беларускія нацыянальныя матывы прасочваюцца найбольш выразна. **К. Каганец** пакінуў шэраг малюнкаў: «За сахою», «Маці», «Буслы», «На ростаньках» і інш. Ён стаў таксама адным з пачынальнікаў палітычнай карыкатуры. У 1910 г. К. Каганец зрабіў вокладку для кнігі Я. Коласа «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». Шматгранны талент **Я. Драздовіча** праявіўся ў афармленні кнігі К. Буйло «Курганная кветка», стварэнні партрэта Ф. Скарыны, эскізах графічных серый «Мір», «Ліда», «Крэва», «Гальшанскае гарадзішча». Асоба Я. Драздовіча ўнікальная ў мастацкім жыцці Беларусі пачатку XX ст. Ён праявіў сябе як графік, жывапісец, скульптар, дэкаратар, археолаг, фальклярыст, пісьменнік. У пастаянных пошуках мастацкіх рашэнняў ён звяртаўся да духоўнай спадчыны народа, яго гістарычных каранёў.

## Архітэктура

У пачатку XX ст. разам з рэтраспектыўна-эклектычным напрамкам атрымалі пашырэнне новыя архітэктурныя кірункі – мадэрн і неакласіцызм. Сферай распаўсюджання эклектыкі былі найперш будынкі масавага прызначэння – гарадское жыллё, даходныя дамы, навучальныя і адміністрацыйныя пабудовы, будынкі гандлёва-фінансавага прызначэння і інш. Прыкладам прымянення эклектыкі ў архітэктуры можа служыць дом на рагу вуліц Валадарскага і Кірава ў Мінску. У неарускім стылі, які не атрымаў значнага пашырэння на тэрыторыі Беларусі, узведзены будынак аддзялення Сялянскага пазямельнага банка ў Віцебску.

Рацыяналізм і прагматызм запатрабаванняў часу і жыцця перыяду разгортвання мадэрнізацыйных працэсаў, станаўлення і актыўнага развіцця буржуазных адносін выявіліся ў з'яўленні на мяжы XIX–XX стст. новага стылявога кірунку ў архітэктуры – мадэрну. Новы стыль стаў адыходам ад пераймальніцтва і кампілятывізму папярэдняга перыяду. Сацыяльнае сталенне прадпрымальніцкіх колаў выявілася ў спробах самавызначэння і ў культуры, з'яўленні ў ёй пластоў, адпаведных іх ладу жыцця. На ўсталяванне мадэрну значны ўплыў аказала фарміраванне капіталістычнага рынку, запатрабаванасць эстэтыкі, адпаведнай індывідуальным густам і звычкам заказчыка. Пачатак па-

шырэння мадэрну быў звязаны з адмаўленнем ад дэманстратыўнага капіравання гістарычных архітэктурных форм.

Найбольш пашыраным кірункам мастацка-стылявога развіцця архітэктуры ў напрамку мадэрну стаў неакласіцызм. Заўважны ўплыў на фарміраванне беларускага неакласіцызму аказала творчасць мінскіх архітэктараў **Г. Гая, С. Гайдукевіча** (будынкі страхавой кампаніі, даходных дамоў у Мінску і інш.). Уздзеянне эстэтыкі мадэрну выявілася таксама ў неараманскім і неагатычным стылях. У цэлым для архітэктуры мадэрну ў Беларусі характэрна выкарыстанне стылізаваных дэкаратыўных элементаў готыкі, класіцызму, старажытнарускага і іншых стыляў. Элементы неараманскага стылю выкарыстаны пры ўзвядзенні будынка аддзялення Сялянскага пазямельнага банка ў Магілёве. У неагатычным стылі з рысамі мадэрну пабудаваны ў 1908–1910 гг. касцёл Сімяона і Алены ў Мінску паводле праекта архітэктара **Т. Пайздэрскага** пры ўдзеле У. Марконі і Г. Гая. У неагатычным стылі была выканана абсалютная большасць касцёлаў, пабудаваных у канцы XIX – пачатку XX ст. У іх ліку касцёлы ў Вілейцы, Івянцы, Ракаве і інш.

Развіццё эканомікі, рост прамысловасці выклікалі з'яўленне новай будаўнічай тэхнікі і матэрыялаў. У будаўніцтве пачалі выкарыстоўвацца чыгун, метал, жалезабетон, што адкрывала новыя магчымасці для ўзвядзення шматпавярховых дамоў.

## Беларускі тэатр і музыка

Актывізацыя грамадскага жыцця ў пачатку XX ст., рэвалюцыйныя падзеі 1905–1907 гг., абвостраная цікавасць у насельніцтва да надзённых сацыяльных пытанняў, рост нацыянальна-культурных рухаў самым непасрэдным чынам адбіліся на развіцці музычна-тэатральнага мастацтва Беларусі, выклікалі актывізацыю культурна-асветніцкага жыцця. Тэатр стаў трыбунай, з якой прапагандаваліся ідэі, сугучныя свабодалюбівым настроям у грамадстве, што мацнелі ў пачатку XX ст. На сцэне час ад часу ставіліся творы, якія садзейнічалі росту грамадскай свядомасці насельніцтва. З'яўленне нацыянальнага прафесійнага тэатра наклала моцны адбітак на фарміраванне этнічнай свядомасці беларусаў.

У пачатку XX ст. Мінск, Віцебск, Магілёў, Бабруйск і іншыя гарады часта наведвалі рускія і ўкраінскія тэатральныя трупы. У Беларусі выступалі акцёрскія таварыствы, творчыя групы і калектывы Алек-

сандрынскага, Маскоўскага Малога, Пецярбургскага тэатраў, Літаратурна-мастацкага таварыства і інш. Беларускія гледачы мелі магчымасць пазнаёміцца з творчасцю В. Камісаржэўскай, К. Варламава, А. Яблачкінай, В. Далматава і інш. Актыўна гастралявалі па беларускіх гарадах і мястэчках украінскія трупы П. Саксаганскага, О. Суслава, А. Сагайдачнага і інш. У рэпертуары рускіх і ўкраінскіх калектываў было шмат твораў М. Гогаля, А. Астроўскага, А. Чэхава, М. Горкага, М. Крапіўніцкага і інш.

Адметнай з'явай у гэты час стала дзейнасць мясцовых тэатральных таварystваў, напаўпрафесійных труп і аматарскіх калектываў. У Мінску працаваў тэатральны калектыў пры Таварыстве аматараў мастацтваў. На сцэне Мінскага гарадскога тэатра выступала мясцовая трупа **П. Струйскага**. У Гомелі дзейнічала таварыства артыстаў пад кіраўніцтвам **А. Паляковай**. Аматарскія калектывы існавалі пры клубах чыгуначных станцый, Народным доме ў Магілёве і інш. У іх рэпертуары пераважалі п'есы рускіх і ўкраінскіх аўтараў. У Беларусі ў складзе мясцовых калектываў выступала нямала здольных акцёраў: **М. Тарханаў**, **І. Загорскі**, **Л. Людвігаў**, **Н. Смірнова**, **Р. Неўскі** і інш.

На мяжы XIX–XX стст. атрымалі пашырэнне так званыя «беларускія вечарынкі» – своеасаблівыя тэатральна-музычныя паказы, на якіх дэкламаваліся творы пераважна беларускіх аўтараў ці ў перакладзе на беларускую мову, выконваліся народныя песні і танцы, ставіліся спектаклі. Адны з першых з іх адбыліся ў 90-х гг. XIX ст. у Радашковічах, у фальварку Карлсберг, які належаў вядомаму беларускаму нацыянальна-культурнаму дзеячу **А. Снітку**. У пачатку XX ст. беларускамоўныя тэатральныя прадстаўленні адбыліся ў Радашковічах, на хутары Пятроўшчына пад Мінскам. «Беларускія вечарынкі» сталі прадвеснікам з'яўлення беларускага нацыянальнага прафесійнага тэатра. Для яго станаўлення патрэбны былі п'есы беларускіх аўтараў. У значнай ступені гэты недахоп быў запоўнены творамі Я. Купалы («Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Прымакі»), К. Каганца («Модны шляхцюк», «Двойчы прапілі», «Старажовы курган», «У іншым шчасці няшчасце схавана»), Я. Коласа («На дарозе жыцця»), Л. Родзевіча («Блуднікі»), З. Бядулі («Пастушкі») і інш. З 1905 г. «беларускія вечарынкі» атрымалі вялікае пашырэнне ў гарадах, мястэчках і вёсках Беларусі. Некаторыя з іх узнікалі стыхійна, часам насілі выпадковы характар, іншыя перарасталі ў пастаянныя тэатральныя калектывы – як, напрыклад, трупа пад кіраўніцтвам І. Буйніцкага. Нярэдка наладж-

валіся беларускія калядкі, паказвалася беларуская батлейка. Акрамя беларускіх аўтараў, выкарыстоўваліся таксама творы М. Крапіўніцкага, А. Чэхава, Э. Ажэшкі і інш.

Яркай старонкай у гісторыі беларускага тэатра пачатку XX ст. стала дзейнасць Першай беларускай трупы, якую стварыў і якой кіраваў **І. Буйніцкі**. Гэта трупа ўзнікла на аснове «беларускіх вечарынак», што І. Буйніцкі праводзіў у сваім фальварку Палівачы Дзісненскага павета. Спачатку трупа наладжвала прадстаўленні ў навакольных вёсках. У 1907 г. сфарміраваўся яе сталы склад. У 1910 г. тэатр І. Буйніцкага пераўтварыўся ў прафесійны з уласным рэпертуарам. Глядач мог пазнаёміцца з народнымі песнямі і танцамі, вершамі, апавяданнямі, драматычнымі творамі беларускіх аўтараў. У складзе тэатра працавалі хор, танцавальная і драматычная трупы. З 1910 г. трупа І. Буйніцкага сістэматычна гастралявала па Беларусі. Спектаклі паказваліся ў Мінску, Вільні, Слуцку, Капылі, Нясвіжы, Полацку і інш. У працы тэатра актыўна ўдзельнічалі Цётка (А. Пашкевіч), А. Бурбіс і інш. Сам І. Буйніцкі быў цудоўным танцорам, добрым акцёрам, рэжысёрам і арганізатарам. Аднак праз абмежаваныя матэрыяльныя магчымасці калектыў у 1913 г. спыніў сваю дзейнасць.

Гастрольныя выступленні па Беларусі трупы І. Буйніцкага далі значны штуршок «беларускім вечарынкам», якія набылі масавы характар і шырокую геаграфію. Акрамя калектыву І. Буйніцкага, узнік віленскі **Беларускі музычна-драматычны гурток**, які ў студзені 1912 г. здзейсніў першую пастаноўку «Паўлінкі» Я. Купалы. К 1910 г. падобныя тэатральныя гурткі дзейнічалі ў Гродне, Мінску, Слуцку, Капылі, Полацку, Дзісне, Радашковічах, Пецярбургу, Варшаве і інш.

Разнастайным было таксама музычнае жыццё. Оперныя трупы, аркестры, харавыя калектывы, ансамблі, салісты-спевакі знаёмілі жыхароў беларускіх гарадоў з рускай і замежнай музычнай класікай. У пачатку XX ст. з вялікім поспехам у Беларусі даваў канцэрты кампазітар і піяніст А. Скрабін, піяністы А. Зілоці, І. Гофман, В. Сафонаў, скрыпачы Л. Аўэр, М. Палякін, спевакі Л. Собінаў, М. Бацісціні і інш. Актыўна гастралявалі ўкраінскія музычна-драматычныя калектывы. З канца XIX ст. на тэрыторыі Беларусі пачалі адкрывацца музычныя школы.

Бурны час пачатку XX ст., уздым нацыянальна-культурнага руху, пашырэнне нацыянальнай свядомасці беларускага народа садзейнічалі развіццю яго музычнай культуры, узбагачэнню яе творамі, насычанымі глыбокім грамадзянскім зместам. Поспехам карысталіся выступленні

хора **В. Тэраўскага** ў Мінску, які праводзіў вялікую дзейнасць па прапагандзе беларускіх народных песень. Апрацоўкай іх займаліся **В. Тэраўскі, Л. Рагоўскі**, **А. Грыневіч**. У 1911 г. Л. Рагоўскі выдаў «Беларускі песеннік з нотамі для народных і школьных хароў». Беларускія народныя матывы выразна прысутнічалі ў напісанай ім сюіце для сімфанічнага аркестра, якая з поспехам выконвалася ў Варшаве і Вільні. Кампазітар і дырыжор, Л. Рагоўскі высока ацэньваў народную творчасць як найвялікшую каштоўнасць духоўнай культуры. Ён напісаў кантату «А хто там ідзе?» на верш Я. Купалы. У 1911 г. **М. Чуркін** апублікаваў свае апрацоўкі беларускіх народных песень для фартэпіяна. І. Шадурскім у 1912 г. была напісана беларуская музычная камедыя «Тарас на Парнасе».

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ

*Абезгауз, З. Е.* Рабочий класс Белоруссии в начале XX в. (1900–1913 гг.) / З. Е. Абезгауз. – Минск : Наука и техника, 1977. – 168 с.

*Абезгауз, З. Е.* Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века / З. Е. Абезгауз. – Минск : Наука и техника, 1971. – 180 с.

*Агурский, С.* Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917) / С. Агурский. – Минск : Белорус. гос. изд-во, 1928. – 346 с.

Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. / М. А. Ткачоў [і інш.] ; пад рэд. М. А. Лазарука [і інш.]. – Мінск : Нар. асвета, 1985. – 464 с.

*Бейлькин, Х. Ю.* Аграрный кризис конца XIX в. и структурная реконструкция сельского хозяйства Беларуси / Х. Ю. Бейлькин. – Минск : Белорус. наука, 2001. – 190 с.

*Бейлькин, Х. Ю.* Капиталистическая трансформация сельского хозяйства Беларуси в начале XX века (1901–1914 гг. ) / Х. Ю. Бейлькин. – Гомель : ЦИИР, 2006. – 296 с.

*Бейлькин, Х. Ю.* Сельскохозяйственный рынок Беларуси 1861–1914 гг. / Х. Ю. Бейлькин ; науч. ред. М. О. Бич. – Минск : Наука и техника, 1989. – 288 с.

Беларусы : у 13 т. / рэдкал.: В. М. Бялявіна [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1995–2012. – Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё / В. К. Бандарчык [і інш.]. – 2001. – 433 с. ; Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.

Белоруссия в эпоху капитализма : сб. док. и материалов : в 2 т. / Гл. арх. упр. при Совете Министров БССР, Ин-т истории АН БССР. – Минск : Наука и техника, 1983–1990. – Т. 1 / сост.: В. И. Мелешко [и др.]. – 1983. – 272 с. ; Т. 2 / сост.: З. Е. Абезгауз, Н. Л. Рябцевич. – 1990. – 336 с.

*Біч, М. В.* Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / М. В. Біч // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1972. – № 4. – С. 32–40.

*Бич, М. О.* Рабочее движение в Белоруссии 1861–1904 гг. / М. О. Бич. – Минск : Наука и техника, 1983. – 280 с.

*Бич, М. О.* Развитие социал-демократического движения в Белоруссии. 1883–1903 / М. О. Бич. – Минск : Наука и техника, 1973. – 232 с.

*Бобровский, П.* Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Гродненская губерния : в 2 ч. / П. Бобровский. – СПб. : Тип. Департамента Генер. штаба : Тип. И. Огрызко, 1863. – Ч. 1. – 866 с. ; Ч. 2. – 1074 с.

*Болбас, М. Ф.* Промышленность Белоруссии. 1860–1900 гг. / М. Ф. Болбас. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 312 с.

*Бригадин, П. И.* Минские губернаторы: история власти / П. И. Бригадин, А. М. Лукашевич. – Минск : ГИУСТ БГУ, 2009. – 351 с. : ил.

*Верещагин, П. Д.* Крестьянские переселения из Белоруссии (вторая половина XIX в.) / П. Д. Верещагин. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 144 с.

Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы / Н. В. Анофранка [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – 447 с.

Гісторыя Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Выш. шк., 2006. – Ч. 1 : Ад старажытных часоў па люты 1917. – 397 с.

Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 519 с.

Гісторыя Беларусі : курс лекцый : у 2 ч. / П. І. Брыгадзін [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2 : XIX–XX ст. – 656 с.

Гісторыя Беларусі і сусветная цывілізацыя : дапам. для студэнтаў прыродазн. фак. / А. Г. Каханоўскі [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2008. – 311 с.

Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму : вучэб.-метад. дапам. : у 5 ч. / склад.: А. П. Жытко [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2005–2009. – Ч. 1 : Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі. – 2005. – 138 с. ; Ч. 3 : Аграрная гісторыя: сацыяльна-эканамічныя і палітычныя праблемы. – 2007. – 216 с. ; Ч. 4 : Буржуазныя рэформы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. – 2009. – 168 с.

Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / рэдкал.: С. А. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988–1994. – Т. 3 : Канец XVIII – пачатак XX ст. / Л. М. Дробаў [і інш.]. – 1989. – 448 с. : іл.

Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. / рэдкал.: У. І. Няфёд [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – Т. 1 : Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. – 496 с. : іл.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XX ст. : у 2 кн. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011–2012. – Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.]. – 2011. – 584 с.

Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старшыня) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 2 : Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.) / рэдкал.: К. І. Шабуня (гал. рэд.) [і інш.]. – 1972. – 688 с.

Гісторыя сялянства Беларусі : у 3 т. / рэдкал.: М. С. Сташкевіч [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1997–2002. – Т. 2 : Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгауз [і інш.] ; пад рэд. В. П. Панюціча. – 2002. – 552 с.

Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с. : іл.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі : у 4 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі ; пад рэд. Н. М. Нікольскага [і інш.]. – Мінск : Выд-ва Акад. навук БССР, 1940. – Т. 2 : 1772–1903. – 938 с.

*Довнар-Запольский, М. В.* История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – Минск : Беларусь, 2003. – 680 с.

*Довнар-Запольский, М. В.* Народное хозяйство Белоруссии. 1861–1914 гг. / М. В. Довнар-Запольский. – Минск : Изд-во Госплана БССР, 1926. – 240 с.

Документы и материалы по истории Белоруссии : в 4 т. / Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1936–1954. – Т. 3 : 1900–1917 гг. / под ред. В. Н. Перцева [и др.]. – 1953. – 1019 с.

*Долбилов, М.* Обратная уния: из истории отношений между католицизмом и православием в Российской империи. 1840–1873 / М. Долбилов, Д. Сталюнас. – Вильнюс : Ин-т истории Литвы, 2010. – 274 с.

*Долбилов, М. Д.* Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М. Д. Долбилов. – М. : Новое лит. обозрение, 2010. – 1000 с. : ил.

*Дроздова, Е. А.* Формирование банковской системы Беларуси (1861–1914 гг.) / Е. А. Дроздова. – Минск : Ковчег, 2008. – 162 с.

*Дудкоў, Д. А.* Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў 2-й палове XIX і пачатку XX стагоддзя / Д. А. Дудкоў. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1932. – 203 с.

*Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. / А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.

*Забаўскі, М. М.* Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906–1917 гг.) / М. М. Забаўскі. – Мінск : БДПУ імя М. Танка, 1999. – 212 с.

*Зайцев, В. М.* Социально-сословный состав участников восстания 1863 г. (опыт статистического анализа) / В. М. Зайцев. – М. : Наука, 1973. – 196 с.

Западные окраины Российской империи / под ред. А. И. Миллера, М. Д. Долбилова. – М. : Новое лит. обозрение, 2006. – 608 с. : ил.

*Иванова, Н. А.* Сословно-классовая структура России в конце XIX – начале XX века / Н. А. Иванова, В. П. Желтова. – М. : Наука, 2004. – 574 с.

*Ігнатоўскі, У.* Гісторыя Беларусі XIX і ў пачатку XX сталецьця / У. Ігнатоўскі. – Мінск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1928. – 252 с.

Иностранные подданные в Беларуси: конец XVIII – начало XX в. / сост. И. Л. Вернер ; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : Тип. Макарова и К., 2012. – 528 с.

История Беларуси: полный курс : учеб. пособие / А. Г. Кохановский [и др.]. – Минск : Юнипресс, 2010. – 512 с.

История рабочего класса Белорусской ССР : в 4 т. / редкол.: К. И. Шабуня [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1984. – Т. 1 : Рабочий класс Белоруссии в период капитализма. – 400 с.

*Каліноўскі, К.* За нашу вольнасць. Творы, дакументы / К. Каліноўскі ; уклад., прадм., паслясл. і камент. Г. Кісялёва. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1999. – 464 с.

Канфесіі на Беларусі, канец XVIII – XX ст. / В. В. Грыгор'ева [і інш.] ; навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.

Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 496 с.

*Каппелер, А.* Россия – многонациональная империя / А. Каппелер. – М. : Прогресс-Традиция, 2000. – 344 с.

*Каханоўскі, А. Г.* Гісторыя Беларусі другой паловы XIX ст. : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў ВНУ / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2012. – 151 с.

*Каханоўскі, А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск : БДУ, 2013. – 335 с.

*Кісялёў, Г. В.* Жылі-былі класікі: Хто напісаў паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе» / Г. В. Кісялёў. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 549 с. : іл.

*Комзолова, А. А.* Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. – М. : Наука, 2005. – 383 с.

*Корева, А.* Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба: Виленская губерния / А. Корева. – СПб. : Тип. И. Огризко, 1861. – 804 с.

*Крук, У. П.* Сялянскі рух на Беларусі, 1864–1900 гг. / У. П. Крук ; пад рэд. М. В. Біча. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 175 с.

*Кулагін, А. М.* Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. / А. М. Кулагін. – Мінск : Ураджай, 2000. – 304 с. : іл.

*Лавринович, Д. С.* Деятельность Конституционно-демократической партии и «Союза 17 октября» в Беларуси (1905–1918 гг.) / Д. С. Лавринович. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2009. – 336 с. : ил.

*Липинский, Л. П.* Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.) / Л. П. Липинский. – Минск : Наука и техника, 1971. – 256 с.

*Липинский, Л. П.* Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии / Л. П. Липинский. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 224 с.

Материалы для географии и статистики Российской империи, собранные офицерами генерального штаба : в 25 т. – СПб. : Воен. тип., 1859–1868. – Т. 15 : Минская губерния : в 2 ч. – 1864. –Ч. 1. – 672 с. ; Ч. 2. – 701 с.

*Миронов, Б. Н.* Социальная история России периода империи (XVIII – начало XX в.): генезис личности, демократической семьи, гражданского общества и правового государства : в 2 т. / Б. Н. Миронов. – СПб. : Дмитрий Буланин, 1999. – 2 т.

На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы / В. В. Яноўская [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 311 с.

Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с. : іл.

*Носевич, В. Л.* Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе / В. Л. Носевич. – Минск : Тэхналогія, 2004. – 350 с.

*Панютич, В. П.* Из истории формирования пролетариата Белоруссии (1861–1914 гг.) / В. П. Панютич. – Минск : Наука и техника, 1969. – 192 с.

*Панютич, В. П.* Историография аграрной истории Беларуси 1861–1917 гг. / В. П. Панютич. – Минск : Ин-т истории НАН Беларуси, 2005. – 262 с.

*Панютич, В. П.* Наемный труд в сельском хозяйстве Беларуси 1861–1914 гг. / В. П. Панютич. – Минск : Навука і тэхніка, 1996. – 142 с.

*Панютич, В. П.* Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. / В. П. Панютич ; науч. ред. П. Г. Козловский. – Минск : Навука і тэхніка, 1990. – 375 с.

Пачынальнікі: з гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / уклад. Г. В. Кісялёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 544 с. : іл.

*Полетаева, Н. И.* Купечество Беларуси: 60-е гг. XIX – начало XX в. / Н. И. Полетаева. – Минск : БГЭУ, 2004. – 247 с.

Публицистика белорусских народников / сост.: С. Х. Александрович, И. С. Александрович. – Минск : Изд-во БГУ, 1983. – 134 с.

Россия: полное географическое описание нашего отечества: настольная и дорожная книга для русских людей : в 19 т. / под ред. В. П. Семенова ; под общ. рук. П. П. Семенова и В. И. Ламанского ; [предисл. В. Семенова]. – СПб. : А. Ф. Девриена, [1899–1914]. – Т. 9 : Верхнее Поднепровье и Белоруссия: [Смоленская, Могилевская, Витебская и Минская губернии] : с 111 политипажами, 37 диагр., картогр. и схемат. профилями, 1 большой справ. и 10 малыми к. / сост.: В. П. Семенов [и др.]. – 1905. – VII, 619 с.

*Самбук, С. М.* Общественно-политическая мысль Белоруссии во второй половине XIX века (по материалам периодической печати) / С. М. Самбук. – Минск : Наука и техника, 1976. – 184 с.

*Самбук, С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. / С. М. Самбук. – Минск : Наука и техника, 1980. – 224 с.

*Самбук, С. М.* Революционные народники Белоруссии (70-е – начало 80-х годов XIX в.) / С. М. Самбук. – Минск : Наука и техника, 1972. – 248 с.

*Слобожанин, В. П.* Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.) / В. П. Слобожанин. – Минск : Гавриленко В. Г., 1994. – 85 с.

*Смалянчук, А. Ф.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – СПб. : Неў. прасцяг, 2004. – 406 с.

*Снапкоўская, С. В.* Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск : НІА, 1998. – 191 с.

*Соколова, М. А.* Общественные движения на территории Беларуси (XIX – начало XX в.): историография, методологические принципы исследования / М. А. Соколова. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 448 с.

*Терешкович, П. В.* Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: в контексте Центрально-Восточной Европы / П. В. Терешкович. – Минск : БГУ, 2004. – 223 с.

*Титов, В. С.* Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов, XIX – начало XX в. / В. С. Титов. – Минск : Наука и техника, 1983. – 152 с.

*Токць, С.* Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX – першая траціна XX ст. / С. Токць. – Менск : Тэхналогія, 2007. – 308 с. : 8 арк. іл.

*Токць, С. М.* Сацыяльныя і культурныя працэсы ў беларускай вёсцы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / С. М. Токць. – Мінск : ДІКСТ БДУ, 2016. – 328 с.

*Улашчык, М.* Была такая вёска : гіст.-этнагр. нарыс / М. Улашчык. Мінск : Маст. літ. , 1989. – 174 с.

*Улащик, Н. Н.* Грамотность в дореволюционной Белоруссии / Н. Н. Улащик // История СССР. – 1968. – № 1. – С. 106–116.

*Улащик, Н. Н.* Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии / Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1965. – 479 с.

*Унучак, А. У.* «Наша ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906–1915 гг.) / А. У. Унучак. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 186 с. : [5 арк.] іл.

*Филяков, В. Г.* Революционные связи рабочих Белоруссии и России в конце XIX – начале XX в. / В. Г. Филяков. – Минск : Наука и техника, 1987. – 142 с.

*Фридман, М. Б.* Отмена крепостного права в Белоруссии / М. Б. Фридман. – Минск : Изд-во Белорус. ун-та, 1958. – 202 с.

*Цьвікевіч, А.* «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – 2-е выд. – Менск : Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

*Цяплова, В. А.* Гісторыя Беларусі XIX ст. : вучэб.-метад. комплекс для студэнтаў гіст. фак. спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя» / В. А. Цяплова, А. Г. Каханоўскі, І. Л. Грыбко. – Мінск : БДУ, 2004. – 244 с.

*Шабуня, К. И.* Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. / К. И. Шабуня ; [под ред. Т. С. Горбунова]. – Минск : Изд-во М-ва высш., сред. спец. и проф. образования БССР, 1962. – 435 с.

*Шимукович, С. Ф.* Благотворительность в Беларуси в конце XIX – начале XX века / С. Ф. Шимукович. – Минск : Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2006. – 188 с.

*Шыбека, З. В.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзя) / З. В. Шыбека. – Мінск : ЭўроФорум, 1997. – 292 с.

Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 213, [2] с.

*Яноўская, В. В.* Хрысціянская царква ў Беларусі 1863–1914 гг. / В. В. Яноўская. – Мінск : БДУ, 2002. – 199 с. : іл.

# ЗМЕСТ

Прадмова .......... 3
Тэма 1. Гістарыяграфія і крыніцы .......... 5
Тэма 2. Мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі .......... 27
Тэма 3. Адмена прыгоннага права. Буржуазныя рэформы 60–70-х гг. XIX ст. .......... 49
Тэма 4. Урадавая палітыка .......... 65
Тэма 5. Сельская гаспадарка .......... 83
Тэма 6. Прамысловасць і гарады. Транспарт, гандаль і крэдыт .......... 99
Тэма 7. Паўстанне 1863 г. Грамадска-палітычнае жыццё .......... 117
Тэма 8. Культура Беларусі ў 1860–90-я гг. Фарміраванне беларускай нацыі .......... 137
Тэма 9. Беларусь на мяжы XIX–XX стст. .......... 161
Тэма 10. Рэвалюцыйныя падзеі 1905–1907 гг. у Беларусі .......... 181
Тэма 11. Сталыпінскія рэформы ў Беларусі .......... 199
Тэма 12. Эканамічнае і грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 1907–1914 гг. .......... 211
Тэма 13. Культура Беларусі ў пачатку XX ст. .......... 225
Спіс літаратуры .......... 245

Вучэбнае выданне

**Каханоўскі** Аляксандр Генадзьевіч

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**Вучэбна-метадычны дапаможнік**

Адказны за выпуск *А. А. Лагвіновіч*
Мастак вокладкі *Т. Ю. Таран*
Тэхнічны рэдактар *Т. К. Рамановіч*
Камп'ютарная вёрстка *С. М. Ягоравай*
Карэктары *Н. В. Яненка, Т. М. Вяльчынская*

Падпісана да друку 30.11.2017. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 14,65. Ул.-выд. арк. 15,3. Тыраж 100 экз. Заказ 768.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/270 ад 03.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.





ISBN 978-985-566-485-8

А. Г. Каханоўскі

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX–ПАЧАТКУ XX ст.